А. М. Змушко Л. Р. Дзенісевіч

# Беларуская мова 8



**Скланенне прыметнікаў**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Н. | ёсць | які? якое? якая? | бел**ы** снег,<br>сін**яе** мора,<br>марозн**ая** зіма |
| Р. | няма | як**ога**? як**ой**? | бел**ага** снегу,<br>сін**яга** мора,<br>марозн**ай** зімы |
| Д. | даць | як**ому**? як**ой**? | бел**аму** снегу,<br>сін**яму** мору,<br>марозн**ай** зіме |
| В. | бачу | як**ога**? як**і**? як**ое**? як**ую**? | бел**ы** снег,<br>сін**яе** мора,<br>марозн**ую** зіму |
| Т. | задаволены | як**ім**? як**ой**? | бел**ым** снегам,<br>сін**ім** морам,<br>марозн**ай** зімой |
| М. | гаварыць | аб як**ім**? аб як**ой**? | аб бел**ым** снезе,<br>аб сін**ім** моры,<br>аб марозн**ай** зіме |

**Скланенні назоўнікаў**

| 1-е скланенне | 2-е скланенне | 3-е скланенне |
|---|---|---|
| ***ж. р. —<br>канчаткі -а, -я*** | ***м. р. —<br>нулявы канчатак;<br>н. р. —<br>канчаткі -а, -я, -о, -е, -ё*** | ***ж. р. —<br>нулявы канчатак*** |
| ваз[а], ракет[а], бабул[я] | лось[ ], мор[а], полым[я],<br>святл[о], раздолл[е], галл[ё] | Свіслач[ ], соль[ ] |

**Часы дзеяслова**

| Прошлы час | Цяперашні час | Будучы час |
|---|---|---|
| абазначае дзеянне, якое адбывалася або адбылося да моманту гутаркі | абазначае дзеянне, якое адбываецца ў момант гутаркі | абазначае дзеянне, якое будзе адбывацца або адбудзецца пасля моманту гутаркі |

А. М. Змушко
Л. Р. Дзенісевіч

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

**Вучэбны дапаможнік для 8 класа
першага аддзялення дапаможнай школы
з беларускай мовай навучання**

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Выдавецкі цэнтр БДУ
2018

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

УДК 811.161.3(075)
ББК 81.411.3я72
З-69

Рэцэнзенты:
кафедра сучаснай беларускай мовы філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры *З. І. Бадзевіч*); настаўнік беларускай мовы першай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Ельская дапаможная школа-інтэрнат» *Т. У. Сугак*

## Умоўныя абазначэнні

‖ — правіла

?! — пытанні і заданні

* — заданні павышанай складанасці

\# — спрошчаныя заданні

— праца ў парах, групах

— вучыцеся весці размову

— слоўнікавая работа, тлумачэнне слоў

— дамашняе заданне

**бандэро́ль** — слоўнікавае слова

*Папярэдняе выданне выйшла ў выдавецтве «Народная асвета» ў 2004 годзе.*

**Змушко, А. М.**
З-69 Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. 1-га аддз-ня дапам. шк. з беларус. мовай навучання / А. М. Змушко, Л. Р. Дзенісевіч. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2018. — 275 с. : іл.
ISBN 978-985-553-533-2.

**УДК 811.161.3(075)**
**ББК 81.411.3я72**

**ISBN 978-985-553-533-2**

© Змушко А. М., 2004
© Змушко А. М., Дзенісевіч Л. Р., 2018, са змяненнямі
© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», 2018

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ПАЎТАРЭННЕ

## *Урок 1. Гукі і літары*




**1.** Прачытайце верш. Ці з такім настроем вы ішлі ў школу 1 верасня?

**За вучобу**

Адшумела лета каласамі,
адспявала ў пушчы і ў бары.
Клас заліўся звонка галасамі,
і за парты селі мы, сябры.
*(Авяр'ян Дзеружынскі)*

?! Раскажыце, як вы рыхтаваліся да 1 верасня.
Успомніце, колькі галосных гукаў у беларускай мове. Колькі літар, якія іх абазначаюць?
Запішыце першы сказ. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць галосныя гукі.

**2.** Прачытайце тэкст.

Першага **верасня** — святочны дзень. Ён нават мае назву: Дзень ведаў. Гэта **свята** вучняў, **настаўнікаў**. Гэта свята і для **бацькоў**,



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

чые **дзеці** ходзяць у **школу.** У святочныя дні **людзі** віншуюць адно аднаго і выказваюць **пажаданні.**

?! Раскажыце, пра што вы прачыталі.
Успомніце, што такое алфавіт. Колькі літар у беларускім алфавіце?
Запішыце выдзеленыя словы ў алфавітным парадку.

**3.** Падумайце, чаго б вы пажадалі ў гэты дзень сабе, сваім сябрам, настаўнікам, бацькам. Прадоўжыце наступныя сказы.

У Дзень ведаў я жадаю сабе ... .
Сваім сябрам я жадаю ... .
Сваім бацькам жадаю ... .

Словы для выбару: *поспехаў у вучобе, добрых адзнак, новых ведаў, здароўя, добрага настрою, гонару за поспехі сваіх дзяцей, цярплівасці.*

?! Запішыце свае пажаданні.

**4.** Прачытайце пажаданне, якое выказвае вучням напачатку новага навучальнага года народны паэт Беларусі Якуб Колас.

**Прыступайце**, дзеці, да навукі,
каб было ўсё **акуратна**,
каб вучыцца на «выдатна».

?! Ці падобнае гэта пажаданне да тых, якія запісалі вы?
Пастаўце націск у выдзеленых словах.
Спішыце, падкрэсліце літары, што абазначаюць галосныя гукі, адной лініяй, а літары, якія абазначаюць зычныя гукі — дзвюма.

**5.** Прачытайце прыказкі. На якую яны тэму?

**Навука** не мучыць, а жыць навучыць.
Цяжка ў **школе**, дык лёгка ў полі.
Хто без навукі, той як **бязрукі**.

?! Растлумачце сэнс трэцяй прыказкі.
Запішыце прыказкі ў сшыткі. Пастаўце націск у выдзеленых словах.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 2. Націск. Правапіс* о, э — а

**6.** Прачытайце тэкст. На якую ён тэму? Прыдумайце назву тэксту.

**Першага** верасня зноў зазвінеў школьны званок. Рукі вучняў яшчэ гараць ад летняй працы. Хлопчыкі гадавалі **карпаў** у сажалках. **Дзяўчынкі** даглядалі **курэй, качак, гусей**. Яшчэ сёння раніцай яны кармілі на **ферме** цялят. *(Паводле Юлія Ванага)*

?! Чым займаліся вучні летам?
Перакажыце тэкст вусна.
Спішыце першы сказ. Падкрэсліце ў словах першага сказа адной лініяй літары, якія абазначаюць галосныя гукі, дзвюма лініямі — літары, што абазначаюць зычныя гукі. Пастаўце націск у выдзеленых словах.
Якія галосныя літары не выкарыстаны ў першым сказе?

**7.** Разгледзьце малюнкі. Што на іх адлюстравана? Ці шмат працы ў людзей летам?





?! Якія з гэтых работ выконвалі летам вы?
Чаму летам патрэбна не толькі адпачываць, але і працаваць?
Да кожнага малюнка прыдумайце сказ.
Запішыце гэтыя сказы. Пастаўце ў словах націск.
Падкрэсліце словы, якія пачынаюцца з галосных гукаў.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**8.** Прачытайце тэкст. Чаму ён мае такую назву?

**Памочніцы**

**Зося** з **сяброўкамі** вырашылі дапамагчы **дарослым** зграбаць сена. Раніцай дзяўчынкі сабраліся на **масточку** за **вёскай** і разам пайшлі ў **поле.** Трэба **было** дапамагчы **цётцы** Дашы зграбаць сена паміж кустоў.

**Цэлы** дзень старанна працавалі **сяброўкі. Цётка** Даша была **задаволена** сваімі **памочніцамі**. *(Паводле Ядвігі Бяганскай)*

?! Выпішыце з тэксту выдзеленыя словы. Пастаўце ў іх націск. Якія літары ў беларускай мове пішуцца толькі пад націскам?

**9.** Прачытайце словы.

Сяброўкі, дарослы, поле, памочніцы, цэлы.

?! Падбярыце да гэтых слоў роднасныя, каб націск у іх падаў на іншы склад. Запішыце паводле ўзору.

Узор. *Сябро́ўкі — сябрава́ць, ... .*

*Успомніце!*
Не пад націскам ***о, э*** пераходзяць у ***а***.

**10.** Раскажыце, што вы рабілі і як адпачывалі летам. Запішыце невялікае апавяданне з 2—3 сказаў. Падкрэсліце ў сказах словы з літарамі ***о, э*** (калі яны ёсць).

Словы для выбару: *экскурсія, рака, госці, лес, гульні, пікнік, веласіпед, скутар, парк, бібліятэка.*

**11.** Прачытайце тэкст. На якую ён тэму?

**Сэрца** адклікаецца на **прыгажосць.** Казачна **прыгожымі** паўстаюць **рэкі, бары, палі** Бацькаўшчыны. **Рака** маленства ўяўляецца самай цудоўнай. **Поле** запамінаецца неабсяжным размахам, **бор —**



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**шчодрымі дарамі**. Гэтыя **шчадроты** дорыць наша зямля **сардэчным** і чулым людзям. *(Вера Ляшук)*

?! Выпішыце выдзеленыя словы парамі паводле ўзору. Пастаўце націск. Падкрэсліце ***о, э — а***.

Узор. *Сэ́рца — сардэ́чным, … .*

## *Урок 3. Зацвярдзелыя гукі і літары, якія іх абазначаюць. Правапіс* е, ё — я

**12.** Прачытайце верш. Чаму і каму выказвае ўдзячнасць паэт?

Вечна я ўдзячны жытняму хлебу,
чыстай вадзе з невялікай крыніцы,
лесу зялёнаму, сіняму небу,
светлай рачулцы, што ў полі бруіцца...
Людзям з адкрытай і шчырай душою,
з кім давялося ў жыцці мне сустрэцца,
краю, што роднай завём мы зямлёю,
што Беларуссю так люба завецца!

*(Пятрусь Броўка)*

?! Знайдзіце ў вершы словы з зацвярдзелымі зычнымі гукамі. Выпішыце гэтыя словы. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя гукі.
Якія галосныя літары могуць стаяць пасля зычных літар, што абазначаюць зацвярдзелыя гукі?

*Успомніце!*
У беларускай мове гукі **[ж], [дж], [ш], [ч], [р], [ц]** заўсёды цвёрдыя (зацвярдзелыя). Пасля літар, якія абазначаюць гэтыя гукі не могуць стаяць літары ***і, ё, е, ю, я, ь***, а пішуцца літары ***а, о, у, ы, э***.

**13.** Прачытайце народныя прыметы. Якія галосныя літары могуць стаяць пасля зычных літар, што абазначаюць зацвярдзелыя гукі?

Гр..м у вер..сні сведч..ць пра доўгую восень.

Лісце бяр..з ж..ўцее з верш..ліны — на р..ннюю восень у наступным годзе.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Па вялікай колькасці ягад на р..біне людзі прадказваюць дажджлівую восень.

?! Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары.
Падкрэсліце ў сказах літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя гукі.

**14.** Прачытайце верш.

Асіна, ліпа,
**клён**, бяроза
нам дораць першыя лісты...
Якое мноства фарбаў розных:
чырвоных,
жоўтых,
залатых!

*(Мікола Бусько)*

?! Выпішыце з верша словы, у якіх ёсць літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя гукі.
Падкрэсліце гэтыя літары.
Падбярыце да выдзеленага слова роднаснае, каб на месцы літары ***ё*** была ***я***.
Запішыце гэту пару слоў. Падкрэсліце ***ё — я***.

**15.** Прачытайце верш. На якую ён тэму? Якія пачуцці выказваюцца ў ім?

## Край бацькоў

Мне часта сняцца тыя далі,
мне часта сніцца край бацькоў,
адкуль на свет мы **выляталі**,
як ранні вывадак шпакоў.
Мне сняцца **светлая** рачулка,
і рэбры мосціка над ёй,
і выспа жоўтая, як булка,
і **цёмны лес** за выспай той,
і **белы** камень ля парога,
і **свежы**, ранішні мурог,
і поле, поле, без якога
мой **дзед** жыцця ўявіць не мог.

*(Марк Смагаровіч)*

**Вы́спа** — невялікі востраў, часцей пясчаны.

?! Выпішыце ў слупок выдзеленыя словы.
Падбярыце і запішыце да кожнага з іх роднаснае, каб націск у ім падаў на іншы склад.
Падкрэсліце ***е, ё — я***.

*Успомніце!*
У першым складзе перад націскам на месцы ***е, ё*** пішацца літара ***я***.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**16.** Прачытайце пары слоў, устаўляючы прапушчаныя літары.

мёд — м..довы
вёска — в..сковы
лес — л..сны
ельнік — ..ловы

Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары. Пастаўце націск у словах (калі ў слове адзін склад, націск не ставіцца).

## *Урок 4. Падоўжаныя зычныя. Глухія і звонкія зычныя*

**17.** Прачытайце верш. Якімі сказамі ён утвораны?

Раздолле ў лузе, эх, **раздолле**!
А колькі смеху і **сваволля**,
і жартаў, плюскату, **штурхання**
над гэтым Нёманам у **купанне**!
*(Якуб Колас)*

Як вымаўляюцца ў выдзеленых словах зычныя гукі, што перададзены на пісьме дзвюма літарамі ***лл, нн***?
Цвёрдыя ці мяккія гэтыя зычныя гукі?

*Успомніце!*
Некаторыя зычныя гукі, калі яны стаяць паміж галоснымі, вымаўляюцца падоўжана. На пісьме гэтая з'ява перадаецца дзвюма літарамі: *прыво**лл**е, заці**шш**а, разво**ддз**е.*

**18.** Прачытайце словы. Якія гукі ў іх прапушчаны?

Пыта..е, сняда..е, кало..е, ра..я, насе..е, навако..е, Пале..е, разво..е, сме..е, збо..а, мя..і.

Спішыце словы, устаўляючы прапушчаныя літары.

**19.** Прачытайце верш. Знайдзіце ў ім словы з падоўжанымі зычнымі.

Нікла жыццё ў шумным лесе,
агаляўся твар зямлі,



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

і ляцелі ў паднябессе
з звонкім крыкам жураўлі.
*(Якуб Колас)*

?! Вывучыце верш на памяць.
Запішыце яго па памяці. Падкрэсліце словы з падоўжанымі зычнымі.

Праверце выкананне практыкавання адно ў аднаго.

**20.** Прачытайце пары слоў. Аднолькавае ці living значэнне маюць словы кожнай пары?

**Ж**ар — **ш**ар, по**п** — бо**б**, ка**з**ка — ка**с**ка, **д**ом — **т**ом.

?! Якія з выдзеленых літар абазначаюць звонкія зычныя гукі, а якія — глухія?
Запішыце спачатку словы з літарамі, што абазначаюць звонкія зычныя, а пасля — з літарамі, якія абазначаюць глухія зычныя.

**21.** Прачытайце словы.

**Б**от, **ж**ыць, **дз**ень, **г**рам, ка**з**а.

?! Замяніце выдзеленыя літары літарамі, якія абазначаюць глухія гукі.
Назавіце і запішыце словы з парнымі па звонкасці-глухасці літарамі.

**22.** Прачытайце верш. Пра што ў ім расказваецца?

Са звонкім гукам —
кожны рады
мяне зварыць
або спячы.





Калі ж з глухім —
шукаюць рады,
каб ад мяне як
уцячы.
*(Паводле Івана Курбекі)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Якімі літарамі адрозніваюцца словы *грып* і *грыб*?
Як чуюцца гукі на канцы гэтых слоў — звонка ці глуха?
Падбярыце да кожнага слова роднаснае, каб на канцы стаяла літара, якая абазначае галосны гук.
Ці выразна чуваць гукі ***п***, ***б***?

**23.** Прачытайце сказы.

Каб трапіць у пад'езд дома, трэба набраць ко.. .
У нас дома жыве пушысты ко.. .
Ме..ь — не вельмі цвёрды метал.
Кожнаму хочацца ме..ь шмат сяброў.

?! Якія гукі абазначаюць прапушчаныя літары?
Якія літары прапушчаны?
Падбярыце праверачныя словы да слоў *код, кот, медзь, мець.*
Спішыце сказы. Падкрэсліце літары, якія вы ўставілі.

## *Урок 5. Мяккія і цвёрдыя зычныя*

**24.** Прачытайце верш. Дапоўніце апошнія чатыры радкі верша словамі з мяккім знакам на канцы.

Гляньце, як амаль няўзнак
усё мяняе мяккі знак:
**вугал** — ... ,
**стол** — ... ,
**кон** — ... ,
**мол** — ... .

*(Паводле Сержука Сокалава-Воюша)*

?! Параўнайце пары слоў. Аднолькавае ці рознае значэнне маюць словы кожнай пары?
Якія зычныя, цвёрдыя ці мяккія, стаяць на канцы выдзеленых слоў? А на канцы слоў, якімі вы дапаўнялі верш?
Спішыце верш, дапісваючы словы з мяккім знакам на канцы. Падкрэсліце ў ім усе літары, што абазначаюць мяккія зычныя гукі, і літары, якія стаяць пасля іх.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**25.** Прачытайце тэкст. Як называецца прамежак восені, калі лётаюць павуцінкі?

### Сярэбраныя нітачкі

Сон..чны в..расн..вы дз..нёк. У залатым убранні **мал..нькая** б..розка. За яе гал..нку зачапіл..ся **сяр..браная** н..тка. За **ёю** — **другая, трэц..я**. Трапеч..цца на в..трыку. На кожнай нітачцы **маленькі** п..вучок. Спрытна і хуц..нька **перабірае** н..жкамі. Рэзка **дыхнуў** ветрык. Адарваліся ад г..лінкі сярэбраныя ніткі. Паплылі ў бл..кіце **в..сеньскага** н..ба. *(Паводле Фамы Рамашкі)*

?! Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя галосныя літары.
* Запішыце выдзеленыя словы, дзелячы іх спачатку на склады, а потым для пераносу.

Узор. *Ма-лень-ка-я, ма-лень-кая, ... .*

**26.** Прачытайце верш. Ці падобная яго тэма да тэмы тэксту з папярэдняга практыкавання?

Полымем прыгожым сінім
дагараюць васількі.
На срабрыстай павуціне
дробных кропель аганькі.

Жоўта, залаціста ў лесе
гэтай слаўнаю парой.
Куст рабіны гронкі звесіў,
як аблітыя зарой.

*(Паўлюк Пранузa)*

?! Выпішыце з верша словы, у якіх усе зычныя гукі цвёрдыя. Пры спісванні дзяліце гэтыя словы на склады.



**27.** Разгледзьце малюнак.

?! З дапамогай малюнка і ўласных назіранняў раскажыце, якая прырода восенню.

**28.** Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.

Лета прагуляўшы, восенню ўраджай не збярэш.
Хто ў ліпені на полі пацее, таго ўзімку печка пагрэе.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Называйце па чарзе адзін за адным усе зычныя гукі ў словах прыказак паводле ўзору.

Узор (вусна). *[Л’], [т], [п], [р], [г], [л’], [ў], [ш], ... .*

Спішыце прыказкі, падзяляючы ўсе словы для пераносу.

**29.** Прачытайце словы.

Буке**т**, ве**ц**ер, сне**г**, лё**д**, са**д**.

Змяніце словы або падбярыце аднакаранёвыя, каб назіралася змена выдзеленых літар ***т — ц, г — ж, д — дз***.
Запішыце словы парамі паводле ўзору.

Узор. *Букет — букецік, ... .*

**30.** Прачытайце пары слоў. У якім слове кожнай пары, першым ці другім, прапушчаны цвёрды зычны гук? А ў якім — мяккі?

Біле.. — біле..ік, каман..а — каман..ір, ліс.. — ліс..е, гора.. — у гора..е, ва..а — у ва..е, кус.. — кус..ік.

Спішыце пары слоў, устаўляючы прапушчаныя літары.
Падкрэсліце літары, што ўставілі.

## *Урок 6. Будова слова. Канчатак*

**31.** Прачытайце рады слоў. Якімі словамі ўтвораны кожны рад?

Мор[а], марск[і], прыморск[і], марак[ ].

Гара, узгорак, гарысты, горны.

Сінька, сіні, сінець, сінь.

Вызначце часткі кожнага рада роднасных слоў.
Спішыце словы. Абазначце часткі слоў паводле ўзору першага радка.

*Успомніце!*
Блізкія па значэнні словы, якія маюць агульны корань, называюцца **роднаснымі** (аднакаранёвымі) словамі.
Часткі слова — **корань, прыстаўка, канчатак, суфікс**.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**32.** Прачытайце словазлучэнні. Словамі якіх часцін мовы яны ўтвораны?

Цёплы дзень, цёплая восень, цёплае надвор’е, цёплыя пальчаткі.

***надво́р'е***

Чым адрозніваюцца прыметнікі ў кожным словазлучэнні? Яны з’яўляюцца роднаснымі словамі ці гэта формы аднаго слова? Спішыце словазлучэнні. Абазначце ў прыметніках корань і канчаткі.

**33.** Прачытайце словазлучэнні, дапаўняючы прыметнікі патрэбнымі канчаткамі.

Бярозав.. гай, бярозав.. лісце, бярозав.. кара, бярозав.. дровы.

Спішыце словазлучэнні, устаўляючы прапушчаныя канчаткі. Якія яшчэ часткі ёсць у словах *бярозавы, бярозавая, бярозавае, бярозавыя*? Абазначце ўсе часткі гэтых слоў.

**34.** Прачытайце і адгадайце загадку.



Цераз палі, цераз лугі
спусціліся канцы дугі.

Запішыце назвы колераў вясёлкі. Абазначце канчаткі.

Узор. *Чырвоны*, ... .

**35.** Утварыце формы слоў *школа* і *юнак* з дапамогай прапанаваных канчаткаў.







Запішыце формы слоў. Абазначце ў іх карані і канчаткі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урокі 7—8. Будова слова. Суфікс*

**36.** Прачытайце дзеясловы. Утварыце іх формы з дапамогай прапанаваных суфіксаў і канчаткаў.




?! Запішыце словы, што атрымаліся.

**37.** Прачытайце часткі слоў. Складзіце з іх словы. Растлумачце, чаму часткі ў адных словах выдзелены злучкамі з двух бакоў, а ў другіх — з аднаго боку.

-бярэж-, -н-, -ы, пры-
па-, -а, -буд-, -ов-

-ы, -н-, кніж-
-пын-, -ак, пера-

?! Запішыце словы. Абазначце іх часткі.
З апошнім словам складзіце і запішыце сказ.

**38.** Прачытайце словы. Падзяліце іх на некалькі груп аднакаранёвых слоў.

Казка, зімачка, пяцёрка, рачны, пяць, расказваць, зазімак, рака, прырэчны, зімаваць, упяцярых, пераказ, зімовы, казаць, пяцярня, рэчка.

?! Запішыце словы па групах аднакаранёвых слоў.
Абазначце ў словах карані.

Праверце выкананне задання адно ў аднаго.

**39.** Прачытайце вершаванае заданне. Адкажыце на пытанні верша.

Садоўнік расаду вясной рыхтаваў,
старанна пасадкі кустоў аглядаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Як хораша сад будзе хутка цвісці!
Табе ж словы-родзічы трэба знайсці.
Знайшоў? Дык слухай заданне ізноў:
хто продак сярод гэтых роднасных слоў?

*(Тацияна Шылько)*

?! Выпішыце з верша роднасныя словы. Абазначце ў іх карані.

**40.** Прачытайце ўрыўкі з верша.

**У верасні, у верасні...**

У верасні, у верасні
зрабіўся дзень малы.
Развітваюцца
ў верасні
з буслянкамі буслы.

У верасні, у верасні
хапае ўсім трывог.
Мядзведзіца
ў верасні
вышуквае бярлог.

Медзведзяняты жвавыя
да самае вясны,
расстаўшыся з забавамі,
глядзець там будуць сны.

*(Артур Вольскі)*

?! Знайдзіце ў вершы дзве групы роднасных слоў.
Выпішыце іх. Дапоўніце кожны рад іншымі роднаснымі словамі.
Абазначце карані.

**41.** Прадоўжыце тэму верша з папярэдняга практыкавання.

Раскажыце, што яшчэ адбываецца ў верасні.
Выкарыстайце малюнкі.







Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

 

?! Да кожнага малюнка складзіце і запішыце сказ.
Пачынайце кожны сказ са слоў: *У верасні...*

**42.** Прачытайце рады аднакаранёвых слоў. Якой часткай яны адрозніваюцца?

Бяроза, бярозка, бярозавы, бярэзнік.
Лета, летні, лецейка.
Прыгожы, прыгажосць, прыгажэйшы.

?! Спішыце словы. Абазначце суфіксы там, дзе яны ёсць.

**43.** Прачытайце верш. Знайдзіце ў ім роднасныя словы.

**У грыбы**

Бацька ўзяў вялікі кош,
сын — маленькі кошык.
У кішэні ў бацькі — нож,
а ў Сяргейкі — ножык.

*(Ніл Гілевіч)*

?! З дапамогай чаго ўтварыліся словы *кошык, ножык, маленькі, Сяргейка*?
Выпішыце гэтыя словы, абазначце ў іх суфіксы.
Якое значэнне надаюць словам суфіксы ***-ык-, -к-, -еньк-***?

**44.** Прачытайце словы з памяншальна-ласкальным значэннем. Назавіце ў іх суфіксы.

Ветрык, дожджык, разумненькі, галубок, саломка, бярозка, цёпленькі.

?! Падбярыце да кожнага слова роднаснае без суфікса.
Запішыце словы парамі паводле ўзору.

Узор. *Ветрык — вецер, ... .*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**45.** Прачытайце верш.

**Летам**

Звоніць поле доляй, воляй,
звоніць поле ў **каласкі;**
на лужочку ззяюць, граюць
кветкі, мошкі, **матылькі.**

**Рэчка** ўецца і смяецца
да зялёных лазнякоў,
а ў **вадзіцы** шыбка **рыбка**
шмыгаціць між паплаўкоў.

Лес бясконцы, векавечны —
цягне, цягне гоман свой;
між хвой скачуць птушкі-ўюшкі
і пяюць, што моцы той.

*(Паводле Янкі Купалы)*

?! Знайдзіце ў выдзеленых словах суфіксы.
Да слова *лес* з дапамогай суфіксаў ***-н-, -ок-, -ав- + -ік-, -ніч- + -оўк-*** падбярыце роднасныя словы. Запішыце гэты рад роднасных слоў. Абазначце суфіксы.
Звярніце ўвагу на чаргаванне ***е, я*** ў корані слоў.

**46.** Прачытайце тэкст. Назавіце ў выдзеленых словах прапушчаныя суфіксы.

Наша Беларусь багата на лясы. На поўначы рэспублікі расце **ял..ы** лес, **дуб..ы.** Ёсць тут і **сасн..ы** бор. Нямала лесу і ў цэнтральнай Беларусі, над Нёманам і Бярэзінай, на **Ашмян..ім** і **Магілёў..ім** узвышшах. А на поўдні — больш чыстага дубняку. *(Паводле Пятра Рунца)*

?! Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя суфіксы.
Абазначце суфіксы.

## *Урок 9. Будова слова. Прыстаўка*

**47.** Прачытайце словы ў абодвух слупках. Знайдзіце аднакаранёвыя словы. Якой часткай яны адрозніваюцца?

| | |
|---|---|
| несці | прыбегчы |
| казаць | аднесці |
| клеіць | падказаць |
| бегчы | прыклеіць |

?! Запішыце пары аднакаранёвых слоў. Абазначце прыстаўкі, калі яны ёсць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**48.** Прачытайце словы. Ці ёсць у іх прыстаўкі?

Крыць, пісаць, крэсліць, несці.

?! З дапамогай прыставак ***пера-, за-, на-*** ўтварыце новыя словы. Запішыце іх паводле ўзору.

Узор. *Крыць — перакрыць, закрыць, накрыць, ... .*

**49.** Прачытайце словазлучэнні. Дапоўніце першыя словы адпаведнымі па сэнсе прыстаўкамі.

..пісаць у сшытак, ..садзіць дрэва, ..апрануць сукенку, ..майстраваць шпакоўню, ..чысціць дыван, ..капаць бульбу.

?! Запішыце словазлучэнні. Абазначце прыстаўкі, што ўставілі.

**50.** Прачытайце народныя выказванні (прыказкі). Растлумачце іх сэнс.

Без па(д/т)палу дровы не гарацць.
Вышэй сябе не па(д/т)скочыш.
Індык думаў, ды галава а(б/п)лезла.

?! Раскрыйце дужкі і пастаўце патрэбныя літары. Спішыце прыказкі. Абазначце прыстаўкі.

**51.** Прачытайце словы. Назавіце ў іх прыстаўкі. Растлумачце іх правапіс.

Аб’езд, перадсвяточны, адступіць, пад’езд, падказаць.

?! Спішыце словы. Абазначце ў іх прыстаўкі. Падкрэсліце апострафы.

**52.** Прачытайце верш.

А(д/т)палалі
васількі.
А(д/т)ляцелі
матылькі.

Неяк
вельмі непрыкметна
адышло з цяплом
і лета.

*(Уладзімір Карызна)*

?! Знайдзіце ў вершы тры словы з адной прыстаўкай і два — з іншай. Выпішыце гэтыя словы. Абазначце прыстаўкі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**53*.** Прачытайце тэкст.

### Восень над Прыпяццю

Усеўладная восень неадступна панавала над усёй мясцовасцю. Яна ўжо **заслала** залацістым абрусам палі збажыны, **пасерабрыла** шаты **прыдарожных** бароў... А паветра **напаіла** той празрыстасцю і чысцінёй, якая бывае толькі цёплай лагоднай восенню.

Над Прыпяццю сінее лес. Адтуль нясе пахам хвоі, прэласцю зямлі, свежасцю і вільгаццю.

Шырокая лугавіна **дапаўняе** гэтую багатую і разнастайную гаму пахучай сумессю аеру, мурагу і салодкай медуніцы. Над воднай гладдзю плавае лёгкі туман. *(Паводле Івана Навуменкі)*

?! Выпішыце з тэксту выдзеленыя словы, абазначце ў іх прыстаўкі. Потым выпішыце словы з падоўжанымі зычнымі, падкрэсліце гэтыя зычныя.

Узор. *Заслала, ... .* *Прыпяццю, ... .*

**54*.** Прачытайце верш. Знайдзіце ў вершы словы з прыстаўкамі.

### Залатая пара

Верасень у госці
болей не запросіць;
маладой бярозцы
павязала восень
жоўтую хусцінку
з белай павуцінкай.

Лета не прысядзе
пад зялёнай кронай;
на рабіне ў садзе
плашч гарыць чырвоны,
і нясуць з даліны
спелы сок каліны.

Дрэвы ў пазалоце,
вокліч жураўліны;
восень на балоце
сее журавіны.
Быццам песня тая
восень залатая.

*(Язэп Пушча)*

?! Выпішыце з верша словы з прыстаўкамі, абазначце ў іх прыстаўкі. З апошняга слупка верша выпішыце словы, роднасныя слову *золата.* Абазначце іх часткі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**55.** Прачытайце словы. Вызначце ў кожным слове прыстаўку. У якіх словах яна вымаўляецца асобна ад наступнага галоснага?

Аб..ліць, раз..яднаць, пад..крэсліць, пад..ехаць, з..есці, аб..-ява, раз..юшаны, пад..ём.

Спішыце словы. Дзе патрэбна, стаўце апостраф. Абазначце ў словах прыстаўкі.

## # *Роднасныя словы. Корань слова*

**56.** Прачытайце словы. Назавіце агульную частку гэтых слоў.

Дуб, дубок, дубовы, дубняк, дуброва, дубочак.

Спішыце роднасныя словы. Абазначце корань.
З адным са слоў складзіце і запішыце сказ.

**57.** Прачытайце рады слоў. Якое слова ў кожным радзе не з'яўляецца роднасным іншым словам?

Пень, пянёк, пянёчак, пенны.
Пілка, пілаваць, пільны, пільшчык.
Голуб, голы, галубка, галубок.

Запішыце толькі роднасныя словы кожнага рада.
Абазначце карані ў роднасных словах.

*Успомніце!*
Блізкія па значэнні словы называюцца **роднаснымі**. Яны маюць агульную частку — **корань**. Такія словы называюцца яшчэ **аднакаранёвымі**.

**58.** Прачытайце словы. Падбярыце да кожнага з іх роднасныя.

Каса́, ноч, шпак, мёд.

Запішыце рады роднасных слоў. Абазначце ў іх карані.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**59.** Прачытайце тэкст. На якую ён тэму?

Я вельмі люблю вечары, калі ўся сям'я збіраецца разам. Мама на вячэру гатуе дранікі. Я стаўлю посуд і клічу вячэраць. А пасля ўсе разам мы глядзім тэлеперадачу «Запрашаем на вячоркі». *(Таццяна Шылько)*

?! Знайдзіце ў тэксце роднасныя словы.
Выпішыце іх. Абазначце корань.
Пастаўце ў гэтых словах націск.

*Успомніце!*
Пад націскам пішацца літара ***о, э***; у першым складзе перад націскам — літара ***я***.

**60.** Разгледзьце малюнкі. Яны працягваюць тэму тэксту з папярэдняга практыкавання. Раскажыце, што робяць вечарамі людзі.









?! Складзіце і запішыце да кожнага малюнка сказ.
Пачынайце сказ так: *Вечарам...*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**61.** Раскажыце, што вы звычайна робіце вечарам дома.

**62.** Прачытайце верш. Знайдзіце ў ім два роднасныя словы.

Займае ўвесь узлесак
зялёненькі падлесак.

Направа і налева
растуць кусты і дрэвы.
*(Мар'ян Дукса)*

Прадоўжыце рад роднасных слоў.
Запішыце роднасныя словы з верша і тыя, якія вы падабралі.
Абазначце корань у словах.

**63.** Прачытайце тэкст. На якую ён тэму?

Кожнаму кусціку, кожнаму дрэву — свая пашана і цана. Бяроза напоіць сокам, рабіна пачастуе чырвонымі ягадамі. Гэта добра. А найлепшая дабрата ў ліпы. Ліпка зацвіла — пчолам мёду дала. Ліпавы мёд — добрае лякарства ад прастуды. *(Антон Бялевіч)*

Знайдзіце ў тэксце роднасныя словы. Які ў іх корань?
Запішыце тэкст пад дыктоўку.

Праверце дыктант па кнізе адно ў аднаго.

**64.** Прачытайце скорагаворку, якая ўтворана роднаснымі словамі.

Лезь, залезь, залезшы, злезь.

Які корань у гэтых словах?
Навучыцеся хутка расказваць скорагаворку.

**65.** Прачытайце тэкст. Якую назву можна яму даць?

На сярэдзіне возера плавалі гусі. Сом хацеў паласавацца гусяцінай. Ён высунуў галаву з вады. Гусак убачыў яго і трывожна закрычаў. Маленькія гусяняткі кінуліся з падлётам да берага, а гусак — на сома. Сом разгубіўся.

Гусак дзеўбануў сома ў галаву і ў вока. Сом плеснуў хвастом па вадзе і нырнуў на дно возера. *(Паводле Алеся Пальчэўскага)*

Выпішыце з тэксту групу роднасных слоў. Абазначце ў іх корань.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 10. Галоўныя члены сказа*

**66.** Прачытайце сказы. Вызначце, пра што гаворыцца ў кожным з іх. Што ў першым сказе гаворыцца пра крынічку? Што ў другім сказе гаворыцца пра бярозкі?

Крынічка бруіцца ў глыбіні лесу. Вянком абступілі яе бярозкі.

*(Міхась Шаванда)*

**Бруíцца** — цячэ, пераліваецца.

?! Спішыце сказы. Падкрэсліце дзейнікі адной лініяй, выказнікі — дзвюма, астатнія словы — хвалістай лініяй.

> *Успомніце!*
> Слова, якое абазначае, пра каго ці пра што гаворыцца ў сказе, і адказвае на пытанне **хто?** ці **што?**, называецца **дзейнікам**.
> Слова, якое абазначае, што гаворыцца пра дзейнік, і адказвае на пытанні **што робіць? што робяць?** і падобныя, называецца **выказнікам**.

**67.** Прачытайце сказы. Якія з іх з'яўляецца народнай прыметай, а якія — прыказкай? Растлумачце сэнс прыказкі.



**кулíк**

Перад суровай зімой лісце з дрэў дружна ападае.

Кожны кулік сваё балота хваліць.

?! Знайдзіце дзейнік і выказнік у кожным сказе.
Спішыце сказы. Падкрэсліце дзейнік адной лініяй, выказнік — дзвюма.

**68.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму. Якую назву можна даць тэксту?

Спрадвеку бедна жылі людзі на Палессі. Не радавалі іх добрым ураджаем палеткі. А глыбока ў зямлі ляжалі калійныя солі.

Мільёны год хавала зямля свае багацці. Але з'ехаліся на Палессе людзі. Пабудавалі яны горад і назвалі яго — Салігорск.

*(Паводле Міколы Маляўкі)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Знайдзіце галоўныя члены ў кожным сказе. Запішыце тэкст пад дыктоўку. Падкрэсліце ў першым, трэцім і чацвёртым сказах галоўныя члены.

Праверце дыктанты адно ў аднаго.

**69.** Прачытайце сказы, устаўляючы прапушчаныя дзейнікі.

Вялікія ... насоўваліся на лясы і палі. Першыя ... ўпалі на дарогу. Спалохаліся ... . Буйны́я ... ўсё часцей стукалі па галінках дрэў.

Словы для выбару: *кроплі, дажджынкі, хмары, стрыжы.*

Запішыце тэкст, падкрэсліце галоўныя члены ў кожным сказе.

**70.** Прачытайце тэкст.

Бяжыць палявая дарога з пагорка. Пасля дажджу засталіся на дарозе лужыны. У вадзе плаваюць бярозавыя лісцікі. Яны здаюцца караблікамі на хвалях.

Запішыце тэкст. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.

## *Урокі 11—12. Галоўныя і даданыя члены сказа*

**71.** Прачытайце групы сказаў. Якія сказы ўтвораны толькі галоўнымі членамі, а якія — галоўнымі і даданымі?

| | |
|---|---|
| Ідзе дождж. | З раніцы ідзе маркотны дождж. |
| Людзі спяшаюцца. | Людзі пад парасонамі спяшаюцца з працы дамоў. |
| Надыходзіць вечар. | Хутка надыходзіць доўгі і сумны восеньскі вечар. |

Спішыце сказы, у якіх ёсць даданыя члены.
Падкрэсліце дзейнік адной лініяй, выказнік — дзвюма, даданыя члены — хвалістай лініяй.

*Успомніце!*
Дзейнік і выказнік — **галоўныя члены сказа**.
Іншыя словы ў сказе, якія адказваюць на якое-небудзь пытанне, з’яўляюцца **даданымі членамі сказа**.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**72.** Разгледзьце малюнкі. Да кожнага з іх складзіце сказ, каб у ім былі галоўныя і даданыя члены.







?! Запішыце сказы. Падкрэсліце галоўныя і даданыя члены.

**73.** Прачытайце злева сказы, якія ўтвораны толькі галоўнымі членамі. Дадайце да гэтых сказаў даданыя члены, што запісаны справа.

| | |
|---|---|
| Сосны абдымалі. | стройныя, паўкругам, поле |
| Бярозкі дапамагалі. | апранутыя ў пазалоту, нібы, сонцу праганяць з лесу змрок |
| Гарэлі гронкі. | чырвоныя, рабіны |

*(Паводле Уладзіміра Шахаўца)*

?! Запішыце сказы, што ў вас атрымаліся.
Падкрэсліце ў іх галоўныя і даданыя члены сказа.

**74.** Прачытайце тэкст, устаўляючы прапушчаныя дзейнікі і выказнікі.

У пачатку кастрычніка часам ... ясныя, сонечныя ... . Зноў ... некаторыя ... . Удзень з-пад кары дрэў ... ... . Дзе-нідзе ... на сонцы ... .

«Бабіна лета» — так ... ... гэтыя цудоўныя дні. *(Паводле Віталя Вольскага)*

Словы для выбару: *бываюць, дні; расцвітаюць, расліны; вылазяць, насякомыя; лятаюць, матылькі; называе, народ.*

?! Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя дзейнікі і выказнікі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**75.** Прачытайце тэкст.

Шчупак любіць шырокія затокі і бухты. Ён падсцерагае рыбу ў ціхім месцы. Але часта сам трапляе на вуду рыбака.

Выпішыце сказы, якія адпавядаюць наступнай схеме:

**76.** Прачытайце тэкст. Растлумачце яго назву. Ці можна лічыць яе сказам?

### Падрастаюць волаты

Сярод бяроз і асін растуць маладыя дубкі. Зараз яны нязграбныя, тонкія. Нават у моцны вецер не пачуеш іх шуму. Бярозы і асіны выраслі на дзве галавы вышэй за дубкі. Мабыць, не дацягнуцца дубкі да красунь бярозак.

Пройдуць гады. Пачырванеюць асіны. Час падточыць іх карэнне. Пакрыюцца нарастам бярозы, апусцяць да зямлі сваё вецце, прагнуцца ад старасці.

А дубкі толькі набяруць сілу, яшчэ мацней урастуць у зямлю і стануць сапраўднымі волатамі.

*(Паводле Васіля Аксёнава; пераклад з рускай мовы)*

**Во́лат** — чалавек вялікага росту і сілы; велікан, гігант.

Знайдзіце ў тэксце два сказы без даданых членаў.
Выпішыце гэтыя сказы, запішыце пытанні, на якія адказваюць галоўныя члены сказаў.

Узор. *(Што зробяць?) Пройдуць (што?) гады.*

**77.** Прачытайце тэкст. Колькі ў ім частак? Аб кім і аб чым расказваецца ў першай? Аб чым — у другой частцы?



Усё гатова да зімы. Паляцелі ў вырай птушкі. Звяры пахаваліся ў норах, берлагах, цёплых дуплах. Палі вакол пустыя, лясы бязлістыя.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Толькі магутны стары дуб не скінуў свайго лісця. Усю зіму стаіць ён у сваім медным адзенні. Ён скіне яго вясною. І прыхарошыцца ў новае, зялёнае. *(Паводле Клаўдзіі Каліны)*

?! Выпішыце другі, трэці, пяты сказы. Пастаўце пытанні да галоўных членаў сказа.

**78*.** Раскажыце, што вы даведаліся пра дуб з тэкстаў практыкаванняў 76 і 77.
Складзіце і запішыце 3—4 сказы пра дуб.
Падкрэсліце ў іх галоўныя і даданыя члены.

**79.** Прачытайце словы.

1. Стагнаў, ноччу, часта, паранены. 2. Зёлкі, дзяўчаты, у, рвалі, лесе. 3. Верхавіну, зламала, старой, бура, бярозы. 4. Возера, дзеці, на, натрапілі, лясное, невялікае. 5. Галінкамі, гнязда, буслы, засцілалі, дно.

?! Складзіце сказы з дадзеных слоў. Запішыце іх. Падкрэсліце галоўныя і даданыя члены сказаў.

**80.** Складзіце сказы па схемах. Запішыце іх.

1.
2.


## # *Віды сказаў па інтанацыі і мэце выказвання*

**81.** Прачытайце верш. Якая ў ім апісваецца пара года і час сутак? Знайдзіце ў вершы словы, якія пацвярджаюць вашы меркаванні.

На ўсходзе неба грае
пераліўным бляскам,
сыпле золата над гаем
і над пералескам.

Як прыемна пахне збожжа!
А вакол — спакойна!
Эх, як слаўна, як прыгожа,
хораша, прыстойна!

*(Якуб Колас)*

**Сугало́ссе** — спалучэнне некалькіх гукаў рознай вышыні, звычайна гарманічнае, прыемнае.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Назавіце знакі прыпынку ў канцы кожнага сказа.
Як называюцца сказы, у якіх аб нечым паведамляецца, утрымліваецца пытанне, выказваецца моцнае пачуццё?

*Успомніце!*
По мэце выказвання сказы бываюць **апавядальныя** (у іх аб нечым паведамляецца), **пытальныя** (у іх утрымліваецца пытанне), **пабуджальныя** (у іх ёсць просьба, заклік, пажаданне).
Сказы, якія вымаўляюцца з моцным пачуццём або выражаюць прывітанне, заклік, называюцца **клічнымі**.

**82.** Прачытайце тэкст. На якую ён тэму? Якую назву можна яму даць?

Ці любіце вы чытаць? Кнігі адкрываюць нам цудоўны свет ведаў і фантазіі. Знаходзьце час чытаць кнігі кожны дзень. *(Вера Ляшук)*

?! Назавіце від кожнага сказа. Якія знакі прыпынку стаяць у канцы кожнага сказа?
Запішыце сказы ў такой паслядоўнасці: апавядальны, пытальны, пабуджальны.

**83.** Прачытайце апавядальныя сказы. Утварыце ад іх пытальныя і клічныя паводле ўзору.

Прыгожа ранняй восенню ў лесе.
Падабаецца мне вучыцца ў школе.

?! Запішыце сказы, што атрымаліся.

Узор. *Ці прыгожа ранняй восенню ў лесе?*
*Як прыгожа ранняй восенню ў лесе!*

**84.** Прачытайце тэкст. На якую ён тэму? Якую назву можна яму даць?

**Гультаёў ніхто не любіць.** Дома ў гультаёў заўсёды беспарадак, бруд, пыл вакол. **Гультаі заўсёды брудныя, неахайныя.** Калі ты не хочаш вырасці гультаём, то павінен ужо зараз вучыцца працаваць.

**Не лянуйся кожны вечар акуратна складваць свае рэчы. Заўсёды старайся ўсё рабіць сам.**



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Калі мама ці тата просяць цябе дапамагчы ім — абавязкова дапамажы. *(Паводле Алеся Бадака)*

?! Назавіце від выдзеленых сказаў. Запішыце выдзеленыя сказы ў такім парадку: спачатку пабуджальныя, а потым апавядальныя.

**85.** Прачытайце пытальныя сказы. Якія пытальныя словы ў іх выкарыстаны? Адкажыце на пытанні. Якімі сказамі з'яўляюцца вашы адказы?

Куды ляцяць восенню птушкі?
Дзе купляюць білет на цягнік?
Якія адзнакі ты часцей атрымліваеш у школе?
Колькі тыдняў у месяцы?

?! Запішыце пытанні і адказы на іх.
Падкрэсліце пытальныя словы.

**86.** Прачытайце пытальныя сказы. Адкажыце на пытанні. Ці атрымалася ў вас невялікае апавяданне?

Як цябе завуць? Колькі табе гадоў? У якім класе ты вучышся? Ці доўга табе яшчэ вучыцца ў школе?

?! Запішыце адказы на пытанні.

**87.** Прачытайце тэкст. Якую назву можна яму даць?

Без чаго не можа жыць чалавек?
Без паветра. Без вады. Без хлеба.
І яшчэ чалавек не можа жыць без працы.
Агляніся навокал. Ты ўбачыш дамы і самалёты, школы і заводы, кнігі і карціны. І ўсё гэта створана працай чалавека. Праца патрэбна чалавеку, як паветра, як вада, як хлеб. *(Паводле Юрыя Якаўлева)*

?! Назавіце від кожнага сказа ў тэксце.
Запішыце пытальны, пабуджальны і апавядальны (на выбар) сказы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**88.** Разгледзьце малюнак.



?! Складзіце да малюнка чатыры сказы: апавядальны, пытальны, пабуджальны, клічны.
Запішыце сказы.

**89.** Прачытайце прыказкі. Якімі сказамі яны з'яўляюцца? Растлумачце сэнс прыказак.

Не за сваю працу не бярыся, а за сваёй не лянуйся.
Ідучы паляваць на зайцоў, рыхтуйся напаткаць мядзведзя.
Чаго не ведаеш, пра тое не гавары.

?! Запішыце прыказкі пад дыктоўку.
Праверце сябе па кнізе.
Пішыце ***не*** асобна з дзеясловамі.

**90.** Прачытайце сказы. Вызначце від кожнага з іх. Якія знакі прыпынку павінны стаяць у канцы кожнага з гэтых сказаў?

У небе спяваў жаваранак *(Іван Шамякін)*
Ці гэта казку лес складае *(Якуб Колас)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Каб мне вучыліся старанна *(Якуб Колас)*
Эх, слаўна ў лесе, слаўна, братцы *(Якуб Колас)*

?! Спішыце сказы. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку.

# МАЎЛЕННЕ

## *Урокі 1—2. Дыялагічнае і маналагічнае маўленне*

**91.** Прачытайце выказванні беларускіх пісьменнікаў.

Родная мова, быццам цэмент, звязвае людзей. Яна дае ім найлепшы спосаб разумець адзін аднаго, адной думкай жыць, адной долі шукаць. *(Цётка)*

Не саромся, беларус, гаманіць па-свойму — на роднай мове бацькоў і дзядоў сваіх. Шануй сваю мову, шануй свае песні, свае казкі, звычаі і ўсё роднае — гэта спадчына дзядоў і вялікі нацыянальны скарб. *(Змітрок Бядуля)*

?! Якая асноўная думка выказванняў? Да чаго заклікаюць нас аўтары?
Раскажыце, якое значэнне мае мова для чалавека. Для чаго яна патрэбна?
Ці можа жыць чалавек без мовы, маўлення?
Спішыце выказванне, якое вам найбольш спадабалася.

> *Успомніце!*
> **Маўленне** — спосаб перадачы думак праз мову, пры дапамозе мовы. Гэта працэс моўных зносін паміж людзьмі.
> Маўленне бывае **пісьмовае** і **вуснае**.

**92.** Прачытайце тэкст.

**У магазіне**

— Добры дзень!
— Добры!
— Ці можна памераць вось гэтыя боты?
— Так, вядома, толькі засталося ўсяго два памеры. У Вас які памер абутку?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Трыццаць сёмы.

— На жаль, засталіся боты толькі трыццаць шостага, трыццаць восьмага памеру. Магу прапанаваць іншую мадэль.

— Не, дзякуй, я такія не нашу. Да пабачэння!

— Усяго добрага! Заходзьце яшчэ.

?! Паміж кім вядзецца размова? Колькі чалавек размаўляюць? Як называецца размова паміж некалькімі людзьмі?

*Успомніце!*
**Дыялагічнае маўленне** — гэта размова двух або некалькіх чалавек. Словы кожнага ўдзельніка ў дыялогу пішуцца з новага радка. Перад імі ставіцца працяжнік.

**93.** Прачытайце тэкст.

Сёння на ўроку настаўніца паведаміла: «Калі вы сабраліся ў падарожжа, абавязкова прачытайце кнігі, у якіх расказваецца пра звычаі жыхароў пэўных краін, каб не адчуваць сябе няёмка пры сустрэчы з незнаёмымі людзьмі. Напрыклад, нашы продкі, каб пераканацца ў мірных намерах іншага чалавека, паціскалі адно аднаму рукі: станавілася зразумела, што ў руцэ няма каменя ці зброі. А эскімосы, вітаючыся, не паціскаюць рукі, а паціраюцца насамі. У Македоніі вітаюцца локцямі. У Італіі прынята горача абдымацца, у Бразіліі — ляпаць адно аднаго па плячы, у Зімбабвэ — церціся



Жыхары Македоніі



Эскімосы



Жыхары Зімбабвэ



Жыхары Нікарагуа



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

спінамі. У Нікарагуа вітаюцца датыкаючыся плячамі. А добра выхаваныя японцы заўсёды разуваюцца, перш чым увайсці ў дом».

**Эскімо́сы** — адзін з народаў, якія жывуць на Поўначы.
**Япо́нцы** — народ, што насяляе Японію.
**Македо́нія, Іта́лія, Бразі́лія, Зімба́бвэ, Нікара́гуа** — краіны свету.

Хто размаўляе ў тэксце? Колькі чалавек размаўляюць?
Як называецца маўленне, калі гаворыць адзін чалавек?

*Успомніце!*
**Маналагічнае маўленне** — гэта гаворка аднаго чалавека.

**94.** Папрацуйце ў парах. Складзіце дыялог.
Тэмы для размовы: «Летні адпачынак», «Мой новы тэлефон», «Любімая камп'ютарная гульня», «Тэлефонная размова з бабуляй» і г. д.

**95.** Прачытайце дыялог. Паміж кім вядзецца размова?

— Жук Іван, а ты чаму не п'еш чаю? — пытаецца настаўнік.
— А я ўжо выпіў.
— А цукар з пірагом у цябе чаму ляжыць?
— Цукар?.. Цукар з пірагом я занясу Маньцы. Яна хворая.
— Гэта твая сястра?
— Угу... Малая. *(Паводле Алены Васілевіч)*

Чаму Іван не з'еў пірог і цукар? Дайце характарыстыку хлопчыку.
Запішыце дыялог у сшыткі. Правільна афармляйце яго пры спісванні.

**96.** Прачытайце апісанне сітуацый. Вызначце, у якіх сказах апісваецца дыялагічнае маўленне, а ў якіх — маналагічнае.

Настаўнік тлумачыць новую тэму.

Міліцыянер выступае перад вучнямі, расказвае, як паводзіць сябе ў экстрэмальных сітуацыях.

Сябры сустрэліся ў кінатэатры.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Мама з бабуляй перапісваюцца праз смартфон.
Хлопчык разважае аб прачытанай кнізе.

?! Прыдумайце яшчэ сітуацыі, дзе выкарыстоўваецца маналагічнае і дыялагічнае маўленне.

**97.** Прачытайце тэкст, які напісаны ад імя Галі Чацвяртак, гераіні аповесці Барыса Васільева «А досвіткі тут ціхія…».

Я з дзіцячага дома, і прозвішча мне далі там жа, таму што на чвэрць меншая за ўсіх ростам была. Вайна застала мяне на трэцім курсе інстытута, і ў першы ж панядзелак наша група ў поўным складзе з’явілася ў ваенкамат. Групу ўзялі, а мяне не хацелі браць ваяваць, таму што не падыходзіла пад вайсковыя стандарты ні ростам, ні ўзростам. Але галоўнае — не здавацца! Я зацята штурмавала ваенкама і так бессаромна хлусіла, што падпалкоўнік канчаткова заблытаўся і ў парадку выключэння накіраваў у зенітчыцы.

**Чвэрць** — чацвёртая частка чаго-небудзь цэлага.
**Ваенкама́т** — установа, якая прызывае ў армію.
**Заця́та** — упарта, настойліва.
**Ваенка́м** — ваенны камандзір, начальнік ваенкамата.
**Зені́тчыца** — ваеннаслужачая, якая з дапамогай спецыяльных гармат збівае самалёты.

?! Хто расказаў гісторыю Галі?
Якое маўленне выкарыстана ў тэксце — маналагічнае ці дыялагічнае?
Пісьмова адкажыце на пытанні. Карыстайцеся тэкстам.

Дзе вырасла Галя Чацвяртак?
Чаму ёй далі такое прозвішча?
Ці адразу яе прызвалі ў армію?
У якія войскі трапіла Галя?

**98.** Прачытайце тэкст.

— Прыкінь, у галоўным парку горада Бостана пастаўлены помнік вераб’ю.
— Як герою? — здзівіўся Юрка.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Ну так! Але ж было за што! — даводзіў Андрэй. — У Амерыку іх некалі англічане завезлі. Вакол Бостана шкодныя насякомыя так размножыліся, што ніхто не мог даць рады. Людзям пагражаў голад.

— Хлусіш! — не паверыў Юрка. — Ад насякомых голад?



***верабе́й***

— А то! Гэтыя пражэрлівыя пачвары напалі на сады і агароды. А тут наляцелі вераб'і і тых вусеняў знішчылі падчыстую! Вераб'і кормяць дзяцей не зернем, а лічынкамі, насякомымі. Кожнай сямейцы — паўтысячы на дзень.

— За гэта ім і помнік?

— Хіба ж не варта? *(Паводле Івана Аношкіна)*

**Бо́стан** — горад у Амерыцы.

Якое маўленне выкарыстана ў тэксце? Чаму?
Якую назву можна даць тэксту?
Прачытайце тэкст па асобах.
За што вераб'ям паставілі помнік? Знайдзіце адказ у тэксце і запішыце яго ў сшытку.

**99.** Складзіце маналог ад свайго імя пра тое, чым вы любіце займацца ў вольны час (3—4 сказы).

# ТЭКСТ

## *Урокі 1—2. Тэкст. Тэма, асноўная думка тэксту*

**100.** Прачытайце сказы. Ці з'яўляюцца яны тэкстам?

### Наш дом — Беларусь

Кожнай жывой істоце важна мець свой дом. Казюрцы дастаткова дзірачкі ў кары дрэва. Многія дзікія звяры жывуць у норах.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Птушкі будуюць сабе гнёзды. Свойскай жывёле жытло майструе чалавек.

У цябе таксама ёсць свой дом. Разам з табой у ім жывуць твае родныя. Гэта твая сям'я. Побач з вамі жывуць вашы суседзі.

Усе мы жывём у адным вялікім доме. Гэта наша краіна. Яна завецца Рэспубліка Беларусь.



***суссе́д***

**Казю́рка** — казяўка, кузурка, маленькае насякомае.

?! Якая тэма гэтага тэксту?
Якая яго асноўная думка?

*Успомніце!*
**Тэкст** — гэта выказванне на пэўную тэму. Кожны тэкст складаецца са сказаў, якія аб'ядноўваюцца агульнай тэмай і асноўнай думкай.
**Тэма** — тое, аб чым гаворыцца ў тэксце.
**Асноўная думка тэксту** — гэта тое галоўнае, што аўтар хоча сказаць чытачу або слухачу.
Асноўная думка, як і тэма, можа быць выказана ў загалоўку або ў адным са сказаў тэксту. Але часцей за ўсё яе трэба вызначыць і сфармуляваць.

**101.** Прачытайце верш. Палічыце, колькі ў ім сказаў.

**Беларуская мова**

Ільняная і жытнёвая. Сялянская.
Баравая ў казачнай красе.
Старажытная. Ты самая славянская.
Светлая, як травы ў расе.
Вобразная, вольная, пявучая,
мова беларуская мая!

*(Пімен Панчанка)*

?! Ці з'яўляецца верш тэкстам?
Якая тэма тэксту?
Сфармулюйце і запішыце асноўную думку тэксту.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**102.** Прачытайце тэкст. Якую назву яму можна даць?



Жывуць ра́кі ў азёрах і рэках. Хаваюцца ў норках пад карчамі ці каменнем. Спажываюць яны чарвякоў, дробную вадзяную жыўнасць, маленькую рыбку. Не даюць забрудзіцца вадзе і гэтым прыносяць карысць.

У рака доўгія вусы і сярдзітыя вочы. Клюшні ў яго падобныя да кавальскіх абцугоў. Поўзае, плавае рак галавой назад. Некалькі разоў за лета ён ліняе. Панцыр лопаецца. Тоўсты гаспадар вылазіць з яго. Потым цярпліва чакае ў нары з’яўлення новай вопраткі.

*(Паводле Уладзіміра Ягоўдзіка)*

**Клю́шня** — канцавая частка ножкі рака і ракападобных, якая нагадвае клешчы і служыць для хапання.
**Абцугí** — металічны інструмент, які выкарыстоўваецца ў кавальскай справе для захоплівання і заціскання жалеза.

?! Пра каго гаворыцца ў тэксце? Ці бачылі вы калі-небудзь рака? Адкажыце на пытанні.

1. Дзе жывуць ра́кі?
2. Чым кормяцца ра́кі?
3. Якую карысць прыносяць ра́кі?
4. Які знешні выгляд рака? (Знайдзіце і прачытайце ў тэксце.)
5. Як рак перамяшчаецца ў вадзе (поўзае)?
6. Што адбываецца з панцырам рака?

# Выпішыце з тэксту адказ на чацвёртае пытанне.
* Пісьмова адкажыце на першае, другое, трэцяе пытанні.

**103.** Прачытайце сказы.

1. Праз тыдзень пасля гракоў прылятаюць жаваранкі. 2. Хто з крылатых сяброў прылятае на радзіму раней? 3. А ўслед за



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

жаваранкамі ляцяць шпакі, пліскі. 4. Разведчыкамі вясны з'яўляюцца ў нас гракі.

?! Ці з'яўляюцца гэтыя сказы тэкстам?
Што трэба зрабіць, каб атрымаўся тэкст?
Размясціце сказы так, каб атрымаўся тэкст.
Запішыце тэкст.

**104.** Прачытайце тэкст. Прыдумайце яму назву.

На двары верасень. Сонца яшчэ шчодра свеціць. Аднак яго промні ўжо не такія гарачыя, як летам. Неўзабаве зацягнуць дажджы. Пасля птушкі паляцяць у вырай. Затым дрэвы пачнуць скідаць сваё лісце.

?! Якая тэма тэксту?
Палічыце, колькі сказаў у тэксце.
Запішыце назву і тэкст у сшытку. У канцы тэксту пазначце алоўкам колькасць сказаў.

**105.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму і асноўную думку.

### Любімая Радзіма

Вельмі прыгожая наша зямля. У нас шмат лясоў, рэк і рэчак, вялікіх і малых азёр.

У нас вельмі цудоўныя, добрыя, ласкавыя, спагадлівыя, працалюбівыя, сціплыя, вясёлыя людзі. Мы — вялікі і старажытны народ, мудры і светлы, чысты і даверлівы, дабрадушны і памяркоўны.

Кожны з нас ганарыцца, што належыць менавіта да такога народа і да такой слаўнай зямлі. *(Паводле Янкі Сіпакова)*

?! Чым багата наша Радзіма?
Якія людзі жывуць у Беларусі?
Знайдзіце сказ, у якім выяўлена асноўная думка тэксту. Запішыце яго.
* Дайце пісьмовае апісанне людзей, якія жывуць у Беларусі. Карыстайцеся словамі з тэксту (калі ў тэксце сустрэліся незразумелыя словы — карыстайцеся тлумачальным слоўнікам).



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**106.** Прачытайце.

Апусцілася на зямлю ноч. У маўклівай цемры патанулі абрысы дрэў і кустоў. Сцішылася большасць звяроў і птушак. Ярка свяціла восеньскае сонца. Змоўклі поле і луг.

?! Вызначце, які сказ не падыходзіць па сэнсе.
Прачытайце, прапускаючы сказ, які не падыходзіць па сэнсе.
Ці з'яўляецца прачытанае тэкстам? Прыдумайце назву тэксту, што атрымаўся.
Запішыце тэкст.

**107.** Прачытайце сказы.

Ён пасядзеў, агледзеўся ды заспяваў. Куст бэзу рос пад акном. Пярнаты співак вітаў сонейка і славіў новы дзень. На галінку куста прыляцеў салоўка. Яна разляталася па ўсім наваколлі. Якая гэта была цудоўная песенька!

?! Ці з'яўляюцца гэтыя сказы тэкстам?
Што трэба зрабіць, каб атрымаўся тэкст?
Размясціце сказы так, каб атрымаўся тэкст. Прыдумайце яму назву.
Запішыце тэкст.

**108.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму.

### Дзівосная іншаземка

Любяць у Беларусі бульбу. Без бульбы нельга ўявіць сабе ні абедзенны, ні святочны стол. Ніхто не грэбуе бульбай, заўсёды яна побач з хлебам. Бульбу вараць, пякуць, смажаць, тушаць, фаршыруюць, сушаць.



Бульба прыйшла да нас з Паўднёвай Амерыкі. Людзі ацанілі харчовыя якасці бульбы і назвалі яе «другім хлебам». У бульбе многа крухмалу, вітамінаў і іншых пажыўных рэчываў. Сёння цяжка абысціся чалавеку без бульбы. Нездарма многія



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

пісьменнікі і паэты прысвячаюць бульбе свае творы. *(Паводле Змітрака Марозава)*

**Гро́баваць** — адчуваць агіду, з пагардай адносіцца да чаго-небудзь.

Што ў Беларусі называюць «другім хлебам»? Якія стравы з бульбы вы ведаеце? А якія з іх умееце гатаваць?
Ці карысныя стравы з бульбы?
Вызначце асноўную думку тэксту, запішыце яе сваімі словамі.

**109.** Запішыце рэцэпт любімай стравы з бульбы. Ці будзе ён з'яўляцца тэкстам? Чаму?

## *Урокі 3—4. Часткі тэксту*

**110.** Прачытайце тэкст.

### Кармушка

У суботу Дзяніска з татам майстравалі кармушку. Атрымалася сапраўдная хатка для птушак. У нядзелю было сонечна. Яны прымацавалі хатку на балконе. Вераб'ям накрышылі хлеба. Сініцам паклалі сала. Праз некалькі хвілін верабей ужо знайшоў ежу. Ён весела чырыкнуў і паляцеў шукаць сяброў. Вераб'і падсілкаваліся хлебам, пакінулі сала сініцам і паляцелі. Сінічкі пачаставаліся салам. Адна птушачка падляцела да шыбы. Яна паківала галоўкай, асцярожна стукнула дзюбай у шкло. Так сінічка падзякавала людзям. *(Паводле Тацяны Мушынскай)*

Якая тэма тэксту?
Што рабілі ў суботу Дзяніска з татам?
Якія птушкі прыляцелі да кармушкі?
Як сінічка падзякавала людзям?
На колькі частак можна раздзяліць тэкст?

*Успомніце!*
Тэкст можна падзяліць на часткі. У тэксце вылучаюць: **пачатак тэксту, асноўную частку** і **заключную**.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**111.** Прачытайце план тэксту.

1. Кармушка сваімі рукамі.
2. Госці каля кармушкі.
3. Падзяка.

?! Ці падыходзіць план да тэксту з папярэдняга практыкавання?
Раздзяліце тэкст «Кармушка» на часткі адпаведна плану.
Запішыце тэкст. Кожную частку пішыце з чырвонага радка.

**112.** Прачытайце верш.

Па сцяжынцы тупаў Вожык,
нёс сунічак поўны кошык.
Замарыўся, успацеў,
адпачыць на пень прысеў.
Зайчанятак не пужае,
а ласкава запрашае:
— Вы частуйцеся, сябры,
шмат сунічак у бары!
Паглядзеў на кошык Вожык,
бачыць: апусцеў ён, кошык.
На палянку да крынічкі
зноў пайшоў збіраць сунічкі.

*(Паводле Леаніда Глушко)*

?! Чым займаўся Вожык?
Каго Вожык частаваў суніцамі?
Куды пайшоў Вожык, калі ўбачыў пусты кошык?
Падзяліце верш на часткі.
Запішыце заключную частку.

**113.** Прачытайце тэкст.

## Каштан

Убачыў я на лузе маленькае жарабя. Вельмі яно спадабалася мне. Яго звалі Каштан. Я даў яму кавалачак цукру. Каштан з’еў цукар і зноў пацягнуўся да далоні. Я пачаў часта прыходзіць да



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

яго. Цяпер мой гадаванец вырас. Я ледзь дастаю да грывы жарабяці. Каштан заўсёды прыветна сустракае мяне.

?! Падзяліце тэкст на часткі.
Запішыце тэкст, правільна афармляючы яго на пісьме.

**114.** Прачытайце часткі тэксту і разгледзьце малюнкі.

Раптам пачуўся моцны ўсплёск. Міхалка і Юрка ўзялі татаў ліхтарык і зазірнулі пад печ. Зазірнулі і спалохана кінуліся назад. У яме пад печчу ляжаў нехта вусаты. Доўгія яго вусы звісалі па краі рота.

Хлопчыкі паклікалі тату. Яны выцягнулі новага жыхара з-пад печы. Гэта быў сом. Вада спала, і ён не змог адтуль выбрацца.







Рэчка Гарынь разлілася вельмі хутка. Яна затапіла двор, сад, агарод і хату Сымона. Калі паводка спала, дзядзька Сымон з жонкай і дзецьмі вярнуліся ў сваю хату. Падлога была мокрая, і лужы стаялі ў яме пад печчу. *(Паводле Віталя Вольскага)*

?! Падбярыце да кожнага малюнка адпаведную частку тэксту.
Складзіце тэкст. Прыдумайце яму назву.
Запішыце назву тэксту, асноўную і заключную часткі.

**115.** Прачытайце тэкст.

### Па арэхі

Была сярэдзіна верасня. Дзьмуў лёгкі ветрык. Шумелі лістотай каля возера кусты ляшчыны. На бераг каціліся невялікія хвалі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Янка збіраў у ляшчынніку арэхі. Раптам хлопчык убачыў у возеры дзвюх вавёрак. Мордачкі і пушыстыя хвосцікі звяркоў узвышаліся над вадой. Вавёркі рухаліся ў бок ляшчынніку. Янка здагадаўся, што яны плывуць з процілеглага берага, з сасонніку па арэхі. Каб не спалохаць звяркоў, хлопчык схаваўся за кустамі.



А вавёркі выбраліся з вады ды скокнулі на ляшчыну. *(Паводле Янкі Галубовіча)*

**Ляшчы́на** — куст ці дрэва, на якім растуць лясныя арэхі.

?! Падзяліце тэкст на часткі.
Складзіце план тэксту. Перакажыце тэкст па складзеным плане.
Запішыце план.

**116.** Прачытайце тэкст. Прыдумайце яму назву.

У адной сям'і жыў Дамавік. Паснуць ноччу людзі, дык ён выйдзе і раскладвае рэчы на свае месцы. Часцей за ўсё гэта былі цацкі Алёнкі. Аднойчы Алёнка захварэла. Ляжыць з высокай тэмпературай і кашлем. А Дамавік бяжыць у лес за дапамогай. Раніцай Алёнчына мама зайшла на кухню. Мёд, арэхі, зёлкі гаючыя ляжаць на стале. Глядзіць і вачам сваім не верыць. А Дамавік-невідзімка пасміхаецца сабе ў бараду. *(Паводле Станіслава Валодзькі)*

?! Падзяліце тэкст на часткі.
Запішыце назву і тэкст. Кожную частку пішыце з чырвонага радка.

**117.** Прачытайце часткі тэксту.

**Буслы**

Старэйшы сын смела рушыў да краю буслянкі. Ён пакружыўся ў паветры і апусціўся на луг.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У буслоў адзіны паратунак — дужыя крылы.

На вялікім разлапістым дубе жыла сям'я буслоў. Аднойчы пасля снедання стары бусел пачаў вучыць буслянят лятаць.

А малы буслік падышоў да краю буслянкі і адступіў назад. Стары бусел ззаду штурхануў баязліўца. Буслік вываліўся з буслянкі і замахаў крыламі. Раптам ён адчуў, што ляціць.

*(Паводле Расціслава Бензерука)*

?! Пастаўце часткі ў правільным парадку, каб атрымаўся тэкст. Запішыце пачатак тэксту ў сшытку.

## *Урок 5. Назва і план тэксту*

**118.** Прачытайце верш.

Жураўлі па-над лясочкам
роўненькім ляцяць шнурочкам.
Мама кажа мне, што гэта
адлятае ад нас лета.
І цяпер мне зразумела,
чаго дождж ідзе дзень цэлы, —
гэта лета, не іначай,
па дзяньках вясёлых плача.

*(Іван Шуцько)*

?! Ці з'яўляецца верш тэкстам? Чаму?
Якую назву можна даць вершу?
Якая тэма гэтага тэксту?
Якая яго асноўная думка?
Колькі сказаў у тэксце?
Запішыце назву і трэці сказ тэксту ў сшытку.

**119.** Прачытайце тэкст. Прыдумайце і запішыце загаловак.

На двар.. канец верасня. У прыродзе адбываюцца значныя змены. Дрэвы апранаюцца ў яркае ўбранне. У лесе дасп..ваюць апошнія д..ры.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



*Рагаты жаваранак*



*Амялушка*



*Пуначка*

Птушкі адл..целі ў вырай. Іх зам..няюць п..ўночныя суродзічы. Прыл..таюць да нас р..гатыя жаваранкі, амялушкі, пуначкі. Пад к..нец мес..ца ў лесе робіцца зусім ціха.

Жабы х..ваюцца ў норы і пад к..рэнне дрэў. Рыбы збіраюцца ў ч..родкі і ідуць у зім..вальныя ямы. *(Паводле Вячаслава Стомы)*

**На дварэ́** — на вуліцы, у прыродзе.

?! Якая тэма гэтага тэксту?
Колькі частак можна выдзеліць у тэксце?
Падбярыце да кожнай часткі назву (карыстайцеся падказкай).

Назвы частак для выбару: *верасень, паўночныя госці, падрыхтоўка да зімы, жыхары зімовых ям, птушкі, восень у прыродзе, у лесе.*

Запішыце загаловак тэксту і план, што ў вас атрымаўся.
* Запішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары.

**120.** Прачытайце народныя прыметы. Ці з'яўляюцца яны тэкстам? Чаму?

Шмат жалудоў на дубах — на цёплую зіму.
Вялікія мурашнікі ўвосень — на суровую зіму.

?! Якая будзе зіма, калі на дубах мала жалудоў?
Звярніце ўвагу, ці многа жалудоў на дубах гэтай восенню.
Якія яшчэ народныя прыметы пра восень вы ведаеце?
Запішыце адзін сказ на выбар.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**121.** Прачытайце тэкст. Дайце яму назву.

Каля кастра сядзелі рыбакі. На патэльні смажылася бульба. Далёка разносіўся яе пах. Раптам у траве нехта зашумеў, затохкаў, зафыркаў. Рыбакі пачулі гэтыя незвычайныя гукі. Усе сцішыліся. Неўзабаве з травы высунуўся чорны мокры нос. Ён быў падобны да свінога пятачка. Гэта маленькі барсучок прыйшоў да кастра. Ён вельмі хацеў есці. Пах бульбы не даваў яму спакою. Рыбакі пашкадавалі галоднага звярка і кінулі яму бульбіну. З’еў барсучок яе, чмыхнуў носам, нібы падзякаваў рыбакам за пачастунак.

Падзяліце тэкст на часткі.
Падбярыце назву да кожнай часткі.
Запішыце загаловак і план тэксту.
Перакажыце тэкст з дапамогай плана.

**122.** Прачытайце тэкст.

**Званочкі на рабіне**

Ля дзядулевай хаты стаіць заснежаная рабіна. На галінках чырванню свецяцца гронкі горкіх ягад.

Аднойчы Любачка пачула з рабіны меладычны спеў. Нібы сотні званочкаў зазванілі. Дзяўчынка ўбачыла, як чубатыя птушкі ласуюцца ягадамі. Доўга стаяла яна і слухала перазвон амялушак. Вось і спатрэбіліся горкія ягады. *(Паводле Фамы Рамашкі)*

Падзяліце тэкст на часткі.
Падбярыце назву да кожнай часткі.
Запішыце загаловак і план тэксту.

## *Урокі 6—7. Пераказ тэксту*

**123.** Прачытайце тэкст.

**Цецерукі**

На старую бярозу прыляцелі цецерукі. Яны дзяўблі бярозавыя пупышкі. Дрэва варушылася, нібы ад ветру. Нанач птушкі зашыліся ў снег. Цецерукі заўсёды так начуюць зімой.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Пад раніцу ўдарыў мароз. Снег ператварыўся ў цвёрдую скарынку. Пад снегам чулася шаргаценне. Гэта цецерукі вызваляліся ад снежнага палону. *(Паводле Васіля Хомчанкі)*

?! Хто прыляцеў на старую бярозу?
Што яны дзяўблі?
Як варушылася дрэва?
Куды схаваліся птушкі ноччу?
У якую пару так начуюць цецерукі?
Што здарылася раніцай?
У што ператварыўся снег?
Што чулася пад снегам?
Адкуль вызваляліся цецерукі?
Адкажыце на пытанні пісьмова.

**124.** Прачытайце тэкст.

### Васілёва бярозка

Васілёк рэдка бывае без занятку. За ўсё ён бярэцца з ахвотай, але не даводзіць справы да канца. Аднойчы хлопчык вырашыў пасадзіць пад акном бярозку. Тата дапамог яму падрыхтаваць дрэўца. Непадалёку сябры Васілька гулялі ў футбол. Хлопчык амаль забыўся пра бярозку. Тата растлумачыў, што ў бярозкі высахне карэнне, калі не пасадзіць яе зараз. Хлопчык закончыў працу. Вясной бярозка моцна ўчапілася каранямі за зямлю і зашумела маладым лісцем. *(Паводле Міколы Гамолкі)*

?! Падзяліце тэкст на часткі.
Складзіце план тэксту.
Перакажыце тэкст па плане вусна.
* Напішыце пераказ.

**125.** Прачытайце тэкст.

### Дапамога

Старэнькая бабулька стаяла на скрыжаванні дарог. Яна некалькі разоў пачынала пераходзіць вуліцу. Але загаралася чырвонае



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

святло. Ісці хутка бабулька не магла. Пешаходы спяшаліся, не звярталі на яе ўвагі.

Хлопчык падышоў да скрыжавання. Вочы яго спыніліся на постаці бабулькі. Хлопчык узяў яе пад руку і павёў. Яны ішлі памаленьку. Ужо загарэлася чырвонае святло, але машыны не скрануліся з месца. Хлопчык перавёў бабульку цераз дарогу і развітаўся з ёй.

?! Хто стаяў на скрыжаванні дарог?
Чаму бабулька не магла перайсці вуліцу?
Хто заўважыў разгубленую бабулю?
Як хлопчык ёй дапамог?
Адкажыце на пытанні, каб атрымаўся кароткі пераказ.
Запішыце пераказ у сшытку.

***ме́сца***

**126.** Прачытайце тэкст.

## Памірыліся

Два чубатыя вераб'і знайшлі каля хлява зярнятка. І разгарэлася паміж імі страшная бойка. Ажно пер'е ляціць з іх. Як тыя пеўні счапіліся. Вераб'і заўзята дзяўблі адзін аднаго.

Я набраў жменю зярнят і сыпнуў вераб'ям. Яны разляцеліся. Недалёка селі на дрэва.

Але хутка яны вярнуліся і сталі дружна сілкавацца зярнятамі.

*(Паводле Васіля Ткачова)*

?! Складзіце план тэксту.
Запішыце загаловак і план.
Перакажыце тэкст вусна.

**127.** Прачытайце тэкст. Вызначце асноўную думку тэксту.

## Сорамна перад салавейкам

Воля і Ліда пайшлі ў лес. Пасля доўгай дарогі селі яны на траве адпачыць і паснедаць. Дасталі з кошыка хлеб, масла, яйкі. Калі дзяўчынкі скончылі есці, непадалёк ад іх сеў на куст салавейка і заспяваў. Зачараваныя яго песняю, Воля і Ліда сядзелі і баяліся



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

паварушыцца. Салавейка перастаў спяваць. Воля сабрала недаедкі, шматкі паперы, кінула пад куст. Ліда сабрала недаедкі, загарнула ў паперу і паклала ў кошык.

— Навошта ты забрала смецце? — спытала Воля. — Мы ў лесе... Ніхто ж не бачыць.

— Сорамна... перад салавейкам, — ціха адказала Ліда. *(Васіль Сухамлінскі; пераклад з рускай мовы)*

?! Успомніце, якое маўленне выкарыстана ў тэксце.
Падзяліце тэкст на часткі.
Перакажыце тэкст вусна па наступным плане.

1. Снеданне ў лесе.
2. Песня салавейкі.
3. Сорам перад салавейкам.

**128.** Прачытайце тэкст.

## Баравікі

Белыя грыбы растуць у розныя поры года. Яны часта не падобны адзін да аднаго. Першымі ў чэрвені з'яўляюцца каласавікі́. Яны растуць у час цвіцення жыта. Потым з пачаткам жніва ў барах высыпаюць жні́ўнікі. А восенню грыбнікоў радуюць прыгажуны ліста́паднікі.

Усе яны — родныя браты. Але адрозніваюцца грыбы колерам капялюшыка і памерам ножкі. У першых баравікоў капялюшыкі і ножкі светлага колеру. У восеньскіх баравікоў карычневыя або чорныя капелюшы. *(Паводле Уладзіміра Ягоўдзіка)*



*Каласавікі*



*Жніўнікі*



*Лістападнікі*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Калі ў лесе растуць баравікі?
Ці падобны баравікі, якія растуць у розную пару?
Калі растуць каласавікі, жніўнікі, лістападнікі?
З апорай на тэкст і малюнкі апішыце летнія і асеннія баравікі.
Запішыце апісанне грыбоў у сшытку.

**129.** Прачытайце загадку, адгадайце яе.

Знае нават і дзятва:
калі ў шапцы выйшаў хтось,
дык пад шапкай галава
у яго, бясспрэчна, ёсць.
А Мікіта баравы
мае шапку, як усе,
ды не мае галавы.
На чым шапка?
Наназе.

*(Ніл Гілевіч)*

?! Ці з'яўляецца загадка тэкстам? Чаму?
Колькі сказаў у тэксце?
Запішыце загадку разам з адгадкай.

**130.** Прачытайце часткі тэксту.

Хлопчык шчыра парадаваўся за птушак.

Мінула два тыдні. Хлопчык зноў прыйшоў на агарод. На галіне старой яблыні ён убачыў сваю рукавіцу. Федзя працягнуў да яе руку. Раптам адтуль вылецела птушка. Хлопчык зазірнуў у рукавіцу і здзівіўся. Там ляжалі маленькія яечкі. Побач на галінцы скакалі два верабейчыкі. Гэта яны звілі гняздо ў рукавіцы.

Федзя капаў на агародзе градкі і згубіў рукавіцу. Доўга шукаў і не знайшоў.

?! Пастаўце часткі тэксту ў правільным парадку, каб атрымаўся тэкст.
Прыдумайце загаловак тэксту.
Запішыце загаловак і тэкст у сшытку.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 8. Напісанне запіскі, нататкі, аб’явы*

**131.** Разгледзьце малюнкі, прачытайце, што на іх напісана.










**Запíска** — кароткае пісьмо.
**Натáтка** — кароткі запіс пра што-небудзь, памятка.
**Аб’я́ва** — паведамленне, якое даводзіцца да ўсеагульнага ведама.

?! Вызначце, дзе запіска, дзе аб’ява, а дзе нататка.
У якіх выпадках мы пішам запіскі, нататкі, аб’явы?
Спішыце тэксты запіскі, нататкі, аб’явы ў сшытак.

**132.** Напішыце запіску сябру (сяброўцы) з просьбай прынесці камп’ютарную гульню, кнігу для пазакласнага чытання, новы часопіс і г. д.
Прыдумайце самастойна запіску на любую тэму.

**133.** Разгледзьце малюнкі. Дзе можна запісаць нататкі, каб своечасова выканаць важныя справы?










?! Напішыце нататкі пра справы, якія вам сёння абавязкова трэба зрабіць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**134.** Прачытайце аб’яву.

**Аб’ява**

Сёння ў 14.30 у актавай зале адбудзецца сустрэча з супрацоўнікам краязнаўчага музея. Тэма гутаркі — «Падарожжа да дыназаўраў». Запрашаюцца вучні 8—10 класаў.

Намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце

?! Ці з’яўляецца аб’ява тэкстам? Чаму?
Пра што аб’ява? Куды запрашаюць вучняў?
На якую тэму будзе гутарка?
Што вы ведаеце пра дыназаўраў?
Ці хацелі б вы паслухаць пра дыназаўраў?

**135.** Прачытайце.

Аб’ява — гэта нейкае паведамленне, якое даводзіцца да ведама зацікаўленых асоб. Спачатку пішацца слова АБ’ЯВА, лепш вялікімі літарамі, каб усе звярнулі ўвагу. Пры напісанні аб’явы неабходна ўказаць наступныя звесткі:

дату, час і месца, дзе адбудзецца падзея ці мерапрыемства;
што менавіта адбудзецца і хто запрашаецца;
хто напісаў аб’яву.

?! Напішыце аб’яву пра тое, што вы запрашаеце настаўнікаў на вечар гумару, прысвечаны заканчэнню першай чвэрці.

**136.** Прачытайце апісанне сітуацый, скажыце, у якіх выпадках неабходна пісаць аб’яву.

Вы згубілі партфель са школьнымі падручнікамі.
У бабулі прапаў кот.
Парваўся бот.
Запрашаеце на свой дзень нараджэння блізкіх сяброў.
Патрэбна дапамога ў пошуку чалавека.
Ідзяце ў магазін.

?! Напішыце аб’яву да сітуацыі (на выбар).

**137.** Напішыце запіску настаўніцы на любую тэму.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урокі 9—10. Складанне апавядання*

**138.** Разгледзьце малюнак.



Словы і словазлучэнні для выбару: *выхадны дзень, сабралася ўся сям'я, пасля смачнага снедання, сумесныя сямейныя справы, старэйшыя браты, разам з бацькам, мадэль яхты, малодшая сястра, маці частуе, светла, утульна, радасна.*

?! Хто адлюстраваны на малюнку? Як усіх гэтых людзей можна назваць?
Як вы думаеце, гэта будзённы дзень ці выхадны? Чаму?
Чым займаецца кожны член сям'і?
Якую назву можна даць малюнку?
Паспрабуйце скласці апавяданне па малюнку на тэму «Сям'я ў выхадны дзень».
Запішыце апавяданне, што ў вас атрымалася.

**139.** Складзіце апавяданне на тэму «Праца на сельскагаспадарчым прадпрыемстве». Карыстайцеся пытаннямі.

Людзі якіх прафесій працуюць на сельскагаспадарчых прадпрыемствах?

Што вырошчваюць на палях земляробы?

Якую жывёлу гадуюць на сельскагаспадарчых фермах?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Людзі якой прафесіі займаюцца вырошчваннем жывёлы?

Чым займаюцца сяляне ў розныя поры года?

Ці хацелі б вы працаваць на сельскагаспадарчым прадпрыемстве? Калі так, то кім?

?! Запішыце апавяданне, што ў вас атрымалася.

**140.** Прачытайце тэкст пра навальніцу, паглядзіце відэа, дзе яна паказана. Успомніце, што адбываецца ў прыродзе перад навальніцай, у час навальніцы і пасля яе. Складзіце апавяданне на тэму «Навальніца» па наступным плане.

1. Спякотная раніца.
2. З'яўленне першых хмарак.
3. Першыя раскаты грому.
4. Неба пацямнела.
5. Парывы ветру.
6. Лінуў дождж.

Словы і словазлучэнні для выбару: *сонечная раніца, яснае неба, устойлівае надвор'е, першыя воблачкі, цёмна-шэрыя хмары, сонца схавалася, пацямнела, пачуліся раскаты, птушкі хаваліся, шалёныя парывы, сосны пахіснуліся і застагналі, зрываў лісце і галінкі дрэў, асобныя кроплі, лінуў дождж, вялікія лужыны.*

?! Складзіце апавяданне вусна.
* Запішыце апавяданне ў сшытку.

**141.** Прачытайце апавяданне пра выпадак з жыцця хлопчыка Ягора.

Аднойчы я катаўся на веласіпедзе. Калі праязджаў каля хаты, дзе жыла бабуля Наста, пачуў нейкі гук. Я злез з веласіпеда і ўбачыў, што шчаня заблыталася ў калючым дроце. Яно параніла лапу і бок. Я паціхеньку разблытаў дрот і забраў шчаня з сабой. Мы з бацькам занеслі шчаня да ветэрынара. Цяпер у мяне ёсць верны сябар Рэкс.

?! Які выпадак здарыўся ў жыцці Ягора?
Ці здараліся нейкія цікавыя падзеі ў вашым жыцці? Раскажыце пра іх.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**142.** Напішыце апавяданне пра цікавую падзею з вашага жыцця.

**143.** Прачытайце тэкст. Хто апісваецца ў апавяданні? Ці ведаеце вы такую птушку?



Коўра — птушка невялікая. Яна крыху большая за качку. У яе вузкая галава з тонкай і вострай дзюбай на канцы. На галаве ззаду пучкі пер'я. Шыя доўгая, гнуткая. А вакол шыі старамодны каўнер залаціста-рыжага колеру. Шчокі, шыя і ўся ніжняя частка тулава бліскуча-белыя. Спіна бурая. Лапы пляскатыя, зеленаватага колеру. У іх няма перапонак.

*(Паводле Віталя Вольскага)*

Да якой птушкі падобна коўра?
Якая яна па памерах?
Знайдзіце ў тэксце і прачытайце, якія галава і дзюба ў коўры.
Якія асаблівасці знешняга выгляду коўры?

**144.** Разгледзьце малюнак.



Складзіце вусна апісанне чорнага бусла паводле ўзору тэксту з папярэдняга практыкавання. Запішыце тэкст у сшытку.

**145.** Разгледзьце малюнак. Што на ім адлюстравана? Апішыце бярозу па наступным плане.

1. Назва дрэва.
2. Ствол бярозы.
3. Крона дрэва.
4. Лісточкі (форма, памер, колер).
5. Месца, дзе расце дрэва.
6. Чым карысная бяроза.



Запішыце тэкст, што атрымаўся.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**146.** Прачытайце апісанні. Здагадайцеся, пра што ідзе гаворка.

Гэтая рэч патрэбна чалавеку, каб апранацца. Яе носяць дзяўчынкі або жанчыны. Яна можа быць доўгай ці кароткай. Можа быць рознага колеру. Яна бывае паўсядзённай і святочнай. А яшчэ яна можа быць шлюбнай.

Гэта посуд. Яго выкарыстоўваюць для прыгатавання ежы. Ён выраблены з металу. Можа быць вялікі і маленькі, колер можа мець розны. У ім гатуюць першыя стравы.

Гэта электрычны прыбор для кухні. Часцей за ўсё ён бывае белага колеру. Патрэбен для захавання і замарожвання прадуктаў.

?! Запішыце назвы прадметаў, пра якія гаворыцца ў практыкаванні.
Складзіце сказ з адной з назваў.
Прыдумайце апісанне вашага верхняга адзення ці любой іншай рэчы. Запішыце яго.

**147.** Апішыце сваю матулю або настаўніцу, выхавальніка па наступным плане.

1. Імя.
2. Занятак, прафесія.
3. Знешні выгляд (рост, колер валасоў, вачэй і г. д.).
4. Асаблівасці характару.

?! Запішыце тэкст, што атрымаўся.

## # *Складанне апавядання па апорных словах і словазлучэннях, па яго пачатку або канцоўцы*

**148.** Прачытайце, дапаўняючы сказы.

Чырвоным пажарам рабін гарыць … … . Аслабелае лісце … … … і бясшумна кладзецца на зямлю. З лёгкім сумам я любуюся … … восені.

Словазлучэнні для выбару: *асенні лес, зрываецца з дрэў, залатым дажджом.*

?! Запішыце тэкст, устаўляючы патрэбныя словазлучэнні.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**149.** Прачытайце пачатак тэксту.

## Арол і кошка

На лузе гулялі кошка і маленькія кацяняты. Адно кацяня было белае, а другое чорнае. Раптам прыляцеў вялізны арол. Ён схапіў чорнае кацяня і хацеў паляцець. У гэты час кошка скокнула на арла...

Словазлучэнні для выбару: *смелая кошка, адважна змагалася, перакусіла крыло, пабіты арол, падышла да кацянят.*

?! Прыдумайце, чым скончылася гісторыя. Запішыце тэкст. Карыстайцеся словазлучэннямі для выбару.

**150.** Прачытайце.

## Выратаванне

Віця катаўся на каньках на рэчцы. Хлопчык праваліўся пад лёд. Ён стаў клікаць на дапамогу.

Па беразе рэчкі ішоў салдат. Ён пачуў крык. Салдат скінуў куртку і скокнуў у ледзяную ваду...



?! Разгледзьце малюнак. З дапамогай малюнка дапішыце заключную частку тэксту.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**151.** Прачытайце.

Мая бабуля вельмі добрая і працавітая. Я часта наведваю яе. Калі ні прыйду, усё нешта робіць.













Вось толькі часу ў бабулі не заўсёды хапае.

?! З дапамогай малюнкаў складзіце асноўную частку тэксту. Запішыце тэкст, кожную частку пішыце з чырвонага радка.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**152.** Разгледзьце малюнак. Складзіце апавяданне па малюнку.



Словы для выбару: *восень, цёпла, надвор'е, дождж, туман, ішлі, убачылі, узлесак, пянёк, грыбы, шмат, збіраць, фартушок, поўны, настрой, цудоўны.*

?! Запішыце тэкст, што атрымаўся.

# СКАЗ

## *Урок 1. Простыя сказы*

**153.** Прачытайце верш. Якая яго асноўная думка?

**З чым хлеб параўнаць?**

— З чым хлеб ты параўнаеш, сынку?
— Хлеб — гэта сонейка часцінка.
Хлеб — гэта радасць, шчасце ў хаце,
з усіх багаццяў ён багацце!
Задумалася на хвілінку
і хлапчуку сказала мама:



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Няма з чым параўнаць хлеб, сынку,
што ні скажы пра хлеб, то мала.

*(Авяр'ян Дзеружынскі)*

?! Колькі сказаў у вершы?
Якія гэта сказы паводле мэты выказвання?
Спішыце першыя тры сказы. Падкрэсліце знакі прыпынку ў канцы сказаў.

**154.** Прачытайце сказ.

Сонца толькі што паказалася з-за сасонніку. *(Іван Шамякін)*

?! Які знак прыпынку стаіць у канцы сказа?
Якія яшчэ знакі могуць стаяць у канцы сказаў?
Знайдзіце ў сказе дзейнік і выказнік. Спішыце сказ. Падкрэсліце адной лініяй дзейнік, дзвюма — выказнік, хвалістай лініяй — даданыя члены.

*Успомніце!*
**Просты сказ** — гэта сказ, у якім ёсць адна граматычная аснова, гэта значыць адзін дзейнік і выказнік.
*Нарэшце прыйшла цёплая вясна.*

**155.** Прачытайце сказы.

1. **У небе спяваў жаваранак.** 2. Павольна апускаецца на зямлю майскі вечар. 3. Дзеці ішлі ў школу. 4. Мы з Пятром часта ходзім у сквер. 5. У крыніцу падае лісце. 6. **Неба на гарызонце пачарнела.** 7. Малы моцна трымаў маці за руку.

?! Знайдзіце ў сказах дзейнікі і выказнікі. Колькі дзейнікаў і выказнікаў у кожным сказе?
Гэтыя сказы простыя ці складаныя?
Запішыце сказы ў сшытак. Падкрэсліце дзейнік і выказнік у кожным сказе. Назавіце ў выдзеленых сказах даданыя члены сказа. Пастаўце да іх пытанні ад выказніка. Абазначце сувязь слоў у сказах стрэлкамі, як паказана на ўзоры.

*дзе?*

Узор. *У небе спяваў жаваранак.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**156.** Прачытайце сказы. Назавіце ў іх дзейнікі і выказнікі.

Смутна шумеў стары лес. *(Якуб Колас)*
Па летніку грэбля вядзе да ракі. *(Змітрок Бядуля)*

**Ле́тнік** — дарога, якой ездзяць толькі летам.
**Грэ́бля** — насціл з бярвення ці галля для праезду цераз балота, гразкае месца; гаць.

Пастаўце пытанні да дадаными членаў сказа.
Выпішыце са сказаў словазлучэнні. Ці з'яўляюцца словазлучэннямі галоўныя члены сказа?

Узор. *Лес (які?) стары, шумеў (як?) ... .*

*Успомніце!*
**Словазлучэнне** — гэта два або некалькі слоў, звязаных па сэнсе. Сувязь паміж словамі ў словазлучэнні ўстанаўліваецца з дапамогай пытанняў.
Дзейнік і выказнік не з'яўляюцца словазлучэннем. Яны ўтвараюць сказ.

**157.** Прачытайце народнае выказванне. Растлумачце яго сэнс.

Кожны кулік сваё балота хваліць.

Вызначце ў сказе дзейнік і выказнік.
Па стрэлачках назавіце словазлучэнні ў сказе. Пастаўце пытанні ад аднаго слова ў словазлучэнні да другога.
Выпішыце са сказа словазлучэнні.

**158.** Прачытайце словазлучэнні. Утварыце з іх сказы.

Уважліва глядзіць, маленькая дзяўчынка, у расчыненае акно.
Таямніча мігцяць, дробныя зоркі, на цёмным небе.

Запішыце сказы, што ўтварыліся. Падкрэсліце ў іх дзейнік, выказнік, дададзеныя члены сказа.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 2. Простыя неразвітыя і развітыя сказы*

**159.** Прачытайце сказы. Ці ёсць у сказах даданыя члены?

Набліжаўся вечар. Сонца зайшло. Паветра пасвяжэла. З’явіўся месяц. Замігцелі зоркі.

Словы для выбару: *летні, за лес, значна, на небе, яркія.*

Падбярыце да галоўных членаў даданыя.
Запішыце сказы, што атрымаліся.
Як называюцца сказы, якія складаюцца толькі з галоўных членаў?
Як называюцца сказы, у якіх акрамя галоўных членаў ёсць і даданыя?

*Успомніце!*
**Неразвітыя сказы** — гэта сказы, якія складаюцца толькі з галоўных членаў.
**Развітыя сказы** — гэта сказы, у якіх акрамя галоўных членаў ёсць адзін або некалькі даданых членаў.

**160.** Прачытайце тэкст. Якая тэма тэксту?

### Залатая восень

Пачалася залатая асенняя пара. Дрэвы і кусты скідаюць свой восеньскі ўбор. Кружаць у паветры лісточкі. Сёння раніцай быў першы замаразак. Але днём яшчэ ярка свеціць сонца.

Назавіце ў кожным сказе галоўныя і даданыя члены.
Ці ёсць у тэксце неразвітыя сказы?
Паспрабуйце пераўтварыць развітыя сказы ў неразвітыя. Што для гэтага трэба зрабіць? Ці зразумелыя атрымаліся сказы?
Запішыце адзін са сказаў (на выбар). Пакажыце з дапамогай стрэлачак сувязь слоў у сказе.

**161.** Прачытайце пытальныя сказы. Адкажыце на іх, каб утварылася апавяданне. На якую тэму атрымаўся тэкст? Якую назву яму можна даць?

Куды прыходзяць вучні раніцай у будзённы дзень?
Куды дзеці ідуць пасля званка?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Чым займаюцца яны на ўроках?
Што робяць вучні на перапынках?
Куды ідуць школьнікі пасля ўрокаў?

?! Дайце назву тэксту.
Запішыце сказы — адказы на пытанні.
Якія сказы ў вас атрымаліся — развітыя ці неразвітыя?

**162.** Прачытайце сказы. Вызначце, якія з іх развітыя, а якія неразвітыя.

1. Крумкаюць жабы. 2. Хлопчыкі гулялі ў шашкі. 3. На канікулах Антон паехаў у вёску. 4. Дождж ішоў. 5. Дзед радасна ўсміхнуўся Алесі. 6. Журавы ўжо адляцелі ў вырай. 7. Дзяўчынка засумавала.

?! Запішыце развітыя сказы. Падкрэсліце галоўныя і даданыя члены сказа.

**163.** Прачытайце тэкст. Што ў ім не так? Падзяліце тэкст на сказы.

Падзьмуў моцны вецер над зямлёй навісла цёмная хмара бліснула маланка грымнуў гром лінуў дождж неўзабаве хмара прайшла выглянула сонца ажыла прырода. *(Іван Паўлоўскі)*

?! Запішыце тэкст, падзяляючы яго на сказы.
Кожны сказ пачынайце з вялікай літары. Які знак прыпынку паставіце ў канцы кожнага сказа?
Падкрэсліце галоўныя члены сказа. Прачытайце неразвітыя сказы.

**164.** Прачытайце неразвітыя сказы.

Мама купіла. Бабуля звязала. Брат памыў. Тата парамантаваў. Сястрычка прапыласосіла.

?! Дапоўніце неразвітыя сказы некалькімі даданымі членамі. Запішыце.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 3. Складаныя сказы*

**165.** Прачытайце сказы, што запісаны справа і злева. Чым яны адрозніваюцца?

| | |
|---|---|
| Хутка казка кажацца.<br>Не хутка справа робіцца. | Хутка казка кажацца, ды не хутка справа робіцца. |

?! Дзе запісаны простыя сказы, а дзе — складаны?
Які знак стаіць паміж часткамі складанага сказа? З дапамогай якога слова злучаны часткі складанага сказа?
Спішыце складаны сказ. Падкрэсліце коску і слова, якое злучае часткі сказа.

*Успомніце!*
Сказ, у якім аб'яднаны дзве або некалькі частак, два або некалькі простых сказаў, называецца **складаным**. Кожная частка мае свае галоўныя члены.

**166.** Прачытайце складаныя сказы.

Празвінеў званок, і вучні заспяшаліся на школьны двор.

На вуліцы дзьмуў моцны вецер, Максіма збівала з ног, але ён не звяртаў на гэта ўвагі.

?! Знайдзіце дзейнікі і выказнікі ў сказах. Колькі дзейнікаў і выказнікаў у другім сказе?
З колькіх частак складаецца гэты сказ?
Якія словы стаяць паміж часткамі складанага сказа?
Спішыце сказы. Падкрэсліце словы ***і, але***.

*Запомніце!*
Паміж часткамі складанага сказа ставіцца коска. Часткі складанага сказа могуць злучацца з дапамогай слоў **і, а, але, ды** і іншых. Гэтыя словы называюцца **злучнікамі**.
*Раніца была прыгожая, **але** быў моцны мароз.*

**167.** Прачытайце тэкст. На якую ён тэму? Якую назву яму можна даць?

Асабліва хораша ў вёсцы восенню. З поля вязуць багаты ўраджай, а на паплавах косяць атаву. Яшчэ цвітуць познія палявыя



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

кветкі, але павучкі ўжо ткуць белае павуцінне. Яно лётае ў паветры і чапляецца за траву і галлё. Гэта адзнака таго, што яшчэ доўга будзе добрае надвор'е. *(Паводле Івана Паўлоўскага)*

?! Знайдзіце ў тэксце складаныя сказы. Вызначце галоўныя члены ў кожнай з частак. Якія злучнікі ўжыты ў сказах?
Запішыце назву тэксту.
Спішыце тэкст. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.

**168.** Прачытайце простыя сказы. Утварыце з двух простых сказаў складаны. Ужывайце злучнікі ***і, а, але***.

Шануй каня дома. Ён пашануе цябе ў дарозе.
Здароўе лёгка страціць. Цяжка яго здабыць.
Слухай многа. Гавары мала.

?! Запішыце складаныя сказы. Падкрэсліце коскі і злучнікі, якія вы ўжылі паміж часткамі сказа.

**169.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце складаныя сказы.

На ствалах бяроз трапечуцца тоненькія стужачкі. Павее ветрык мацней, і адрываюцца стужкі ад бярозак. Так бярозкі мяняюць свае сукенкі, а ветрык ім дапамагае. *(Фама Рамашка)*

?! Запішыце складаныя сказы. Падкрэсліце коску паміж іх часткамі. Падкрэсліце дзейнік і выказнік у кожнай частцы складанага сказа.

## *Урокі 4—5. Складаныя сказы. Злучнікі паміж часткамі складанага сказа*

**170.** Прачытайце складаныя сказы. Назавіце злучнікі, якія стаяць паміж іх часткамі. Дзе павінны быць коскі ў гэтых сказах?

Налятаў віхор з навальніцаю ды не гнуўся ты перад бураю. *(Якуб Колас)*

Вузенькая кладка на палявой рачулцы і нам на гэтай кладцы ніяк не размінуцца. *(Максім Танк)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Возера было спакойнае толькі ля самага берага з’яўляліся хвалькі. *(Уладзімір Караткевіч)*

Між дзяўчат-бярозак чырванее ясень а пахмуры ельнік вабіць сонца ў засень. *(Якуб Колас)*

**За́сень** — месца, закрытае ад прамянёў сонца; цень.

?! Спішыце сказы. Пастаўце паміж іх часткамі коскі, падкрэсліце злучнікі.

**171.** Разгледзьце малюнак. Раскажыце з дапамогай малюнка і з уласнага вопыту, што робяць людзі восенню. Выкарыстайце складаныя сказы.



?! Запішыце назву апавядання, якое ў вас атрымалася.
Напішыце некалькі сказаў, каб атрымаўся тэкст.

**172.** Прачытайце верш. Якімі сказамі ён утвораны — простымі ці складанымі?

Пасінела неба,
рэчка пасвятлела.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Матылькі ўзняліся
каля вішань смела.

*(Уладзімір Карызна)*

?! Спішыце верш у радок.
Падкрэсліце дзейнікі і выказнікі ў сказах. Ці ёсць злучнік у складаным сказе?

**173.** Прачытайце складаныя сказы, устаўляючы патрэбныя злучнікі ***і, але, каб, што, бо***.

1. На небе з’явілася прасветліна, ... выглянула яркая адзінокая зорка. 2. Косціку здалося, ... ён чуе асцярожныя крокі. 3. Раніца была прыгожая, ... мароз не меў літасці. 4. Паездку мы вымушаны былі адкласці, ... надвор’е сапсавалася. 5. Карціну мы павесілі на такім месцы, ... яе можна было ўбачыць адразу.

?! Запішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя злучнікі.
Падкрэсліце ўстаўленыя злучнікі.

**174.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў ім складаныя сказы. Назавіце злучнікі ў складаных сказах.

Перад школай быў пустыр, летам на ім расла трава. Старэйшыя школьнікі рашылі пасадзіць на пустыры парк. Вяскоўцы прывезлі маладыя дрэўцы, і дзеці дружна ўзяліся за працу. Ім дапамагаў вясковы садоўнік. Ён асцярожна браў саджанцы і апускаў у ямку, а старшакласнікі абкладвалі торфам і палівалі. А вясной на пустыры зашумеў малады парк.

?! Спішыце тэкст. Не забывайцеся ставіць коску паміж часткамі складанага сказа. Падкрэсліце злучнікі.

**175.** Прачытайце сказы.

1. На ўсходзе неба святлее, і над гарызонтам паказваецца сонца. 2. Рэчка ачысцілася ад лёду, але паводка яшчэ не сышла. 3. Загуляў вецер, і льняное поле пачало пераліваецца блакітам. 4. Дружба сапраўдная пачынаецца тады, калі людзі добра ведаюць



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

адно аднаго. 5. Бадзёра спяваюць зяблікі і дразды, клапатліва мітусяцца розныя дробныя птушкі.

Спішыце сказы. Падкрэсліце коскі паміж часткамі складанага сказа. Які сказ адпавядае наступнай схеме?
*[ ], але [ ].*

**176.** Разгледзьце малюнкі. Складзіце простыя сказы з апорай на малюнкі.



а





і





але



Зрабіце з дапамогай злучнікаў з простых сказаў складаныя. Запішыце іх. Пастаўце коскі паміж часткамі складаных сказаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**177.** Прачытайце тэкст.

Дзеці прыйшлі на тое месца дзе ўчора працавалі касілкі. Яны пачалі разбіваць падвялую траву. Сонца пякло нясцерпна але работа паступова набліжалася да канца. Сонца стаяла яшчэ высока над гарызонтам а грабцы ўжо закончылі грабці сена. Неўзабаве цэлы абоз рушыў па ледзь прыкметнай, зарослай травой дарозе. *(Паводле Юрыя Збанацкага; пераклад з украінскай мовы)*

?! Спішыце тэкст, устаўляючы коскі паміж часткамі складаных сказаў.

**178.** Прачытайце простыя сказы. Зрабіце з іх складаныя.

1. Восенню дзеці пасадзілі дрэўцы ў школьным садзе. Вясной дрэўцы зацвілі.
2. Хмара насоўвалася з захаду. Хутка пайшоў дождж.
3. Каця пайшла ў бібліятэку. Патрэбнай кнігі не было.
4. Максіму было сумна гуляць аднаму. Камп'ютарная гульня была няпростая.

?! Запішыце сказы, пастаўце коскі паміж часткамі складанага сказа.

## *Урок 6. Аднародныя члены сказа*

**179.** Прачытайце верш. З колькіх сказаў ён складаецца? Ці з'яўляецца гэты сказ складаным?

**Нашы птушкі**

У нашым краі — Беларусі —
ёсць буслы, сарокі, гусі,
каршуны, сіваваронкі,



*Шчыгол*



*Каршун*



*Сіваваронка*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



*Слонка*



*Зяблік*



*Курапатка*

жаўранкі, шчыглы і слонкі,
шпакі, зяблікі, цяцеры,
курапаткі пер’ем шэры,
ластаўкі і верабейкі,
і сініцы, салавейкі...

*(Алесь Гурло)*

?! Назвы якіх птушак пералічваюцца ў вершы?
На якое пытанне адказваюць усе гэтыя словы? Да якога слова яны адносяцца?
З якой інтанацыяй вы чыталі верш?
Выпішыце назвы птушак у алфавітным парадку.

*Запомніце!*
У сказе могуць быць словы, якія выражаюць пералічэнне прадметаў, з’яў, дзеянняў, прымет. Такія словы (члены сказа) адказваюць на адно і тое ж пытанне, звязаны з адным і тым жа словам, вымаўляюцца з інтанацыяй пералічэння.
Яны называюцца **аднароднымі** членамі сказа.
***Вясной і ўвосень*** *тут нельга было прайсці* ***ні балотам, ні лесам****.* *(Іван Шамякін)*
Аднароднымі могуць быць і галоўныя, і даданыя члены сказа.

**180.** Прачытайце тэкст. Якая яго тэма?

## Галасы беларускіх лясоў

**Звіняць, заліваюцца** беларускія лясы птушынымі спевамі. На ўсю краіну гучаць іх галасы. А ўзначальваюць чароўную сімфонію салаўі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Дзесьці ў густых шатах дрэў кукуе зязюля. **Села** на галінку сініца і **пачала цінькаць.** Вухкае вялізная сава. Толькі чорны бусел **зашыўся** ў чашчобу і **маўчыць.** Гэтая таямнічая птушка не падае свайго голасу.

Можа, яна крыўдзіцца на каго? *(Паводле Уладзіміра Караткевіча)*

?! Пастаўце пытанні да выдзеленых слоў. Ці на адно і тое ж пытанне адказваюць выдзеленыя словы ў кожным сказе?
Якімі членамі сказа з'яўляюцца выдзеленыя словы?
Запішыце сказы з выдзеленымі словамі. Падкрэсліце выказнікі.

**181*.** Прачытайце сказы. Знайдзіце ў сказах аднародныя члены.

Колькі радасці ад птушак, калі яны вясной вяртаюцца з выраю! Каля хаты, у полі, у лесе чуваць іх ласкавы спеў. Ён не змаўкае ўсю вясну. Я люблю слухаць шпакоў, ластавак, жаўрукоў.

?! З якімі словамі звязаны аднародныя члены ў сказах?
Пастаўце пытанні да аднародных членаў.
Які знак стаіць паміж аднароднымі членамі сказа?
Выпішыце са сказаў словазлучэнні з аднароднымі членамі.

Узор. *Чуваць (дзе?) каля хаты, у полі, у лесе.*

**182.** Прачытайце незакончаныя сказы. Дапоўніце кожны з іх аднароднымі членамі.

У беларускіх лясах водзяцца ваўкі, ... .
На палях Беларусі вырошчваюць бульбу, ... .
Вялікія гарады Беларусі — Мінск, ... .

?! Запішыце сказы з аднароднымі членамі. Стаўце паміж аднароднымі членамі коскі.

*Запомніце!*
Паміж аднароднымі членамі сказа ставіцца коска, калі яны звязаны інтанацыяй пералічэння.
*На лузе расцвілі дзьмухаўцы, званочкі, валошкі.*

_____ _____ _____, _____, _____.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**183.** Прачытайце пытанні. Адкажыце на іх, выкарыстоўваючы аднародныя члены сказа.

Якія дрэвы растуць у садзе?
Людзі якіх прафесій працуюць у сельскай гаспадарцы?
Якую прадукцыю выпускаюць прадпрыемствы Беларусі?

Запішыце адказы на пытанні.

## *Урокі 7—8. Злучнікі паміж аднароднымі членамі і знакі прыпынку пры іх*

**184.** Прачытайце тэкст.

**Гарадскія вуліцы**

Гарадскія вуліцы розныя. Шырокія **і** прамыя, як страла. Вузкія **і** пакручастыя. Доўгія — праз увесь горад — **і** кароткія.

На шырокай **і** шумнай вуліцы шмат машын. Цяжка **і** небяспечна пераходзіць яе. Таму тут зроблены падземны пераход. *(Паводле Хведара Жычкі)*

Знайдзіце ў тэксце аднародныя члены сказа. Колькі аднародных членаў у кожным сказе?
Якое слова стаіць паміж імі? Ці стаіць паміж аднароднымі членамі коска?

*Запомніце!*
Паміж аднароднымі членамі сказа могуць стаяць злучнікі **і, а, ды, але, ці, або** і інш.
Калі злучнікі **і, ды** ўжыты ў сказе адзін раз, то коска паміж аднароднымі членамі не ставіцца. Не ставіцца коска і перад адзіночнымі злучнікамі **ці, або**.
*Каласіцца на палетку жыта* ***ды*** *пшаніца. (Кандрат Крапіва)*
*Ля кожнай маладой таполі яблынька* ***ці*** *вішня расцвіла. (Пімен Панчанка)*
Калі злучнік ***і*** паўтараецца перад аднароднымі членамі некалькі разоў, то коска паміж імі ставіцца.
***І*** *сэрцы,* ***і*** *воля,* ***і*** *думы народа злучыліся ў плыні адной. (Якуб Колас)*
Перад злучнікамі **а, але** коска ставіцца заўсёды.
*Час быў нялёгкі,* ***але*** *вясёлы. (Паводле Івана Шамякіна)*
*Не васількамі,* ***а*** *буйным калоссем, лета, нам сэрца кранi. (Кастусь Кірэенка)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**185.** Раскажыце, як патрэбна пераходзіць вуліцу, калі ёсць святлафор. Як пераходзіць вуліцу, калі святлафора няма? Якія яшчэ правілы дарожнага руху вы ведаеце?

**186.** Прачытайце верш. Знайдзіце ў першым сказе аднародныя члены. З дапамогай чаго яны злучаны?

Я жыву ў Беларусі,
дзе азёры і лясы.
Тут у нас гняздзяцца гусі
і гамоняць верасы.
*(Еўдакія Лось)*

?! Выпішыце з верша аднародныя члены сказа разам са злучнікам.

**187*.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў сказах аднародныя члены.

**На Сцюдзёнцы**

Сцюдзёнка не дужа шырокая рака але вельмі глыбокая. Сцюдзёнкай яе назвалі невыпадкова. Нават у самы спякотны дзень вада ў рацэ халодная ледзяная. Гэта таму, што бяжыць яна праз густы цёмны лес праз балоты. Тысячы крыніц і крынічак упадаюць у яе. У Сцюдзёнцы многа ракаў і ментузоў. Ёсць і плоткі і акуні і сомікі. *(Паводле Міколы Ваданосава)*



***мянту́з***

?! Растлумачце, у якіх выпадках паміж аднароднымі членамі патрэбна ставіць коскі, а ў якіх — не.
Спішыце тэкст. Стаўце, дзе трэба, коскі.
Падкрэсліце злучнікі паміж аднароднымі членамі.

**188.** Прачытайце тэкст. У якой частцы Беларусі цячэ Бярэзіна? Ці далёка яна ад той мясціны, дзе жывяце вы?

**Бярэзіна**

Бярэзіна — прыток Дняпра. Яна цячэ па беларускай зямлі. Рака сваёй вадой **забяспечвае фабрыкі** і **заводы, поіць** навакольныя



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

палі. Правы бераг ракі высокі, а левы бераг **нізкі, лугавы, балоцісты**. *(Паводле Віталя Вольскага)*

?! Спішыце тэкст. Падкрэсліце аднародныя члены сказа. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры аднародных членах.

**189.** Разгледзьце карту Беларусі. Назавіце рэкі, якія на ёй пазначаны. Якая з гэтых рэк працякае паблізу ад месца вашага жыхарства?




?! Складзіце і запішыце сказ з аднароднымі членамі — назвамі рэк Беларусі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**190.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце на карце рэкі, якія ўпамінаюцца ў тэксце. Якой ракі вы не знайшлі на карце?

### Куды нясуць свае воды беларускія рэкі?

Наша беларуская зямля, можна сказаць, сочыцца вадою. Па ўсёй тэрыторыі параскіданы блакітныя люстэркі малых і вялікіх азёр. Карта Беларусі пранізана сінімі жылкамі крыніц, ручаёў, рачулак і магутных рэк. Іх налічваецца некалькі тысяч.

Адны рэкі ўпадаюць у Чорнае мора, другія — у Балтыйскае. У Балтыйскае мора нясуць свае воды Нёман, Заходняя Дзвіна, Буг, Ловаць. У Чорнае — Дняпро, Бярэзіна, Сож, Прыпяць і мноства дробных рэчак. *(Паводле Уладзіміра Караткевіча)*

?! Растлумачце напісанне вялікіх літар у словах тэксту.
Назавіце ў сказах аднародныя члены.
Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.

**191*.** Прачытайце тэкст. Ці можна сказаць, што ён працягвае тэмы тэкстаў з папярэдніх практыкаванняў?

Усе рэкі Беларусі дужа прыгожыя. Дняпро з высокім правым **берагам** і неаглядным **далячынямі** зарэчных паплавоў, паплямаваных **дубамі** і сінімі **люстэркамі** старыц. Прыпяць з яе празрыстай цёмнай **вадой, астравамі, пратокамі** і **шапкамі** буслянак на прырэчных дрэвах. Ласкавы Нёман, у воды якога глядзяцца старажытныя **вежы** і густыя лістоўныя **пушчы**. *(Уладзімір Караткевіч)*

**Ста́рыца** — старое, перасохлае рэчышча.

?! Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку паміж выдзеленымі аднароднымі членамі.
Выпішыце з тэксту сказы з аднароднымі членамі.

**192.** Раскажыце, якая рэчка працякае паблізу ад вас.
Якая яна летам, а якая — зімой?
Ці любіце вы адпачываць на ёй? Што вы там робіце?
Выкарыстайце ў сваім расказе аднародныя члены сказа.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**193.** Прачытайце тэкст. Якая асноўная думка гэтага тэксту? Якія беларусы?

## Чым займаліся нашы продкі



*Тур*

Галоўным заняткам старажытных жыхароў Беларусі было земляробства. Яны сеялі жыта ячмень авёс грэчку лён і каноплі.

Продкі беларусаў былі людзі дружныя і працавітыя. Для пасеваў яны высякалі дрымучы лес а потым яго выпальвалі. Са свойскіх жывёл у нашых продкаў былі каровы козы авечкі свінні сабакі.

Нашы продкі былі выдатныя паляўнічыя. Яны палявалі на зубра тура мядзведзя лася вепра. Было вельмі развіта лясное пчалярства.

Мёд воск звярыныя шкуры старажытныя жыхары Беларусі не толькі спажывалі самі але і вывозілі ў іншыя краіны. *(Паводле Віталя Вольскага)*

**Тур** — першабытны дзікі бык, продак свойскай каровы.
**Вепр** — дзікі кабан, дзік.

У якіх сказах ёсць аднародныя члены? З дапамогай чаго яны злучаны? Дзе патрэбна паставіць коскі, а дзе — не?

Выпішыце з тэксту сказы з аднароднымі членамі. Пастаўце, дзе трэба, коскі.

Падкрэсліце злучнікі ***і, а, але***.

**194.** Прачытайце, устаўляючы прапушчаныя аднародныя члены.

## Наш сад

Сад пераліваецца ў пярэстых колерах. Вісяць ..., ..., ..., ... плады. Нібы сыпануў іх нехта шчодрай рукой і яны ... за галіны і ... на іх. Радуе вока гэты ..., ... ўраджай.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ад ранняй вясны мы даглядалі сад. Калі дрэвы зацвілі, здавалася, уся вёска ..., ... .

Словы для выбару: *багаты, шчодры; белыя, залатыя, ліловыя, ружовыя; зачапіліся, павіслі; прыбралася, памаладзела.*

?! Запішыце тэкст, устаўляючы аднародныя члены сказа.

## *Урок 9. Падагульненне па тэме «Сказ»*

**195.** Прачытайце. Дапоўніце кожны сказ аднароднымі членамі.

Цэлы дзень па праспекце імчацца тралейбусы, ..., ..., ... .
На заводах вырабляюць пральныя машыны, ..., ..., ... .
Ад сонца снег іскрыўся чырвонымі, ..., ..., ... агеньчыкамі.

?! Запішыце сказы, дапаўняючы іх аднароднымі членамі.

**196.** Прачытайце сказы.

Насоўваецца хмара. Цямнее неба. Заціх лес. Бліснула маланка. Лінуў дождж. Ён барабаніў.

?! Якія сказы вы прачыталі? Утварыце з неразвітых сказаў развітыя. Запішыце тэкст.
* Паспрабуйце з простых сказаў зрабіць складаныя.

**197.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго асноўную думку.

**Чалавечыя рукі**

Колькі цудоўных рэчаў зрабілі старанныя, умелыя, працавітыя рукі! Рукі людзей розных прафесій клапоцяцца пра хлеб, малако, масла, цукар. Чалавечыя рукі шыюць, будуюць, пішуць, лечаць.

Рукамі ствараюцца машыны, станкі, самалёты, касмічныя караблі.

Праца рук на карысць грамадства, радзімы робіць чалавека разумным, шчаслівым, дужым. *(Іван Паўлоўскі)*

?! Знайдзіце ў тэксце аднародныя члены сказа. Вызначце, з якімі словамі яны звязаны, на якія пытанні адказваюць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Выпішыце аднародныя члены і словы, да якіх яны адносяцца.

Узор. *Рукі (якія?) старанныя, ... .*

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

**1.** Зрабіце з простых неразвітых сказаў развітыя з дапамогай дадзеных членаў. Запішыце.

Сабака бег.
Цячэ рака.

**2.** Выпішыце складаны сказ.

Васіль пасля школы пайшоў да дзеда Арцёма. Дзед жыў адзін і Васіль часта дапамагаў яму дагледзець свойскую жывёлу.

Пастаўце коску паміж часткамі складанага сказа. Падкрэсліце злучнік паміж часткамі складанага сказа.

**3.** Дапоўніце сказы аднароднымі членамі.

Надвор'е стаяла ... і ... .
У гаспадарчым магазіне Фёдар купіў рыдлёўку ... ... ... .

Запішыце. Пастаўце, дзе трэба, коскі.

## # *Галоўныя і даданыя члены сказа*

**198.** Прачытайце сказ.

На перапынку вучні выбеглі на вуліцу.

?! Пра каго гаворыцца ў сказе? Што гаворыцца пра вучняў?
Калі вучні выбеглі? Куды яны выбеглі?
Якія словы ў сказе — галоўныя члены? Без якіх слоў не было б сказа?
Якія словы — даданыя члены сказа?
Запішыце сказ. Падкрэсліце слова *вучні* адной лініяй, слова *выбеглі* — дзвюма, астатнія словы — хвалістай лініяй.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**199.** Прачытайце сказы.

У акварыуме плаваюць залатыя рыбкі.
Маладзенькія лісточкі з’явіліся на дрэвах.

?! Якія словы ў сказах — галоўныя члены сказа, а якія — даданыя?
Спішыце сказы.
Падкрэсліце даданыя члены сказа хвалістай лініяй.

*Успомніце!*
У сказе ёсць галоўныя і даданыя члены.
Без галоўных членаў сказа не бывае, таму што не выказваецца ніякая думка. Галоўныя члены сказа — **дзейнік** і **выказнік**.
Усе астатнія члены сказа, калі яны ёсць, — даданыя. Сказ можа быць з даданымі членамі, а можа быць і без іх: *Лес напоўніўся вясновымі пахамі. Цвіце чаромха.*

**200.** Разгледзьце малюнкі. Складзіце па іх сказы.







?! Якія словы з’яўляюцца галоўнымі членамі ў кожным сказе, а якія — даданымі?
Пра каго гаворыцца ў першым сказе? Як называецца гэты член сказа?
Што гаворыцца пра дзяцей у першым сказе? Што яны робяць? Якім членам сказа з’яўляецца гэта слова?
Вызначце тое ж у другім і трэцім сказах.
Запішыце сказы. Падкрэсліце дзейнік адной лініяй, выказнік — дзвюма, астатнія словы — хвалістай лініяй.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**201.** Прачытайце сказы.

Недзе высока над галавою каркалі вароны. *(Алесь Якімовіч)*
Пад узгоркам блішчала круглае возера. *(Якуб Колас)*

?! На якое пытанне адказвае дзейнік у першым сказе?
На якое пытанне адказвае дзейнік у другім сказе?
Пастаўце пытанні да выказнікаў.
Спішыце сказы. У дужках запішыце пытанні, на якія адказваюць дзейнік і выказнік.

*Успомніце!*
**Дзейнік** абазначае, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе, і адказвае на пытанні **хто? што?**
**Выказнік** абазначае, што гаворыцца ў сказе пра дзейнік, і адказвае на пытанні **што робіць? што рабіў? што будзе рабіць? што робяць?** і інш.

**202.** Прачытайце сказы. Знайдзіце ў кожным з іх дзейнік і выказнік. Пастаўце да іх пытанні. Ці ёсць у гэтых сказах даданыя члены?

Птушкі будуюць.
Вучні ідуць.
Вера дапамагае.
Сонца свеціць.

?! Дапоўніце гэтыя сказы даданымі членамі.
Запішыце сказы, што атрымаліся.

**203.** Прачытайце сказы. Дапоўніце іх з дапамогай пытанняў даданымі членамі.

(К а л і ?) ... ападае (я к о е ?) ... лісце.
(К у д ы ?) ... адлятаюць (я к і я ?) ... птушкі.
Насякомыя хаваюцца (к у д ы ?) ... .

?! Запішыце сказы, што атрымаліся.
Падкрэсліце галоўныя і даданыя члены сказаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**204.** Прачытайце словы. З кожнага радка слоў складзіце сказ.

Цёплы, пачынаўся, ранак. З балота, туман, сплываў, лёгкі. Свяціла, яркае, сонца, з неба.

Запішыце сказы, што атрымаліся.
Знайдзіце ў кожным дзейнік і выказнік.

**205.** Прачытайце тэкст. На якую ён тэму? Якую назву яму можна даць?

Прыйшла восень. Жытнёвае поле ўжо апусцела. Людзі пачынаюць капаць бульбу. У гэты час птушкі адлятаюць у вырай. Далёка недзе ў небе даносіцца крык жураўлёў. Высока-высока ляцяць жураўлі. Яны кідаюць на зямлю развітальны крык. *(Паводле Якуба Коласа)*

Знайдзіце ў тэксце сказ, які складаецца толькі з галоўных членаў.
Запішыце назву, якую вы далі тэксту.
Напішыце тэкст пад дыктоўку.

**206.** Прачытайце тэкст. Якую назву яму можна даць?

У садзе па траўцы бегалі шпакі.

— Гэта наш сад! — кідаючыся на шпакоў, закрычаў верабейка.

— Наш, наш! — перадражніў шпак. — А мядзведак і земляных цвыркуноў тут паўнютка. Сад даглядаць трэба!

І ён доўгай дзюбай падчапіў і выцягнуў з норкі тоўстага чорнага цвыркуна. *(Вісарыён Гарбук)*

**Мядзве́дка, земляны́ цвырку́н** — насякомыя, якія жывуць у зямлі і шкодзяць сельскагаспадарчым раслінам.

Знайдзіце ў першым сказе дзейнік. На якое пытанне ён адказвае?
На якое пытанне адказвае выказнік?
Пастаўце пытанні да дададзеных членаў.
Запішыце першы сказ тэксту. Падкрэсліце ў ім галоўныя і дададзеныя члены.

**207.** Назавіце вядомых вам птушак.
Раскажыце, якую карысць прыносяць птушкі.
А якую шкоду могуць прыносіць птушкі?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**208.** Прачытайце верш. Разгледзьце малюнак. Ці вядомая вам гэта птушка?



Ля вадзіцы блізка
прабягае пліска.
Лёгенькія ножкі
не стаяць ні трошкі.

Цёмныя вочкі,
белыя шчочкі,
чорная галоўка,
шэрая ватоўка.

*(Паводле Станіслава Шушкевіча)*

?! Запішыце першы сказ верша ў радок.
Знайдзіце ў ім галоўныя і даданыя члены. Падкрэсліце іх.

**209.** Прачытайце пытальныя сказы. Які знак ставяць у канцы пытальных сказаў? Адкажыце на пытанні.

Хто гатуе дома снеданне?
Якое адзенне носяць зімой людзі?
Куды ходзяць людзі за пакупкамі?

?! Запішыце сказы — адказы на пытанні.
У кожным сказе знайдзіце галоўныя і даданыя члены.

**210.** Прачытайце выказнікі. Складзіце з імі сказы.

Рашаюць, пішуць, чытаюць, малююць.

?! Запішыце сказы, што атрымаліся.
Падкрэсліце ў іх дзейнікі, выказнікі, даданыя члены, калі яны ёсць.

**211.** Прачытайце тэкст.

**Памяць**

Паўлік ідзе праз поле. Палявая сцежка вядзе хлопчыка да школы. Здалёк відаць яе сцены з чырвонай цэглы і шырокія вокны.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Каля крайняга акна растуць дзве сасны. Гэтыя сосны пасадзілі двое сяброў. Яны загінулі на вайне.

Дрэвы, пасаджаныя іх рукамі, школьнікі даглядаюць і берагуць.

?! Колькі частак у тэксце?
Аб чым расказваецца ў першай частцы?
Якую назву можна даць гэтай частцы?
Аб чым расказваецца ў другой частцы? Якую назву можна даць ёй?
Прыдумайце назву трэцяй частцы.
Запішыце назву тэксту і план.
Перакажыце вусна тэкст спачатку па частках, а потым цалкам.

## # *Словазлучэнне*

**212.** Прачытайце сказ. З дапамогай стрэлачак вызначце, якія словы звязаны ў сказе па сэнсе.

якая? што?

Беластволая бярозка скінула лісце.

?! Спішыце сказ разам з усімі абазначэннямі.
Запішыце таксама наступныя спалучэнні слоў.

Бярозка (я к а я ?) беластволая, скінула (ш т о ?) лісце.

**213.** Прачытайце сказ. Паводле ўзору папярэдняга сказа і з дапамогай стрэлачак вызначце, якія словы звязаны па сэнсе.

У вырай адляцелі чорныя дразды.

На лясной палянцы расла медуніца.

?! Выпішыце са сказа спалучэнні слоў, звязаныя па сэнсе.
Запішыце ў дужках пытанне, на якое адказвае слова, да якога накіравана стрэлачка.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Запомніце!*
Словы ў сказе звязаны парамі па сэнсе.
Сувязь слоў устанаўліваецца па пытаннях ад аднаго слова да другога.
Два словы, звязаныя паміж сабой па сэнсе, называюцца **словазлучэннем**: *поўны месяц, павольна ўзыходзіў.*
Дзейнік і выказнік словазлучэннем не з’яўляюцца. Яны ўтвараюць сказ.
*Месяц узыходзіў.*

*які?* *як?* *дзе?*

*Поўны месяц павольна ўзыходзіў на небе.*

**214.** Прачытайце сказ. Знайдзіце ў ім галоўныя члены сказа.

(Калі?) Раніцай пайшоў (які?) вялікі дождж.

?! З якімі словамі звязаны па сэнсе словы *раніцай, вялікі*?
На якія пытанні адказваюць гэтыя словы?
Выпішыце са сказа словазлучэнні.

**215.** Прачытайце сказ.

(Як?) Высока (дзе?) ў небе зазвінела (якая?) вясёлая песня (каго?) жаваранка.

?! Знайдзіце ў сказе галоўныя і даданыя члены.
Колькі словазлучэнняў у сказе?
Выпішыце са сказа словазлучэнні. Спачатку пішыце слова, ад якога ставіцца пытанне, потым пытанне ў дужках, і нарэшце — слова, якое адказвае на пытанне.

**216.** Прачытайце словы і пытанні. Дадайце адпаведныя па сэнсе словы, каб атрымаліся словазлучэнні.

Ісці (адкуль?) ..., расказваць (пра што?) ..., сонца (якое?) ..., пытанне (якое?) ..., ехаць (на чым?) ... .

?! Запішыце словазлучэнні, што атрымаліся.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**217.** Прачытайце словы ў двух слупках. Складзіце з імі словазлучэнні.

| | |
|---|---|
| белыя | лету |
|ісці | казку |
| расказваць | па дарозе |
| радавацца | кветкі |
| цікавая | надвор’е |
| цёплае | кніга |

?! Пастаўце з дапамогай стрэлачак пытанні ад аднаго слова да другога паводле ўзору.

*якія?*

Узор. *Белыя кветкі.*

Запішыце словазлучэнні, што атрымаліся.

**218.** Прачытайце сказы. Знайдзіце ў іх словазлучэнні.

**Ярка свеціць сонейка. Дзяўчынка палівае кветкі. Вада пераліваецца вясёлкай.**

?! Колькі словазлучэнняў у кожным сказе?
Запішыце сказы. Пакажыце стрэлачкамі сувязь слоў у сказе.

**219.** Прачытайце словазлучэнні. Складзіце з іх сказы.

**ластаўкі (якія?) працавітыя, зрабілі (што?) гняздо, зрабілі (дзе?) пад страхой, пад страхой (чаго?) дома**

**выглядалі (адкуль? з чаго?) з гнязда, птушаняты (якія?) маленькія**

?! Запішыце сказы, што атрымаліся.
Пачынайце сказ з вялікай літары. У канцы стаўце кропку.

**220.** Прачытайце сказы.

**Крынічка бруіцца (дзе?) ў глыбіні (чаго?) лесу. (Чым?) Вянком абступілі (што?) яе бярозкі.** *(Міхась Шаванда)*

?! Выпішыце са сказаў словазлучэнні.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**221.** Разгледзьце малюнак. Прачытайце словазлучэнні. З дапамогай малюнка і словазлучэнняў складзіце невялікае апавяданне.



Словазлучэнні для выбару: *маленькае кацяня, злосны сабака, уцякае ад сабакі, узяў на рукі, адагнаў сабаку, прытулілася да хлопчыка, дрыжала ад страху.*

?! Якую назву вы дасце апавяданню?
Запішыце назву апавядання і некалькі сказаў, каб атрымаўся тэкст.

**222.** Прачытайце сказы, якія складаюцца толькі з галоўных членаў. У правым слупку прачытайце словазлучэнні. Пашырце сказы гэтымі словазлучэннямі.

| | |
|---|---|
| Лагчынка зарасла. | лагчынка невялічкая, зарасла ландышамі, зарасла густа |
| Птушачка праляцела. | птушачка маленькая, праляцела раптам, праляцела над галавой |

?! Запішыце сказы, што атрымаліся.
Пакажыце стрэлачкамі сувязь слоў у гэтых сказах.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**223.** Прачытайце тэкст. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў канцы сказаў. Як называюцца сказы з клічнікам на канцы?

### Венік і рыдлёўка

Аднойчы паспрачаліся венік і рыдлёўка. Хто з іх лепш працуе? Вырашылі правесці спаборніцтва. Рыдлёўка будзе капаць зямлю. **Венік старанна падмяце вуліцу.** Чыя праца будзе лепшай?

Венік добра зрабіў сваю работу. Сцяжынка ў садзе стала чыстай. Рыдлёўка таксама пастаралася. Яна выкапала я́му для пасадкі дрэўца.

Па чыстай дарожцы так прыемна хадзіць! На месцы ямы ўжо расце маладзенькі дубок. Людзі ўдзячныя за карысную працу. Ці трэба шукаць пераможцу?

?! Назавіце галоўныя і даданыя члены ў выдзеленым сказе.
Выпішыце з гэтага сказа словазлучэнні.
Прачытайце тэкст яшчэ раз.
Напішыце першы абзац тэксту пад дыктоўку.

**224.** Прачытайце верш. Знайдзіце ў ім галоўныя і даданыя члены. Пастаўце пытанні да даданых членаў сказа.

Залатое сонейка
выбегла на ганейкі.
І руплівая пчала
дзень працоўны пачала.
*(Алесь Пісьмянкоў)*

?! Выпішыце з верша словазлучэнні.

# СЛОВА

## *Урок 1. Значэнне слова*

**225.** Прачытайце тлумачэнні значэнняў вядомых вам слоў.

**Акно́** — праём у сцяне будынка для святла і паветра, а таксама рама са шклом, якая закрывае гэты праём.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Бяро́за** — лісцевае дрэва з белай карой.

**Бярэ́знік** — бярозавы лес.

**Каўбаса́** — прадукт харчавання з асаблівым чынам прыгатаванага фаршу ў абалонцы.

**Нядзе́ля** — сёмы дзень тыдня, агульны дзень адпачынку.

**Ро́гат** — гучны, нястрымны смех.

**Ры́жык** — ядомы грыб з рыжай шапачкай.

?! Спішыце тлумачэнні значэнняў 3—4 слоў (на выбар).

*Запомніце!*
Кожнае самастойнае слова нешта абазначае. Іначай кажучы, яно ма́е значэнне.

**226.** Прачытайце злева тлумачэнні значэнняў слоў. У правым слупку выберыце словы, якія адпавядаюць прыведзеным значэнням.

| | |
|---|---|
| Назва прадмета, адказвае на пытанне што?, абазначае нябеснае свяціла, якое ярка асвятляе і грэе зямлю. | свяціць<br>сонца<br>сонечны |
| Назва дзеяння, адказвае на пытанне што рабіць?, абазначае «рухацца, ступаючы нагамі». | ісці<br>плыць<br>хадзьба |
| Назва прыметы, адказвае на пытанне які?, абазначае яркі колер, блізкі да пунсовага, колер крыві. | чырвоны<br>чырвань<br>чырванец |

?! Спішыце тлумачэнні значэнняў слоў, дапішыце слова, якое тлумачыцца.

**227.** Прачытайце тлумачэнні значэнняў слоў. Назавіце словы, якія тлумачацца.

Шэры звярок, які хутка скача, мае маленькі хвост і доўгія вушы, — ... .

Невялікі жвавы звярок з доўгім пушыстым хвастом — ... .

Драпежная жывёла, падобная да сабакі, звычайна шэрай масці — ... .



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Жывёла-грызун, якая жыве ў лесе каля рэк і вадаёмаў і мае каштоўнае футра, — ... .

?! Спішыце тлумачэнні значэнняў слоў, дапішыце патрэбныя словы замест кропак.

**228.** Прачытайце, як тлумачацца значэнні слоў у загадках. Здагадайцеся, пра што ідзе гаворка.

Хоць шчуплая работніца,
дапамагчы ж — ахвотніца:
чарціць чарцёж ці план там нейкі
ніхто не можа без ... .
*(Нічыпар Парукаў)*



Дзве блакітных палавіны
ўмясцілі ўсе краіны.
Яны ў школе на сцяне.
Ведаеш ты іх ці не?
*(Уладзімір Мацвеенка)*



Адна нага на месцы стаіць,
другая — вакол першай бяжыць.
*(Уладзімір Мацвеенка)*



Можна ў ім рашаць, пісаць.
Вам я прызнаюся,
што ён можа расказаць
і як я вучуся.
*(Таццяна Шылько)*



Дом без вокан, без дзвярэй —
поўна ў доме тым людзей.
Там ляжаць браты радочкам —
на іх розныя сарочкі.
*(Нічыпар Парукаў)*



?! Спішыце дзве загадкі (на выбар). Запішыце адгадкі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**229.** Пагартайце вучэбны дапаможнік. Па ўмоўным абазначэнні (глядзіце старонку 2 вучэбнага дапаможніка) знайдзіце тлумачэнні сэнсу незнаёмых слоў.
Запішыце 5—6 слоў (на выбар) разам з тлумачэннямі іх значэнняў.

**230.** Прачытайце загадку. Адгадку знайдзіце ў першых літарах радкоў.

**Д**нём і ноччу ляжыць,
**А** вядзе любога.
**Р**озных знакаў не злічыць.
**О**х, як іх тут многа!
**Г**оры нават прабівае,
**А**дгадайце, хто такая?
*(Паводле Уладзіміра Мацвеенкі)*

Запішыце слова-адгадку. Паспрабуйце самі растлумачыць значэнне гэтага слова.

## *Урокі 2—3. Тлумачальны слоўнік*

**231.** Разгледзьце малюнак. Як называецца адлюстраваная на ім кніга? Ці бачылі вы такую кнігу? Ці ўмееце ёю карыстацца?

Значэнне слоў паясняецца ў «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы». Па іншых слоўніках можна праверыць напісанне слоў, перакласці слова з адной мовы на другую і гэтак далей.




Слоўнік — гэта даведачная кніга, дзе ўтрымліваюцца словы, размешчаныя ў пэўным парадку. У слоўніку тлумачыцца значэнне слоў, даецца розная інфармацыя пра іх, пераклад на іншую мову і г. д. Звычайна словы размешчаны ў слоўніку ў алфавітным парадку.

Тлумачэнні слоў вы таксама можаце знайсці ў інтэрнэце на сайце http://www.skarnik.by/tsbm.

**232.** Прачытайце словы. Паспрабуйце растлумачыць іх значэнні.

Небяспека, тлумачыць, пяшчотны, небасхіл, столь.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**233.** Прачытайце, як тлумачацца значэнні слоў з папярэдняга практыкавання ў «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы».

**Небяспе́ка** — стан, становішча, якое пагражае каму-небудзь, можа прычыніць няшчасце, зло, шкоду.

**Тлума́чыць** — даваць зразумець сэнс чаго-небудзь.

**Пяшчо́тны** — поўны ласкі, замілавання, які выяўляе ласку, любоў.

**Небасхі́л** — частка неба над лініяй гарызонту.

**Столь** — верхняе ўнутранае пакрыццё памяшкання, процілеглае падлозе.

?! Спішыце ў сшытак тлумачэнні трох слоў на выбар.

**234.** Прачытайце тлумачэнні значэнняў слоў, як яны даюцца ў «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы». Здагадайцеся, пра што ідзе гаворка.

Плоскі, адносна шырокі і нятоўсты кавалак дрэва, выпілаваны або высачаны з бервяна, — ... .




Прадмет мэблі ў выглядзе шырокай гарызантальнай дошкі на высокіх падпорках, ножках — ... .

Жылая сялянская пабудова з бярвення — ... .

Масіў зямлі, зарослы дрэвамі, — ... .

Збудаванне для пераходу або пераезду цераз раку, канал, чыгунку і іншае — ... .

Лісток паперы з запісам, кароценькае пісьмо — ... .

Ежа з мяснога фаршу ў выглядзе шарыкаў — ... .

?! Запішыце тлумачэнні слоў і назвы прадметаў, якія тлумачацца.

*Запомніце!*
Словы ў слоўніку размешчаны ў алфавітным парадку.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**235.** Папрацуйце з «Тлумачальным слоўнікам беларускай мовы». Знайдзіце ў слоўніку тлумачэнні значэнняў дадзеных слоў.

Кніга, сшытак, аловак, кракадзіл, крама, жыллё, дождж, дог.

Запішыце словы і тлумачэнні іх значэнняў.

**236.** Папрацуйце ў парах. Адзін называе слова, а другі шукае гэта слова і тлумачэнне яго значэння ў слоўніку. Потым удзельнікі мяняюцца ролямі.

**237.** Працягніце працу ў парах. Адзін апісвае добра вядомы прадмет, а другі спрабуе адгадаць, пра што ідзе гаворка. Потым удзельнікі мяняюцца ролямі.

Узор. *У ёй вучацца дзеці, працуюць настаўнікі. — Школа.*

**238.** Прачытайце загадкі. Адгадайце іх з дапамогай малюнкаў. Аднолькавыя словы-адгадкі па гучанні ці не? А па значэнні?

Першы возіць сена, дровы,
цягне плуг, бо ён здаровы.
І на ім алюрам, рыссю
вельмі хораша прамчышся.
А другі — зусім малеча,
скача ў травах і стракоча,
днём яго або пад вечар
можна ўбачыць, як захочаш.

Нараджаецца ў вадзе,
нам патрэбна ў ядзе.
Ёсць і ў музыцы таксама —
пяты гук музычнай гамы.

*(Міхась Пазнякоў)*










**Алю́р, рысь** — спосабы бегу каня.

Дайце пісьмовае тлумачэнне словам-адгадкам. Карыстайцеся тлумачальным слоўнікам.

Узор. *Конік — невялікі конь. Конік — ... .*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**239.** Прачытайце дзіцячы вершык. Якія словы ў ім гучаць аднолькава?

Гаварыў дзед Полі,
што Марынка ў полі.
Разам з маці поле
калгаснае поле.
*(Уладзімір Мацвеенка)*

?! Ці аднолькавыя значэнні ў слоў, аднолькавых па гучанні? Растлумачце значэнне кожнага з гэтых слоў.

**240.** Прачытайце тэкст. Што значыць быць гаспадаром свайго слова?

**Слова**

Словы мы чуем і вымаўляем, чытаем і пішам. Са словамі мы звяртаемся да чалавека з самымі дарагімі **скарбамі** сваёй душы.

Слова патрабуе выключнай сумленнасці ў абыходжанні з яго зместам і сутнасцю. У **добрасумленнага** чалавека слова не разыходзіцца са справай. Ён гаспадар свайму слову. Але вельмі небяспечна, калі прыгожыя **заклікі** не адпавядаюць уласным учынкам і паводзінам. *(Паводле Васіля Віткі)*

?! Прачытайце тэкст яшчэ раз. Раскажыце, што вы даведаліся з яго.
* Знайдзіце і запішыце тлумачэнні слоў *скарб, добрасумленны, заклік.*

**241.** Прачытайце пары сказаў. Выберыце са слоў у дужках тыя, якія падыходзяць па сэнсе.

Вакол будынка стаіць (плот, плыт). Па рацэ плыве (плот, плыт). Маці прыгатавала (сыты, сытны) сняданак. (Сыты, сытны) галоднаму не спагадае. Кветкі стаяць у (гліністым, гліняным) глечыку. Мы ідзём па (гліністым, гліняным) беразе.

?! Запішыце сказы, дапаўняючы іх патрэбнымі па сэнсе словамі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урокі 4—5. Сінонімы*

**242.** Прачытайце словы.

1. Сумны, маркотны. 2. Пагорак, узгорак. 3. Моцны, дужы. 4. Есці, карміцца.

?! Ці падобныя па значэнні словы кожнай пары? Спішыце пары блізкіх па значэнні слоў.

> *Запомніце!*
> Словы, якія гучаць па-рознаму, але маюць аднолькавае або вельмі блізкае значэнне, называюцца **сінонімамі**: *ступаць, крочыць, плесціся, ісці, брысці.*

**243.** Прачытайце словы.

Ісці, хопіць, вугал, дарога.

Словы для выбару: *досыць, хадзіць, шлях, куток.*

?! Якія словы блізкія па значэнні да пададзеных?
Запішыце пададзеныя словы і падбярыце да іх сінонімы.

**244.** Прачытайце словы.

Весела, малы, брудны, сумны.
Радасна, неахайны, невялікі, пануры.

?! Падбярыце да кожнага слова з першага радка сінонім з другога радка. Запішыце словы парамі.
Складзіце сказ з любой парай сінонімаў. Запішыце яго.

**245.** Пагуляйце ў парах у гульню «Скажы інакш». Адзін называе слова, другі падбірае да яго сінонім. Потым мяняйцеся ролямі.

Адзенне, таварыш, дом, мяцеліца, гарачы, работа, шмат, крычаць, напалохаць, цяжкі, марудны, кепска, лес.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**246.** Прачытайце сказы. Знайдзіце ў іх сінонімы.

1. Фантастычнай і дзівоснай здавалася тая ноч. 2. Спачатку загігікаў Васіль, потым засмяяліся старыя. Хутка ўсе пачалі рагатаць. 3. Роўна сцелюцца сняжынкі ў полі, круцяцца, кружацца ціха, павольна. 4. Ад шуму, гвалту, ляманту затрэслася паветра, магутная пушча разгайдалася, расшумелася. 5. Белыя, чырвоныя, зялёныя агні ззяюць на стрэлках, зіхацяць на семафорах, мігцяць на далёкай лініі.

?! Спішыце. Падкрэсліце сінонімы.

**247.** Прачытайце сказы вядомых беларускіх пісьменнікаў. Знайдзіце ў іх сінонімы.

У прамежках між хатамі, дзе не свецяць вокны, цемень, як дзёгаць. *(Іван Навуменка)*

Чарната — не відаць нічога за пяць крокаў. *(Барыс Сачанка)*

Пройдзе ночка, згіне цьма. *(Якуб Колас)*

Вакол панавала цемрадзь, і сцежкі зусім не было відаць. *(Міхась Лынькоў)*

?! Выпішыце словы-сінонімы. Якія яшчэ сінонімы можна падабраць да гэтых слоў?

**248.** Назавіце сітуацыі, калі людзі размаўляюць, калі шэпчуць, калі балбочуць. Якія яшчэ сінонімы да слова *гаварыць* вы ведаеце? Разыграйце некалькі маўленчых сітуацый. Можна выкарыстаць наступныя малюнкі.







Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**249.** Прачытайце прыказку. Знайдзіце ў ёй словы-сінонімы.

Заўсёды зыч іншаму таго, чаго сабе жадаеш.

Спішыце прыказку. Падкрэсліце ў ёй блізкія па значэнні словы. Ці ведаеце вы іншыя сінонімы гэтых слоў?

**250.** Прачытайце тэкст, у якім выкладзены правілы маўленчых паводзін.

Перш чым сказаць — падумай.

Калі гаворыш, не спяшайся, старайся дакладна выказаць думку, каб субяседнік зразумеў цябе.

Калі слухаеш, будзь уважлівы, не перапыняй таго, хто гаворыць.

Суразмоўцы павінны быць ветлівымі адзін да аднаго, вытрыманымі, паважаць чужую думку. *(Паводле Міколы Яленскага)*

Знайдзіце ў тэксце словы-сінонімы.
Выпішыце словы-сінонімы з тэксту.

Раскажыце, як вы паводзіце сябе ў час размовы.

**251.** Прачытайце сказы.

1. На вуліцы сёння **мароз**. 2. З ранку да вечара **ідзе** дождж. 3. Па небе хмары **няспешна** бягуць. 4. Уночы **неспадзявана** пайшоў снег. 5. Шчаня было вельмі **баязлівае**. 6. За справу ўзяліся **супольна**. 7. На плошчы людзей сабралася **нямала**.

Выдзеленыя словы замяніце сінонімамі.
Запішыце сказы, што атрымаліся.

**252.** Прачытайце верш. Што азначае слова *талака*?

**Талака**

У мурашоў **занятак** свой,
яны **працуюць талакой:**
то **домік** свой **падправяць,**
то **ежы назбіраюць.**



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Але ці **бачыў** хто калі,
каб **спрэчку** мурашы вялі?
*(Кастусь Жук)*

**Талака́** — калектыўная дапамога пры выкананні якіх-небудзь работ.

?! Падбярыце да выдзеленых слоў сінонімы. Запішыце словы парамі.

## *Урокі 6—7. Антонімы*

**253.** Прачытайце пары слоў. Якія гэтыя словы па значэнні: блізкія ці процілеглыя?

Дзень — ноч, весела — сумна, зверху — знізу, ідзе — стаіць.

*Запомніце!*
Пары слоў, якія маюць супрацьлеглае значэнне, называюцца **антонімамі**: *вялікі — малы, вечар — раніца.*

**254.** Прачытайце словы. Падбярыце да іх антонімы.

Горкі, блізкі, дужы, гарачы, жыццё, браць, брудны, ісці, апрануцца, соль, жанчына, пуста.

?! Запішыце парамі словы з антонімамі.

**255.** Прачытайце прыказкі. Знайдзіце ў іх словы з супрацьлеглым значэннем — антонімы.

Хто ў маладосці працуе, той на старасці не шкадуе.
Добрая слава людзей збірае, а дрэнная — разганяе.
Благі абразіць, а добры разважыць ды яшчэ і парадзіць.
Хто ўмее любіць радзіму, той умее ненавідзець ворага.

**Абра́зіць** — пакрыўдзіць, надта прынізіць.
**Разва́жыць** — *тут*: супакоіць, палепшыць настрой.

?! Спішыце прыказкі. Падкрэсліце антонімы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**256.** Прачытайце незакончаныя прыказкі. Закончыце іх антонімамі да выдзеленых слоў.

Лёгка **пасварыцца**, цяжэй … .
**Лёгка** зламаць, ды … зрабіць.
Не хваліся **пачаткам**, а хваліся … .

?! Спішыце прыказкі. Дапоўніце іх патрэбнымі словамі.

**257.** Пагуляйце з суседам па парце ў гульню «Падбяры антонім». Адзін чытае слова, другі называе супрацьлеглае па значэнні. Потым памяняйцеся ролямі.

Дзень, раніца, вайна, зіма, кісла, дорага, глыбока, цяжка, мокра, гаварыць, заснуў, бяжыць, шырокі, купіць, белы.

**258.** Прачытайце спалучэнні слоў (словазлучэнні). Да выдзеленых слоў падбярыце антонімы.

**Салодкі** яблык, **сухі** бераг, **шырокая** дарога, **белы** хлеб, **хворы** чалавек, **праўдзівая** гісторыя, **добра** ведаць, **многа** зрабіць.

?! Запішыце словазлучэнні парамі паводле ўзору.

У з о р. *Салодкі яблык — кіслы яблык, … .*

**259.** Прачытайце дзве пары загадак. Адгадайце іх. Якімі словамі з'яўляюцца адгадкі кожнай пары загадак?

Вабіць нас яно заўжды
ягадамі, жытам,
звонкай свежасцю вады,
сонечным блакітам.

алте

А яна палоніць сном
луг, і сад, і поле,
пакрывае рэчку льдом,
снегам — наваколле.

азмі



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Брат, празрысты, светлы,
працаваць нас кліча.
Запрашае ветла
спаць сястра-чарніца.
Ім абодвум, верце,
не па іхняй волі
разам не сустрэцца,
не пабыць ніколі.

*(Паводле Міхася Пазнякова)*



Складзіце сказы са словамі-адгадкамі. Запішыце сказы. Падкрэсліце ў іх антонімы.

**260.** Прачытайце сказы.

1. Дарога спусцілася ў лагчыну, паднялася на пагорак. 2. Учора не дагоніш, ад заўтра не ўцячэш. 3. А наша жыццё са святла і змроку. 4. Сняжынкі то ўзнімаюцца ў паветра, то апускаюцца на зямлю. 5. Калі малое дрэва кідае цень на вялікае, вялікае дрэва таго проста не заўважае.

***учо́ра***

Знайдзіце ў сказах антонімы.
Спішыце сказы, падкрэсліце антонімы.

**261.** Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.

Левая рука не ведае, што робіць правая.
Блізка відаць, ды далёка дыбаць.
За што купіў, за тое і прадаю.
Аднаму густа, а другому пуста.
Далей паложыш — бліжэй возьмеш.

**Ды́баць** — ісці размерана і важна або нязграбна.

Выпішыце словы-антонімы парамі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**262.** Прачытайце тэкст. Пра якую ён пару года?

**Восень** лічыцца **сумнай** парой. **Гаснуць** у гэты час яркія фарбы на лугах і палях. **Змаўкае** лес. Птушкі **адлятаюць. Хмурнее** неба. Уся прырода **замірае. Цішай** напоўнена зямля. Сонца быццам **слабее**, робіцца **нядужым.** Ёсць асаблівае хараство ў **асенніх** фарбах.

Словы для выбару: *вясна, радаснай, загараюцца, гамоніць, прылятаюць, яснее, ажывае, гулам, мацнее, дужым, вясенніх.*

?! Замяніце выдзеленыя словы на антонімы.
Пра якую пару года атрымаўся тэкст?
Запішыце, замяняючы выдзеленыя словы антонімамі. Дзе трэба, змяняйце формы слоў.

**263.** Прачытайце сказы з твораў вядомых беларускіх пісьменнікаў.

Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі, больш з табою ўжо ніколі я не разлучуся. *(Янка Купала)*

Усходзілі, заходзілі свяцілы, буялі травы, замеці мялі́, а мне тугія мроіліся крылы, што нас цяпер над светам паднялі. *(Сяргей Грахоўскі)*

Здаваліся хвілі гадамі — сны чаргаваліся з явай, а ява са снамі.
*(Аркадзь Куляшоў)*

**Буя́ць** — бурна расці.
**За́мець** — завіруха, мяцеліца або снег, які вецер пераганяе па зямлі.
**Мро́іцца** — уяўляцца ў думках, здавацца.
**Хві́ля** — хвіліна, мінута, імгненне.
**Я́ва** — тое, што сапраўды існуе або існавала; рэальнасць, рэчаіснасць, а не сон ці мара.

?! Знайдзіце ў кожным сказе словы-антонімы. Выпішыце іх.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**264.** Прачытайце сказ, падбіраючы па сэнсе антонімы да прыметнікаў і ўстаўляючы іх замест прапушчаных слоў.

Ёсць людзі добрыя і ..., мужныя і ..., вясёлыя і ..., здаровыя і ..., старыя і ..., аптымістычныя і ..., моцныя і ..., актыўныя і ... .

**Аптымісты́чны** — жыццярадасны.
**Песімісты́чны** — які бачыць толькі адмоўнае.
**Акты́ўны** — дзейсны, энергічны.
**Пасі́ўны** — неактыўны, неэнергічны; абыякавы да ўсяго.

Запішыце сказ, устаўляючы патрэбныя антонімы.

# РОДНАСНЫЯ СЛОВЫ

## *Урокі 1—2. Роднасныя словы*

**265.** Прачытайце рады слоў. Якое слова ў кожным радзе з'яўляецца лішнім?

Асіна, падасінавік, сіняк, асінавы.
Акно, падаконнік, аканіцы, акунь.
Снег, снегавік, негаваркі, сняжок, падснежнік, снежны.

Запішыце рады роднасных слоў. Абазначце ў іх корань.

> *Успомніце!*
> Словы, якія маюць агульную частку і звязаны паміж сабою па сэнсе, называюцца **аднакаранёвымі** ці **роднаснымі**: *сябар, сябраваць, сяброўскі.*

**266.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў ім роднасныя словы.

Аб чым спяваў жаваранак, снуючыся высока ў паветры над лесам? Маладая хвойка была ўся захоплена гэтай песняй. Ёй хацелася ўбачыць самога песняра. Яна падымала сваю галоўку так, што



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

шапачка яе скінулася і зялёныя іголачкі разышліся, пачалі раскрывацца, як бы смяяліся, пачуўшы такую прыгожую песню.

*(Якуб Колас)*

?! Выпішыце роднасныя словы. Абазначце ў іх корань.

**267.** Прачытайце словы. Што яны абазначаюць?

кот — кацяня
гусь — гусяня
карова — цяля
каза — казляня
курыца — кураня
качка — качаня
конь — жарабя
свіння — парася

?! Якія з гэтых пар слоў з'яўляюцца роднаснымі? Запішыце аднакаранёвыя словы. Абазначце ў іх корань.
Якія літары чаргуюцца ў корані слоў *кот — кацяня*?

**268.** Пагуляйцеся па парах. Адзін вучань называе дзікую жывёлу, а другі — яе дзіцяня. Мяняйцеся ролямі. Запішыце тыя пары слоў, якія з'яўляюцца аднакаранёвымі.
Паспаборнічайце ў класе: якая пара вучняў успомніць і запіша больш аднакаранёвых слоў — назваў дзікіх жывёл і іх дзіцянят.

**269.** Прачытайце тэкст. Якое значэнне мае вада на зямлі?

Калі едзеш па Маскоўскай шашы, за Крупкамі, ля рэчкі Бобр, міжволі звяртаеш увагу на ўказальнік. Ён паведамляе, што непадалёку ад магістралі ёсць крынічная вада.

З крыніц пачынаюцца рэкі, яны даюць жыццё блакітным азёрам. Крыніцы ўпрыгожваюць наш край. На іх радуюцца, з іх п'юць гаючую ваду не толькі людзі. Вакол лугавой крынічкі лепш як дзе буяюць травы, цвітуць дзьмухаўцы і медуніцы. Ля іх званчэй цвыркаюць конікі і спяваюць птушкі. А на пясчаных сцяжынках,



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

што вядуць да лясных і пералескавых крыніц і ручайкоў, можна ўбачыць сляды казуль і аленяў. Усё жывое цягнецца да вады — асновы асноў жыцця на зямлі. Яна ж захоўвае і наша галоўнае багацце — зямлю. *(Паводле Віктара Шымука)*

Знайдзіце аднакаранёвыя словы. Выпішыце іх. Абазначце карані. Падкрэсліце ў каранях літары, якія змяніліся.
Прачытайце тэкст яшчэ раз. Перакажыце яго.

**270.** Прачытайце тэкст. Якую назву яму можна даць?

На ўзгорку пасяліліся барсукі. Ціхае гарыстае месца ім вельмі спадабалася. Кожнай вясной тут з'яўляліся свежыя норы. І празвалі гэтую горку Барсуковай гарой. Сонейка прагравала барсучыныя норы. Добра жылося тут звярам.

Знайдзіце ў тэксце роднасныя словы.
Спішыце тэкст. Абазначце карані ў роднасных словах.

**271.** Прачытайце аднакаранёвыя словы. Вызначце, да якіх часцін мовы яны адносяцца.

Святло, свяціць, светлы.
Дарыць, падарунак, падарункавы.
Добры, падабрэць, дабрыня.

Знайдзіце карані ў кожнай групе аднакаранёвых слоў. Запішыце гэтыя словы. Абазначце ў іх карані.

**272.** Прачытайце словы, якія адносяцца да розных часцін мовы. Падбярыце да іх аднакаранёвыя словы з іншых часцін мовы.

| Назоўнік | Прыметнік | Дзеяслоў |
|---|---|---|
| сябар | ... | ... |
| ... | вясёлы | ... |
| ... | ... | смяяцца |

Запішыце групы аднакаранёвых слоў. Абазначце корань.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**273.** Папрацуйце ў парах. Паводле ўзору з папярэдняга практыкавання да слова адной часціны мовы прыдумвайце аднакаранёвыя словы, якія адносяцца да іншых часцін мовы.

**274.** Прачытайце рады аднакаранёвых слоў. Назавіце ў іх карані.

Каса — касіць, касьба, касавіца, касец, пракос, касілка.
Дарога — дарожны, дарожка, падарожжа.
Нага — падножка, падножжа.
Вучыць — вучань, вывучыць, вучоны, навучыць, вучоба.

?! З дапамогай якіх частак слова ўтварыліся роднасныя словы? Запішыце рады роднасных слоў. Абазначце ў іх карані, суфіксы, прыстаўкі. Падкрэсліце ў каранях літары, якія чаргуюцца.

**275.** Прачытайце словы.

Сасна, лыжы, цукар, агарод, рабіна.

?! Да дадзеных слоў падбярыце аднакаранёвыя назоўнікі і прыметнікі. Запішыце і абазначце ў іх корань.

## *Урокі 3—4. Формы слова і роднасныя словы*

**276.** Прачытайце тэкст. Якую назву яму можна даць?

За вёскай працякае **рака**. Каля **ракі** растуць вербы. Праз **раку** пралягае мост. За **ракой** раскінуўся шырокі луг. Па **рацэ** плывуць лодкі. *(Іван Паўлоўскі)*

?! Ці з'яўляюцца роднаснымі выдзеленыя словы?
Якой часткай яны адрозніваюцца?
Спішыце тэкст разам з назвай, якую вы яму далі.
Абазначце ў выдзеленых словах канчаткі.

*Успомніце!*
Словы *рака, ракі, раку, ракой, па рацэ* з'яўляюцца **формамі аднаго слова**, а не роднаснымі словамі. Яны маюць аднолькавае значэнне і адрозніваюцца толькі канчаткамі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**277.** Разгледзьце схему. Раскажыце з яе дапамогай, чым адрозніваюцца формы слова і аднакаранёвыя словы.

| Аднакаранёвыя словы | Формы слова |
| --- | --- |
| корань + прыстаўка + суфікс | корань + канчатак |
| сад □ — пасадк[а] | сад □ — сад[ы], сад[ам], у садз[е] |

**278.** Прачытайце групы слоў.

Лес□, пралеск[а], ляснік□, лесавік□, узлесак□, узлесс[е].

Лес□, ляс[ы], лес[у], лес[ам], аб лес[е].

?! Якая група слоў з'яўляецца аднакаранёвымі словамі, а якая — формамі аднаго слова?

**279.** Прачытайце словы.

Горад, рыба, зіма.

?! Падбярыце аднакаранёвыя словы да дадзеных слоў, запішыце іх. Абазначце часткі слоў.

Змяніце словы, каб атрымаліся розныя іх формы. Запішыце словы, што атрымаліся. Абазначце канчаткі.

**280.** Прачытайце тэкст. Пра што вы з яго даведаліся?



Ты думаеш, што **кнігі** былі заўсёды? А між тым быў час, калі ні **кніг**, ні паперы не было.

На чым толькі не пісалі тады людзі! На лістах дрэў, на бярозавай кары, на гліняных таблічках.

Пазней пачалі пісаць на скурах маленькіх цялят, ягнят, казлянят. На тоўстую **кнігу** ішло каля двухсот скур.

Таму даўней **кніга** была вельмі дарагая. *(Паводле Анатоля Клышкі)*

?! Чым з'яўляюцца выдзеленыя словы: роднаснымі словамі ці формамі слова? Чаму?

Выпішыце выдзеленыя словы. Абазначце іх часткі.

Прачытайце тэкст яшчэ раз. Перакажыце яго.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**281.** Прачытайце скорагаворкі.

Прычапі, Пракоп, прычэп да трактара.
У бары баравікі бяры.

?! Знайдзіце ў скорагаворках словы з аднолькавымі каранямі. Гэта роднасныя словы ці формы аднаго слова? Чаму?
Запішыце скорагаворкі. Абазначце часткі роднасных слоў.

**282.** Прачытайце верш.

**Бульба**

Ад палеткаў, ад загонаў
ранняй восенню штодзень
і ў трохтонках, і ў вагонах
едзе бульба да людзей.
Кожны з нас
да бульбы ласы,
без яе ўсё не ўсмак.
Бульбу вараць,
бульбу смажаць,
бульба — хлеб другі здаўна!

*(Мікола Чарняўскі)*

?! Знайдзіце ў тэксце верша слова, якое ўжываецца ў розных формах.
Выпішыце гэтае слова і яго формы, абазначце канчаткі.

**283.** Прачытайце тэкст. Прыдумайце яму назву.

На Беларусі жыве два віды зайцоў: бяляк і русак. Бяляк атрымаў сваю назву ад белага футра, якое апранае зімой, а русак увесь год у шэранькім ходзіць. Жывуць яны па-рознаму. Палі, пералескі, узлескі — уладанні русака, бяляк — жыхар лясоў. Зайцы вядуць начны спосаб жыцця, а днём адпачываюць.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У сакавіку ў зайца-русака з'яўляюцца зайчаняты. Накарміўшы зайчанят, маці ўцякае, пакідае дзіцянят на волю лёсу. Беспрытульныя зайчаняты разбягаюцца, затойваюцца сярод купін. Потым ідуць на пошукі маці праз суткі-двое. Кожная маці-зайчыха, натрапіўшы на зайчаня, накорміць яго.



Але чаму зайчыха пакідае сваіх дзяцей, не абагравае іх? Справа ў тым, што ў нованароджаных зайчанят адсутнічаюць спецыяльныя залозкі на падушачках лапак, таму сляды іх не маюць паху. Ліса ці іншы драпежнік пройдзе каля зайчаняці і не заўважыць яго. А калі б маці-зайчыха часта наведвалася да дзіцянят, яна б немінуча прывяла да зайчанят любога драпежніка. Вось і выходзіць, што зайчыха — не такая і дрэнная маці, хоць корміць сваіх або чужых зайчанят адзін раз у двое сутак. *(Паводле Аляксандра Курскова)*

?! Знайдзіце ў тэксце словы, роднасныя слову *заяц*. А якія словы з'яўляюцца формамі гэтага слова?

Знайдзіце ў першым абзацы тэксту яшчэ тры групы роднасных слоў. Выпішыце іх. Абазначце карані. Да якіх часцін мовы адносяцца гэтыя словы?

**284.** Уважліва прачытайце яшчэ раз тэкст з папярэдняга практыкавання. Ці можна даць яму назву «Зайцы»?

Колькі частак вылучана ў тэксце? Пра што расказваецца ў першай частцы? А ў другой? У трэцяй?

Прыдумайце назвы да кожнай часткі. Складзіце план тэксту. Запішыце назву і план.

Прачытайце тэкст. Закрыйце кнігі. Вусна перакажыце тэкст па плане.

**285.** Прачытайце тэкст. Якую назву яму можна даць?

Расла на палянцы каліна. Зацвіла каліна белым цветам і закрасавалася на здзіўленне бярозцы і асінцы. Дрэвы зайздросцілі пахучай каліне. А палянцы было прыемна, што ўсе паглядалі на



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

прыгожую каліну. Пышным цвіценнем каліны зацікавіліся руплівыя пчолкі. Яны цэлы дзень кружыліся і дзынкалі над яе бялюткімі кветачкамі.

Выпішыце формы слова *каліна*. Абазначце ў іх корань і канчаткі.
Да слоў *бярозка, пчолкі, асінка* падбярыце роднасныя. Запішыце іх, абазначце часткі слоў.

**286.** Да слова *шум* дапішыце розныя канчаткі.
Ад слова *шум* утварыце новыя словы з дапамогай прыставак і суфіксаў.
Запішыце формы слова *шум* і аднакаранёвыя да яго словы.
Абазначце часткі слоў.

## *Урокі 5—6. Прыстаўкі і прыназоўнікі*

**287.** Прачытайце словы з прыстаўкамі.

Адбегчы, узгорак, накрыць, надпіс, абрэзаць.

Як запісаны словы з прыстаўкамі — асобна ці разам? Прыстаўка — гэта частка слова ці асобнае слова? Запішыце словы з прыстаўкамі. Абазначце ў кожным слове прыстаўку знакам ¬ .

*Запомніце!*
Прыстаўкі патрэбна пісаць разам (злітна), бо гэта — частка слова: ***аб-, ад-, пад-, перад-, над-, уз-, без-, бяз-, раз-, рас-, бес-, бяс-, с-, з-, на-, за-, са-, вы-, пры-, да-, пера-***: *аббегчы, прыехаць.*

**288.** Прачытайце словы. Якая частка слова знаходзіцца ў дужках?

(Пад)пісаць дакумент, (ад)несці ў бібліятэку, (пры)думаць план, (ад)кусіць яблык, (рас)пілаваць дошку, (пад)месці падлогу, (па)ліць расліны.

Запішыце словазлучэнні, раскрываючы дужкі. Абазначце прыстаўкі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**289.** Прачытайце словазлучэнні. Да якой часціны мовы адносяцца выдзеленыя словы? Як запісаны выдзеленыя словы з наступным словам — разам ці асобна?

Зайсці ў клас, пасвіцца **на** лужку, гуляць з сябрам, адказваць **каля** дошкі, стаяць **перад** домам, думаць **пра** свята.

?! Спішыце словазлучэнні. Падкрэсліце прыназоўнікі.

*Запомніце!*
Прыназоўнікі пішуцца асобна, бо гэта іншае слова: **ад, у, на, з, пад, над, перад, пра, каля, да, паміж, па, пры, аб, без**.
Паміж прыназоўнікам і наступным словам можна ўставіць і іншае слова: ***у** лесе — **у** густым лесе.*
Прыназоўнікі трэба адрозніваць ад прыставак.

**290.** Прачытайце сказы. Знайдзіце ў іх словы з прыстаўкамі і прыназоўнікі.

Лодка адплыла ад берага.
Радасны Алесь падскочыў амаль пад столь.

?! Спішыце сказы. Абазначце прыстаўкі, падкрэсліце такія ж прыназоўнікі.

**291.** Прачытайце словазлучэнні. Вызначце, дзе ў іх прыстаўкі, а дзе прыназоўнікі.

(Ад)бегчы (ад)дома, (за)чыніць (за)сабой дзверы, (па)крочыць (па)дарозе, (у)зірацца (ў)фотаздымак, (на)пісаць (на)паперы.

?! Спішыце словазлучэнні, апускаючы дужкі. Абазначце прыстаўкі, падкрэсліце прыназоўнікі.

**292.** Прачытайце сказы, узятыя з твораў беларускіх пісьменнікаў.

Усе (ад)каціліся (ад)самалёта хуценька і досыць далёка. *(Мікола Гіль)*

Даволі моцна (пад)пякала сонца, і асабліва (ад)чувалася гэта (ў)горадзе. *(Андрэй Федарэнка)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ганя (з)Толікам (бяс)конца могуць слухаць (пра)дзедавы медалі. *(Ядвіга Бяганская)*

Бабуля дастала торбачку, (раз)вязала шнурочак. *(Алесь Якімовіч)*

?! Вызначце, дзе ў дужках прыстаўкі, а дзе прыназоўнікі. Спішыце сказы, раскрываючы дужкі.

**293.** Прачытайце тэкст. Вызначце, дзе ў дужках прыназоўнікі, а дзе прыстаўкі.

(Пад)елачкай (за)шамацела сухое лісце. (Па)казалася рыжая лясная мышка. Яна спрытна (пад)нялася (па)высокай траве і (з)нікла (ў)гняздзе. Яна (па)будавала яго высока (над)зямлёй.

*(Паводле Рыгора Ігнаценкі)*

?! Спішыце тэкст, апускаючы дужкі. Прыстаўкі пішыце разам, а прыназоўнікі — асобна ад наступнага слова.

**294.** Прачытайце верш. Якой парой года паэт выказвае зачараванне?

Мне мілей (за)ўсё
(пры)волле:
лес, лужок,
рачулка, поле...

(На)глядзецца
(на)ўсё гэта,
як відаць,
не хопіць лета.

*(Павел Сушко)*

?! Скажыце, дзе стаіць прыназоўнік, а дзе прыстаўка. Выпішыце словы з прыстаўкамі і прыназоўнікі з наступнымі словамі.

**295.** Прачытайце тэкст.

Надвор'е ўвосень няўстойлівае. Ноччу бываюць (за)маразкі. Удзень (за)хмарамі сонейка не ўбачыш, імжыць дождж. А часам тэрмометр пакажа больш (за)дваццаць градусаў цяпла. Усё часцей (на)свістваюць вятры свае сумныя песні. (Па)жоўклі бярозы і асіны. (Па)галінках клёнаў нібы агеньчык (пра)скочыў. Раскazвае той агеньчык (пра)канец лета.

?! Спішыце тэкст, апускаючы дужкі. Прыстаўкі пішыце разам, а прыназоўнікі — асобна ад наступнага слова.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**296.** Прачытайце словы.

(Пры)сонейку, (за)гараць, (да)бабулі, (у)выхадны, (з)унукам, (пра)дзед, (за)лесам, (уз)лесак, (над)тачыць, (пры)ляцелі, (па)чынаюць, (пад)носяць, (на)рацэ, (ад)пачываюць, (у)вадзе.

?! Запішыце словы ў два слупкі. У першы — словы з прыстаўкамі, у другі — з прыназоўнікамі.
Складзіце сказ з адным са слоў. Запішыце.

**297.** Прачытайце сказы.

1. Вецер зрывае з дрэў апошняе лісце. 2. Навальніца наляцела на лес. 3. Лівень панёсся па зямлі. 4. Напішы на канверце адрас і адпраў пісьмо па пошце. 5. Хлопчык убачыў у лесе гняздо незнаёмай птушкі. 6. Мацвей нарэзаў хлеб на стале.

?! Спішыце сказы. Абазначце прыстаўкі, падкрэсліце прыназоўнікі.

## *Урокі 7—8. Часткі слова*

**298.** Прачытайце і адгадайце загадку.

Пані ў каморы, а косы на двары.

оракмв

?! Запішыце загадку і адгадку.
Знайдзіце ў загадцы словы, якія адпавядаюць схеме (⌒ + □).

**299.** Прачытайце словы.

Вязка, вязанне, вязальшчыца, вязальны.
Лесавічок, лясны, ляснік, леснічоўка.

?! Запішыце словы. Абазначце ў іх часткі слоў.
Складзіце сказы са словамі *вязальшчыца* і *ляснік*.

**300.** Прачытайце прыказкі. Устаўце патрэбныя прыстаўкі.

Не ..кладвай на заўтра тое, што паспееш ..рабіць сёння.
Адным махам дрэва не ..валіш.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Пакармі птушак зімой, яны ..плоцяць табе вясной.
Рана ўстанеш — многа работы ..робіш.

?! Растлумачце сэнс прыказак.
Запішыце прыказкі, устаўляючы патрэбныя прыстаўкі, абазначце іх.

**301.** Прачытайце тэкст. Дайце яму назву.

Скончыліся заняткі. Вучні разам з настаўнікам (зайшлі, пайшлі) на вуліцу. Сцежкі (замяло, падмяло) снегам. Усе дружна пачалі працаваць. Адны (зачышчалі, расчышчалі) дарожкі. Другія (адвозілі, прывозілі) снег на санках. Работа кіпела. Аднаму чалавеку цяжка было б (зрабіць, перарабіць) столькі. А разам за гадзіну (выбралі, прыбралі) снег. Вось што значыць усе разам!

?! Спішыце, падбіраючы патрэбныя словы з дужак. Абазначце ў іх прыстаўкі.

**302*.** Прачытайце словы ў табліцы.

| Прыстаўка | Корань | Суфікс | Канчатак |
|---|---|---|---|
| падкінуць | накорміць | дзянькі | бяроза |
| бяскрыўдны | край | вобразны | людзі |
| прабег | узлесак | вавёрка | вата |
| закінуць | будаўнік | дубовы | рабіна |

?! Утварыце новыя словы. Для гэтага вазьміце патрэбныя часткі са слоў, змешчаных у табліцы.
Запішыце словы, што атрымаліся.

Узор.

| *Прыстаўка* | *Корань* | *Суфікс* | *Канчатак* | *Новае слова* |
|---|---|---|---|---|
| *падкінуць* | *накорміць* | *дзянькі* | *бяроза* | *падкормка* |



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**303.** Прачытайце тэкст. Якую назву яму можна даць?

Леб..дзі будуюць **гнёзды** ў недаступных м..сцінах. Прыгожая пту..ка нібы **казачны** карабель плавае па вадз..ной **гладзі**. Ніколі не сп..шаецца гэты высакародны птах. У **народзе** з даўніх **часоў** леб..дзя называюць каралеўскім **птахам**.

Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары.
У выдзеленых словах абазначце корань.

**304.** Прачытайце верш.

Зашуміць трава густая,
кветкі ў лузе засмяюцца.
Вясна прыйдзе маладая,
усюды песні панясуцца.
*(Якуб Колас)*

Вывучыце верш на памяць. Запішыце яго па памяці.
Знайдзіце словы з прыстаўкамі, абазначце прыстаўкі ў іх.

**305.** Прачытайце тэкст.

Маленькі вожык (вы/пры)бег (за/па)гуляць па лесе і (за/на)блудзіўся. Хлопчык (з/уз)лавіў яго і (пры/ад)нёс дамоў. Хутка вожык (аб/пры)вык да людзей. Ён (з/с)прытна бегаў па падлозе, выпіваў малако са сподачка. Спаць вожык (за/пера)біраўся пад канапу.

Да дзеясловаў падбярыце з дужак прыстаўку, якая падыходзіць па сэнсе.
Запішыце тэкст, які ў вас атрымаўся.

**306.** Прачытайце тэкст. Закончыце апошні сказ.

Замерзла возера, і Толік выйшаў пакатацца на каньках. Ён разагнаўся на лёдзе і зрабіў круты паварот. Тонкі лёд затрашчаў і прагнуўся пад нагамі. Хлопчык праваліўся ў ваду і пачаў тануць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Яго прарэзлівы крык пачуў Паўлік. Ён кінуўся на дапамогу і выцягнуў Толіка з вады. Толік і Паўлік...

?! Якая тэма гэтага тэксту? Якую назву можна яму даць?
Якая асноўная думка тэксту?
Як трэба сябе паводзіць на вадаёме ў зімовы час?
Запішыце назву і тэкст.
Знайдзіце словы з прыназоўнікамі і прыстаўкамі. Абазначце прыстаўкі, падкрэсліце прыназоўнікі.

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

**1.** Прачытайце рады слоў. Якое з слоў не з'яўляецца сінонімам?

Дарога, поле, сцежка, гасцінец.
Гаворка, балбатня, скрып, размова.

Запішыце сінонімы.

**2.** Прачытайце словы, падбярыце да іх антонімы.

Малады — ..., мароз — ..., хуткі — ..., гаварыць — ..., пакупнік — ..., мяккі — ... .

Запішыце пары слоў.

**3.** Прачытайце словы.

Бераг, бе́рага, узбярэжжа, беражок, бе́рагу, берагі, прыбярэжны, бе́рагам, аб беразе.

Выпішыце формы слова *бераг.*

**4.** Прачытайце словы. Вызначце часткі гэтых слоў.

Перапіска, прышкольны, пасадка, трубка, прыказка.

Запішыце словы. Абазначце корань, канчатак, прыстаўку, суфікс.

**5.** Ад дзеясловаў *вязаць, садзіць, есці* ўтварыце, калі можна, аднакаранёвыя словы пры дапамозе прыставак ***аб-, ад-, пад-, над-***. Запішыце.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# # Будова слова

**307.** Прачытайце групы роднасных слоў. Назавіце часткі слоў, якія абазначаны ў словах.

Вечар□, вячэр-н-і, вячэр-а, вячэр-аць, па-вячэр-аць.

Вецер□, ветр-ан-ы, ветр-ав-ы, па-ветр-ан-ы.

?! Як называецца агульная частка роднасных слоў?
Назавіце частку слова, што стаіць пасля кораня і служыць для ўтварэння новых слоў.
Назавіце частку слова, што стаіць перад коранем і служыць для ўтварэння новых слоў.
Назавіце зменную частку слова, што служыць для сувязі слоў у сказе.
Запішыце абедзве групы роднасных слоў у сшытак. Абазначце іх часткі.

**308.** Разгледзьце графічныя абазначэнні разбору слова па саставе. Прачытайце словы, што запісаны пад гэтымі абазначэннямі.



Корань, прыстаўка, канчатак, суфікс.

?! Падбярыце абазначэнне да кожнай назвы часткі слова. Запішыце назвы частак слова разам з абазначэннямі ў правільнай паслядоўнасці.

**309.** Прачытайце. Успомніце, што вы вывучалі пра часткі слова.

Блізкія па сэнсе словы, якія маюць агульную частку, з'яўляюцца **роднаснымі**, ці **аднакаранёвымі**: *грыб, грыбок, грыбны.*

**Корань** — агульная частка роднасных слоў: *труб-а, труб-ачк-а*.

**Прыстаўка** — частка слова, якая стаіць перад коранем. Прыстаўка служыць для ўтварэння слоў з новым значэннем і формаў слова: *клікаць — паклікаць.*

**Суфікс** — частка слова, якая стаіць пасля кораня. Суфікс служыць для ўтварэння новых слоў і формаў слова: *бяроза — бяроз-к-а, бяроз-ав-ы*.

**Канчатак** — зменная частка слова. Канчатак служыць для сувязі слоў у сказе. З яго дапамогай утвараюцца не новыя словы, а формы гэтага ж слова: *краін-а, краін-ай*.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Прачытайце тэкст практыкавання яшчэ раз. Закрыйце кнігі. Праверце адно аднаго: раскажыце па чарзе пра роднасныя словы, корань, канчатак, суфікс, прыстаўку.

**310.** Прачытайце словы. Ці з’яўляюцца яны роднаснымі?

**Сад, садоўнік, пасадка, садок, садочак, садовы, пасадзіць.**

Выдзеліце агульную частку гэтых слоў. Як яна называецца?
У якіх словах ёсць частка слова перад коранем? Назавіце яе.
У кожным слове, акрамя першага, назавіце частку, якая стаіць пасля кораня. Як яна называецца?
Выдзеліце ў кожным слове канчатак. У якім слове ён нулявы? Для чаго служыць канчатак?
Спішыце гэты рад аднакаранёвых слоў. Абазначце часткі слова.

**311.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце, як тлумачыцца значэнне роднасных слоў.









**Кні́га** — друкаванае выданне ў выглядзе пераплеценых разам лістоў паперы з якім-небудзь тэкстам.
**Кні́жнік** — знаўца і аматар кніг.
**Кніга́рня** — кніжная крама.
**Кні́жачка** — невялікая кніга, пераважна дзіцячая.

Падбярыце да кожнага малюнка адно з роднасных слоў.
Якая частка ў гэтых роднасных словах з’яўляецца агульнай? Што за літары ў ёй чаргуюцца?
Назавіце астатнія часткі, што ёсць у гэтых словах. Якой часткі ні ў адным з іх няма?
Запішыце роднасныя словы. Абазначце часткі слоў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**312.** Прачытайце пытанні і адкажыце на іх.

Ці бывалі вы ў кнігарні? Ці шмат там кніг?

Якія кнігі прадаюцца ў кніжнай краме? Што вы хацелі там набыць?

Вы знайшлі патрэбную вам кнігу самі ці спыталі наконт яе ў прадаўца?

Ці падабаецца вам наведваць кніжную краму?

?! Па малюнках, пытаннях, а таксама з дапамогай уласнага досведу складзіце вуснае паведамленне пра наведванне вамі кніжнай крамы.
Ці часта ў вашым аповедзе сустракаюцца словы, роднасныя слову *кніга*, а таксама формы гэтага слова?

**313.** Паразмаўляйце з сябрам (сяброўкай). Скажыце, якую кнігу (карту, паштоўку, альбом і іншае) вам хочацца набыць. Запрасіце сябра (сяброўку) наведаць з вамі кніжную краму і дапамагчы знайсці патрэбную вам рэч.

**314.** Прачытайце рад аднакаранёвых слоў.

Мароз, марозіць, замаразкі, замарозіць, марозны.

?! Разбярыце словы па саставе і запішыце. Абазначце іх часткі.

**315.** Прачытайце словы. Падбярыце да кожнага з іх роднасныя.

Гара, ..., ... .
Моц, ..., ... .
Корм, ..., ... .

?! З дапамогай якіх частак утварыліся новыя словы?
Запішыце рады роднасных слоў. Абазначце іх канчаткі.

**316.** Прачытайце словы. Ці з'яўляюцца яны роднаснымі?

Гара, гары, гару, на гары.
Моцны, моцнае, моцная.
Карміць, карміў, карміла.

?! Якой часткай адрозніваюцца словы? Спішыце формы слоў. Абазначце іх канчаткі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**317.** Прачытайце сказы.

Шырокая **дарога** вяла проста ў вёску. Дзе-нідзе абапал **дарогі** раслі высокія бярозы і маладыя ліпкі. **Па дарозе** з вёскі рухаліся камбайны. Злева **за дарогай** пачыналася жытнёвае поле.

Выпішыце выдзеленыя словы. Ці з'яўляюцца яны роднаснымі? Абгрунтуйце сваё меркаванне.
Абазначце ў гэтых словах корань і канчаткі.

**318.** Прачытайце тлумачэнні значэнняў слоў. Назавіце гэтыя словы.

Паласа зямлі, прызначаная для язды і хадзьбы, якая злучае асобныя пункты мясцовасці, — **...** .

Прызначаная для хадзьбы вузкая дарога ў садах, парках і гэтак далей — **...** .

Спецыяліст па будаўніцтве, рамонце і эксплуатацыі дарог і гарадскіх вуліц — **...** .

Знаходжанне ў дарозе — **...** .

Які знаходзіцца пры дарозе — **...** .

Словы для выбару: *падарожжа, дарожнік, дарога, прыдарожны, дарожка.*

Ці можна назваць роднаснымі словы, якія вы падбіралі? Абгрунтуйце сваё меркаванне.
Спішыце тлумачэнні значэнняў слоў, дапішыце замест кропак адпаведныя словы. Абазначце ў роднасных словах часткі.

**319.** Прачытайце сказы. Якія вы ведаеце ядавітыя грыбы?

Грыбы збіраюць летам і восенню. У цёплую дажджлівую восень бывае шмат грыбоў. Але не ўсе грыбы можна збіраць. Ядавітымі грыбамі можна атруціцца. Вопытныя грыбнікі разбіраюцца ў грыбах. *(Іван Паўлоўскі)*

Знайдзіце ў тэксце роднасныя словы і формы аднаго слова.
Запішыце і абазначце часткі спачатку ў роднасных словах, а потым — у формах слова.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**320.** Разгледзьце малюнкі з адлюстраваннем на іх ядомых і ядавітых грыбоў.


*Баравік*


*Падасінавік*


*Грузд*


*Падбярозавік*


*Мухамор*


*Лісічкі*


*Апенькі*


*Паганкі*


*Сыраежкі*


*Шампіньёны*

?! Назавіце адлюстраваныя на малюнках грыбы. Якія з іх ядомыя, а якія — ядавітыя? Успомніце іншыя назвы ядомых і ядавітых грыбоў. Растлумачце, чаму грыбы *баравік, падбярозавік, падасінавік, апенька* маюць такія назвы. Падбярыце да гэтых слоў аднакаранёвыя. Запішыце ўсе словы ў сшытак. Абазначце іх часткі.

**321.** Прачытайце тэкст.

**Апенькі**

Скупая была восень на дажджы. Ледзь-ледзь папырскае і перастане. Зачакаліся добрага дождживку і грыбкі, і грыбнікі.

Іду ў лес. Мала яшчэ грыбоў, вельмі мала. Выгляне які з зямлі — зморшчыцца: холадна, суха.

І раптам — што гэта? Адстала кара на старым пяньку, і з-за яе, як з-за плота, грыбочкі выглядаюць. Рудыя, у рабацінні, як рыжаватыя хлапчукі.

«Апенькі!» — узрадаваўся я. *(Паводле Паўла Місько)*

?! Знайдзіце ў тэксце дзве групы роднасных слоў. Запішыце гэтыя словы. Абазначце іх часткі.

**322.** Прачытайце тэкст. Якую назву можна яму даць?

Ішоў па лесе грыбнік. У адной руцэ трымаў вялікі кош. А ў другой — востры нож. Раптам грыбнік убачыў у траве чырвоную



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

шапачку падасінавіка. Нагнуўся, каб падрэзаць грыб. Аж гэта пачырванелы асінавы лісток. Пайшоў грыбнік далей. Убачыў каля асінкі чырвоную плямку. Не звярнуў на яе ўвагі. А гэта быў падасінавік.

*(Паводле Змітра Бяспалага)*

Знайдзіце ў тэксце тры групы роднасных слоў. Назавіце іх часткі. Прачытайце тэкст яшчэ раз. Напішыце яго пад дыктоўку. Праверце дыктоўкі адно ў аднаго.

**323.** Прачытайце словы. Якія ў іх часткі?

Сэрцайка, рачулка, маленькі, дожджык, школьны, каменны, лясочак.

Утварыце ад гэтых слоў роднасныя без суфікса. Запішыце пары роднасных слоў. Абазначце іх часткі.

**324.** Прачытайце словы. Разбярыце іх па саставе.

Дуб, лаза, бяроза, рака.

Утварыце роднасныя словы з дапамогай суфіксаў ***-ов-, -к-***.

**325.** Прачытайце. Утварыце з дапамогай прыставак і суфіксаў новыя словы.

пад- → -снеж- / -вод- → нік

за- → -печ- / -двор- → -ак

Запішыце словы, што атрымаліся. Абазначце іх часткі.

**326.** Прачытайце карані слоў. Падбярыце аднакаранёвыя словы.

→ -бег →
→ прац- →

→ -вёз →
→ пчал- →

З дапамогай якіх частак утварыліся новыя словы? Запішыце групы роднасных слоў. Абазначце іх часткі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**327.** Прачытайце назвы часцін мовы і словы, якія адносяцца да іх.

| Назоўнік | Дзеяслоў | Прыметнік |
| --- | --- | --- |
| зіма | зімаваць | зімовы |
| свет | ... | ... |
| ... | карміць | ... |
| ... | ... | багаты |

?! Падбярыце замест кропак роднасныя словы адпаведных часцін мовы. Запішыце тры групы роднасных слоў. Абазначце іх часткі.

**328.** Прачытайце словы і спалучэнні слоў.

Сумленне — ... праца, месца — ... камбінат, неба — ... сінь, вясна — ... дожджык, раніца — ... зарадка, спальня — ... мэбля.

?! Паводле ўзору падбярыце замест кропак прыметнік, роднасны назоўніку.

Узор. *Радасць — радасны настрой.*

Запішыце спалучэнні слоў, што атрымаліся. Абазначце частку слова, з дапамогай якой утварыліся роднасныя прыметнікі.

## # *Правапіс прыставак*

**329.** Прачытайце словы.

Абвязаць, абтачыць, аднавіць, адступіць, падказаць, надпіс, перадсвяточны.

?! Выдзеліце ў словах прыстаўкі. На якія літары яны заканчваюцца? Спішыце словы. Абазначце ў іх карані і прыстаўкі.

*Запомніце!*
Прыстаўкі ***аб-, ад-, пад-, над-, перад-*** пішуцца заўсёды аднолькава незалежна ад іх вымаўлення: *падземны, абтачыць, адыграць, перадабедзенны.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**330.** Прачытайце словы. З дапамогай прыставак ***ад-, аб-, пад-, над-*** утварыце новыя словы.

Пілаваць, рэзаць, ісці.

Запішыце словы, што ўтварыліся. Пішыце прыстаўкі правільна незалежна ад гучання.

**331.** Прачытайце словы і прыстаўкі. Утварыце з іх дапамогай як мага больш новых слоў.

аб-, ад-, над- → будаваць

аб-, ад-, над- → ламаць

аб-, ад-, пад- → несці

аб-, ад-, пад- → капаць

Запішыце словы, што ўтварыліся. Абазначце прыстаўкі.

**332.** Прачытайце спалучэнні слоў. Якія прыстаўкі тут патрэбна ўставіць?

..пісаць дакумент, ..несці ў бібліятэку, ..думаць план, ..рэзаць нажом, ..ліць вадой, ..месці падлогу, ..кусіць яблык, ..пілаваць дошку.

Спішыце спалучэнні слоў. Устаўце прапушчаныя прыстаўкі.

**333.** Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.

Без па(д/т)палу дровы не гараць.
Вышэй сябе не па(д/т)скочыш.

Запішыце прыказкі ў сшытак, раскрываючы дужкі і выбіраючы патрэбную літару.

**334.** Прачытайце сказы. Якія літары прапушчаны ў словах з прыстаўкамі?

Сталявары а..крылі ў печы маленькія дзверцы, і па металічным жолабе хлынула вогненная рака. *(Міхась Даніленка)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Дзецям карціць хутчэй а..чыніць скрынку. *(Міхаіл Герчык)*
Мы па..клалі голля, ярка ўспыхнуў агонь. *(Ільля Гурскі)*

**Жо́лаб** — прыстасаванне з дошак, ліставога жалеза і іншага для сцёку вадкасцей або перасыпання чаго-небудзь.
**Карце́ць** — адчуваць неадольнае жаданне зрабіць што-небудзь.

?! Запішыце словы, што ўтварыліся. Пішыце прыстаўкі правільна незалежна ад гучання.

**335.** Прачытайце паэтычныя радкі. Якія літары прапушчаны ў прыстаўках?

А..цвіло, а..шапацела лета,
калабком скацілася з гары.
*(Хведар Жычка)*

А..рывае восень
за лістком лісток.
*(Артур Вольскі)*

?! Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары. Абазначце прыстаўкі. Падкрэсліце літару, што ўставілі.

**336.** Прачытайце назоўнікі з прыназоўнікамі. Утварыце ад іх прыметнікі з прыстаўкамі.

Над азёрамі, пад вадой, пад зямлёй, перад выбарамі.

?! Запішыце спалучэнні паводле ўзору. Абазначце прыстаўкі.

У з о р. *Ад імя — адыменны, ...*

**337.** Прачытайце верш. Якая прыстаўка прапушчана ў словах?

..палалі васількі.
..ляцелі матылькі.
Неяк вельмі непрыкметна
..ышло з цяплом і лета.
*(Уладзімір Карызна)*

?! Выпішыце словы, у якіх прапушчана адна і тая ж прыстаўка. Абазначце яе ў кожным слове.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**338.** Прачытайце словы. Як называецца знак, што стаіць у словах пасля прыставак?

**Раз’яднаць, з’есці, пад’ём, з’явіцца, пад’ехаць.**

?! Спішыце словы. Абазначце прыстаўкі.

*Запомніце!*
Апостраф пішацца пасля прыставак, якія канчаюцца на зычны, перад літарамі ***я, е, ё, ю*** і націскным ***і***: *з’езд, аб’яднанне, аб’інец, пад’язны*.

**339.** Прачытайце словы. Растлумачце іх значэнне.

**Раз’юшаны, пад’езд, аб’ява.**

?! Прачытайце тлумачэнне гэтых слоў, як яно падаецца ў «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы».

**Раз’ю́шаны** — якi знаходзiцца ў лютасцi, шаленстве.
**Пад’е́зд** — уваход у будынак; месца, па якiм пад’язджаюць да чаго-небудзь.

?! Запішыце тлумачэнні слоў. У словах, што тлумачылі, абазначце прыстаўкі.

**340.** Прачытайце тэкст. Разгледзьце малюнак-ілюстрацыю.



Мы выехалі з горада на шашу. Вось і скрыжаванне з кальцавой дарогай. Яна прыўзнята на насып, перакінута мостам цераз шашу.

Мы (пад)ехалі пад мост, зрабілі паварот направа, (аб)ехалі па маленькім кальцы, (уз)ехалі на кальцавую дарогу. Хутка мы (з)едзем з дарогі ў лес. *(Паводле Хведара Жычкі)*

?! У першай частцы тэксту знайдзіце словы з прыстаўкамі.
Спішыце другую частку тэксту, раскрываючы дужкі. Стаўце пасля прыставак апостраф.
Праверце адно ў аднаго правільнасць выканання задання.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**341.** Прачытайце словы і спалучэнні слоў на рускай мове. Як называецца ў рускай мове літара **ъ**?

Объявление, объём, объезд, съел, обед, подъёмный кран, съехал с горки.

?! Перакладзіце гэтыя словы і спалучэнні слоў на беларускую мову. Запішыце гэтыя словы і спалучэнні слоў.
Які знак вы запішаце замест цвёрдага знака?

**342.** Прачытайце загадку. Адгадайце яе з дапамогай малюнка.

Зімою хаваюся,
увесну (з)яўляюся,
летам весялюся,
увосень спаць кладуся.



?! Спішыце загадку, раскрываючы дужкі. Які знак трэба паставіць пасля літары ***з***?

# ЧАСЦІНЫ МОВЫ

## НАЗОЎНІК

### *Урок 1. Назоўнік*

**343.** Прачытайце словы. На якія пытанні яны адказваюць? Што абазначаюць гэтыя словы?

Сястра, шафёр, мароз, дождж, сабака, спаборніцтва, дыван, пыласос, цеплыня, халат.

?! Да якой часціны мовы адносяцца гэтыя словы?
Запішыце словы. Пасля кожнага з іх у дужках пастаўце пытанне, на якое слова адказвае.

*Успомніце!*
**Назоўнік** — часціна мовы, якая абазначае **прадмет** і адказвае на пытанні **хто? што?**



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**344.** Прачытайце пытанні. Адкажыце на іх.

Хто лечыць людзей? Што расце ў лесе? Хто вучыць дзяцей у школе? Хто піша кнігу? Што дорацць людзям на свята? Што стаіць у кватэры на Новы год?

?! Запішыце назоўнікі — адказы на пытанні ў два слупкі: у першы — тыя, якія адказваюць на пытанне хто?, а ў другі — якія адказваюць на пытанне што?
У якім слупку назоўнікі абазначаюць жывых істот, а ў якім — нежывыя прадметы?

**345.** Прачытайце жартоўныя загадкі-пытанні. Знайдзіце сярод прапанаваных малюнкаў адгадкі.

Што без ног ідзе?
Што без вады плавае?
Што гарыць без полымя?
Хто цар звяроў?
Хто ўночы лятае, а ўдзень адпачывае?







?! Запішыце словы-адгадкі. Пастаўце ў дужках пасля кожнага слова пытанне, на якое яно адказвае.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**346.** Прачытайце тэкст.

### Мой пісьмовы стол

(...) **Косцік** часта сядзеў за сваім пісьмовым сталом. Ён любіў свой (...) **стол**. Яго падарыў (...) **тата**. Гэта было ў мінулым годзе. Цяпер на стале ляжалі (...) **кніжкі** і (...) **сшыткі**. Пісьмовыя прылады ляжалі ў шуфлядках. Але тут можна было знайсці і (...) **цацкі**. Для іх было патаемнае месца. Яно зачынялася на (...) **замочак**.

*(Паводле Лідзіі Арабей)*

?! Пастаўце пытанні хто? або што? да выдзеленых назоўнікаў. Растлумачце, у якіх выпадках патрэбна ставіць пытанне хто?, а ў якіх — пытанне што?

Спішыце тэкст. Пасля выдзеленых слоў запішыце пытанні хто? або што?

**347.** Разгледзьце малюнак.
Адкажыце на пытанні.



Ці вудзілі вы калі-небудзь рыбу?

Якія прылады патрэбны для лоўлі рыбы?

Дзе гэта адбывалася?

Як называлася рака ці возера, дзе вы вудзілі рыбу?

Ці шмат вы налавілі?

Ці адбывалася што-небудзь цікавае, калі вы вудзілі рыбу?

?! З дапамогай пытанняў і малюнка раскажыце пра які-небудзь выпадак з жыцця рыбалова.

**348.** Прачытайце словы.

Ружа, чытач, бадзёры, прыбіраць, янот, праехаць, малюнак, жывёла, чырвоны, чалавек, матылёк, смачны, дзядуля, прафесар, часопіс, выхад, восеньскі, збіраюць.

?! Выпішыце назоўнікі. Пасля кожнага слова ў дужках запішыце пытанне, на якое яно адказвае.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 2. Лік назоўнікаў*

**349.** Прачытайце пары слоў. На якія пытанні яны адказваюць? Да якой часціны мовы адносяцца?

Горад — гарады, вуліца — вуліцы, свята — святы, кветка — кветкі, ліхтар — ліхтары, дзіця — дзеці, народ — народы, дождж — дажджы, сабака — сабакі.

?! Чым адрозніваюцца назоўнікі кожнай пары?
У якім ліку ўжыты ўсе першыя словы кожнай пары? У якім — другія словы кожнай пары?
Выпішыце ў першы радок усе назоўнікі адзіночнага ліку, а ў другі — назоўнікі множнага ліку.

*Успомніце!*
Большасць назоўнікаў маюць два лікі — ***адзіночны*** *(адз. л.)* і ***множны*** *(мн. л.)*.

**350.** Прачытайце словы. У якім яны ліку?

Плот, кош, бацька, лялька, відэлец, дзённік, цягнік, сасна, рукавіца, свіння, сусед, провад, чамадан, сурвэтка, настаўнік, сябар, аловак.

?! Запішыце словы ў множным ліку, абазначце іх канчаткі.

**351.** Прачытайце словы. Вызначце, у якім ліку ўжыта кожнае з іх.

Ліст, дамы́, вецер, календары, месяц, тыдні, сцяна, часопіс, газеты, партфелі.

?! Змяніце лік кожнага назоўніка.
Запішыце пары слоў паводле ўзору.

Узор. *Ліст (адз. л.) — лісты (мн. л.), ... .*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**352.** Прачытайце тэкст. Ці назіралі вы прыродныя з'явы, якія апісаны ў тэксце?

### Позняя восень

У лесе, на полі, у вёсцы — усюды адчуваецца хуткае **набліжэнне** зімы. Днём было яшчэ **сонца**, сіняе чыстае **неба**. Калі чырвоны сонечны **дыск** заходзіў за **лес**, апусцелая няласкавая **зямля** стыла на холадзе. Пад **поўнач** усё пакрывалася інеем. Па-зімоваму белая была **трава, палі, балоты**. Але ўзнялося сонца. **Іней** знік. Сонечная **цеплыня** разлілася па зямлі. Аднак у паветры ўсё ж адчуваўся здаровы **халадок**. *(Паводле Івана Мележа)*

?! На якое пытанне адказваюць усе выдзеленыя словы? Што яны абазначаюць? Да якой часціны мовы адносяцца? Выпішыце выдзеленыя словы. Абазначце іх лік — адзіночны ці множны.

**353.** Прачытайце тэкст.

### У лесе

Раптам у лесе нешта шаснула. На палянку выскачылі казулі. Яны спыніліся ў здзіўленні. На паляне былі людзі. Жывёлы крыху пастаялі і схаваліся ў лесе. Людзі не звярталі на казуль увагі. Яны наклалі ў кармушкі сена, селі ў сані і паехалі. Казулі падышлі да кармушак і пачалі скубці сена. *(Паводле Янкі Маўра)*



?! Знайдзіце ў тэксце назоўнікі. Вызначце іх лік. Запішыце назоўнікі ў сшытку, укажыце іх лік.

* Паспрабуйце прачытаць тэкст так, як быццам падзеі адбываюцца з адной казуляй.

**354.** Прачытайце верш.

### Зіма

Ля хат высокія **сумёты**,
пад снежнай коўдрай спяць **палі**.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Вятры** бяздомныя ля плота
з віхурай песню завялі.
Замоўклі белыя **прасторы**,
змарыў іх ціхі зімні **сон**,
малюе срэбныя **ўзоры**
**зіма** на шыбінах акон.

*(Мікола Хведаровіч)*

**Віху́ра** — бура, завея, завіруха.

?! Спішыце тэкст. У выдзеленых словах абазначце лік.

## *Урок 3. Назоўнікі, якія не змяняюцца па ліках*

**355.** Прачытайце наступныя словы. У якім ліку ўжыты словы ў першым радку? У якім — у другім?

Сумленне, радасць, насенне, зерне, цукар, масла, чай.
Дзверы, акуляры, нажніцы, канікулы, суткі, духі́, кансервы.

?! Паспрабуйце змяніць лік гэтых слоў. Ці магчыма гэта?

*Запомніце!*
Ёсць назоўнікі, якія не могуць змяняцца па ліках.
Такія назоўнікі маюць або толькі адзіночны, або толькі множны лік: *Мінск, барацьба, шахматы, Ждановічы.*

**356.** Прачытайце словы. Паспрабуйце змяніць іх лік.

Прыволле, лес, сонца, прыцемкі, жыта, цэмент, Баранавічы, вочы, неба, крэсла, вячоркі.

?! Запішыце назоўнікі ў тры слупкі: у першы — тыя, што змяняюцца па ліках, у другі — тыя, што маюць толькі адзіночны лік, у трэці — тыя, што маюць толькі множны лік.
Складзіце тры сказы, каб у кожным з іх выкарыстоўвалася адно са слоў кожнага слупка.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**357.** Разгледзьце карту Беларусі. Прачытайце назвы гарадоў. Якія з назваў маюць форму адзіночнага ліку, а якія — множнага?




?! Вызначце на карце месца, дзе знаходзіцца ваш родны горад ці вёска, ваша школа.

Запішыце спачатку назвы гарадоў Беларусі, якія маюць адзіночны лік, а потым тыя, якія маюць множны лік.

*Запомніце!*

Назвы гарадоў, як і іншыя ўласныя назвы, пішуць з вялікай літары.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**358.** Прачытайце сказы.

1. Марынка, падай цукар бабулі. 2. Нажніцы зусім затупіліся, і Аленка ўжо цэлую хвіліну не магла адрэзаць нітку. 3. З панядзелка пачыналіся канікулы, настаўніца рыхтавала заданні для дзяцей. 4. Дзед Грыша павольна і акуратна намазваў масла на хлеб. 5. У паход дзеці ўзялі з сабой рыбныя і мясныя кансервы. 6. Дзверы ціха расчыніліся, у пакой увайшоў Міхаіл Тарасавіч.

?! Спішыце сказы. Падкрэсліце назоўнікі, якія не змяняюцца па ліках.
Знайдзіце і прачытайце пабуджальны сказ.
Колькі складаных сказаў у практыкаванні? Прачытайце іх. Вызначце галоўныя члены ў гэтых сказах.

**359.** Прачытайце словы.



Гняздо, радасць, шчасце, дзяцел, сон, камень, розум, **натхненне**, дождж, сасна, расліна, туман, **чаканне**, сэрца, ветлівасць, **гасціннасць**, рака, яблык, **гонар**, талерка.

?! Выпішыце назоўнікі, якія не змяняюцца па ліках.
Складзіце і запішыце сказы з выдзеленымі словамі.
Паспрабуйце перакласці выдзеленыя словы на беларускую мову. Пры неабходнасці карыстайцеся беларуска-рускім слоўнікам.

***тале́рка***

## *Урокі 4—5. Род назоўнікаў*

**360.** Прачытайце словы ў трох слупках. Які лік маюць усе гэтыя словы?

| | | |
|---|---|---|
| пчаляр | вежа | акно |
| стог | ліпа | галлё |
| перапалох | морква | полымя |

?! Да назоўнікаў якога слупка можна аднесці словы ён, мой; яна, мая; яно, маё?
Якога роду назоўнікі, што запісаны ў першым слупку, якога — у другім, якога — у трэцім?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Успомніце!*
Кожны назоўнік у форме адзіночнага ліку належыць да аднаго з трох родаў — мужчынскага **(ён, мой)**: *край*; жаночага **(яна, мая)**: *краіна*; ніякага **(яно, маё)**: *поле*.
Каб вызначыць род назоўнікаў множнага ліку, патрэбна іх змяніць такім чынам, каб яны прынялі форму адзіночнага ліку: *лясы (мн. л.) — лес (адз. л., м. р.).*

**361.** Паспаборнічайце. Разгледзьце ўсе прадметы навокал.
Запішыце іх назвы ў тры слупкі ў залежнасці ад роду: мужчынскі, жаночы і ніякі род.
Праверце запісы адно ў аднаго.
Пераможа той, хто запіша больш назваў і не памыліцца з вызначэннем роду назоўніка.

**362.** Прачытайце тэкст.

### Родныя прасторы

Над зямлёй узыходзіць **сонца**. Загараецца **неба** адценнямі чырвані і золата. Пачынаецца **раніца** новага дня.

У ясным небе плывуць **самалёты**. Красуе і хвалюецца на лёгкім ранішнім ветрыку **жыта**. Шумяць старыя **пушчы**. Гамоняць бярозавыя **гаі** і **пералескі**.

Усюды віднеюцца **рыштаванні**. Растуць **заводы** і **фабрыкі**. На палях гудуць **трактары** і **камбайны**. Па дарогах імчацца **аўтамабілі**. Блішчаць на сонцы шыферныя і бляшаныя **дахі**. Увечары **гарады** і **сёлы** свецяцца электрычным бляскам.

Над роднымі прасторамі кіпіць **жыццё**.

*(Паводле Сяргея Грахоўскага)*

**Рыштава́нне** — часовае збудаванне з дошак, стоек або металічных трубак, якое ўстанаўліваецца ўздоўж сцен для будаўнічых або рамонтных работ.

Вызначце лік кожнага з выдзеленых назоўнікаў.
Змяніце назоўнікі, каб яны прынялі форму адзіночнага ліку.
Запішыце ў слупок усе назоўнікі ў адзіночным ліку.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

З дапамогай слоў ё н, м о й; я н а, м а я; я н о, м а ё вызначце, якога роду кожны з назоўнікаў: мужчынскага, жаночага або ніякага.

Пазначце род назоўнікаў побач з кожным са слоў: мужчынскі — ***м.***, жаночы — ***ж.***, ніякі — ***н.***

**363.** Прачытайце верш. Якія пачуцці выказвае ў ім аўтар у адносінах да роднай мовы?

Багата, родная ты мова,
цябе стварыў і ўзнёс народ.
А вобразы якія ў словах,
а параўнанняў што за ўзлёт!

Вятры — вандроўнікі, вядома,
барозны — гуслі на раллі,
а сосны — рыцары ў шаломах,
крыніцы — вочы ўсёй зямлі,

а хвалі ўвосень — гэта зрэб'е.
як срэбра, ручаёк цячэ.
А зоры, як цвікі на небе…
І шмат яшчэ, і шмат яшчэ!

*(Пятрусь Броўка)*

**Вандро́ўнік** — чалавек, які вандруе, падарожнічае.
**Гу́слі** — мнагаструнны музычны інструмент славянскіх народаў.
**Шало́м** — шлем, старажытны металічны воінскі галаўны ўбор, які ахоўваў галаву ад udараў, стрэл.
**Зрэ́б'е** — грубая кудзеля (валакно), што аддзяляецца пры трапанні лёну і іншага, а таксама палатно з такой кудзелі і адзенне з такога палатна.

?! Знайдзіце ў вершы назоўнікі, што адказваюць на пытанні х т о? або ш т о? Вызначце лік кожнага назоўніка. Пастаўце назоўнікі, калі гэта магчыма, у адзіночным ліку.

Запішыце назоўнікі ў адзіночным ліку. Вызначце род кожнага з іх. Абазначце род адпаведнымі літарамі: ***м. р., ж. р., н. р***.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**364.** Прачытайце тэкст.

## Прыз

На высокай сасне ў дупле жыла **вавёрачка**. **Вочкі** ў яе як **гузікі**. А **вушкі** да **пэндзлікаў** падобныя.

Убачыла вавёрачка сароку. Што за **птушка** такая? Вылезла з дупла. І тут заўважыла **грыб**. Ён на другім дрэве на сучку вісіць. Вельмі захацелася вавёрцы грыбком паласавацца. Ды баіцца з дрэва на **дрэва** пераскочыць. Маленькая яна.

Але вавёрачка адважылася і скокнула. Чырвоная **шапачка** падасінавіка стала ёй прызам за адвагу. *(Паводле Валерыя Кастручына)*

?! Спішыце тэкст. У выдзеленых назоўніках вызначце лік і род.

**365.** Прачытайце словы. Ці зразумела, якога яны роду? Вызначце іх род з дапамогай прыметнікаў, што запісаны ў дужках.

(Ружовы) фламінга, (вялікі) шымпанзэ, (новае) атэлье, (прасторнае) фае, (прыгожая) мадам, (добрая) пані, (прадстаўнічае) журы.

?! Спішыце спалучэнні слоў, раскрываючы дужкі. Абазначце род назоўнікаў.

**366.** Прачытайце назоўнікі. Падбярыце да кожнага з іх прыметнік.

Паветра, цягнік, плюс, насенне, пісьменнік, букет, кветка, сям'я.

?! Запішыце спалучэнні слоў. Абазначце род назоўнікаў.

**367.** Прачытайце прыметнікі ў дужках і назоўнікі. Ці спалучаюцца ў родзе прыметнікі з назоўнікамі?

(Маляўнічы) пано, (тэлевізійны) інтэрв'ю, (рамонтны) дэпо, (фруктовы) пюрэ, (рыбны) філе, (водны) пола, (свабодны) таксі.

?! Вызначце род кожнага назоўніка. Спалучыце з назоўнікамі прыметнікі. Запішыце спалучэнні слоў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**368.** Прачытайце словазлучэнні на беларускай і рускай мовах. Па форме прыметнікаў вызначце род кожнага з назоўнікаў у рускай і беларускай мовах.

Па-беларуску: злы сабака, высокі насып, размашысты подпіс, моцны боль.

Па-руску: злая собака, высокая насыпь, размашистая подпись, сильная боль.

?! Складзіце сказ, у якім выкарыстайце адно са словазлучэнняў на беларускай мове. Запішыце яго.

**369.** Прачытайце спалучэнні слоў. Вызначце род назоўнікаў.

Салдацкі шынель, шырокі стэп, балючы мазоль, баявы медаль, афрыканская жырафа, сярдзітая гусь, высокая таполя.

?! Пагуляйце ў перакладчыкаў: паспрабуйце перакласці гэтыя словы на рускую мову.
Які род маюць назоўнікі з гэтых спалучэнняў у рускай мове?

**370.** Прачытайце словы на рускай мове. Перакладзіце іх на беларускую мову.

Начарціце ў сшытках і разгадайце крыжаванку.

1. Лук 2. Простор 3. Пар




?! Якое слова атрымалася па вертыкалі ў выдзеленых клетачках?
Вызначце род кожнага назоўніка ў рускай і беларускай мовах.

**371.** Прачытайце тэкст. Якую назву яму можна даць?

У лістападзе да новых умоў надвор'я рыхтуюцца **жывёлы** і **птушкі**. Пасяляюцца бліжэй да чалавека **сініцы, сарокі, галкі** і іншыя птушкі. Адлятаюць апошнія пералётныя **качкі**, белыя **лебедзі**, стайкі дзікіх галубоў. У апусцелым лесе застаюцца **пішчухі, попаўзні, дзятлы,**



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**сойкі**. **Звяры** назапашваюць **корм**. Заканчваецца **лінька**. Засынаюць **мядзведзь, барсук**, янотападобны **сабака**, большасць рыб, за выключэннем шчупака, акуня, ярша, ментуза. **Зайцы** ўжо змянілі футра на белае і трымаюцца ў лясным гушчары, пакуль няма снегавога покрыва. **Насякомыя** закопваюцца ў **мох**, глебу, пад апалае **лісце**, забіваюцца ў расколіны дрэў. *(З календара «Родны край»)*

?! Чым яшчэ характарызуецца прырода ў лістападзе?
Назавіце лік кожнага з выдзеленых назоўнікаў. Запішыце ўсе гэтыя назоўнікі ў адзіночным ліку.
Вызначце род кожнага назоўніка і абазначце яго літарамі: ***м. р., ж. р., н. р.***

**372.** Прачытайце тэкст.

### Зялёныя вішанькі

Раніцою над шэрай, прыхопленай першым марозцам зямлёй пранёсся вецер. Ён узняў апалае лісце, і на двары віхурай загуляла дзіўная жоўта-карычневая завея.

По небе папаўзлі шэра-попельныя хмары. Яны дыбіліся, лезлі адна на адну. І зусім нечакана паваліў густы, сухі снег. Усюды — у полі, у лесе — ладна яго насыпалася. Няўжо зіма пачалася?

Неба неўзабаве запаланіў туман. Праз яго ледзьве прабівалася сонца.

Расцвыркаліся, расхваляваліся пад застрэшкамі хат вераб'і.

Дым з комінаў ішоў каромыслам.

Шыбы вокнаў пацелі.

«На цяпло ўсё гэта», — зрабіў выснову я.

Кажуць, што пакуль увосень дождж раку не змыў, ліст не сагнуў, то зімы не павінна быць.

Так яно і адбылося. Снег падапрэў, ажно ручайкі пабеглі.

Гляджу — а ў садзе дзве вішанькі стаяць! Зялёненькія, быццам толькі што вясну сустрэлі.

Праўду кажуць: калі ліст з вішань не апаў, снег ляжаць не будзе. *(Паводле Янкі Галубовіча)*

?! Знайдзіце ў тэксце дзве народныя прыметы.
Выпішыце іх. У гэтых сказах знайдзіце назоўнікі, якія адказваюць на пытанне ш т о? Вызначце іх лік і род.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 6. Значэнне склонаў і склонавыя пытанні*

**373.** Разгледзьце табліцу.

| Пытанні | Назоўнікі |
|---|---|
| (хто? што?) | бабул-я, цукар |
| (каго? чаго?) | бабул-і, цукр-у |
| (каму? чаму?) | бабул-і, цукр-у |
| (каго? што?) | бабул-ю, цукар |
| (кім? чым?) | бабул-яй, цукр-ам |
| (па кім? аб чым?) | па бабул-і, аб цукр-ы |

?! Якая частка слова змянялася ў назоўнікаў? Колькі формаў назоўнікаў вы налічылі?
Як называецца змяненне назоўнікаў па пытаннях?

*Успомніце!*
Змяненне назоўніка па пытаннях называецца скланеннем.
Формы назоўніка называюцца склонамі.
Пры змяненні формаў назоўнікаў мяняецца канчатак.
У назоўніка шэсць склонаў: **назоўны, родны, давальны, вінавальны, творны, месны**.

**374.** Прачытайце, як скланяюцца, гэта значыць змяняюцца па склонах, назоўнікі *рука, камар, печ, рэчка*.

| | | |
|---|---|---|
| Назоўны | хто? што? | рука, камар, печ, рэчка |
| Родны | каго? чаго? | рукі, камара, печы, рэчкі |
| Давальны | каму? чаму? | руцэ, камару, печы, рэчцы |
| Вінавальны | каго? што? | руку, камара, печ, рэчку |
| Творны | кім? чым? | рукой, камаром, печчу, рэчкай |
| Месны | аб кім? аб чым? | аб руцэ, аб камары, аб печы, аб рэчцы |

?! Вызначце род кожнага з назоўнікаў.
Ці аднолькавыя канчаткі ў назоўнікаў пры скланенні?
Спішыце практыкаванне. Абазначце канчаткі назоўнікаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**375.** Прачытайце, адкуль пайшлі назвы склонаў і што яны абазначаюць.

Назоўны склон абазначае назву імені, прадмета. Яго пытанні — хто? што?

Родны склон абазначае нешта блізкае. Гэта другі склон пасля нараджэння слова, самы «блізкі» і «родны». Яго пытанні — каго? чаго?

Давальны склон атрымаў сваю назву па сувязі са словам «даваць». Яго пытанні — каму? чаму?

Назва вінавальнага склону абазначае «віна, прычына». Можна вінаваціць каго ці што. Таму і пытанні вінавальнага склону — каго? што?

Творны склон названы так паводле аднаго са сваіх значэнняў, якое паказвае, з дапамогай чаго адбываецца, «творыцца» дзеянне. Яго пытанні — кім? чым?

Месны склон, магчыма, атрымаў такую назву таму, што можа абазначаць месца дзеяння. Ён мае пытанні аб кім? аб чым?

*(Паводле Міколы Яленскага)*

Прачытайце тэкст яшчэ раз.
Паспрабуйце расказаць сваімі словамі, што абазначае назва кожнага склону.

**376.** Прачытайце пытанні. Адкажыце на іх поўнымі сказамі. Пры адказах выкарыстайце слова *сястра.*

Хто працуе на швейнай фабрыцы?
Каго сёння не было на працы?
Каму доктар даў бюлетэнь?
Каго ты наведаў у выхадны дзень?
Кім ты заўсёды ганарышся?
Аб кім ты расказаў сёння?

Ці атрымалася ў вас пры адказах на пытанні звязнае выказванне?
Запішыце адказы на пытанні паводле ўзору.

Узор. *Мая сястра працуе на швейнай фабрыцы.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**377.** Разгледзьце табліцу. Прачытайце і запомніце дапаможныя словы, якія аблегчаць скланенне назоўнікаў.

| **Склон** | **Дапаможнае слова** | **Склонавае пытанне** | **Прыклад** |
|---|---|---|---|
| Назоўны | ёсць | хто? што? | ліса, дом |
| Родны | няма | каго? чаго? | лісы, дома |
| Давальны | даць | каму? чаму? | лісе, дому |
| Вінавальны | бачу | каго? што? | лісу, дом |
| Творны | задаволены | кім? чым? | лісой, домам |
| Месны | гаварыць | аб кім? аб чым? | аб лісе, аб доме |

?! Праверце адно ў аднаго веданне назваў склонаў, склонавых пытанняў і дапаможных слоў.

**378.** Прачытайце запісы ў табліцы. Якіх пытанняў у ёй няма? Якіх формаў назоўнікаў не хапае?

| **Склон** | **Склонавыя пытанні** | | **Склонавыя формы** |
|---|---|---|---|
| Назоўны | хто? | ... | дзед, кветка |
| Родны | ... | чаго? | ..., кветкі |
| Давальны | ... | чаму? | дзеду, ... |
| Вінавальны | каго? | ... | дзеда, ... |
| Творны | кім? | ... | дзедам, кветкай |
| Месны | пры кім? | ... | пры дзеду, пры кветцы |

?! Запішыце змест табліцы ў сшытку. Замест шматкроп'яў устаўце прапушчаныя словы і пытанні.

**379.** Прачытайце верш. Што паэт называе ў вершы слязой?

### Сляза

На вуліцы ціха сягоння.
Лаўлю я сняжынкі рукой.
Адна з іх на цёплай далоні
Растала — і стала слязой.

*(Мікола Чырык)*

?! Знайдзіце ў вершы назоўнікі. Вызначце іх склон.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**380.** Прачытайце тэкст. Вызначце з дапамогай пытанняў склоны, у якіх выкарыстаны формы слова *фіялка*.

Вясною расцвіла прыгожая фіялка. Над фіялкай сталі кружыць пчолы. Яны падляталі да фіялкі і бралі салодкі нектар. Яны расказвалі аб пахучай фіялцы ўсім насякомым. Усе хацелі пазнаёміцца з фіялкай. Фіялку ўсе вельмі палюбілі. *(Вера Ляшук)*

?! Выпішыце формы слова *фіялка* ў тым парадку, як ідуць склоны. Форма якога склону адсутнічае? Пастаўце слова ў давальным склоне. Запішыце і гэтую форму.

## *Урок 7. Склоны і склонавыя пытанні*

**381.** Прачытайце тэкст.

Выпаў першы снег. Усё навокал стала белым ад снегу. Дзеці радуюцца пушыстаму снегу. Схаваліся пад снег зялёныя елачкі. Зіма засыпала снегам сцежкі і дарогі. Усюды на снезе відаць сляды і слядочкі. *(Іван Паўлоўскі)*

?! Звярніце ўвагу, як мяняюцца формы слова *снег.* Пастаўце пытанні да формаў гэтага слова. Назавіце склоны, у якіх стаіць назоўнік у кожным сказе.
Запішыце тэкст. Абазначце склон назоўніка *снег* і формаў гэтага слова.

**382.** Прачытайце словазлучэнні. Такія дзеясловы таксама дапамогуць скланяць назоўнікі. Дапаўняйце формы назоўніка *зіма* канчаткамі.

Н. Надыходзіць зім□
Р. Падрыхтаваліся да зім□
Д. Радуюцца зім□
В. Сустракаюць зім□
Т. Замярзае зім□
М. Напісаў аб зім□

?! Запішыце практыкаванне, дапісвайце прапушчаныя канчаткі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**383.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце незакончаныя сказы. Дапоўніце з дапамогай малюнкаў і пытанняў сказы назоўнікамі ў патрэбным склоне.







Хлопчык выконвае (ш т о?) ... .
Дзяўчынка любуецца (ч ы м?) ... .
Сярожа бярэ кавалак (ч а г о?) ... .
Птушка сядзіць (н а ч ы м?) ... .
Мама чытае казку (к а м у?) ... .

?! Запішыце сказы, што атрымаліся.
Абазначце склон назоўнікаў, якімі вы заканчвалі сказы.

**384.** Прачытайце тэкст.

Узімку **жыццё** ў **лесе** працягваецца. Снежнае **покрыва** размалявана **ўзорам**. Вось зусім танюсенькі **след** працягнуўся па **снезе**.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Абышоў ён **кусцік ядлоўцу** і раптам абарваўся. Гэта маленькая **мышка** выбегла са свайго падземнага **сховішча**. Але спалохалася моцнага **холаду** і зноў схавалася ў **адтуліне** глыбокай **норкі**. *(Паводле Вячаслава Стомы)*



***ядло́вец***

?! Пастаўце пытанні да выдзеленых слоў, вызначце іх склон. Запішыце тэкст, у дужках запішыце пытанні, абазначце склон выдзеленых назоўнікаў.

**385.** Прачытайце тэкст. Стаўце словы, што ў дужках, у патрэбным склоне. Ацаніце ўчынак хлопчыка. Ці прынёс ён карысць сваім учынкам?

**Крынічка**

**Пад высокім (дуб) шмат гадоў бруілася крынічка. Яна давала людзям (вада).**

**Аднаго разу сюды прыйшоў хлопчык. Ён любіў розныя пустыя забаўкі. Падняў камень і шпурнуў яго ў (крыніца). Камень упаў на дно (крыніца) і заткнуў гарлячок. Струменьчык (вада) спыніўся. Крыніца памерла.**

**Перасохла трава вакол (крыніца). Засох дуб. Падземныя раўчукі пацяклі ў іншае месца.**

**На (дуб) перасталі віць гнёзды птушкі. Змоўклі іх песні. Сумна зрабілася ў (луг).**

**Мінула шмат (гады). Хлопчык стаў (дзед). Прыйшоў ён на тое (месца). Толькі не было тут ні лугу, ні дуба, ні птушак, ні (крыніца).**

***(Паводле Васіля Сухамлінскага; пераклад з рускай мовы)***

?! Назавіце склон кожнага назоўніка, што стаіць у дужках. Спішыце, раскрываючы дужкі. Запісвайце назоўнікі ў патрэбным склоне. Абазначце гэтыя склоны.

**386.** Прачытайце тэкст.

З балкона нашай (...) **кватэры** мы бачым (...) **двор**. У двары зроблена дзіцячая (...) **пляцоўка**. Для маленькіх жыхароў (...) **дома** прывезлі жоўты (...) **пясок**.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Абапал (...) **тратуара** пасаджаны дрэвы і кусты. Каля пад’езда пастаўлена (...) **лаўка**.

?! Пастаўце пытанні да выдзеленых слоў, вызначце іх склон.
Спішыце тэкст, у дужках запішыце пытанні да выдзеленых назоўнікаў, абазначце іх склон.

## *Урок 8. Скланенне назоўнікаў множнага ліку*

**387.** Прачытайце словы.

Урач, урачы.

?! У якім ліку ўжыты назоўнікі?
Змяніце па склонах дадзеныя словы, запішыце паводле ўзору. Абазначце ў іх канчаткі.

Узор. *Н. (хто?) урач*□, *урач*[ы].

Параўнайце канчаткі назоўнікаў у адзіночным і множным ліку.

> *Успомніце!*
> Назоўнікі і ў адзіночным, і ў множным ліку маюць аднолькавыя скланавыя пытанні.

**388.** Прачытайце верш. Як ставіцца паэт да зімы?

У заснежаных лясах
сонечна і весела.
Там на дрэвах свой пасаг
ты ўначы развесіла.

Я люблю цябе, зіма:
ты да працы звыклая.
Колькі посцілак сама
ты на кроснах выткала!

Колькі ты на радасць мне
нарабіла сёлета



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

макрамэ і мулінэ
з серабра і золата.

Я любуюся табой
раніцаю ціхаю —
прыгажуняю такой
і такой майстрыхаю!

*(Уладзімір Скарынкін)*

**Паса́г** — маёмасць, якую даюць бацькі ці родзічы маладой, калі яна выходзіць замуж.



*макрамэ́*

**По́сцілка** — лёгкая саматканая коўдра або прасціна, што рассцілаюць на пасцель, якой накрываюць ці засцілаюць ложак, або кавалак тканіны, якой накрываецца ці завешваецца што-небудзь.

**Кро́сны** — ручны ткацкі станок.

**Макрамэ́** — мастацкі выраб з тоўстых плеценых нітак.

**Мулінэ́** — гатунак каляровых нітак для вышывання.

?! Знайдзіце ў вершы назоўнікі множнага ліку.
Пастаўце да іх пытанні ад слоў, з якімі назоўнікі звязаны па сэнсе.
Выпішыце спалучэнні слоў паводле ўзору.

Узор. *Сонечна і весела (у чым?) у лясах — М. ...*

**389.** Прачытайце тэкст. Пастаўце пытанні да назоўніка *памідоры* і яго формаў. У адзіночным ці множным ліку стаіць гэты назоўнік?

### Памідоры

Растуць чырванабокія памідоры на градцы. Без памідораў і агарод не агарод. Смачныя яны і ў свежым выглядзе і ў салатах. Гаспадыні памідоры соляць, марынуюць, кансервуюць, фаршыруюць, выкарыстоўваюць у якасці прыправы. Існуе больш за сто спосабаў кулінарнай перапрацоўкі памідораў. Памідорам прыдумалі назвы: «Перамога», «Талаліхін», «Белы наліў». У памідорах шмат



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

вітамінаў і іншых пажыўных рэчываў. Ешце памідоры, і будзеце здаровыя. *(Паводле Змітрака Марозава)*

?! Вызначце склон назоўніка *памідоры* ў кожным сказе, дзе ён ужыты. Аднолькавыя ці розныя склонавыя пытанні ў назоўнікаў у адзіночным і множным ліку?
Спішыце тэкст. Над формамі слова *памідоры* абазначце склон гэтага назоўніка.

**390.** Прачытайце. Назоўнікі, што ў дужках, змяніце, як патрабуе сэнс.

Стаіць (к а л я  ч а г о?) ... (дрэвы, боты, дзверы).
Прыйшоў (д а  к а г о?) ... (бацькі, людзі, суседзі).
Зварылі (з  ч а г о?) ... (буракі, макарона, яблыкі).
Дапамог (к а м у?) ... (дзеці, зайцы, вожыкі).

?! Запішыце. Абазначце канчаткі і склоны назоўнікаў.

**391.** Прачытайце тэкст, стаўце словы, што ў дужках, у патрэбным склоне.

Каля дома растуць (ліпы). Гэтым (ліпы) больш як сто гадоў. Птушкі спяваюць старым (дрэвы) песні. Вятры расказваюць (ліпы) свае казкі. Хмары нясуць зялёным (прыгажуні) вільгаць. Буйны́я росы дораць іх (лісты) свежасць.

?! Спішыце, раскрываючы дужкі. Абазначце склон назоўнікаў.

## *Урок 9. Тры скланенні назоўнікаў*

**392.** Прачытайце словы.

| | | |
|---|---|---|
| матуля | гарбуз | мыш |
| хата | неба | соль |
| вокладка | жыццё | ноч |
| лодка | вясло | сталь |
| зямля | поле | восень |
| казуля | дзіця | радасць |



**во́кладка**

?! Вызначце род слоў і іх канчаткі ў кожным слупку.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Запомніце!*
Назоўнікі маюць тры скланенні.
Да **1-га скланення** адносяцца назоўнікі **жаночага роду** з канчаткамі ***-а, -я***: *душа, сям'я, вада, зямля.*
Да **2-га скланення** адносяцца назоўнікі **мужчынскага роду** з нулявым канчаткам і **ніякага роду** з канчаткамі ***-а, -я, -е, -ё, -о***: *вецер, хлеб, дзень; поле, жыццё, мора.*
Да **3-га скланення** адносяцца назоўнікі **жаночага роду** з нулявым канчаткам: *аповесць, соль, мыш, Нарач.*

**393.** Разгледзьце табліцу.

| 1-е скланенне | 2-е скланенне | 3-е скланенне |
|---|---|---|
| ж. р.<br>канчаткі **-а, -я** | м. р. нулявы канчатак;<br>н. р. канчаткі **-а, -я, -о, -е, -ё** | ж. р.<br>нулявы канчатак |
| ваз-а, ракет-а, бабул-я | лось, мор-а, полым-я, святл-о, раздолл-е, галл-ё | Свіслач, соль |

?! Колькі скланенняў назоўнікаў у беларускай мове?
Прачытайце прыклады назоўнікаў. Спачатку тых, што адносяцца да 1-га скланення, затым — да 2-га і 3-га.

**394.** Прачытайце словы.

Машына, возера, ноч, таварыш, папера, сшытак, мужнасць, вядро, пяро, партфель, насенне, цемрадзь, гняздо, птушка, аловак, шчырасць, кніга, год, сэрца, прыгажосць, пісьмо, атрад, задача, моладзь, казка, падручнік, памяць, воблака, ракета, глуш, цяпло, вучань.

?! Запішыце словы ў тры радкі паводле ўзору.

Узор. *1-е скланенне — машына, ... .*
*2-е скланенне — возера, ... .*
*3-е скланенне — ноч, ... .*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**395.** Прачытайце словы.

Ноч, раніца, гора, сіла, гарачыня, канец, хвароба, вайна, святло, маладосць, поўдзень, захад.

?! Падбярыце да назоўнікаў антонімы.
Запішыце словы парамі, абазначце іх скланенне.

**396.** Прачытайце тэкст.

Шырокая **плынь** ракі дыхае **халадком** і **свежасцю**. Сцелецца над **зямлёю** асенні **туман**. **Вільгаць** адчуваецца ў **паветры**, кропелькамі асядае на **галіны** дрэў і траву. **Берагі ракі** робяцца шэрымі, сумнымі.

?! Запішыце тэкст. Вызначце скланенне выдзеленых назоўнікаў, калі патрэбна, пастаўце іх у назоўным склоне і адзіночным ліку.

**397.** Прачытайце словы.

Радасць, маладосць, трава, свежасць.
Яблык, парасон, вядро, мыш.
Карова, вяроўка, цвік, рыдлёўка.
Зямля, воблака, насенне, свята.

?! Вызначце скланенне кожнага слова.
Знайдзіце лішняе слова ў кожным радку. Абгрунтуйце сваё меркаванне.
Запішыце ўсе словы, акрамя лішняга.

## *Урок 10. Першае скланенне назоўнікаў*

**398.** Прачытайце словы. Якога яны роду? Вызначце канчаткі ў гэтых словах.

Зіма, вясна, песня, брыгада, майстэрня, дарога.

?! Назавіце іншыя словы жаночага роду з канчаткамі ***-а, -я***.
Запішыце шэраг такіх слоў. Абазначце ў іх канчаткі.

*Запомніце!*
Да **1-га скланення** адносяцца назоўнікі **жаночага роду** з канчаткамі ***-а, -я***: *душа, сям’я, вада, зямля.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**399.** Разгледзьце табліцу. Звярніце ўвагу на канчаткі назоўнікаў 1-га скланення.

| Склон | Пытанні | Прыклады | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Н. | хто? што? | хво-я | сястр-а | зямл-я | школ-а |
| Р. | каго? чаго? | хво-і | сястр-ы | зямл-і | школ-ы |
| Д. | каму? чаму? | хво-і | сястр-ы | зямл-і | школ-е |
| В. | каго? што? | хво-ю | сястр-у | зямл-ю | школ-у |
| Т. | кім? чым? | хво-яй (-яю) | сястр-ой (-ою) | зямл-ёй (-ёю) | школ-ай (-аю) |
| М. | аб кім? аб чым? | аб хво-і | аб сястр-ы | аб зямл-і | аб школ-е |

?! Запішыце змест табліцы ў сшытку. Абазначце канчаткі назоўнікаў 1-га скланення.

**400*.** Прачытайце, як скланяюцца словы *вучаніца, парта, кніга, сям'я.*

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Н. (ёсць) хто? што? | вучаніца | парта | кніга | сям'я |
| Р. (няма) каго? чаго? | вучаніцы | парты | кнігі | сям'і |
| Д. (даць) каму? чаму? | вучаніцы | парце | кнізе | сям'і |
| В. (бачу) каго? што? | вучаніцу | парту | кнігу | сям'ю |
| Т. (задаволены) кім? чым? | вучаніцай | партай | кнігай | сям'ёй |
| М. (гаварыць) аб кім? аб чым? | аб вучаніцы | аб парце | аб кнізе | аб сям'і |

?! У якіх склонах у назоўнікаў 1-га скланення аднолькавыя канчаткі? Запішыце гэтыя два склоны з прыкладамі ў сшытку. Абазначце канчаткі ў словах.

**401.** Прачытайце словазлучэнні. Праскланяйце іх.

Наша краіна, родная вёска, марозная зіма.

?! Запішыце словазлучэнні паводле ўзору. Абазначце канчаткі ў назоўнікаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У з о р.
*Н. наша краін-*[*а*]
*Р. нашай краін-*[*ы*]
*Д. нашай краін-*[*е*]
*В. нашу краін-*[*у*]
*Т. нашай краін-*[*ай*]
*М. аб нашай краін-*[*е*]

**402.** Праскланяйце назоўнікі 1-га скланення.

Рыба, патэльня, вёска.

?! Запішыце назоўнікі, абазначце канчаткі ў склонах.

## *Урок 11. Змяненне па склонах назоўнікаў 1-га скланення (давальны і месны склоны)*

**403.** Прачытайце пытанні. Пры адказах выкарыстоўвайце назоўнікі 1-га скланення. У якім склоне яны стаяць?

Каму вучні падрыхтавалі кветкі?
Каму далі мянушку Зорка?
Каму споўнілася шэсцьдзясят гадоў?
Каму мама купіла новую сукенку?

?! Адкажыце на пытанні пісьмова. Падкрэсліце назоўнікі 1-га скланення, якія стаяць у давальным склоне. Абазначце канчаткі.

**404.** Прачытайце пытанні. Пры адказах выкарыстоўвайце назоўнікі 1-га скланення. У якім склоне будуць гэтыя назоўнікі?

Дзе жыве рыба?
Дзе жыве сабака?
Дзе жыве мышка?
Дзе жыве кошка?

?! Запішыце адказы на пытанні. Падкрэсліце назоўнікі 1-га скланення, якія стаяць у месным склоне. Абазначце ў іх канчаткі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**405.** Прачытайце словы і пытанні. З дапамогай пытанняў складзіце словазлучэнні з назоўнікамі 1-га скланення.

Напісаў (каму?) ..., прысвяціў (чаму?) ..., дапамог (каму?) ..., гутарылі (аб чым?) ..., вырасла (на чым?) ..., расказваў (аб чым?) ... .

?! У якіх склонах ужыты назоўнікі 1-га скланення?
Запішыце словазлучэнні. Абазначце склоны назоўнікаў і канчаткі.

**406.** Прачытайце словазлучэнні. Словы, што ў дужках, пастаўце ў месным склоне.

Гуляць па (алея), быць у (вёска), купацца ў (рэчка), стаяць у (чарга), пераначаваць у (леснічоўка), ляжаць на (падлога), пабываць на (выстаўка), вісець на (сліва), ісці па (сцежка), напісаць на (папера), спыніцца пры (хадзьба).

?! Запішыце словазлучэнні. Абазначце склоны назоўнікаў і канчаткі.

**407*.** Прачытайце тэкст. Назоўнікі, што ў дужках, змяняйце, як патрабуе сэнс.

Шмат турбот у зімы. Рыхтуе белую коўдру кожнай (галінка) і кожнай (траўка). (Сасна) і (елка) надзене яна пушыстыя шапкі на верхавінкі. Укрые (яблынька) і (сліўка) мяккай посцілкай. Кожнай (хата) змайструе зіма іскрысты высокі дах. (Рэчка) падарыць бліскучую стужку з лёду.

?! Запішыце тэкст, раскрываючы дужкі. Абазначце склон назоўнікаў і канчаткі.

**408.** Прачытайце. Падбярыце да дзеясловаў па два назоўнікі, стаўце іх у патрэбным склоне.

Спяваць (аб чым?) ..., ... .
Плысці (па чым?) ..., ... .
Працаваць (дзе?) ..., ... .
Ездзіць (на чым?) ..., ... .



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Купіць (к а м у?) ..., ... .
Радавацца (ч а м у?) ..., ... .
Прыгатаваць (к а м у?) ..., ... .

С л о в ы д л я в ы б а р у: *ферма, фабрыка; Радзіма, прырода; сяброўка, кошка; вада, рака; электрычка, машына; адзнака, паштоўка; бабуля, сястра.*

?! Запішыце, абазначце канчаткі назоўнікаў, вызначце іх склоны. Складзіце і запішыце сказ з адным словазлучэннем на выбар.

## *Урок 12. Змяненне па склонах назоўнікаў 1-га скланення (вінавальны і назоўны склоны)*

**409.** Прачытайце словазлучэнні. Вызначце склон назоўнікаў 1-га скланення.

Люблю (к а г о?) маму, спяваю (ш т о?) песню, слухаю (ш т о?) казку, шкадую (к а г о?) бабулю.

?! Спішыце словазлучэнні.
Абазначце склон і канчаткі назоўнікаў.

**410.** Прачытайце пары сказаў, у якіх ужыты аднолькавыя назоўнікі 1-га скланення. Вызначце, у якіх склонах стаяць гэтыя назоўнікі.

Развітальная песн.. журавоў даносіцца да людзей. Сваю задуменную песн.. пяе векавы бор.
Зім.. прыйшла раптоўна. На ўсю зім.. паснулі палеткі і лугі.
Зямл.. адпачывала. Снег укрыў зямл.. белай пушыстай коўдрай.

*(Іван Паўлоўскі)*

?! Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя канчаткі. Абазначце склоны назоўнікаў 1-га скланення.

**411*.** Прачытайце тэкст. Якую яшчэ назву можна яму даць?

### Кошка і вавёрка

У дзяцей была кошка Мурка. У яе нарадзіліся кацяняты. Раптоўна кацяняты памерлі. Кошка вельмі сумавала па іх. Аднойчы



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

дзеці знайшлі ў лесе маленькую вавёрачку і прынеслі дамоў. Яны паклалі яе каля кошкі. Мурка абнюхала вавёрачку. Затым палізала яе і пачала карміць. Так і выгадавала кошка вавёрку. Мурка нават вучыла яе лавіць мышэй. Але вавёрка гэтую навуку так і не зразумела. *(Паводле Ірыны Гімпель)*

?! Знайдзіце ў тэксце назоўнікі 1-га скланення, якія стаяць у вінавальным склоне.
Пастаўце пытанні да гэтых назоўнікаў.
Выпішыце сказы з такімі назоўнікамі паводле ўзору. Стрэлачкай пакажыце, ад якога слова вы ставілі пытанне.

Узор. *Так і выгадавала кошка вавёрку.*

**412.** Прачытайце тэкст. Назоўнікі, што ў дужках, змяняйце, як патрабуе сэнс.

Лес здаўна служыць чалавеку. У лесе людзі грыбы і ягады збіраюць. З дрэва і (мэбля) робяць, і (папера). А галоўнае — умее лес і (вада), і вецер утаймоўваць. Наляціць вецер, ды ніяк не можа прабрацца праз лісце і галлё дрэў. І з вадой лес па-свойму спраўляецца. Ён не дае снегу раставаць і ў (рэчка) уцякаць.

?! Запішыце тэкст, апускаючы дужкі. Абазначце склон назоўнікаў і канчаткі.

**413.** Прачытайце словазлучэнні ў назоўным склоне. Пастаўце іх у вінавальным склоне.

| Н. | В. |
|---|---|
| дарагая радзіма | … |
| шырокая рака | … |
| цікавая кніга | … |
| свая галава | … |

?! Запішыце словазлучэнні ў назоўным і вінавальным склонах. Абазначце канчаткі. Якія канчаткі ўжываюцца ў вінавальным склоне?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 13. Змяненне па склонах назоўнікаў 1-га скланення (родны склон)*

**414.** Прачытайце незакончаныя сказы. Дапоўніце іх.

На вокладцы **кнігі** напісаны яе назва і ... .
Рукі **матулі** самыя ... .
Краявіды **радзімы** самыя прыгожыя і ... .

?! З дапамогай пытанняў вызначце склон выдзеленых назоўнікаў. Запішыце закончаныя сказы. Абазначце склон і канчаткі выдзеленых назоўнікаў.

**415.** Прачытайце словы. З дапамогай пытанняў складзіце словазлучэнні з назоўнікамі 1-га скланення.

Падарунак для (каго?) ..., не прынёс (чаго?) ..., скаціўся (з чаго?) ..., сумна (без каго?) ..., недалёка (ад чаго?) ... .

?! У якім склоне ўжыты назоўнікі 1-га скланення? Якія яны маюць канчаткі ў родным склоне?
Запішыце словазлучэнні. Абазначце канчаткі назоўнікаў роднага склону.

**416.** Прачытайце загадкі. Адгадайце іх з дапамогай літар у рамках.

Гэтую загадку адгадайце вы:
з галавой ніжэйшая,
чым без галавы.

ааупшдк

Хістаюцца-вагаюцца,
усё праўды дамагаюцца.
Нікога не падмане,
а скажа: так ці не.
*(Паводле Анатоля Клышкі)*

гваі

?! Запішыце загадкі разам з адгадкамі.
Знайдзіце ў загадках назоўнікі 1-га скланення, якія ўжыты ў родным склоне. Абазначце ў іх канчаткі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**417*.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў ім назоўнікі 1-га скланення.

**Рыжая драпежніца**

З-пад вербалозу ўзнялася старая качка і апусцілася паміж купін балота. Ціха падкрадвалася да яе рыжая лісіца. Уся ўвага лісіцы была прыкавана да купіны. Лісіцу вабіла ціхае пакракванне качкі. Скачок! Качка ў зубах! З усяе сілы тая замахала доўгімі крыламі і ледзь вырвалася з вострых зубоў лісіцы. А ў зубах рыжай драпежніцы застаўся толькі хвост качкі. Лісіца са злосцю выплюнула пер'е і пабегла шукаць іншую пажыву. *(Паводле Ірыны Гімпель)*

**Вербало́з** — куст ці дрэва сямейства вярбовых.

Вызначце, у якіх склонах ужыты ў тэксце назоўнікі 1-га скланення.
Прачытайце тэкст уважліва яшчэ раз.
Запішыце яго пад дыктоўку.

Праверце дыктанты адно ў аднаго.
Абазначце канчаткі назоўнікаў 1-га скланення.

**418.** Прачытайце тэкст.

Аднойчы я сядзеў на беразе (рака). Вакол стаяла цішыня. Раптам з (вада) паказалася чорная галоўка, а потым высунуўся ўвесь звярок. Гэта была выдра. З гладкай (скура) выдры сцякалі кропелькі (вада). На беразе выдра агледзелася і заўважыла кветкі, якія выглядалі з (трава). З-пад (галінка) (вярба) нечакана выскачыла маленькая жабка і плюхнулася ў ваду. Выдра ўмомант знікла.

Пастаўце словы, што ў дужках, у родным склоне.
Запішыце тэкст, абазначце канчаткі ў назоўнікаў роднага склону.

## *Урок 14. Змяненне па склонах назоўнікаў 1-га скланення (творны склон)*

**419.** Прачытайце пытанні. Разгледзьце малюнкі. Адкажыце на пытанні з дапамогай малюнкаў.

Чым піша вучань?
З чым гуляе Наташа?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

З кім Паша хадзіў у краму?
Дзе схаваўся заяц?









?! Адкажыце на пытанні пісьмова.
Абазначце канчаткі назоўнікаў творнага склону.

**420*.** Прачытайце назоўнікі, якія стаяць у назоўным склоне. З дапамогай пытанняў кім? чым? і прыназоўнікаў пастаўце іх у творным склоне.

| Н. | Т. |
|---|---|
| вучаніца | перад (кім?) … |
| бяроза | пад (чым?) … |
| гара | пад (чым?) … |
| рака | за (чым?) … |
| настаўніца | з (кім?) … |



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

| | |
|---|---|
| дарога | перад (чым?) … |
| матуля | з (кім?) … |
| праўда і хлусня | паміж (чым?) … і (чым?) … |
| нядзеля | перад (чым?) … |
| парта | за (чым?) … |

Запішыце назоўнікі ў творным склоне. Пастаўце ў словах націск. Якія галосныя ўжываюцца пад націскам, а якія — без націску?

**421.** Прачытайце народныя загадкі. Адгадайце іх па першых літарах.

На дварэ гарою, а ў хаце вадою.

| | | | |
|---|---|---|---|
| с | | | г |

Пад адной шапкай чатыры панічы жывуць.

| | | | |
|---|---|---|---|
| с | | | л |

Пад зямлёю жалезны крот рые.

| | | | |
|---|---|---|---|
| п | | | г |

Знайдзіце ў загадках назоўнікі 1-га скланення, якія стаяць у творным склоне. Запішыце іх. Пастаўце націск. Абазначце канчаткі.

**422.** Прачытайце верш. Добрая памочніца ў мамы ці не вельмі? Адкажыце на пытанне, якое змешчана ў вершы.

### Памочніца

Ледзьве **мама** ў **кватэру** —
да яе спяшае **Вера**.
І дакладвае ёй з ходу
пра вялікую **работу**.
— **Я вячэру** згатавала!
(**У муцэ** чамусьці **зала**.)
— Стол я выцерла! (Але
пісягі на тым стале.)



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Я мялá, як ты вучыла!
(У куце **мятлу** забыла.)
— Я памыла сарафан!
(**У ванне** — мора-акіян.)
— Вось якая я чысцюля!
...Разгубілася **матуля**,
**думу** думае: як быць?
Ці хваліць, ці не хваліць?

*(Галіна Каржанеўская)*

**Пісягí** — *тут:* брудныя сляды.

Вызначце склоны выдзеленых назоўнікаў.
Выпішыце назоўнікі з тэксту і абазначце іх склоны.

**423.** Прачытайце словы. З кожнага рада слоў складзіце сказ.

**Школа**, дзеці, у, спяшаліся.
Ішлі, лес, яны, праз, **сцежка**.
Раслі, **сцежка**, каля, кветкі.
Букет, вучні, **настаўніца**, сабралі.

Запішыце сказы, якія атрымаліся. Выдзеленыя назоўнікі пастаўце ў патрэбным склоне. Абазначце склон і канчаткі ў выдзеленых словах.

## *Урок 15. Змяненне па склонах назоўнікаў 2-га скланення*

**424.** Прачытайце назоўнікі. Вызначце іх род.

Чалавек, лес, сябар, неба, поле, сшытак, алень, сонца.

Назавіце канчаткі ва ўсіх гэтых назоўніках.
Спішыце словы. Абазначце іх род. Выдзеліце канчаткі.

*Успомніце!*
Нельга сказаць, што ў словах *чалавек, лес* і падобных няма канчатка.
У гэтых словах канчатак нулявы. Ён абазначаецца так: *чалавек*□.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Запомніце!*
Да **2-га скланення** адносяцца назоўнікі **мужчынскага роду** з нулявым канчаткам і **ніякага роду** з канчаткамі ***-а, -я, -е, -ё, -о***: *вецер, хлеб, дзень; жыццё, вядро, поле, мора.*

**425*.** Прачытайце назоўнікі. Назавіце тыя, якія адносяцца да 2-га скланення.

Горад, неба, газета, надвор'е, таполя, дуб, дошка, стол, парта, печ, ноч, страха, рака, вецер, дно, акно, моладзь, сшытак, ручка.

?! Выпішыце назоўнікі 2-га скланення. Абазначце іх род і канчаткі.

**426.** Разгледзьце табліцу. Звярніце ўвагу на канчаткі назоўнікаў 2-га скланення.

| Склон | Дапаможнае слова | Пытанні | Прыклады |
|---|---|---|---|
| Н. | ёсць | хто?<br>што? | гаспадар-, таварыш-, вучань-, шчасц-е, акн-о |
| Р. | няма | каго?<br>чаго? | гаспадар-а, таварыш-а, вучн-я, шчасц-я, акн-а |
| Д. | даць | каму?<br>чаму? | гаспадар-у, таварыш-у, вучн-ю, шчасц-ю, акн-у |
| В. | бачу | каго?<br>што? | гаспадар-а, таварыш-а, вучн-я, шчасц-е, акн-о |
| Т. | задаволены | кім?<br>чым? | гаспадар-ом, таварыш-ам, вучн-ем, шчасц-ем, акн-ом |
| М. | гаварыць | аб кім?<br>аб чым? | аб гаспадар-у, аб таварыш-у, аб вучн-ю, аб шчасц-і, аб акн-е |

?! Запішыце ў сшытку назвы склонаў і прыклады змянення назоўнікаў 2-га скланення. Абазначце канчаткі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**427.** Праскланяйце наступныя назоўнікі 2-га скланення.

| | | | |
|---|---|---|---|
| Н. хто? што? | бераг | вучань | сонца |
| Р. каго? чаго? | … | вучня | … |
| Д. каму? чаму? | берагу | … | сонцу |
| В. каго? што? | бераг | вучня | … |
| Т. кім? чым? | … | … | сонцам |
| М. аб кім? аб чым? | аб беразе | аб вучню | … |

?! Запішыце, устаўляючы прапушчаныя формы назоўнікаў.

**428.** Прачытайце словы.

Хмара, крок, сэрца, навальніца, зорка, воблака, жыццё, салавей, мора, луг, вільгаць, трактар, гай, медзь, здароўе, раніца, святло, мазь, пустазелле, лётчык, студэнт, мель, бервяно, плуг, вядро, сын, крыло, дрэва, арэх, надвор’е.

?! Выпішыце назоўнікі 2-га скланення, абазначце ў іх канчаткі.

## *Урок 16. Змяненне па склонах назоўнікаў 2-га скланення (назоўны і вінавальны склоны)*

**429.** Прачытайце.

Прачытаць артыкул, ..., ... .
Вымыць акно, ..., ... .
Купіць мёд, ..., ... .

?! Дапішыце да дзеясловаў назоўнікі 2-га скланення. Вызначце склон назоўнікаў, абазначце ў іх канчаткі.
Складзіце і запішыце сказы з гэтымі словазлучэннямі (на выбар).

**430*.** Прачытайце тэкст. Якую назву можна яму даць?

Снежань — самы пахмурны месяц. У марозным халодным паветры кружацца ўзорыстыя сняжынкі, укрываючы зямлю белай пярынай.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Як зачараваны стаіць лес. Апусцілі пачарнелыя галінкі дрэвы, і толькі сосны, яліны ды кусты ядлоўцу зялёныя. Сям-там выглядаюць з-пад снегу вечназялёныя кусцікі бруснічніку і верасу.

Цяжка ўзімку жыхарам лесу. Глыбокі снег ускладняе ім пошук ежы, не дазваляе рабіць доўгія пераходы ў шуканні корму. Некаторыя звяры мяняюць футра, робяцца бялюткімі, як снег. Гэта ласка, гарнастай, заяц-бяляк. Паспрабуй разгледзі іх сярод белых прастораў.

Шнырыць па полі ў пошуках ежы лісіца. Выпадковым кормам даводзіцца перабівацца зайцам. Глыбокай ноччу выходзяць на дарогу воўк з ваўчыцай. У зімовай спячцы мядзведзь і барсук. У развіліне сагнутага дрэва пільнуе сваю здабычу рысь. *(З календара «Родны край»)*

?! Знайдзіце ў тэксце назоўнікі 2-га скланення, якія стаяць у назоўным склоне. Выпішыце іх, абазначце канчаткі. Нулявы канчатак таксама абазначайце.

*Успомніце!*
Назоўнік у назоўным склоне ў сказе з'яўляецца дзейнікам — галоўным членам сказа.

**431.** Прачытайце словазлучэнні з назоўнікамі 2-га скланення, якія стаяць у назоўным склоне. Пастаўце гэтыя назоўнікі ў вінавальным склоне.

| Н. | В. |
|---|---|
| ёсць (хто? што?) | бачу (каго? што?) |
| родны дом | … |
| яблыневы сад | … |
| чыстае акно | … |
| родны брат | … |
| добры таварыш | … |

?! Жывых істот ці нежывыя прадметы абазначаюць назоўнікі, формы якіх аднолькавыя ў назоўным і вінавальным склонах?
Запішыце словазлучэнні ў вінавальным склоне. Абазначце канчаткі назоўнікаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**432.** Прачытайце пары сказаў. Вызначце, дзе выдзелены назоўнік стаіць у назоўным склоне, а дзе — у вінавальным.

**Стол** стаяў пасярод пакоя. Усе селі за **стол** вячэраць.

Ад нечаканага моцнага ветру **акно** адчынілася. У пакой праз **акно** пранікаў цёплы сонечны прамень.

**Дуб** стаяў на беразе Нёмана. Нават самы моцны вецер не мог нахіліць **дуб.**

Спішыце сказы. Падкрэсліце ў сказах дзейнікі адной лініяй. Абазначце склон выдзеленых назоўнікаў.

**433.** Прачытайце верш. Вывучыце яго на памяць. Знайдзіце ў вершы два назоўнікі 2-га скланення, якія стаяць у вінавальным склоне.

Люблю я прыволле  
шырокіх палёў,  
зялёнае мора  
буйны́х каласоў.  
*(Якуб Колас)*

Запішыце верш па памяці.

Праверце напісанне верша адно ў аднаго.

**434.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў ім назоўнікі 2-га скланення.

## Зімою

Хораша ў полі зімою!

Серабрыцца снег, мігцяць незлічоныя мільёны брыльянцістых іголак. **Мароз шчыпле за шчокі, за нос. Забіраецца за каўнер. Невідзімкаю прабіраецца пад кажух са сваёй халоднай пяшчотай.**

Надыходзіць вечар. Сінеюць снегавыя гурбы. Ад бледнага месяца цягнуцца празрыстыя промні і не ззяюць, а тлеюць над лесам і полем.

Сінія далі плывуць за кустамі, кладуцца ў баразёнкі, у снегавыя сумёты. Зоры блішчаць у марозным паветры. **І салодкі сум закрадаецца ў сэрца.** *(Паводле Міхася Лынькова)*

У выдзеленых сказах знайдзіце назоўнікі 2-га скланення, якія стаяць у вінавальным склоне.

Выпішыце гэтыя сказы, абазначце назоўнікі вінавальнага склону.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 17. Змяненне па склонах назоўнікаў 2-га скланення (родны склон)*

**435.** Прачытайце назоўнікі 2-га скланення ў назоўным склоне. Пастаўце іх у родным склоне.

| Н. | Р. |
|---|---|
| ёсць **хто? што?** | няма **каго? чаго?** |
| брат | … |
| поле | … |
| хлеб | … |
| вецер | … |

?! Запішыце словы ў назоўным і родным склонах. Абазначце канчаткі назоўнікаў у родным склоне.

**436*.** Прачытайце словазлучэнні.
Знайдзіце ў кожным словазлучэнні назоўнікі 2-га скланення роднага склону.

Раскаты грому, вецер з поўдня, кроплі дажджу, ускраіна лесу, шмат часу, ураджай ячменю, матор трактара, гул камбайна, кілаграм цукру, рогі аленя, верхавіна дуба, пах бэзу.

?! Спішыце словазлучэнні. Абазначце канчаткі ў назоўнікаў роднага склону.
Пакажыце з дапамогай стрэлачак паводле ўзору, ад якога слова ставілі пытанне.

Узор. *Раскаты гром-[у]*, …

**437.** Прачытайце прыназоўнікі. Змяніце назоўнікі ў дужках, каб яны мелі форму роднага склону.

З (горад), сярод (поле), да (сонца), каля (трактар), вакол (стол), ад (Мінск), да (Гомель), без (розум), з-за (шум), для (чай), з (пясок).



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Запішыце назоўнікі з прыназоўнікамі ў родным склоне. Абазначце канчаткі назоўнікаў.

Якія канчаткі могуць быць у назоўнікаў 2-га скланення ў родным склоне?

**438.** Прачытайце тэкст. Якую назву можна яму даць?

Галадаюць зімой і птушкі. Снегіры выдзёўбваюць насенне палын.., ясен.., клён.. . Пупышкамі бярозы і ягадамі кормяцца рабчыкі і цецерукі.

Цяжка шэрай курапатцы. Так ужо склалася, што яна прыстасавана да жыцц.. на адкрытых месцах. Але зямля ўкрыта суцэльнай скарынкай снег.., яго не заўсёды ўдаецца прабіць птушкам. Каля жытл.. чалавек.. можна сустрэць чачотак, сініц. Асабліва шмат галак, варон, сарок.

Хутка бягуць кароткія зімовыя дні. Ужо і навагодняя ноч не за гарамі. Скончыцца снежань, і загрукае лютымі маразамі студзень — самы халодны месяц года. *(З календара «Родны край»)*

?! Запішыце назву, якую вы далі тэксту.

Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя канчаткі назоўнікаў 2-га скланення роднага склону.

**439.** Прачытайце тэкст, устаўляючы патрэбныя канчаткі. Якую назву можна даць тэксту?

Каля сасновага бор.. праходзіла чыгунка. Ля самых пуцей ляжалі роўныя кучы вугал.. . Яны былі зацярушаны крупінкамі першага снег.. . Ад нязвыклага зіхацення снег.. Сяргейка зажмурыў вочы. Хлопчык не баяўся холад.. і мароз.. . Ён увесь час назіраў за цягнікамі. Ад іх грукат.. і стук.. ўздрыгвала пад нагамі зямля. Але Сяргейка не палохаўся. Да ўсяго гэтага ён прывык з дзяцінств.. .

?! Запішыце назву тэксту.

Спішыце тэкст, устаўляючы патрэбныя канчаткі ў словах. Вызначце ў іх склон.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 18. Змяненне па склонах назоўнікаў 2-га скланення (давальны склон)*

**440.** Прачытайце назоўнікі ў назоўным склоне. Пастаўце іх у давальным склоне.

| Н. | Д. |
|---|---|
| хто? што? | каму? чаму? |
| мастак | мастаку |
| сшытак | ... |
| пенал | ... |
| вецер | ... |
| шчасце | ... |
| хлопчык | ... |

?! Запішыце назоўнікі ў давальным склоне. Абазначце іхканчаткі.

**441.** Прачытайце дзеясловы і назоўнікі. Складзіце словазлучэнні дзеяслоў + назоўнік. Пастаўце пытанне ад дзеяслова да назоўніка. У якім склоне ўжываюцца тут назоўнікі?

Радавацца, уручаць, даручаць, даць.
Герой, брат, поспех, вучань.

?! Запішыце словазлучэнні паводле ўзору.

Узор. *Радавацца* (чаму?) *поспеху (Д.), ... .*

**442*.** Прачытайце тэкст. Якую назву можна яму даць?

Дзед быў на рынку і купіў яблык. Пакруціў яго ў руцэ, хацеў з’есці, ды перадумаў. Дома ён **аддаў** яблык унуку Сярожу.

Хлопчык толькі хацеў адкусіць, як прыйшоў з працы стомлены тата. Ён пачаставаў тату.

Тата **падзякаваў** Сярожу, палюбаваўся яблыкам і **перадаў** яго маленькаму Міхаську.

Хлопчык дастаў са скрынкі ножык і разрэзаў яблык на чатыры часткі. Смачны быў яблык. Салодкі, сакавіты. Усе елі і хвалілі Міхаську. *(Паводле Васіля Хомчанкі)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Ад выдзеленых дзеясловаў пастаўце пытанні да назоўнікаў. Вызначце склон назоўнікаў.
Запішыце словазлучэнні, што атрымаліся.

**443.** Прачытайце дзеясловы. Дадайце да кожнага з іх назоўнікі 2-га скланення ў давальным склоне.

Падарыў (каму?) ..., ... .
Дапамог (каму?) ..., ... .

?! Запішыце дзеясловы з назоўнікамі. Абазначце канчаткі назоўнікаў 2-га скланення ў давальным склоне.

**444.** Уявіце, што ў вашага малодшага брата, бацькі і дзядулі хутка дні нараджэння. У вас ёсць такія падарункі: цацачны паравоз, чай, кніга. Каму вы падорыце паравоз? Каму — чай? Каму — кнігу?
Адкажыце, ужываючы словы *брат, бацька, дзядуля* ў давальным склоне.
Складзіце сказы, запішыце іх.

## *Урок 19. Змяненне па склонах назоўнікаў 2-га скланення (творны склон)*

**445.** Прачытайце назоўнікі ў назоўным склоне. Пастаўце іх у творным склоне.

| Н. | Т. |
|---|---|
| хто? што? | кім? чым? |
| стол | пад сталом |
| гаспадар | з гаспадаром |
| снег | пад ... |
| сын | за ... |
| лес | над ... |
| калектыў | з ... |

?! Запішыце назоўнікі 2-га скланення ў творным склоне. Выкарыстайце прыназоўнікі. Абазначце канчаткі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**446.** Прачытайце дзеясловы. Разгледзьце малюнкі. З дапамогай малюнкаў і пытання ч ы м? складзіце словазлучэнні.








***ручні́к***

Мыць …, маляваць …, прасаваць …, выцірацца …, гуляць …, месці … .

?! Запішыце словазлучэнні. Абазначце канчаткі назоўнікаў у творным склоне.

**447*.** Прачытайце тэкст. Ці зразумелі вы, чаму людзі зімой носяць цёплае адзенне?

***дзве́ры***

**Чаму адзенне грэе?**

Перш за ўсё трэба спытацца ў сябе: ці праўда, што адзенне грэе?

У сапраўднасці ж не кажух грэе чалавека, а, наадварот, чалавек аддае цяпло **кажуху**. Ды хіба можа быць інакш? Кажух жа — не печка. «Вось як? — спытаецеся вы. — А чалавек хіба печка?»

Вядома, печка! Стравы, якія мы з'ядаем, — гэта дровы, якія ў нас згараюць. **Агню** пры гэтым не відаць, але мы здагадваемся пра яго па тым цяпле, якое адчуваем у целе.

Цяпло гэта трэба берагчы. Каб не выпускаць яго на вуліцу, мы будуем дамы з тоўстымі сценамі, абабіваем дзверы **лямцам.** Тое самае і з **адзеннем.** Замест таго каб грэць сваім **целам** паветра ў пакоі



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ці на вуліцы, мы грэем **адзенне**, а яно захоўвае гэта цяпло каля нас. Вядома, адзенне наша таксама аддае **цяпло**, але не так хутка, як наша цела.

Такім чынам, мы прымушаем **адзенне** мерзнуць замест нас.

*(Паводле Канстанціна Ушынскага; пераклад з рускай мовы)*

**Ля́мец** — тоўсты, шчыльны матэрыял, зваляны з шэрсці, воўны.

?! Вызначце склон выдзеленых назоўнікаў.
Спішыце сказы, у якіх ёсць назоўнікі 2-га скланення ў творным склоне.

**448.** Прачытайце дзеясловы. Складзіце словазлучэнні дзеяслоў + назоўнік.

Працаваць (кім?) ..., ... .
Кіраваць (чым?) ..., ... .

?! Дапоўніце дзеясловы назоўнікамі. Абазначце канчаткі назоўнікаў 2-га скланення ў творным склоне.

## *Урок 20. Змяненне па склонах назоўнікаў 2-га скланення (месны склон)*

**449.** Прачытайце назоўнікі. Пастаўце іх у месным склоне. Ужывайце прапанаваныя прыназоўнікі.

| Н. | М. |
|---|---|
| стол | на стале |
| мароз | на ... |
| лес | у ... |
| дупло | у ... |
| падарожжа | у ... |
| агарод | на ... |
| жыта | у ... |

?! Запішыце назоўнікі ў месным склоне. Абазначце іх канчаткі. Падкрэсліце прыназоўнікі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**450.** Разгледзьце малюнкі. Скажыце, дзе што знаходзіцца.






?! Запішыце словазлучэнні н а з о ў н і к + н а з о ў н і к 2-га скланення меснага склону. Абазначце канчаткі ў назоўнікаў меснага склону. Падкрэсліце прыназоўнікі.

**451.** Прачытайце. Назоўнікі, што ў дужках, пастаўце ў месным склоне.

Высушыць на (сонца), працаваць на (двор), сядзець на (бераг), прынесці ў (вядро), убачыць па (тэлевізар), убачыць на (здымак), жыць у (горад), сустрэцца на тым (тыдзень), расказаць аб (здарэнне).

?! Запішыце, апускаючы дужкі. Стаўце назоўнікі ў месным склоне. Абазначце іх канчаткі.
Якія канчаткі могуць быць у назоўнікаў 2-га скланення ў месным склоне?

**452.** Прачытайце тэкст. Стаўце слова *мастак* у патрэбнай склонавай форме.

Мой сусед — (мастак). (Мастак) не было дома, калі з пошты прынеслі тэлеграму. Гэта было віншаванне (мастак) з нагоды



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

адкрыцця выставы. Убачыўшы (мастак), я перадаў яму тэлеграму. Усе суседзі зацікавіліся (мастак), бо пра яго карціны была перадача па тэлебачанні. Аб (мастак) напісалі таксама ў газеце. *(Мікола Яленскі)*

**Нагóда** — падстава для чаго-небудзь.

?! Спішыце сказы, апускаючы дужкі. Абазначце склоны і канчаткі слова *мастак* у кожным сказе.

**453*.** Прачытайце тэкст. Ці бачылі вы такіх птушак у лесе? Як яны выглядаюць? Чаму яны так называюцца?

**Крыжадзюб**



На зялёных, зацярушаных **снегам** галінах гушкаюцца, лазяць, куляюцца і вісяць дагары нагамі невялікія чырванаватыя і зеленаватыя птушкі. Сваімі моцнымі, крыху скрыжаванымі дзюбамі яны вылушчваюць **насенне** з жоўтых яловых шышак.

Гэта — крыжадзюбы. Яны не баяцца ні **снегу**, ні **марозу**. Дзяцей сваіх яны выводзяць не толькі летам, але і зімой. У яловым **бары** можна часам убачыць, як у самы люты **мароз** кормяць крыжадзюбы сваіх маленькіх птушанят. А тыя сядзяць **у гняздзе** пад тоўстым заснежаным **суком**, каля самага **ствала. Корму** малым хапае, а **холад** ім у цёплым **гняздзе** не страшны.

**Крыжадзюб** — птушка вандроўная. У хвойным **лесе** іх многа бывае тады, калі добры **ўраджай** на шышкі. Калі шышак мала, крыжадзюбы перабіраюцца ў іншае **месца**. *(Віталь Вольскі)*

?! На якія пытанні адказваюць выдзеленыя назоўнікі? Вызначце склон кожнага з гэтых назоўнікаў.
Выпішыце з тэксту сказы, у якіх ёсць назоўнікі, што стаяць у месным склоне. Абазначце канчаткі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**454.** Прачытайце тэкст. Ці правільна зрабіў Віталь? Чаму слова *Віталь* напісана з вялікай літары? Якія яшчэ словы пішуцца заўсёды з вялікай літары?

**Птушынае гняздо**

Аднойчы Віталь пайшоў у лес. У кусце ён убачыў гняздо з птушанятамі. Птушка прыляцела карміць дзяцей. Яна сядзела на дрэве за гняздом. Хлопчык не захацеў палохаць яе. Ён ціхенька адышоў ад гнязда.

?! Спішыце тэкст. Знайдзіце ў тэксце назоўнікі 2-га скланення. Вызначце іх склоны.

**455.** Уявіце, што нікога няма дома, а вам таксама патрэбна некуды пайсці. Вы павінны напісаць запіску, у якой паведаміце, куды вы пайшлі і калі вернецеся дамоў. Напішыце такую запіску.
Знайдзіце ў ёй назоўнікі. Вызначце іх склоны і канчаткі.

## *Урок 21. Трэцяе скланенне назоўнікаў*

**456.** Прачытайце назоўнікі. Які канчатак у гэтых назоўнікаў? Якога яны роду?

Ноч, печ, радасць, рунь, любоў, моладзь, сувязь.

?! Запішыце гэтыя назоўнікі. Абазначце нулявы канчатак паводле ўзору.

Узор. *Ноч* □, ... .

*Запомніце!*
Назоўнікі жаночага роду з нулявым канчаткам адносяцца да 3-га скланення: *аповесць, соль, мыш, Нарач.*

**457*.** Прачытайце назоўнікі. Вызначце, да якога скланення адносіцца кожны назоўнік.

Вада, хлопчык, нага, квецень, сонца, дзень, ноч, шыр, веліч, раніца, прыгажосць, вечар, тыдзень, месяц, вярба, поле, унук, унучка.

?! Запішыце гэтыя словы ў сшытак: спачатку назоўнікі 1-га скланення, потым — 2-га і 3-га.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**458.** Разгледзьце табліцу. Прачытайце, як змяняюцца па склонах назоўнікі 3-га скланення.

| Склон | Пытанні | Дапаможнае слова | Прыклады |
|---|---|---|---|
| Н. | хто? што? | ёсць | мыш, моладзь, рысь, соль, крэпасць |
| Р. | каго? чаго? | няма | мыш-ы, моладз-і, рыс-і, сол-і, крэпасц-і |
| Д. | каму? чаму? | даць | мыш-ы, моладз-і, рыс-і, сол-і, крэпасц-і |
| В. | каго? што? | бачу | мыш, моладзь, рысь, соль, крэпасць |
| Т. | кім? чым? | задаволены | мышш-у, моладдз-ю, рысс-ю, солл-ю, крэпасц-ю |
| М. | аб кім? аб чым? | гаварыць | аб мыш-ы, аб моладз-і, аб рыс-і, аб сол-і, аб крэпасц-і |

?! Запішыце змест табліцы ў сшыткі.
Абазначце ўсе канчаткі, у тым ліку і нулявыя, знакам □.
У якіх склонах у назоўнікаў 3-га скланення аднолькавыя канчаткі?

**459.** Паводле ўзору з папярэдняга практыкавання праскланяйце наступныя назоўнікі 3-га скланення.

Н. хто? што? ноч, прыгажосць, Нарач, Прыпяць
Р. каго? чаго? ...
Д. каму? чаму? ...
В. каго? што? ...
Т. кім? чым? ...
М. аб кім? аб чым? ...

?! Запішыце, абазначце канчаткі.
Растлумачце правапіс вялікай літары.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**460.** Прачытайце. Устаўце прапушчаныя словы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| Н. | сінь | мазь | Беларусь |
| Р. | сіні | мазі | … |
| Д. | … | … | Беларусі |
| В. | … | мазь | … |
| Т. | сінню | маззю | Беларуссю |
| М. | … | … | аб Беларусі |

?! Запішыце, устаўляючы прапушчаныя формы назоўнікаў. Абазначце ўсе канчаткі назоўнікаў 3-га скланення.

## *Урок 22. Змяненне па склонах назоўнікаў 3-га скланення*

**461.** Прачытайце назоўнікі. Пастаўце іх у вінавальным склоне. Ці адрозніваюцца назоўны і вінавальны склоны?

| Н. | В. |
|---|---|
| *ёсць* | *бачу* |
| х т о? ш т о? | к а г о? ш т о? |
| тая рэч | тую рэч |
| шырокая далонь | … |
| мая радасць | маю радасць |
| маленькая мыш | … |
| цёплая печ | … |

?! Запішыце спалучэнні слоў у назоўным і вінавальным склонах.

**462.** Прачытайце сказы. Вызначце склон выдзеленых назоўнікаў. Памятайце, што назоўнік у назоўным склоне звычайна з'яўляецца галоўным членам сказа.

Праз доўгія гады пранёс я **памяць** аб родных мясцінах у сваім сэрцы. *(Мікола Хведаровіч)*

Васілёк выбягаў за аколіцу, узлазіў на плот і ўглядаўся ў палявую **далеч**. *(Сяргей Грахоўскі)*

Вось і **Гарынь**, глыбокая, шырокая, імклівая. *(Віталь Вольскі)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Над Радзімай сокал узляцеў высока і акінуў вокам **даль** зямлі навокал. *(Язэп Пушча)*

?! Запішыце тыя сказы, у якіх назоўнікі 3-га скланення стаяць у вінавальным склоне.

**463.** Прачытайце тэкст. Ці лавілі вы зімой рыбу?

## На крызе

Рыбакі лавілі рыбу на марскім узбярэжжы. Надышла ноч. Яны вырашылі правесці яе на крызе. Раптоўна пачаўся шторм. Узнялася завіруха. Крыгу панесла ў адкрытае мора. Жыццё рыбакоў было ў небяспецы. У такіх умовах аказаць ім дапамогу было вялікай цяжкасцю. На пошукі вылецелі самалёты і верталёты. Рыбакоў знайшлі і выратавалі. *(Паводле Ірыны Гімпель)*

?! Знайдзіце ў тэксце назоўнікі 3-га скланення.
Спішыце тэкст. Вызначце склоны назоўнікаў 3-га скланення.

**464.** Прачытайце назоўнікі 3-га скланення ў назоўным, родным, давальным, месным склонах. Што вы заўважылі?

| Н. | Р. | Д. | М. |
|---|---|---|---|
| *ёсць* | *няма* | *даць* | *гаварыць* |
| рэч | рэч-ы | рэч-ы | аб рэч-ы |
| гусь | гус-і | гус-і | аб гус-і |
| цяжкасць | цяжкасц-і | цяжкасц-і | аб цяжкасц-і |
| печ | печ-ы | печ-ы | аб печ-ы |

?! Якія канчаткі назоўнікаў 3-га скланення ў родным, давальным і месным склонах?
Запішыце прыклады ў сшытку.

**465*.** Прачытайце сказы. Вызначце з дапамогай пытанняў склоны выдзеленых назоўнікаў.

Праедзь па **Прыпяці** памалу раз-другі, і на ўсё жыццё запомніш яе ціхія люстраныя плёсы і таямнічыя старыцы. *(Усевалад Краўчанка)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ад **прагнасці** ніхто дабра не меў. *(Эдуард Валасевіч)*
Дзівіцца трэба **ўпартасці** і сіле, якую меў заўсёды наш народ. *(Уладзімір Дубоўка)*

Спішыце сказы. Абазначце склоны і канчаткі выдзеленых назоўнікаў.

**Плёс** — шырокі ціхі ўчастак ракі паміж перакатамі або астравамі.

**466.** Прачытайце тэкст.

### Рысь

У цёмным лясным гушчары затаілася рысь. Змрочна і ціха ў начным лесе.

У зялёную страху спляліся яловыя галіны. Доўгімі сівымі барадамі лішайнікаў абраслі сукі́ і ствалы дрэў. Ва ўсе бакі працягнуліся вузлаватыя карані.



У логаве амаль немагчыма заўважыць рысь. У лясной цемры добра бачаць яе вочы. Ціха ступаюць па зямлі кашэчыя мяккія лапы рысі. Добра чуюць вушы.

Усе малыя лясныя звяры і птушкі баяцца сустракацца з рыссю. Старанна хаваюць яны гнёзды, ахоўваюць і берагуць сваіх дзіцянят. *(Паводле Івана Сакалова-Мікітова; пераклад з рускай мовы)*

Вызначце склон назоўніка *рысь* у тых сказах, дзе гэта слова сустракаецца.
Выпішыце гэтыя сказы. Абазначце склон і канчатак назоўніка *рысь*.

**467.** Ці ведаеце вы, як выглядае рысь? Ці жыве рысь у беларускіх лясах?
Спытайцеся пра гэта ў настаўніка біялогіі. Размаўляйце з ім па-беларуску.
Якія яшчэ пытанні пра рысь можна задаць? Падумайце і запішыце іх на аркушы паперы, потым пагутарыце з настаўнікам.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 23. Змяненне па склонах назоўнікаў 3-га скланення (творны склон)*

**468.** Прачытайце, якую форму маюць назоўнікі 3-га скланення ў творным склоне.

| Н. | Т. |
|---|---|
| *ёсць* | *задаволены* |
| Беларусь | Белару**сс**ю |
| моладзь | мола**ддз**ю |
| ціш | ці**шш**у |
| далеч | дале**чч**у |

?! Якія канчаткі маюць назоўнікі 3-га скланення ў творным склоне? Якая яшчэ з'ява назіраецца ў форме творнага склону? Як вымаўляюцца гукі, што абазначаны літарамі ***-сс-, -ддз-, -шш-, -чч-***?

**469*.** Прачытайце назоўнікі. Пастаўце іх у творным склоне.

Прыстань — ..., мыш — ..., Прыпяць — ..., столь — ..., памяць — ..., моладзь — ..., сталь — ..., Пціч — ..., Свіслач — ... .

?! Запішыце назоўнікі ў назоўным і творным склонах. Абазначце канчаткі творнага склону. Падкрэсліце літары, якімі перададзена падаўжэнне зычных.

**470.** Прачытайце сказы. Знайдзіце ў іх назоўнікі 3-га скланення, што ўжыты ў творным склоне.

Мы помнім, што кроўю здабыта на працу вялікае права. *(Пятро Глебка)*

Бярозкі, бярозкі... І кожная ў белым, і постаццю кожная як на падбор. *(Алесь Бачыла)*

Вецер патыхнуў вясенняй вільгаццю. *(Аркадзь Чарнышэвіч)*

Вецер з шалёнай восеньскай лютасцю абтрасаў бярозы. *(Васіль Быкаў)*

?! Спішыце сказы. Падкрэсліце назоўнікі жаночага роду творнага склону.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**471.** Прачытайце народныя прыметы зімовага надвор'я.



Моцная цяга ў печы — будзе мароз.
Кошка на печ — сцюжа ў двор.
Чырвоны агонь у печы — да марозу.

?! Знайдзіце ў тэксце ўсе назоўнікі. Вызначце іх род, склон, скланенне.
У якіх склонах ужыты назоўнік 3-га скланення?

***сцю́жа***

**472.** Прачытайце словы. Да якога скланення адносяцца назоўнікі?

Радасць, маладосць, вільгаць, гразь, весялосць.

?! Праскланяйце назоўнікі, запішыце іх у сшытку. Абазначце канчаткі.

## *Урок 24. Падагульненне па тэме «Назоўнік»*

**473.** Прачытайце тэкст.

Мінуў **тыдзень**, як мы пачалі вучыцца ў новай **школе. На двары** ўжо **восень. Надвор'е** стаіць халоднае. Але ў кожнага з нас святочны **настрой**. Кожны дзень мы прыходзім **у школу з кветкамі.** Асабліва стараюцца першакласнікі. Нясуць **вяргіню** і **астру, гладыёлус** і **настурку. У** іх **класе** заўсёды шмат кветак.

?! Спішыце тэкст. У выдзеленых назоўніках вызначце скланенне і склон паводле ўзору.

Узор. *Тыдзень (2-е, Н.), ... .*

**474.** Прачытайце сказы.

За вёскай серабрыстым люстэркам святлела рак.. . У рац.. завісалі залатыя косы сонца.

Вад.. пакрылася тонкім ледзяным шклом. Пясчаныя берагавыя выспы схаваліся пад вад.. .

Развітальная песн.. журавоў даносіцца да зямлі. Сваю задуменную песн.. пяе векавы бор.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Зім.. прыйшла раптоўна. На ўсю зім.. паснулі палеткі і лугі.

*(Іван Паўлоўскі)*

?! Спішыце, устаўляючы ў назоўніках патрэбныя канчаткі. Вызначце склон гэтых назоўнікаў.

**475.** Прачытайце тэкст. Дайце тэксту загаловак.

Над садам прашумеў моцны дождж. Заблішчалі на траве кроплі. Адна кропля закацілася пад лісток.

Раптам яна пачула, як нехта яе кліча. Гэта зярнятка клікала кроплю. Учора дзяўчынка ела яблык і кінула агрызак. Сонца прыгрэла. Зярнятка пачало сохнуць. Кропля напаіла яго, а сама знікла.

Праз некаторы час пусціла зярнятка ў зямлю карэньчык, а ўверх парастак. Так вырасла яблынька.

?! Знайдзіце ў тэксце назоўнікі 2-га скланення. Вызначце іх склон.
Колькі частак у гэтым тэксце?
Аб чым расказваецца ў першай частцы? Якую назву ёй можна даць?
Аб чым расказваецца ў другой частцы? Як можна яе назваць?
Аб чым трэцяя частка? Якая назва падыходзіць да яе?
Складзіце план гэтага тэксту. Запішыце яго.
Прачытайце тэкст яшчэ раз.
Раскажыце па плане пра падзеі тэксту. Напішыце пераказ.

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

**1.** Прачытайце тэкст.

### Надвячорак

Зайшло **сонца**. Ад **ракі** пацягнула **вільгаццю**. **Паветра** пасвяжэла. Павольна насоўваўся **змрок**. Загараліся **агні** ў **вокнах**. Замільгалі **зоркі**.

Спішыце тэкст. Вызначце, якой часцінай мовы з’яўляюцца выдзеленыя словы, вызначце іх лік і род.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**2.** Прaскланяйце словы.

**Мост, боль, вяргіня.**

Запішыце. Абазначце канчаткі ў словах.

**3.** Прачытайце словы.

**Вакзал, боль, мужнасць, карова, адліга, сыр, спякота, соль, памяць, білет, далеч, падушка, шчасце, вільгаць, праца, адзенне, мыш, капуста, воля, адказ, жарт.**

Запішыце словы ў тры слупкі: 1-е, 2-е і 3-е скланенне.

## # *Склоны і склонавыя пытанні назоўнікаў*

**476.** Прачытайце сказы. Звярніце ўвагу на назоўнік *зіма*.

Надыходзіць халодная **зіма**.
Людзі добра падрыхтаваліся **да зімы**.
Дзеці радуюцца **зіме**.
Яны сустракаюць **зіму** з лыжамі і канькамі.
Рэчка замярзае **зімой**.
Вучань напісаў **аб зіме** сачыненне.

?! Колькі сказаў пра зіму вы прачыталі?
Паспрабуйце з дапамогай стрэлачак паставіць пытанні, на якія адказвае слова *зіма* ў кожным сказе.

**477.** Прачытайце сказы.

На ясным вячэрнім небе ўзышла (што?) зорка.
Раптам хмары заслалі неба, і (чаго?) зоркі не стала.
Сумна (чаму?) зорцы.
Глянуў на (што?) зорку месячык.
Ён залюбаваўся (чым?) зоркай.
А калі яна нечакана згарэла і ўпала, месячык доўга сумаваў (аб чым?) аб зорцы. *(Паводле Міколы Яленскага)*

?! Колькі сказаў вы прачыталі? На якое пытанне адказвае слова *зорка* ў кожным сказе?
Выпішыце са сказаў формы слова *зорка* разам з пытаннямі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**478.** Прачытайце сказы. На якое пытанне адказвае слова *мядзведзь* у кожным сказе? Мядзведзь — гэта жывая істота ці не?

(Хто?) Мядзведзь — вельмі дужы звер.
Усе лясныя жыхары баяцца (каго?) мядзведзя.
Зімой (каму?) мядзведзю добра спіцца ў бярлозе.
(Кім?) Мядзведзем пужаюць малых дзяцей, калі яны сваволяць.
(Аб кім?) Аб мядзведзю складзена шмат народных казак.

?! Выпішыце формы слова *мядзведзь* з пытаннямі. Колькі формаў вы выпісалі?

**479.** Прачытайце спалучэнні слоў і пытанні, на якія адказваюць назоўнікі ў кожным са спалучэнняў.

Ёсць (хто? што?) брат, вёска.
Няма (каго? чаго?) брата, вёскі.
Даць (каму? чаму?) брату, вёсцы.
Бачу (каго? што?) брата, вёску.
Задаволены (кім? чым?) братам, вёскай.
Гаварыць (аб кім? аб чым?) аб браце, аб вёсцы.

?! Колькі формаў назоўнікаў тут вылучана?
Колькі пар пытанняў вы налічылі?
Якой часткай слова адрозніваюцца формы назоўніка?
Запішыце гэтыя формы назоўніка.

*Запомніце!*
Назоўнік у беларускай мове мае шэсць формаў. Гэтыя формы называюцца ***склонамі***.
Пры змяненні формаў назоўніка мяняецца канчатак.
Кожны склон адказвае на пэўныя пытанні.
**Назоўны — хто? што?**
**Родны — каго? чаго?**
**Давальны — каму? чаму?**
**Вінавальны — каго? што?**
**Творны — кім? чым?**
**Месны — аб кім? аб чым?**


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**480.** Прачытайце словы. У якім склоне яны стаяць? Змяніце з дапамогай пытанняў гэтыя словы.

Назоўны склон (хто? што?) ліса, вада
Родны склон (каго? чаго?) ...
Давальны склон (каму? чаму?) ...
Вінавальны склон (каго? што?) ...
Творны склон (кім? чым?) ...
Месны склон (аб кім? аб чым?) ...

?! Запішыце назвы склонаў, пытанні і словы, якія вы змянялі.

**481.** Закончыце сказы з дапамогай малюнкаў і склонавых пытанняў.

Ляціць (што?).





(Хто?) ідзе.





Вучаніца стаіць каля (чаго?).

Бабуля расказвае казку (каму?).





Хлопчык робіць (што?).

Бацька пілуе (чым?).





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Кветкі стаяць (у чым?).

?! Запішыце сказы, што атрымаліся.
Вызначце склоны назоўнікаў, якімі вы дапаўнялі сказы.

**482.** Прачытайце верш. З дапамогай пытанняў вызначце склоны назоўніка *вожык*.

**Каця**

У Каці добры (хто?) вожык,
а з ёй гуляць не хоча.
У (каго?) вожыка сто ножак,
так ноччу ён тупоча.
І Каця (каму?) вожыку крычыць,
што хоча ножкі палічыць.

*(Пімен Панчанка)*

?! Чаму ў вершы гаворыцца, што ў вожыка сто ножак? Ці так гэта на самай справе?
Выпішыце з верша формы назоўніка *вожык*.
Якія склоны гэтага слова ў вершы не выкарыстаны?

**483.** Разгледзьце табліцу. У ёй пададзены скарочаныя назвы склонаў, склонавыя пытанні, дапаможныя словы, якія аблегчаць скланенне, і прыклады змянення назоўнікаў па склонах.

| Склон | Пытанні | Дапаможнае слова | Прыклады |
|---|---|---|---|
| Н. | хто? што? | ёсць | стол, дзяўчынка, ноч |
| Р. | каго? чаго? | няма | стала, дзяўчынкі, ночы |
| Д. | каму? чаму? | даць | сталу, дзяўчынцы, ночы |
| В. | каго? што? | бачу | стол, дзяўчынку, ноч |
| Т. | кім? чым? | задаволены | сталом, дзяўчынкай, ноччу |
| М. | аб кім? аб чым? | гаварыць | аб стале, аб дзяўчынцы, аб ночы |

?! Запішыце змест табліцы ў сшыткі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**484.** Разгледзьце табліцу. Якія пытанні і словы прапушчаны ў ёй?

| Склон | Пытанні | Прыклады |
|---|---|---|
| Назоўны | хто? … | сын, кветка |
| Родны | …, чаго? | сына, … |
| … | …, чаму? | …, кветцы |
| Вінавальны | каго? … | …, кветку |
| … | кім? чым? | сынам, … |
| Месны | аб кім? … | …, аб кветцы |

?! Запішыце змест табліцы, устаўляючы прапушчаныя словы.

**485.** Прачытайце незакончаныя сказы. Дапоўніце іх формамі слова *медуніца*.

У кветніку расцвіла прыгожая … . Кружылі (над чым?) **над** … пчолы. Яны падляталі (да чаго?) **да** … і бралі салодкі нектар. Пчолы расказвалі (аб чым?) **аб** пахучай … ўсім насякомым. Усе хацелі пазнаёміцца (з чым?) **з** … . (Што?) … ўсе вельмі палюбілі.



***меду́ніца***

?! Па пытаннях вызначце склоны назоўніка *медуніца*.
Якой часцінай мовы з'яўляюцца выдзеленыя ў тэксце словы?
Спішыце сказы, дапаўняючы іх патрэбнымі формамі слова *медуніца*.

**486.** Прачытайце спалучэнні слоў. Па пытаннях вызначце склон назоўніка ў кожным з іх.

Даехалі (да чаго?) да маста; сядзіць (на чым?) на дрэве; бачыць (каго?) сябра; пазнаёміцца (з кім?) з дзяўчынкай; быць удзячным (каму?) настаўніку.

?! Спішыце спалучэнні слоў. Абазначце склон назоўнікаў літарамі: ***Н., Р., Д., В., Т., М***.
Складзіце сказ з адным са спалучэнняў слоў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**487.** Прачытайце верш. Знайдзіце ў ім назоўнікі.

### Сымонка

Ён (да чаго?) да працы
(што?) прагнасць мае,
ён і ў песнях самы звонкі,
у каго ні запытаеш,
хваляць спрытнага (каго?) Сымонку.
З першых дзён
(чаго?) вайны-нягоды
(каго?) бацькі (у каго?) ў хлопчыка не стала –
хоць дванаццаць год (ад чаго?) ад роду,
гаспадарыць ён удала.

*(Пятрусь Броўка)*

Па пытаннях вызначце склоны назоўнікаў.

**488.** Прачытайце незакончаныя сказы. Дапоўніце іх адным словам-назоўнікам.
Вызначце склон гэтага назоўніка.

На ўроку ў вучня не было (чаго?) ... .
Міша падарыў кнігу (каму?) ... .
Навука спатрэбіцца (у чым?) ... .
У гасцях Зоська сустрэла (каго?) ... .

Запішыце сказы, што атрымаліся. Абазначце склон назоўнікаў, якія вы ўстаўлялі.

**489.** Прачытайце пытанні. Адкажыце на іх.

Што грэе зямлю?
Чаго не хапае ў супе?
Каму цяжка зімой?
Каго вітаюць дзеці ў школе?
Чым пішуць вучні ў сшытку?
Дзе жывуць ласі?

Вызначце склон тых назоўнікаў, якія вы выкарысталі пры адказах.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**490.** Прачытайце жарт. Ці ведаеце вы драпежных птушак? Камар — гэта птушка?

— Дзеці, хто **назаве** драпежную птушку? — спытала выхавацелька.

Руку **падняла** Таня.

— Камар! Бо ён **смокча** чалавечую кроў. *(Алена Ясючэня)*

?! Знайдзіце ў жарце ўсе назоўнікі.
Прачытайце словы, якія выдзелены ў тэксце.
Дапоўніце іх з дапамогай пытанняў назоўнікамі з жарта. Вызначце склоны назоўнікаў. Запішыце спалучэнні слоў, што атрымаліся.

Узор. *Назаве (каго?) ...; падняла (што?)...; смокча (што?)... .*

**491.** Прачытайце спалучэнні слоў. На якія пытанні адказваюць назоўнікі ў гэтых спалучэннях?

Падыходзіць да хлопчыка, гаварыць сябру, убачыць бабулю, ганарыцца бацькам, быць пры справе.

?! Запішыце спалучэнні слоў. У дужках устаўце пытанні.
Абазначце род назоўнікаў.

Узор. *Падыходзіць (да каго?) да хлопчыка — Р., ... .*

**492.** Прачытайце тэкст.

### Сінічка

Аднойчы прыляцела **сінічка** да **акна**. Сюды загнала яе **сцюжа**. Гаспадар пашкадаваў **птушку** і адчыніў **акно**. Сінічка паляцела ў **хату**. Яна згаладалася і пачала дзяўбці насыпаныя **зярняткі**.

**Дзеці** палюбілі **птушку**. Яна пражыла ў **хаце** ўсю **зіму**. *(Паводле Канстанціна Ушынскага; пераклад з рускай мовы)*

?! Пастаўце пытанні да выдзеленых назоўнікаў.
Па пытаннях вызначце склон назоўнікаў.
Запішыце тэкст пад дыктоўку.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**493.** Разгледзьце малюнак. Адкажыце на пытанні.

У якую пару года адбываецца дзеянне на малюнку?
Што робяць дзеці?
Навошта яны вешаюць кармушкі?
Чаму зімой патрэбна дапамагаць птушкам?



?! Запішыце адказ на другое пытанне.
Вызначце склоны назоўнікаў у гэтым сказе.

**494.** Прачытайце, як можна па паводзінах птушак зімой прадказаць змены ў надвор'і.

Снягір зімой спявае — на снег, завіруху і слату.
Сарока паблізу жытла лятае, пад страху лезе — будзе завіруха.
Варона пад крыло дзюбу хавае — да холаду.

**Сла́та, сло́та** — вадкая гразь на зямлі, на дарогах.

?! Знайдзіце ўсе назоўнікі ў гэтых сказах. Вызначце іх склоны.

**495.** Ці ведаеце вы якія-небудзь прыметы, па якіх можна прадказаць надвор'е? Раскажыце іх.
Спытайцеся дома ў сваіх бацькоў, бабуль і дзядуляў, настаўнікаў у школе, як можна даведацца пра тое, што надвор'е зменіцца.
Раскажыце, што вы даведаліся ў школе пра надвор'е.

**496.** Прачытайце тэкст.

З поўначы дзьмуць халодныя **вятры.** Надышла пара **маразоў** і **завірух.** Заснулі ў **норах** і **дуплах** лясныя **жыхары.** *(Іван Паўлоўскі)*

?! У якім ліку ўжыты выдзеленыя назоўнікі?
Вызначце іх склоны.

*Запомніце!*
Назоўнікі ў множным ліку змяняюцца па такіх жа склонах і адказваюць на тыя ж пытанні, што і ў адзіночным ліку.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**497.** Прачытайце тэкст. Ці бывалі вы ў заапарку? Спадабалася вам там або не? Чаму?

Своеасабліва рэагуюць (на што?) на змены надвор'я белыя (хто?) мядзведзі, якія ўтрымліваюцца (у чым?) у заапарках. За некалькі (чаго?) дзён да пахаладання яны перастаюць купацца ў басейне. А дні за тры да пацяплення ахвотна лезуць у ваду і падоўгу купаюцца. *(Паводле Аляксея Рошчына; пераклад з рускай мовы)*

**ахво́тна**

?! Знайдзіце ў тэксце назоўнікі. Вызначце іх лік.
З дапамогай пытанняў вызначце склоны назоўнікаў, да якіх пытанні адносяцца.

**498.** Разгледзьце малюнак.



?! Складзіце па малюнку некалькі сказаў, у якіх ёсць назоўнікі множнага ліку. Запішыце гэтыя сказы на дошцы і ў сшытку.
Абазначце склоны назоўнікаў множнага ліку.

**499.** Прачытайце сказы. Назоўнікі, што ў дужках, пастаўце ў патрэбным склоне.

Дубы стаялі пры ўездзе ў вёску. Пад (дубы) вясковыя хлапчукі адпачывалі ў цяньку. Птушкі прыляталі пасядзець на (дубы). Вецер гушкаўся ў галінах (дубы). *(Паводле Барыса Сачанкі)*

?! Спішыце сказы, апускаючы дужкі.
Абазначце склоны назоўніка *дубы*.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**500.** Прачытайце яшчэ адну прымету надвор'я.

(Хто?) Вароны кружацца ў паветры, а потым садзяцца (на што?) на дахі і (што?) вершаліны (чаго?) дрэў — будзе мароз.

Вызначце па пытаннях склоны назоўнікаў.
Спішыце сказ разам з пытаннямі. Абазначце склоны назоўнікаў множнага ліку.

# ПРЫМЕТНІК

## *Урокі 1—2. Прыметнік*

**501.** Прачытайце групы аднакаранёвых слоў. Знайдзіце прыметнікі ў кожнай з гэтых груп.

Белізна́, белы, бель, бялець, бялюткі.
Прыгожы, прыгажосць, найпрыгажэйшы, прыгажэць.
Кнігарня, кніжны, кніга, кніжачка.
Зелянець, зялёны, зялёненькі, зелень, зелянейшы.

Да якіх часцін мовы адносяцца астатнія словы?
Выпішыце прыметнікі.

*Успомніце!*
Прыметнік — гэта часціна мовы, якая абазначае прыметы прадмета.
Прыметнік можа адказваць на пытанні **які? якая? якое? якія?**
У сказе ён звязаны па сэнсе з назоўнікам.

**502.** Прачытайце тлумачэнні слоў. Падбярыце прыметнікі, якія маюць такое значэнне.

Той, хто хоча есці, — ... .
Той, хто заўсёды гаворыць праўду, — ... .
Той, хто сочыць за сваімі рэчамі і адзеннем, — ... .
Той, хто весяліцца, — ... .

Запішыце прыметнікі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**503.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце назоўнікі.

Заяц, ліса, воўк, мядзведзь, ёлка, дрэва, яблык.









З дапамогай малюнкаў падбярыце да кожнага назоўніка звязаны па сэнсе прыметнік. На якія пытанні адказваюць прыметнікі?
Што абазначае прыметнік?
Запішыце словазлучэнні, што атрымаліся.

**504.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў ім прыметнікі.

*якое?*

**Незайздроснае** зайцава жыццё ў лесе. **Лясны** звярок увесь час павінен быць напагатове.

Пачуе заяц **незнаёмы** гук, адчуе небяспеку — выручаюць ногі. **Пярэднія** ногі — **кароткія**, а **заднія** — амаль у тры разы **даўжэйшыя** за пярэднія. Заднімі нагамі заяц адштурхоўваецца. Робіць скачкі на тры-чатыры метры. *(Паводле Змітра Бяспалага)*

Вызначце, з якімі назоўнікамі звязаны па сэнсе выдзеленыя прыметнікі.
Пастаўце ад гэтых назоўнікаў пытанні да прыметнікаў.
Колькі прыметнікаў характарызуюць назоўнік *ногі* ў чацвёртым сказе?
Спішыце тэкст. Стаўце пытанні паводле ўзору з першага сказа.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**505.** Прачытайце пытанні. Адкажыце на іх, выкарыстоўваючы толькі прыметнікі.

Які дзень?
Якая зіма?
Якое надвор’е?

Запішыце адказы на пытанні. Выкарыстайце як мага больш прыметнікаў.

Узор. *Дзень зімовы, кароткі, ... .*

**506.** Прачытайце прыметнікі. Падбярыце да іх назоўнікі.

Вузкая ..., зімовы ..., белы ..., салодкае ..., цікавыя ..., ласкавыя ..., вясёлая ..., празрысты ... .

На якое пытанне адказвае кожны прыметнік?
Запішыце словазлучэнні, што атрымаліся.

**507.** Прачытайце прыметнікі. Што могуць характарызаваць такія словы?

Абветраны, бледны, заспаны, чырванашчокі, добры, схуднелы.

Адкрытая, белазубая, вясёлая, вінаватая, шчырая, ласкавая, ветлівая.

Доўгія, пушыстыя, кучаравыя, распушчаныя, бліскучыя, пышныя.

На якія пытанні адказваюць прыметнікі ў кожным радзе?
Запішыце прыметнікі і назоўнікі, якія яны характарызуюць.

**508.** Раскажыце, якімі могуць быць *голас, нос, вусны*.
Падбярыце як мага больш прыметнікаў да прапанаваных назоўнікаў.

**509.** Раскажыце пра сябе, выкарыстоўваючы прыметнікі.
Скарыстайцеся наступным планам.

Якая ў мяне знешнасць (колер вачэй, валасоў, форма твару, носа, рост і гэтак далей)?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Які ў мяне характар?
Які я сябар?

Запішыце адказы на пытанні. Ці атрымаўся ў вас тэкст?

**510.** Разгледзьце малюнкі.



Па выразе твару паспрабуйце зразумець, які настрой у чалавека. Запішыце прыметнікі, якімі можна ахарактарызаваць настрой, адлюстраваны на кожным малюнку.

**511.** Прачытайце тэкст. На якую ён тэму? Якую назву можна яму даць?

Характар беларуса паважны, спакойны, рахманы, з добра развітою воляю і трываласцю ў працы. На першы погляд здаецца, што беларус крыху недаверлівы і скрытны. У кожным разе ён не так хутка сходзіцца з людзьмі. Затое, як толькі пазнаёміцца з новым чалавекам і пераканаецца ў яго няшкоднасці, робіцца даверлівым і шчырым.

Беларус добры гаспадар, шануе капейку. Гэта не перашкаджае яму быць вельмі гасцінным. Беларус любіць павесяліцца. Весялосць у яго шчырая, ад усёй душы. Гэта відаць з песень, прыпевак і танцаў. *(Паводле Аркадзя Смоліча)*

Пісьмова адкажыце, які характар беларуса.
Выпішыце з тэксту прыметнікі, якія апісваюць беларуса.

## *Урокі 3—5. Лік і род прыметнікаў*

**512.** Прачытайце спалучэнні назоўнікаў з прыметнікамі.

дзень (які?) зімовы
сонца (якое?) зімовае



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

вопратка (я к а я?) зімовая
канікулы (я к і я?) зімовыя

?! Назавіце род і лік кожнага назоўніка.
Ці змяняецца па родах і ліках прыметнік *зімовы*? Якая частка слова ў ім змяняецца?
Запішыце гэтыя словазлучэнні. Абазначце канчаткі прыметнікаў.

**513.** Прачытайце спалучэнні назоўнікаў з прыметнікамі, якія ўжыты ў розных родах і ліках. Дапаўняйце прыметнікі патрэбнымі канчаткамі.

| | | | |
|---|---|---|---|
| студзень (я к і?) | снежн.. | яблык (я к і?) | вялік.. |
| | марозн.. | | салодк.. |
| | халодн.. | | смачн.. |
| песня (я к а я?) | вясёл.. | фарба (я к а я?) | ярк.. |
| | звонк.. | | сін.. |
| | гучн.. | | нов.. |
| надвор'е (я к о е?) | ясн.. | адзенне (я к о е?) | летн.. |
| | цёпл.. | | асенн.. |
| | халодн.. | | зімов.. |
| рукі (я к і я?) | пяшчотн.. | сняжынкі (я к і я?) | лёгк.. |
| | працавіт.. | | іскрыст.. |
| | ласкав.. | | прыгож.. |

?! Запішыце словазлучэнні паводле ўзору, каб канчаткі прыметнікаў адпавядалі пастаўленым пытанням.
Вызначце род і лік прыметнікаў. Ад чаго залежыць род і лік прыметнікаў?

У з о р. *Студзень снежн[ы] (м. р., адз. л.), ... .*

*Успомніце!*
Прыметнікі змяняюцца па родах і ліках.
Яны маюць такі ж род і лік, што і назоўнікі, з якімі яны звязаны па сэнсе.
Прыметнікі, як і назоўнікі, могуць быць **мужчынскага, жаночага** і **ніякага роду**, **адзіночнага** ці **множнага ліку**.
Прыметнікі мужчынскага роду ў назоўным склоне адзіночнага ліку маюць канчаткі ***-ы, -і***; жаночага роду — канчаткі ***-ая, -яя***; ніякага роду — ***-ое, -ае, -яе***.
У назоўным склоне множнага ліку прыметнікі маюць канчаткі ***-ыя, -ія***.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**514.** Прачытайце назоўнікі. Падбярыце да іх прыметнікі.

Дом (які?) ..., кніга (якая?) ..., возера (якое?) ..., сябры (якія?) ..., вецер (які?) ..., вёска (якая?) ..., дрэўца (якое?) ..., кветкі (якія?) ... .

?! Запішыце словазлучэнні паводле ўзору. Выдзеліце канчаткі. Абазначце род і лік прыметнікаў: адзіночны лік — ***адз. л.***, множны лік — ***мн. л.***; мужчынскі род — ***м. р.***, жаночы род — ***ж. р.***, ніякі род — ***н. р.***

Узор. *Дом* (які?) *вялік[і] (м. р., адз. л.), ... .*

**515.** Прачытайце сказы. Дапоўніце іх патрэбнымі канчаткамі прыметнікаў.

На двары сапраўдн.. казка.
Сукеначка на ёй чырвон.., гузікі таксама чырвон.., бліскуч.. . *(Васіль Хомчанка)*
Быў цёпл.. сонечн.. дзень.
Наспел.. колас гнецца к долу. *(Алесь Гурло)*

?! Па назоўніках, з якімі яны звязаны, вызначце род і лік прыметнікаў. Спішыце сказы, устаўляючы канчаткі.
Абазначце канчаткі прыметнікаў.

**516.** Прачытайце верш. Які колер найчасцей сустракаецца ў вершы? Ці падабаецца вам гэты колер? Што яшчэ можа быць ружовым?

**Ружовы сон**

Да вады ідзе паненка.
Ружаватая **сукенка**,
у тон сукенкі парасон,
пояс, пацеркі, істужка...

На вадзе — ружовы **сон**:
у ружовым пер’і птушка.
— Ёсць такая, — кажа Інга, —
называецца фламінга.

*(Надзея Сторажава)*

?! Знайдзіце ў вершы прыметнікі. З якімі назоўнікамі яны звязаны па сэнсе? Выпішыце прыметнікі, якія характарызуюць выдзеленыя назоўнікі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**517.** Прачытайце тэкст. Ці бачылі вы ільняное поле?

### Блакітная ніва



Стаіць чэрвеньская раніца. Ласкавае сонейка дорыць зямлі цяпло. У небе звініць срэбная песня жаваранка.

Павеяў цёплы ветрык. Заварушылася блакітная ніва. Пабеглі па ёй, як па моры, хвалі.

Ільняное поле цвіце шмат дзён. Але кожная кветачка жыве толькі паўдня. Расплюшчыцца блакітнае вочка і палюбуецца сонцам. Ападуць пялёстачкі, а замест іх застанецца зялёная галоўка. У галоўцы будзе спець насенне. *(Ірына Гімпель)*

***пялёсткі***

?! Знайдзіце ў тэксце прыметнікі.
Выпішыце словазлучэнні н а з о ў н і к + п р ы м е т н і к. Абазначце род і лік прыметнікаў.

**518.** Прачытайце загадку, якая ўтворана толькі назоўнікамі і прыметнікамі.
Адгадайце яе з дапамогай падказкі.

Поле — шкляное,
празрыстае, чыстае.
Межы — драўляныя,
падмаляваныя.
*(Ніл Гілевіч)*

| | | | |
|---|---|---|---|
| | к | н | |

?! Вызначце род і лік прыметнікаў.
Як вызначыць род прыметнікаў *драўляныя, падмаляваныя*?
Запішыце загадку ў радок. Абазначце род і лік прыметнікаў.

*Успомніце!*
Каб вызначыць род назоўніка або прыметніка, што стаіць у множным ліку, трэба паставіць яго ў адзіночным ліку: *вялікія лясы — вялікі лес (м. р.).*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**519.** Прачытайце прыметы, якія характарызуюць надвор'е студзеня.

Студзень халодны — ліпень сухі і гарачы, не чакай грыбоў да восені.

Калі ў студзені частыя снегапады ды мяцеліцы, то ў ліпені частыя дажджы.

Калі студзень у мінулым годзе быў цёплы, то студзень наступнага года будзе халодны. Халодныя студзені запар амаль не паўтараюцца.

**За́пар** — непасрэдна адзін за адным, без пропуску.

?! Знайдзіце ў сказах прыметнікі. Назавіце іх род і лік. Спішыце сказы, у якіх прыметнікі выкарыстаны ў множным ліку. Пастаўце іх (вусна) у адзіночным ліку і вызначце род.

**520.** Прачытайце верш народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча.

Белыя сыпяцца долу **крышталікі**,
белыя крышацца **хмаркі** ўгары.
Сосны захутаны ў белыя **шалікі**.
Белая **мітусь** у белым **бары**.
Белая, мяккая **ціша** няхрусткая,
белай **дрымотай** спавіты кусты.
Белае белле... **Зіма** беларуская...
Што ж мне не дорыш снягурачку ты?

**Бе́лле** — *тут:* белізна́, яркі, чысты белы колер.

?! Выпішыце з верша спалучэнні выдзелены назоўнік + прыметнік. Пастаўце ўсе прыметнікі і назоўнікі ў адзіночным ліку і назоўным склоне. Абазначце род прыметнікаў.

Узор. *Крышталік* (які?) *белы (м. р.), ... .*

**521.** Прачытайце спалучэнні слоў.

Ціх.. ноч, нов.. тэлефон, цікав.. гісторыя, бяскрайн.. мора, ярк.. сонца, прост.. аловак, горн.. веласіпед, стар.. сяло,



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

металічн.. цвікі, доўг.. валасы, чырвон.. гузік, прыгож.. сукенка.

?! Запішыце спалучэнні слоў, дапішыце канчаткі прыметнікаў. Вызначце род і лік прыметнікаў.

**522.** Прачытайце тэкст. Ці бачылі вы калі-небудзь жывога бабра? Калі бачылі, раскажыце пра гэта.

**Бабёр**



На беразе невялічкай рэчкі дзеці знайшлі мал.. бездапаможн.. бабраня. Яно заблыталася ў густых водарасцях. Дзеці пашкадавалі малога звярка і ўзялі яго з сабою.

Калі бабёр вырас, узніклі непрадбачан.. цяжкасці. У бабра выраслі востр.. зубы, і яму трэба было што-небудзь грызці. Бабёр грыз усё: дзверы, мэблю, падаконнікі. Выпускаць бабра на волю было небяспечна. Браканьеры маглі паквапіцца на цудоўн.. чорн.. футра. Гаспадары вырашылі аддаць яго ў запаведнік. *(Паводле Віталя Вольскага)*

?! Якія канчаткі прыметнікаў прапушчаны ў тэксце? Вызначце род і лік гэтых прыметнікаў.
Колькі частак у тэксце?
Якую назву можна даць першай частцы? Аб чым у ёй расказваецца?
Якую назву можна даць другой частцы? Пра што гэтая частка?
Чым заканчваецца тэкст?
Запішыце план тэксту. Ён, напрыклад, можа быць такім.

1. Знаходка.
2. Непрадбачаныя цяжкасці.
3. Лёс бабра.

Прачытайце тэкст яшчэ раз.
Перакажыце яго вусна па плане.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**523.** Уявіце наступную сітуацыю.

Вы вярнуліся дамоў з лыжнай прагулкі.

Зімовы дзень быў вельмі добры, вы надта задаволены тым, што прайшліся на лыжах. У вас выдатны настрой.

?! Патэлефануйце сябру, які не змог з вамі пайсці, і раскажыце пра свае ўражанні.
Выкарыстайце як мага больш прыметнікаў.

**524.** Прачытайце тэкст. Дапаўняйце прыметнікі канчаткамі.



Белавежск.. пушча знаходзіцца непадалёку ад Брэста. Мы ідзём па лясной сцяжынцы запаведніка. Лес здзіўляе незвычайнай стракатасцю, чаргаваннем розных парод. Велізарн.. сосны і елкі, дубы. Ёсць асобн.. дубы, якім ужо больш за пяцьсот год. Смалов.. пах хвоі перамешваецца з грыбным пахам. Справа і злева лясн.. палянкі, якія пакрыты стракатым дыванам з кветак. На палянках сустракаюцца хутканог.. казулі, ласі, дзікі і многія іншыя жывёлы, якія тут утрымліваюцца ў прыродных умовах.

Гонар Белавежскай пушчы — зубр. Цяжк.. тулава жывёлы ўпрыгожвае масіўн.. галава з выпуклымі вачыма і закругленымі рагамі. Белавежск.. пушча — адно з нямногіх месцаў у свеце, дзе ў прыродных умовах жывуць гэтыя старажытн.. жывёлы. *(Паводле Марка Максімава)*

**Страка́ты** — які вылучаецца неаднароднасцю, разнастайны, з розных элементаў; рознакаляровы.

?! Растлумачце напісанне вялікай літары ў словах *Брэст, Белавежская пушча.*
Выпішыце з тэксту прыметнікі, якія вы дапаўнялі канчаткамі, разам з назоўнікамі, з якімі яны звязаны па сэнсе. Абазначце іх лік і род.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**525.** Раскажыце, ці ёсць лес каля вашай вёскі ці горада. Ці бывалі вы там? Што вы там рабілі? Што можна рабіць у лесе летам? А зімой?
Якімі колерамі вы намалявалі б лес?
Раскажыце пра свае ўражанні ад наведвання лесу.

**526.** Прачытайце верш-загадку. Каго паэт называе *шэрае,* а каго — *чорнае*?

### Чорнае і шэрае

Чорнае спакойна дрэмле на падлозе.
Шэрае на варце туліцца ў трывозе.
Чорнае паціху лапай варухнула.
Шэрае адразу хвосцікам махнула.

*(Ігар Мазнін; пераклад з рускай мовы Васіля Віткі)*

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | |

| | | |
|---|---|---|
| | | |

Па колькасці літар вызначце словы-адгадкі.
Назавіце род і лік прыметнікаў, што выкарыстаны ў вершы.

**527.** Прачытайце тэкст.

### У заапарку

У Мінску ўжо шмат год працуе заапарк. Вучні разам з настаўнікамі вырашылі паехаць туды на экскурсію. У заапарку яны бачылі многа звяроў і птушак. У клетках скакалі вясёлыя і смешныя малпы. Каля загародкі гулялі белыя ла́мы і паласатыя зебры. За сеткай лcraталі розныя птушкі. У заапарку дзеці бачылі рыжую лісу, бурага мядзведзя, шэрага ваўка. Нядаўна ў заапарку з’явіліся ўсурыйскі тыгр і белавежскі зубр.

Спішыце тэкст. Падкрэсліце прыметнікі хвалістай лініяй.
Растлумачце напісанне малой літары ў словах *усурыйскі тыгр* і *белавежскі зубр*.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урокі 6—14. Змяненне прыметнікаў па склонах*

**528.** Прачытайце склонавыя формы словазлучэнняў. Знайдзіце ў словазлучэннях прыметнікі.

Н. (я к і?) белавежск-і зубр
Р. (я к о г а?) белавежск-ага зубра
Д. (я к о м у?) белавежск-аму зубру
В. (я к о г а?) белавежск-ага зубра
Т. (я к і м?) белавежск-ім зубрам
М. (а б я к і м?) аб белавежск-ім зубры

?! Ці змяняюцца па склонах прыметнікі?
Якая частка слоў мяняецца?
Ад чаго залежыць склон прыметніка?

*Запомніце!*
Прыметнік змяняецца па склонах, гэта значыць скланяецца.
Прыметнік мае той жа склон, што і назоўнік, з якім ён звязаны па сэнсе.
Каб даведацца, у якім склоне стаіць прыметнік, трэба вызначыць склон адпаведнага назоўніка.

**529.** Прачытайце. Запомніце пытанні, на якія адказваюць прыметнікі ў розных склонах.

| **Склон** | **Дапаможныя словы** | **Пытанні** | **Прыклады** | |
|---|---|---|---|---|
| Н. | ёсць | **я к і? я к о е?** | бел-ы снег | сін-яе мора |
| Р. | няма | **я к о г а?** | бел-ага снегу | сін-яга мора |
| Д. | даць | **я к о м у?** | бел-аму снегу | сін-яму мору |
| В. | бачу | **я к о г а?** **я к і? я к о е?** | бел-ы снег | сін-яе мора |
| Т. | задаволены | **я к і м?** | бел-ым снегам | сін-ім морам |
| М. | гаварыць | **а б я к і м?** | аб бел-ым снезе | аб сін-ім моры |

?! Запішыце скланенне прыметнікаў у сшытак. Абазначце канчаткі прыметнікаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**530.** Змяніце па склонах наступныя словазлучэнні.

Н. (які? якое?) маўклівы лес, добрае сэрца
Р. (якога?) …
Д. (якому?) …
В. (які? якое?) …
Т. (якім?) …
М. (аб якім?) …

Запішыце словазлучэнні ва ўсіх склонах. Абазначце канчаткі прыметнікаў.

**531.** Прачытайце назоўнікі, якія выкарыстаны ў розных склонах. Прыметнікі, што ў дужках, пастаўце ў патрэбным склоне з дапамогай пытанняў.

Вучня (якога?) (старанны), сына (якога?) (любімы), полю (якому?) (шырокае), за сталом (якім?) (абедзенны), аб браце (якім?) (родны), небам (якім?) (цёмнае).

Спішыце, ставячы прыметнікі ў патрэбным склоне.
Абазначце склоны прыметнікаў.

Узор. *Вучня (якога?) стараннага — Р., … .*

**532.** Прачытайце назоўнікі. Падбярыце да іх звязаныя па сэнсе прыметнікі.

Акно, мёд.

Праскланяйце словазлучэнні, якія атрымаліся, ва ўсіх склонах. Запішыце тое, што атрымалася.

**533.** Прачытайце склонавыя формы словазлучэнняў. Знайдзіце ў словазлучэннях прыметнікі.

Н. (як**ая**?) паласат-ая зебра
Р. (як**ой**?) паласат-ай зебры
Д. (як**ой**?) паласат-ай зебры
В. (як**ую**?) паласат-ую зебру



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Т.  (я к **о й**?) паласат-ай зебрай
М. (а б  я к **о й**?) аб паласат-ай зебры

?! Ці скланяюцца прыметнікі?
Якая частка слова ў іх змяняецца?
Ад чаго залежыць склон прыметніка?

**534.** Прачытайце. Запомніце пытанні, на якія адказваюць прыметнікі ў розных склонах.

| Склон | Дапамож-<br>нае слова | Пытанні | Прыклады | |
|---|---|---|---|---|
| Н. | ёсць | я к **а я**? | марозн-ая зіма | дараг-ая рэч |
| Р. | няма | я к **о й**? | марозн-ай зімы | дараг-ой рэчы |
| Д. | даць | я к **о й**? | марозн-ай зіме | дараг-ой рэчы |
| В. | бачу | я к **у ю**? | марозн-ую зіму | дараг-ую рэч |
| Т. | задаволены | я к **о й**? | марозн-ай зімой | дараг-ой (-ою) рэччу |
| М. | гаварыць | аб  я к **о й**? | аб марозн-ай зіме | аб дараг-ой рэчы |

?! Запішыце скланенне прыметнікаў. Абазначце канчаткі прыметнікаў.

**535.** Змяніце па склонах наступныя словазлучэнні. Успомніце дапаможныя словы, якія аблегчаць скланенне.

Н. (я к а я?) шырокая стужка, сіняя сукенка
Р. (я к о й?) …
Д. (я к о й?) …
В. (я к у ю?) …
Т. (я к о й?) …
М. (а б  я к о й?) …

?! Запішыце словазлучэнні ва ўсіх склонах. Абазначце канчаткі прыметнікаў.

**536.** Прачытайце верш.

Белая бярозка, дробная раса,
у полі каля вёскі пасадзіў я сам.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ты расці, бярозка, белая кара,
тоненькая ножка, быццам з серабра.
*(Рыгор Няхай)*

?! Знайдзіце прыметнікі жаночага роду.
Вызначце, з якімі назоўнікамі яны звязаны па сэнсе.
Спішыце, абазначце канчаткі прыметнікаў.
Вызначце склон прыметнікаў.

**537.** Прачытайце словазлучэнні.

Шустрая вавёрка, зімняя сцюжа.

?! Праскланяйце словазлучэнні. Запішыце іх.

**538.** Прачытайце словазлучэнні, у якіх выкарыстаны назоўнікі ў розных склонах. Падбярыце замест кропак прыметнікі. Пастаўце іх у адпаведных склонах.

Сустрэў ... чалавека, спужаўся ... звера, сядзеў пад ... дрэвам, быў на ... свяце, гуляў у ... лесе, сустрэў ... сябра, прачнуўся ... раніцай.

?! Запішыце словазлучэнні, што атрымаліся.
Абазначце склон назоўніка і прыметніка.

Узор. *Сустрэў добрага чалавека — Р., ... .*

**539.** Прачытайце сказы. Па стрэлачках вызначце, з якімі назоўнікамі звязаны па сэнсе прыметнікі.

У мяккім перадвячэрнім асвятленні від на ўзгоркі з сасновым лесам здаецца асабліва прыгожым. *(Віталь Вольскі)*

Над зжатым прасторам пераклікаліся жніўныя песні. *(Сяргей Грахоўскі)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Добра было ясным днём на высокім беразе. *(Кузьма Чорны)*

На свеце вельмі многа прыгожых мясцін, добрых людзей, шчырых сяброў. *(Мікола Хведаровіч)*

?! Пастаўце пытанні па стрэлачках: ад назоўнікаў да прыметнікаў.
У якіх сказах выкарыстаны назоўнікі ў множным ліку? У якім ліку стаяць звязаныя з гэтымі назоўнікамі прыметнікі?
Вызначце склоны назоўнікаў у другім і трэцім сказах.
Запішыце гэтыя сказы. Абазначце склоны прыметнікаў.

**540.** Прачытайце тэкст. Дзе знаходзіцца Швецыя? Ці даўно было навагодняе свята?

У далёкай **Швецыі** на навагоднім **свяце** бывае каралева святла. За каралеву выбіраюць найпрыгажэйшую **дзяўчыну** ў горадзе. Надзяюць ёй на галаву карону, а на той кароне гарыць шмат свечак. Тады ўсе выходзяць на вуліцу. Каралева святла выходзіць наперад і ўсім раздае святочныя **падарункі**. *(Паводле Анатоля Клышкі)*

?! Вызначце склоны выдзеленых назоўнікаў.
Знайдзіце прыметнікі, якія звязаны з дадзенымі назоўнікамі па сэнсе.
У якім склоне яны будуць стаяць?
Выпішыце з тэксту сказы з выдзеленымі назоўнікамі паводле ўзору.

Узор. *У далёкай (М.) Швецыі на навагоднім (М.) свяце бывае каралева святла.*

**541.** Уявіце, што вы зноў рыхтуецеся адзначыць навагодняе свята ў школе. Раскажыце, як вы будзеце рыхтавацца да свята.
У сваім выказванні ўжывайце прыметнікі.

**542.** Прачытайце тэкст.

### Зімовы лес

Цікава пабываць у **зімовым** лесе. **Зімовы** лес апрануў **зялёную** елку ў **белае** ўбранне. Няма ў **зімовага** лесу **лепшай** гульні, як закідваць дрэвы і кусты **іскрыстым** снегам. Весела **зімоваму** лесу



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

слухаць **ціхае** шапаценне галін. Апускаюцца сняжынкі на **зімовы** лес, ухутваюць яго **пушыстым** пакрывалам, хаваюць ад **лютага** марозу.

?! Вызначце склоны выдзеленых прыметнікаў.
Знайдзіце назоўнікі, ад якіх залежаць гэтыя прыметнікі. Вызначце склон назоўніка, па ім даведайцеся аб склоне прыметніка.

**543.** Прачытайце тэкст.

### Зімовае адзенне



*ла́ска*

Некаторыя звяры з надыходам зімы мяняюць (летні) футра на (цёплы) (зімовы) адзенне. У (пушысты) (густы) футрачка адзелася ліса. Зімовы ўбор у зайца-беляка і ласкі. Звяркі апранулі (беласнежны) адзенне. На (белы) снезе іх ніхто не ўбачыць.

?! Спішыце тэкст, змяняйце прыметнікі, што ў дужках, як патрабуе сэнс. Абазначце іх род і склон.

**544.** Прачытайце тэкст. Які зімовы месяц у ім апісаны?



*по́паўзень*

Апошні месяц зімы для жывёл і птушак дужа цяжкі. Корму мала. Зіма ўжо надакучыла. Глыбокі снег у лесе і на полі, ледзяная скарынка перашкаджаюць ласям, лісам, зайцам здабываць ежу.

Але ў дні з добрым надвор'ем ужо чутны спеў сініц, снегіра, попаўзня. У канцы месяца пачынаюць адлятаць на поўнач птушкі, што зімавалі ў нас. На лясных дрэвах з'яўляюцца пупышкі, каля стваloў — праталіны. Усё чакае вясну. *(З календара «Родны край»)*

?! Знайдзіце ў тэксце прыметнікі і назоўнікі, з якімі яны звязаны па сэнсе.
Запішыце словазлучэнні.
Вызначце склоны назоўнікаў і прыметнікаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**545.** Прачытайце верш, які напісаў вядомы беларускі паэт Адам Русак.

Рассцілаюцца сняжынкі
бел.. пухам на траве,
а сінічка на акенцы
нас у сад заве.

Наш садок узорам бел..
упрыгожыла зіма,
на галінках многа цвету,
толькі груш няма.

Мы паставілі кармушку,
клічам к цёпл.. акну,
каб сустрэла наша птушка
з песняю вясну.

?! Якія канчаткі прапушчаны ў прыметнікаў?
Выпішыце прыметнікі разам з назоўнікамі. Вызначце склон гэтых прыметнікаў. Абазначце канчаткі.

**546.** Прачытайце тэкст, устаўляючы прапушчаныя канчаткі прыметнікаў.

Глух.. цёмн.. сцяной падступае з абодвух бакоў да ракі лес. Сосны і яліны, кучарав.. бярозы глядзяць у ваду, як у люстра. Іх кроны адбіваюцца ў ціх.. плыні. Потым лес расступаецца, адкрывае шырок.. пойму з лугамі, векав.. дубы, бярозав.. гай. *(Паводле Тараса Хадкевіча)*

?! Вызначце лік і склон прыметнікаў.
Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя канчаткі. Зверху над прыметнікамі пазначце іх склон.

**547.** Прачытайце тэкст.

Густы змрок ахутаў наваколле. Бледная палоска зары прабівалася праз вячэрняе сутонне. Усю ноч шумела ў садзе гнуткае голле маладзенькіх вішань. Раніцой на тонкія галінкі дрэўцаў белы снег накінуў пушыстыя шапкі. Іскрысты снег церушыў увесь дзень.

?! Спішыце тэкст. Падкрэсліце прыметнікі адзіночнага ліку. Вызначце іх род і склон.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**548.** Прачытайце, як змяняюцца па склонах прыметнікі множнага ліку.

| Склон | Пытанне | Прыклады |
|---|---|---|
| Н. | якія? | працавіт-ыя, сумленн-ыя, шчыр-ыя людзі |
| Р. | якіх? | працавіт-ых, сумленн-ых, шчыр-ых людзей |
| Д. | якім? | працавіт-ым, сумленн-ым, шчыр-ым людзям |
| В. | якіх? | працавіт-ых, сумленн-ых, шчыр-ых людзей |
| Т. | якімі? | працавіт-ымі, сумленн-ымі, шчыр-ымі людзьмі |
| М. | аб якіх? | аб працавіт-ых, сумленн-ых, шчыр-ых людзях |

?! Спішыце, абазначце канчаткі прыметнікаў.

**549.** Прачытайце незакончаныя сказы.
Устаўце замест кропак прыметнікі множнага ліку, што падыходзяць па сэнсе.

У кветніку расцвілі … кветкі.
У горадзе пабудавалі многа … дамоў.
Кніга расказвае пра … сяброў.
Наш настаўнік нядаўна пабываў у … мясцінах.

?! Запішыце сказы. Устаўце прыметнікі.
Вызначце склоны гэтых прыметнікаў.

**550.** Прачытайце тэкст. Разгледзьце малюнак, на якім адлюстравана аўсянка. Ці бачылі вы гэтую птушку ў прыродзе?



**аўся́нка**

Зімой аўсянкі — ціх.. і непрыкметн.. птушкі. Іх можна нават з вераб'ямі зблытаць. Такія ж шэраньк.. . Марозн.. днямі яны часта з вераб'ямі скачуць па вясков.. дарогах. Згублен.. каласкі цярэбяць.

*(Паводле Рыгора Ігнаценкі)*

?! У якім ліку ўжыты ў тэксце прыметнікі і назоўнікі?
Якія канчаткі прыметнікаў прапушчаны?
Спішыце тэкст, абазначце канчаткі прыметнікаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**551.** Прачытайце верш. З чым параўноўваюцца суніцы?

Вы не бачылі, сябры, —
зоркі выпалі ў бары.
Свецяцца жарынкі —
цёпл.. смяшынкі,
сонечн.. дочкі —
зваблів.. вочкі.
*(Васіль Зуёнак)*

?! Спішыце верш, дапішыце канчаткі прыметнікаў. Вызначце іх лік, род і склон.

**552.** Прачытайце верш.

На **прылеску** каля сцежак
столькі знойдзеш сыраежак!
Чырванюткіх, жаўтаватых,
смуглых, шэрых, сіняватых,
сакавітых, саладзенькіх
сыраежак маладзенькіх.
*(Авяр'ян Дзержынскі)*

?! Вызначце прыметнікі, якія адносяцца да слова *сыраежкі*. Выпішыце іх.
Вызначце лік і склон прыметнікаў, абазначце канчаткі.
Выдзеленае слова разбярыце па саставе.

**553.** Прачытайце верш. Што паэт лічыць скарбамі? А што лічыце скарбам вы?

**Лясныя скарбы**

Я часта і доўга па лесе блукаю,
дзівосныя скарбы яго сабіраю:
зязюль кукаванне
і песні драздоў,
грыбное маўчанне



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

і звон ручайкоў,
і смутак ракіт,
і крынічак блакіт,
і водар сасновы,
і пах чабаровы,
рабіны цяпло
і бярозак святло…
Я самы шчаслівы, багаты
вяртаюся з лесу дахаты.
*(Іван Муравейка)*

?! Знайдзіце ў вершы спалучэнні назоўнік + прыметнік.
Якое слова характарызуюць прыметнікі *шчаслівы, багаты* ў апошнім сказе верша?
Вызначце лік, род і склон прыметнікаў у вершы.

**554.** Уявіце рэч, чалавека або яшчэ нешта іншае, што для вас з'яўляецца вельмі дарагім. Апішыце свой скарб. Не называйце тое, пра што расказваеце. Слухачы павінны здагадацца, пра што ідзе гаворка.
Выкарыстоўвайце пры апісанні прыметнікі.

**555.** Прачытайце тэкст.

**Жолуд і гарбуз**

Бегаў хлапец па лесе. Змарыўся і лёг адпачыць пад высокім густым дубам. На тым дубе жалудоў — не злічыць.

Хлапец падумаў: «Вось дзіва! На такім вялізным дрэве такія малыя жалуды растуць. Гарбуз во які вялікі, а на тонкім сцябле трымаецца. Чаму б гарбузам на дубе не расці?»

Падняўся моцны вецер, зашумеў галінамі стары дуб, дажджом сыпануліся жоўтыя жалуды на зямлю. Адзін жолуд так спрытна ўдарыў хлапцу ў нос, што аж забалела.



***гарбу́з***



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

«Ну і добра, што не гарбузы на дубе растуць!» — сказаў бедны хлапец і, нахіліўшы галаву, хуценька ўцёк з-пад дуба. *(Паводле Леанілы Гарэцкай)*

Знайдзіце ў тэксце прыметнікі. Вызначце іх склоны.
Колькі частак у тэксце?
Аб чым расказваецца ў першай частцы? Якую назву можна ёй даць?
Пра што ідзе гаворка ў другой частцы? Як можна назваць яе?
Аб чым трэцяя частка тэксту? Прыдумайце назву і ёй.
Падбярыце назву да чацвёртай часткі тэксту.
Запішыце назвы тэксту і яго частак.
Перакажыце тэкст па частках.
* Напішыце пераказ тэксту.

**556.** Прачытайце назвы пораў года. Якімі словамі можна ахарактарызаваць кожную з іх?
Падбярыце як мага больш прыметнікаў да кожнага назоўніка.

Зіма — марозная, ..., ... .
Вясна — ..., ... .
Лета — ..., ... .
Восень — ..., ... .

Запішыце назвы і прыметнікі.
Абазначце канчаткі прыметнікаў. Назавіце іх род.

**557.** Прачытайце словазлучэнні.

Чырвоныя ружы, цяжкія камяні.

Праскланяйце словазлучэнні, абазначце канчаткі прыметнікаў.

**558.** Прачытайце рэцэпт пірага.

Вазьміце 3 кіслыя яблыкі, 5 курыных яек, 200 грамаў пшанічнай мукі, 200 грамаў цукровага пяску, 1 чайную лыжку разрыхляльніку цеста. Узбіце яйкі ў пышную пену з цукрам. Дадайце



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

прасеяную муку, разрыхляльнік, змяшайце. Заліце парэзаныя яблыкі цестам. Выпякайце ў гарачай духоўцы 30—40 хвілін. Смачна есці!

?! Дайце назву тэксту-рэцэпту.
Запішыце рэцэпт у сшыткі.
Падкрэсліце прыметнікі хвалістай лініяй, вызначце іх лік, род і склон.

**559.** Прачытайце верш. Што можна прыгатаваць у чыгунку?

### Чыгунок

Чорны, **чорны** чыгунок
грэўся ў печцы нашай.
Чорны, чорны чыгунок —
ды з **духмянай** кашай.

З **рысавай** ці **ячнаю** —
**сытнаю** і **смачнаю**.
А магчыма, з бабкаю,
з **пульхнымі** аладкамі?



Чорны, чорны чыгунок
грэўся ў печцы нашай.
Чорны, чорны чыгунок
з **апетытнай** кашай.

*(Таццяна Мушынская)*

?! Ці елі вы калі-небудзь ежу, прыгатаваную ў печы?
Ці ёсць у сучаснай кватэры, доме печ? Што яе замяняе?
З якіх круп гатуюцца ячная і рысавая кашы? Якія кашы вы яшчэ ведаеце?
З чаго гатуюць бабку?
Запішыце выдзеленыя прыметнікі разам з назоўнікамі, да якіх яны адносяцца. Вызначце род, лік і склон выдзеленых прыметнікаў. Абазначце іх канчаткі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**560.** Падбярыце да назоўніка *бульба* як мага больш прыметнікаў, якія адлюстроўваюць спосаб прыгатавання. Карыстайцеся малюнкамі.







?! Пісьмова праскланяйце словазлучэнні, што атрымаліся.

**561.** Прачытайце назвы каш. На якой мове яны запісаны?

**Манная, гречневая, пшённая, рисовая, перловая, овсяная, гороховая, ячневая.**

?! Якой часцінай мовы з'яўляюцца назвы каш?
Перакладзіце назвы каш на беларускую мову. Запішыце іх у сшытак.
Складзіце сказ з назвай любімай кашы.

**562.** Прачытайце словазлучэнні.

**Баршчу (я к о г а?) (гарачы), хлебам (я к і м?) (свежы), салаты (я к о й?) (маладая), марожанае (я к о е?) (шакаладнае), аб грушы (я к о й?) (салодкая), цукру (я к о м у?) (карычневы), бульбы (я к о й?) (смажаная), аб варэнні (я к і м?) (журавінавае).**

?! З дапамогай пытанняў пастаўце прыметнікі ў патрэбным склоне, запішыце іх, абазначце канчаткі. Вызначце склон прыметнікаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**563.** Прачытайце тэкст.

### Вясна ідзе

Уздоўж вузк.. сцежкі, што вядзе ў школу, дзівосн.. фігурамі ўзвышаюцца высок.. гурбы снегу.

Ух, як холадна! Бр-р-ррр...

Але раптам у агародчыку заспявала сініца. Ды так звонка! Нібы сярэбран.. званочак зазвінеў. Міжволі спынішся і з хваляваннем слухаеш гэту вясёл.. песеньку. А жаўтагруд.. спявачка не заўважае ні гурбаў снегу, ні бел.. вопраткі на дрэвах, ні моцн.. сцюжы. Ляціць і ляціць ва ўсе бакі вясёл.. песенька-заклік.

Хутка яе падхопліваюць іншыя птушкі. Песня шырыцца, расце. *(Рыгор Ігнаценка)*

?! Спішыце тэкст, дапішыце патрэбныя канчаткі ў прыметніках, абазначце іх.

Вызначце род і склон прыметнікаў.



**564.** Прачытайце і адгадайце загадкі.

Кудлатая, калючая,
высокая, рыпучая.
Што восень, што вясна —
зялёная ...



Трапяткая прастора —
цёмна-сіняе мора.
Як жывое, да рання
ўсё пульсуе ад ззяння.
*(Соф'я Шах)*

?! Запішыце загадкі і адгадкі.

Падкрэсліце прыметнікі хвалістай лініяй.

Абазначце канчаткі прыметнікаў, вызначце іх склоны.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**565.** Прачытайце. Падбярыце да прыметнікаў антонімы.

Нясмачн.. малаком — ... малаком.
На цвёрд.. крэсле — на ... крэсле.
З вясёл.. настроем — з ... настроем.
Нізкам.. хлопцу — ... хлопцу.
Чэрств.. булкі — ... булкі.
Халодн.. раніцу — ... раніцу.

?! Запішыце словазлучэнні парамі, дапішыце канчаткі. Вызначце склон прыметнікаў.

Узор. *Нясмачным (Т.) малаком — смачным (Т.) малаком.*

**566.** Прачытайце тэкст.

Была ў Ягоркавага дзядулі **музычная** шкатулка. **Маленькі** малаточак стукаў па **тонкім** дроціку. Дроцік адзываўся **ціхім** звонам. З гэтых гукаў складалася **цудоўная** мелодыя. Яна грала **прыгожым** **тоненькім** галасочкам. Ягорку здавалася, што на **высокім** дрэве **ясным** **звонкім** галаском выводзіць **дзіўную** мелодыю нейкая птушачка.

?! Спішыце тэкст. Вызначце род і склон прыметнікаў.
Абазначце канчаткі прыметнікаў.

**567.** Прачытайце. Дапоўніце сказы патрэбнымі прыметнікамі.

Казуля — грацыёзная і ... жывёла. Яна мае ... тулава. Хутка перабірае казуля ... ножкамі, калі ратуецца ад драпежнікаў. Кожная ножка заканчваецца ... капытком. У казулі ... галоўка на ... шыі. Звер мае ... зрок і ... нюх.

Словы для выбару: *прыгожая, добры, лёгкае, востры, стройныя, тонкая, невялікая, тонкі.*

?! Запішыце тэкст, устаўце прапушчаныя прыметнікі, змяніце іх, як патрабуе сэнс. Абазначце канчаткі прыметнікаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**568.** Разгледзьце малюнак. Складзіце тэкст — апісанне зубра.



Словазлучэнні для выбару: *густая кучаравая поўсць, вялікая галава, чорная барада, шырокія мускулістыя грудзі, высокі карак, калматая грыва, тоўстыя кароткія ногі.*

**569.** Прачытайце тэкст.



Цікавая гісторыя звязвае Камянецкую вежу і Белавежскую пушчу. Каб абараніць заходнюю граніцу, князь вырашыў выбраць месца для новага горада. Ён знайшоў прыгожую мясціну сярод густой пушчы на беразе ціхай рэчкі. Князь загадаў пабудаваць тут мураваную вежу. Яна заўсёды мела чырвоны колер, але людзі яе называюць «Белая вежа».

**Ве́жа** — высокае і вузкае архітэктурнае збудаванне.
**Князь** — правіцель і кіраўнік войска ў старажытныя часы.

?! Знайдзіце ў тэксце прыметнікі, выпішыце іх разам з назоўнікамі, да якіх яны адносяцца.
Абазначце склон прыметнікаў і іх канчаткі.

**570.** Прачытайце тэкст. Словы, што ў дужках, пастаўце ў патрэбным склоне.

Аднойчы Васілёк прынёс дамоў (якое?) (маленькае) шчаня. З той пары ўвесь свой (які?) (вольны) час хлопчык праводзіў каля (якога?) (новы) сябра. Ён даваў (якому?) (маленькае) шчаняці (якое?) (свежае) малако, карміў яго (якімі?) (хлебныя) крошкамі і мясам. (Якому?) (Маленькі) камячку не сядзелася на адным месцы. Ён хутка бегаў за Васільком і тузаў яго за руку. (Якому?) (Маленькае) шчаняці хлопчык даў клічку Тузік.

?! Спішыце тэкст. Прыметнікі, што ў дужках, змяняйце, як патрабуе сэнс. Абазначце канчаткі прыметнікаў. Вызначце іх склон.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 15. Падагульненне па тэме «Прыметнік»*

**571.** Прачытайце тэкст.

Багаты змешанымі лясамі наш край. Тонкія сосны стаяць упрэмешку з лісцевымі дрэвамі. Улетку лес поўніцца птушынымі спевамі. Зімой пад зялёнымі хвойкамі знойдуць прытулак звяры і птушкі. Лясным жыхарам у лесе цёпла і ўтульна. Іх не палохае зіма з маразамі і злоснымі завеямі.

?! Выпішыце з тэксту прыметнікі з назоўнікамі, да якіх яны адносяцца. Вызначце лік і род прыметнікаў.

**572.** Праскланяйце прыметнікі разам з назоўнікамі.

Зялёныя лугі, цікавыя кнігі, шырокія палі.
Турысцкі паход, вузкая сцежка, сіняе возера.
Лёгкае воблака, вясёлая песня, цяжкі дзень.

?! Запішыце, абазначце канчаткі прыметнікаў.

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

**1.** Прачытайце тэкст.

Прыгрэла **веснавое** сонейка. На **лясной** палянцы пачаў раставаць снег. Пад **старой** сасной прачнуліся жыхары **вялікага** дома. Гэта **працавітыя** мурашы.

Спішыце тэкст.
Якой часцінай мовы з’яўляюцца выдзеленыя словы? Вызначце іх лік і род.

**2.** Прачытайце сказы, дапоўніце іх прыметнікамі, што падыходзяць па сэнсе.

У (сыры, мокры, вільготны) надвор’е лепш пасядзець дома.
У лесе расцвіў (духмяны, пахучы, водарны) ландыш.
Мы адпачылі пад (моцны, магутны, атлетычны) дубам.

Запішыце. Абазначце канчаткі прыметнікаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**3.** Прачытайце словазлучэнні.

Прыгарадны вакзал, цёплая рукавіца.

Праскланяйце словазлучэнні, запішыце іх.
Абазначце канчаткі прыметнікаў.

# ЗАЙМЕННІК

## *Урок 1. Займеннік. Агульнае паняцце*

**573.** Прачытайце верш. Адкажыце на пытанне, што змешчана ў ім.

Калі **я** знаёмых
ці родных спаткаю,
вітаюся,
зняўшы ўбор з галавы,
і ветла кажу,
калі што ў **іх** спытаю:
— Вялікі **вам** дзякуй!
Прабачце. А **вы**?

*(Анатоль Клышка)*

?! Сказы якіх відаў ёсць у вершы?
Прачытайце выдзеленыя ў вершы словы. Ці можаце вы іх аднесці да вядомай вам часціны мовы? Гэта назоўнікі? Прыметнікі? Дзеясловы?
Запішыце гэтыя словы ў сшытку.

*Запомніце!*
Часціна мовы, якая называецца **займеннік**, паказвае на прадмет, прымету, але не называе іх: *мой, такі, яно, ты, вы, увесь, ніхто, гэты, наш, ваш, чый, каторы, сябе*.
Займеннікаў няшмат, але яны ўжываюцца часта.

**574.** Прачытайце словы. Раздзяліце іх па часцінах мовы.

Час, кніга, гуляць, вясёлы, чырвоны, мой, з, на, мы, вечар, працаваць, цалаваць, перад, пад, добры, мы, ён, сябе.

?! Запішыце словы па наступных групах: назоўнікі, прыназоўнікі, дзеясловы, прыметнікі, займеннікі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**575.** Падумайце, чаму займеннік мае такую назву. Прачытайце разважанні.

Разбяром гэта слова па саставе.

Корань слова *-йм-* або *-ім-*. Прыстаўка *за-*. Напэўна, гэта скарочанае слова *замест*. Можна сказаць, што ў назве займенніка схаваны яго сэнс: займеннік выкарыстоўваецца *замест імені* або назвы.

?! Запішыце слова *займеннік*. Абазначце патрэбнымі знакамі яго часткі. Якая частка гэтага слова не названа ў тэксце?

**576.** Прачытайце сказы. Як называецца такая з'ява? Калі яна часцей за ўсё адбываецца?

Рэкі выйшлі з берагоў. Яны злучыліся ў нізінах з ляснымі рэчкамі, балотамі ў адзін вялікі вадзяны прастор. Відаць толькі асобныя ўзвышшы. На іх ратуюцца лясныя жыхары.

?! Знайдзіце займеннікі ў другім і чацвёртым сказах. Замест якіх слоў яны ўжыты?
Спішыце сказы. Падкрэсліце займеннікі.

**577.** Прачытайце жартоўныя дыялогі. Як вы лічыце, дзеці якога ўзросту размаўляюць тут са сваімі маці? А з вамі вашы матулі сталі б гаварыць на такія тэмы ці не? Чаму?

— Я шмат разоў казала, каб ты не хадзіў па лужынах. Бачыш, зноў захварэў! — дакарае маці сына.
— Добра, мама, я цяпер буду бегаць.

— Мама, я сёння ўпаў, — скардзіцца хлопчык.
— Ты плакаў?
— Не, паблізу нікога не было.

?! Знайдзіце ў дыялогах займеннікі. Выпішыце іх.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**578.** Прачытайце жартоўныя дыялогі. Растлумачце сэнс кожнага жарта. Замест кропак устаўце прапушчаныя займеннікі *я, ты, ён, мы*.

Маці ўшчувае сына-гультая.
Ён апраўдваецца:
— Мамачка, чаго ... крычыш? ... ж нічагусенькі не рабіў.

Бацька спытаў:
— Дзе твой дзённік, сынок?
— ... аддаў яго Валодзю — ... хоча напалохаць сваіх бацькоў.

— ... не бойся, — супакойвае маці сына перад кабінетам зубнога ўрача. — Нічога табе тут не зробяць.
— Тады чаго ... сюды прыйшлі?

?! Знайдзіце з дапамогай настаўніка іншыя займеннікі ў гэтых жартах. Запішыце ўсе займеннікі, якія тут выкарыстаны.

**579.** Прачытайце сказы. Назавіце ў іх займеннікі.



***падбе́л***

Мы цябе не баімся. *(Алесь Асіпенка)*
Ён быў вельмі палахлівы. *(Змітро Бяспалы)*
Ноччу яны адпачываюць. *(Рыгор Ігнаценка)*
А ты зараз кладзіся спаць. *(Уладзімір Караткевіч)*
Яна падбягае да брата і моцна яго абдымае. *(Іван Сіняўскі)*
Гараць залатыя чародкі падбелу, яны яшчэ з кволымі бязлістымі сцяблінкамі. *(Васіль Хомчанка)*

?! У якім сказе выкарыстана два займеннікі? Спішыце сказы. Падкрэсліце займеннікі.

## *Урок 2. Асабовыя займеннікі*

**580.** Прачытайце тэкст. Якой часцінай мовы з'яўляюцца выдзеленыя словы?

Аднойчы знайшоў бацька ў лесе маленькае лісяня. **Яно** было вясёленькае, шустрае. «**Ты** пакармі **яго**», — сказаў тата. **Я** наліў



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

малака ў сподачак. Неўзабаве прыбег мой сябар Міхась. **Ён** прынёс кавалак свежага мяса. **Мы** пачалі разам карміць лісяня. **Яно** зусім не баялася **нас**. Пасябравала **яно** і з нашым катом. **Яны** ўдваіх пілі малако з аднаго сподачка.

?! Выпішыце выдзеленыя займеннікі з тэксту.

*Запомніце!*
Займеннікі **я, ты, ён, яна, яно, мы, вы, яны** называюцца **асабовымі**.

**581.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце незакончаныя сказы. Замест кропак устаўце займеннікі.






... спіць у калысцы. ... мые посуд. ... робіць урокі. ... гуляюць у хакей.

?! Запішыце сказы з займеннікамі. Падкрэсліце займеннікі.
Замест якіх слоў вы ўжывалі займеннікі?

**582.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў ім займеннікі.

### Вавёрчын падарунак

Аднойчы я пайшоў у лес. Раптам лясную сцежку мне перабегла вавёрка. Яна ўзабралася на маладую сасонку і з вялікай цікавасцю пазірала на мяне. На пушыстым хвасце рыжай вавёркі чырванеў асінавы лісток. Я махнуў рукой. Шустрая вавёрка спужана скокнула на высокую сасну, а чырвоны лісток з хваста



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ўпаў на мой рукаў. З вавёрчыным падарункам я пакрочыў дамоў. (*Паводле Ірыны Гімпель*)

Запішыце тэкст пад дыктоўку.
Падкрэсліце займеннікі.

Праверце дыктанты адно ў аднаго.

**583.** Прачытайце верш. Вывучыце яго на памяць. Раскажыце дома верш сваім маці.

**Родныя рукі**

Я ласкай сагрэты,
пяшчотай тваёю.
Ты — яснае сонца,
што рана ўстае.

І робяць усё
для мяне з любоўю
родныя рукі,
мама, твае.

(*Уладзімір Місун*)

Знайдзіце ў вершы займеннікі.
Якія словы яны замяняюць?

**584.** Уявіце, што ў вашай мамы дзень нараджэння або надышоў Міжнародны жаночы дзень. А можа, вам проста хочацца сказаць, як вы яе любіце?
Успомніце самыя цёплыя і ласкавыя словы, з якімі вы звернецеся да сваёй матулі.

Выкажыце адно аднаму тыя словы, якія вам хочацца сказаць сваім маці.
Выкарыстоўвайце ў сваіх выказваннях займеннікі.

**585.** Прачытайце верш. Як называюцца песні, што спяваюць маці сваім маленькім дзецям перад сном?

**Вечаровая песня**

Ахінае сцежкі ночка,
дрэмлюць дрэвы і кусты.
Мой сыночак, мой званочак,
засынай хутчэй і ты.
У дарослых ёсць дарогі,



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

многа пройдзеных дарог,
ёсць у нас свае трывогі,
у цябе няма трывог.
Падрасцеш, сынок, і будзеш
мір ахоўваць на зямлі,
каб спакойна спалі людзі,
каб шчаслівымі былі.
*(Васіль Жуковіч)*

?! Колькі сказаў у гэтым вершы?
Запішыце ў радок тыя сказы, у якіх сустракаюцца займеннікі.
Падкрэсліце займеннікі.

## *Урокі 3—4. Знаходжанне займеннікаў у сказе, тэксце*

**586.** Прачытайце тэкст. Якую назву яму можна даць? Якая асноўная думка гэтага тэксту? Што аўтар хацеў выказаць з яго дапамогай?

Калі Ала прыбегла са школы, маці якраз наводзіла ў кватэры парадак. Сёння — субота, і ў гэты дзень у доме заўсёды ўборка.

Ала пачала дапамагаць маме. Яна памыла лісточкі кветак, паліла вазоны. Дзяўчынка любіла даглядаць кветкі.

Потым Ала працірала шкло ў вокнах. Яна старалася. І выходзіла ў яе, як у сапраўднай гаспадыні. Шыбы ажно папісквалі. Скончыўшы работу, дзяўчынка адышла ад акна, каб паглядзець, ці ёсць на шкле яшчэ плямкі. Зірнула — і здзівілася...

— А дзе шкло? Я ж толькі яго працірала.

Маці ўсміхнулася і абняла Алу:

— Памочніца ты мая залатая! Шкло нікуды не падзелася. Гэта ты дужа добра справілася са сваёй работай. Плямак няма — вось і шкла не відаць. *(Паводле Васіля Ткачова)*

?! Знайдзіце ў тэксце займеннікі.
Прачытайце тэкст яшчэ раз. Закрыйце кнігі.
Перакажыце тэкст сваімі словамі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**587.** Прачытайце тэкст. Пра якую прафесію ён распавядае? Ці былі вы на пошце?

## На пошце

Генава мама Ларыса Пятроўна працуе на пошце. Яна прымае і выдае пасылкі, бандэролі. Мы бачылі яе там, як адпраўлялі пасылку бабулі Алесі і дзядулю Міхасю. Яны жывуць у вёсцы Навасёлкі на самым беразе ракі Прыпяць.



Спрытна працуе Ларыса Пятроўна. Паставіць пасылку на вагі, узважыць і пачынае перавязваць вяровачкаю. Пасля бярэ нешта падобнае на растоплены шакалад, лье на пасылку і ставіць пячатку. *(Паводле Алены Мімрык)*

***бандэро́ль***

**Бандэро́ль** — паштовае адпраўленне ў папяровай абгортцы.

Растлумачце напісанне слоў з вялікімі літарамі ў тэксце.
Знайдзіце ў сказах займеннікі. Замест якіх слоў яны ўжыты?
Спішыце першую частку тэксту. Падкрэсліце ў сказах займеннікі.

**588.** Раскажыце, навошта яшчэ людзі ходзяць на пошту.
Ці бывалі вы там? Што вы рабілі?

**589.** Раскажыце аб прафесіях сваіх маці. Дзе яны працуюць? Якія ў іх абавязкі на працы? Ці можаце вы дапамагчы ім у выкананні іх працоўных абавязкаў?
Выкарыстоўвайце займеннікі.

**590.** Прачытайце тэкст.

## Верабей

Знайшоў аднойчы верабей вялікую скарынку хлеба. Але ў птушкі не хапала сілы падняць **скарынку** і аднесці ў гняздо. Наляцелі іншыя вераб’і і хацелі дапамагчы небараку. Але ён спужаўся, што трэба будзе скарыначкай з **вераб’ямі** падзяліцца.

Верабей прагнаў птушак і сам стараўся справіцца са скарынкай. Цяжка **вераб’ю** прыйшлося. Спачатку скарынка не паддавалася.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Занадта вялікая **скарынка** была. Але настойлівасць птушкі перамагла. *(Паводле Галіны Браілоўскай; пераклад з рускай мовы)*

?! Замяніце выдзеленыя словы займеннікамі, якія падыходзяць па сэнсе. Запішыце тэкст, падкрэсліце займеннікі.

**591.** Прачытайце вершаваныя загадкі. Здагадайцеся, пра каго або пра што ў загадках гаворыцца *ён*.

Для адных ён — садавод.
Для другіх ён — палявод.
Паспявае ўсюды быць,
поле, луг і сад паліць.
*(Нічыпар Парукаў)*

У ваду нырае смела.
Хату ён будуе ўмела.
Пад вадой і на вадзе
будаўніцтва ён вядзе.

Ён прачнуўся
рана-рана.
Мэблю возіць
ён старанна.
На будоўлю —
цэглу, рамы.
Малако і хлеб —
у крамы.
Ён лайдачыць не прывык.
А завецца — … .
*(Паводле Алеся Емяльянава)*

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | |

?! Па намаляваных схемах слоў праверце колькасць літар у словах-адгадках. Запішыце словы-адгадкі.

**592.** Прачытайце верш. Замест кропак устаўце прапушчаныя займеннікі *я, ён, мне, яна, мяне.*

Чорны дзяцел сеў на дуб,
узлахмаціў чорны чуб:
— Ох і птах … безгаловы:
дуб стары, але ж здаровы,
жалудоў … мае кош,
а яды … ні на грош.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Палячу ... на сасну,
сук струхлелы паласну.
Будзе смачны ... абед,
папалудную як след.
... мшыстая, старая,
ежу для ... трымае.
Дзяцел збіў пушысты мох
і наеўся колькі мог.

*(Паводле Станіслава Шушкевіча)*

?! Гэты верш сур'ёзны ці жартоўны?
Якія займеннікі выкарыстаны ў вершы двойчы?

**593.** Прачытайце. Замест кропак устаўце патрэбныя займеннікі.

Наляцеў на лес буран. ... раскачваў дрэвы. ... гнуліся да самай зямлі. ... назіраў за маленькай бярозкай. ... расла паводдаль ад астатніх дрэў. Вецер іграў з яе лісткі.

... з таварышам прынеслі палку і прывязалі дрэўца. Здалося, што ... прыветна паківала нам вершалінкай.

Вы бачылі на ўскрайку лесу прыгожую бярозку? Гэта ж тое дрэва, што некалі мы ўратавалі ад бурану!

?! Палічыце, колькі сказаў у тэксце. Якія знакі прыпынку стаяць у канцы сказаў? Назавіце віды сказаў, што ёсць у тэксце.
Спішыце тэкст, устаўце прапушчаныя займеннікі.

**594.** Прачытайце тэкст. Ён сур'ёзны ці жартоўны?

## Бабровая хатка

Бабёр — клапатлівы гаспадар. На беразе рэчкі ён будуе драўляную хатку. Знізу і ўнутры яна змацоўваецца рачным глеем.

Часам да бабровай хаткі падыходзіць воўк. Але драпежнаму зверу не хапае сілы разбурыць яе. У моцнай хатцы бабёр адчувае сябе спакойна.

У час Вялікай Айчыннай вайны бабровая хатка была іншы раз надзейнай схованкай ад чужынцаў. Вядомая гісторыя, калі ў фашысцкай засадзе апынуліся тры партызаны. Але яны змаглі схавацца



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ў адной бабровай хатцы. Калі небяспека мінула, яны выбраліся з хаткі і вярнуліся ў партызанскі атрад. *(Паводле Віталя Вольскага)*

**Глей** — вязкі асадак з мінеральных або арганічных рэчываў на дне вадаёмаў.
**Партыза́н** — удзельнік вайны ў тыле ворага.

?! Знайдзіце ў тэксце займеннікі. Выпішыце іх.
Прачытайце тэкст яшчэ раз.
На колькі частак яго можна падзяліць?
Аб чым расказваецца ў першай частцы? У другой?
Якія падзеі апісаны ў трэцяй частцы тэксту?
Падбярыце назвы да кожнай часткі. Запішыце план тэксту.
Перакажыце пісьмова трэцюю частку тэксту.

**595.** Прачытайце тэкст.

### На рыбалцы

Аднойчы Коля пайшоў лавіць рыбу. На рацэ яго заспела навальніца. Грымеў гром, бліскала маланка. Коля схаваўся ад дажджу пад лодку. Хутка навальніца прайшла. Коля вярнуўся дамоў з добрым уловам.

?! Куды пайшоў Коля?
Што здарылася на рыбалцы?
Куды схаваўся Коля ад дажджу?
З якім уловам вярнуўся хлопчык дамоў?
Паспрабуйце прачытаць (расказаць) тэкст ад свайго імя.

**596.** Прачытайце тэкст. Прыдумайце яму назву.

У жывым кутку жыў маленькі вожык. Спачатку **вожыка** ўсё палохала. Мы кармілі вожыка і даглядалі яго. Паступова **вожык** прывык да дзяцей. Вожык увесь час тупаў за дзецьмі па пакоі. З надыходам вясны **вожык** засумаваў. Мы аднеслі вожыка ў лес і выпусцілі на волю.

?! Запішыце назву тэксту. Спішыце тэкст, замяніце выдзеленыя назоўнікі займеннікамі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ДЗЕЯСЛОЎ

## *Урок 1. Дзеяслоў*

**597.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў ім дзеясловы. На якія пытанні яны адказваюць?



Нашы продкі садзілі каля хат ліпы. Дрэвы аберагалі будынкі ад маланак. З ліпавага камля выдзёўбвалі посуд, а цвет сушылі на лекі. Прыгадаем яшчэ, якія смачны ліпавы мёд і якое карыснае лыка!

**ль́ыка**

**Каме́ль** — ніжняя патоўшчаная частка дрэва, расліны, якая прылягае да кораня.
**Лы́ка** — унутраны слой кары маладых ліслевых дрэў (пераважна ліпы).

Што яшчэ вы ведаеце пра карысць ліпы? Ці пілі вы чай з ліпавага цвету? Калі такі чай асабліва карысны?
Спішыце тэкст, падкрэсліце дзеясловы двюма лініямі, вусна пастаўце да іх пытанні.

*Успомніце!*
**Дзеяслоў** — гэта часціна мовы, якая абазначае назву дзеяння. Дзеяслоў адказвае на пытанні **што рабіць? што рабіў? што зрабіць? што будзе рабіць?** і падобныя.

**598.** Прачытайце верш. Ці адпавядае настрой аўтара верша вашаму сённяшняму настрою? Чаму?

**Пяе душа**

Вось-вось праклюнуцца пупышкі
нясмелым лісцем на вярбе.
Кудысьці ў сонечным зацішку
паўзуць мурашкі паўз цябе.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

На пазалочаным прыпёку
спяваюць сонныя чмялі.
А ў сасняку непадалёку
пралескі вабна зацвілі.

Навокал — мяккая лагода,
дзень ясны дыхае ў шчаку.
Адчуўшы добрую нагоду,
пяе душа ў сакавіку.

*(Паводле Мар'яна Дуксы)*

?! Знайдзіце ў вершы дзеясловы. Пастаўце да іх пытанні. Запішыце дзеясловы разам з пытаннямі.

**599.** Прачытайце верш. Растлумачце, чаму плуг не ржавее.

**Чаму плуг не ржавее**

Ясны дзень ці вецер свішча,
ці то ўвосень, ці ўвясну,
зранку ў полі плуг-плужышча
пракладае баразну.
Ён нібыта ў сшытку піша —
за радком радок бяжыць.
А ралля з палёгкай дыша,
быццам цеста ў дзяжы.
Лемяшы аж пунсавеюць,
кожны ззяе, як прамень...
Плуг ніколі не ржавее,
бо працуе цэлы дзень.

*(Мікалай Салаўцоў)*



**Ляме́ш** — частка плуга, якая падразае пласт зямлі знізу.

?! Запішыце ў сшыткі апошні сказ верша. Пастаўце пытанні да дзеясловаў. Як пішацца ***не*** з дзеясловамі?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**600.** Прачытайце словы.

| | |
|---|---|
| чаромха | павявае |
| вясна | распускаюцца |
| пупышкі | цвіце |
| мурашкі | настала |
| ветрык | зазелянела |
| трава | паўзуць |

?! Да назоўнікаў падбярыце дзеясловы з правага слупка. Запішыце словы парамі. Пастаўце пытанні да дзеясловаў.
Складзіце і запішыце невялікае апавяданне пра вясну.

**601.** Прачытайце тэкст.

### Прыход вясны

Вясна прыйшла неяк раптоўна. Сонца ўзнялося над лесам. Яно шырока расплюшчыла вочкі. Адразу з узгоркаў памчаліся ручаіны. На рэчцы ледзяныя крыгі адсталі ад берагоў. На схілах узгоркаў паказаліся чорныя плямы. Зямля ўздыхнула пасля доўгага зімовага сну.

?! Спішыце тэкст. Падкрэсліце дзеясловы дзвюма лініямі, пастаўце да іх пытанні.

## *Урок 2. Лік дзеясловаў*

**602.** Прачытайце дзеясловы. Хто або што можа выконваць такія дзеянні? Якія з дзеясловаў ужыты ў множным ліку, а якія — у адзіночным?

Ідзе, плывуць, бяжыць.

?! Складзіце па два сказы з кожным дзеясловам, каб дзеянні выконваліся рознымі прадметамі.

**603.** Прачытайце дзеясловы.

Прыбяжыць, памые, напісаў, танцуе, гуляе, пазірае, слухаю, чытаю.

?! У якім ліку ўжыты дадзеныя дзеясловы? Пастаўце іх у множным ліку. Запішыце дзеясловы парамі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**604.** Прачытайце тэкст. Якую назву можна яму даць? Чаму людзі любяць кветкі?

Любяць людзі кветкі не за тое, што маюць якую-небудзь карысць ад іх. Дзеля чаго разводзіць чалавек у сваіх садах бэз, язмін, ружы? Дзеля чаго збіраюць дзяўчаты і дзеці краскі на лугах? Красак жа (не)ядуць, — дык якая ж з іх карысць?

Але чалавеку хочацца не толькі есці, хочацца чалавеку харaства. Цешаць і чаруюць чалавека краскі сваёй прыгажосцю, сваім водарам, як цешыць і чаруе яго салаўіная песня.

Дзеля таго збіраюць і садзяць людзі краскі, дзеля таго і ўбіраюць імі сваё жыллё. *(Паводле Леанілы Чарняўскай)*

?! Знайдзіце дзеясловы ў кожным сказе. Пастаўце да іх пытанні.
Скажыце, у адзіночным ці множным ліку ўжыты дзеясловы.
Спішыце чацвёрты сказ, апускаючы дужкі.
Пішыце ***не*** асобна ад наступнага дзеяслова.

**605.** Прачытайце. Устаўце замест кропак дзеясловы патрэбнага ліку.

| | |
|---|---|
| я спяваю | мы ... |
| ты ... | вы слухаеце |
| ён гуляе | яны ... |

?! Да якой часціны мовы адносяцца словы *я, мы, ты, вы, ён, яны*?
Запішыце, устаўляючы прапушчаныя дзеясловы.

**606.** Прачытайце верш. У які час і ў якое надвор'е лепш лавіць рыбу?

Летні поўдзень. Ля ракі
мы сядзім — два рыбакі.
Я з ілба сціраю пот,
вочы хмурыць Васька-кот.
Мы для плотак, шчупакоў
накапалі чарвякоў.
Вудзім рыбу ад відна —
хоць бы клюнула адна!



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Вінаваты Васька-кот,
бо на сонцы грэў жывот,
вуркатаў ля рэчкі ён
і нагнаў на рыбу сон.
*(Вера Вярба)*

Знайдзіце ў вершы дзеясловы. Вызначце іх лік.
Выпішыце дзеясловы. Абазначце іх лік *(адз. л., мн. л.)*.

**607.** Уявіце, што зараз лета і гэта вы вырашылі пайсці вудзіць рыбу. Раскажыце, як вы будзеце збірацца, з кім вы пойдзеце на раку або возера, што з сабой возьмеце.
У сваім выказванні ўжывайце дзеясловы.

**608.** Прачытайце сказы. У якім ліку ўжыты ў сказах дзеясловы? Перабудуйце сказы, каб дзеясловы былі ўжыты ў множным ліку.

Вучань чытае цікавую кнігу.
Дуб расце на лясной паляне.
Бяроза вясной пускае сок.

Знайдзіце ў кожным сказе галоўныя члены.
Якім членам сказа звычайна з'яўляецца дзеяслоў?
Запішыце сказы, якія вы ўтварылі. Падкрэсліце дзейнік адной лініяй, выказнік — дзвюма.

Узор. *Вучань чытае (адз. л.) цікавую кнігу. Вучні чытаюць (мн. л.) цікавую кнігу.*

**609.** Прачытайце тэкст. Як вы лічыце, гэты тэкст мастацкі ці навуковы? Якія змены ў прыродзе заўважалі вы ў сакавіку?

Пасля зімы абуджаецца прырода. З сярэдзіны сакавіка на поўдні Беларусі пачынаецца рух сокаў у клёна, праз некалькі дзён — у бярозы. У цэнтральнай частцы і на поўначы гэта адбываецца пазней на тыдзень-два. З'яўляюцца першыя кветкі падбелу звычайнага. Зацвітае шэрая вольха, ляшчына. Вяртаюцца з выраю гракі, шпакі, канаплянкі, жаваранкі. Яны будуць нас радаваць усю вясну і лета сваімі песнямі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У канцы сакавіка ў вавёрак і зайчых з'яўляюцца дзеткі. Прачынаюцца ад зімовай спячкі мядзведзі і барсукі. У звяроў пачынаецца веснавая лінька. Рыбы пакідаюць зімавальныя ямы і плывуць на мелкаводдзе. Сонечнымі днямі адаграюцца мухі, павукі, матылі. Само паветра пахне вясною. *(З календара «Родны край»)*

?! Запішыце першы і апошні сказы тэксту.
Падкрэсліце выказнікі дзвюма лініямі.

**610.** У якой частцы Беларусі жывяце вы?
Пазней ці раней, чым у іншых мясцінах Беларусі, надыходзіць у вас вясна?
Раскажыце, па якіх прыметах вы заўважаеце, што прыйшла вясна.

## *Урокі 3—4. Часы дзеяслова*

**611.** Прачытайце сказы. У якім сказе дзеянне ўжо адбылося, у якім — адбываецца, а ў якім — толькі будзе адбывацца?

Нарэшце скончылася зіма.
Прырода вясной абуджаецца.
Летнія канікулы пачнуцца яшчэ не хутка.

?! Вызначце час дзеяслова ў кожным сказе: прошлы, цяперашні або будучы.
Запішыце сказы. Абазначце час дзеяслова *(пр. ч., ц. ч., б. ч.)*.

> *Успомніце!*
> Дзеясловы могуць змяняцца па часах.
> Яны могуць стаяць у **прошлым часе, цяперашнім** і **будучым**: *працаваў, працую, папрацую, буду працаваць*.

**612.** Прачытайце тэкст. Ці запускалі вы калі-небудзь паветраных змеяў? Гэта цікава ці не?

Памятаеш, як ты летам запускаў паветранага змея?
Змей спачатку капрызіў, (не)хацеў ляцець угору. Ён цягнуўся па зямлі, чапляўся хвастом за кусты, куляўся ў паветры.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

А потым яго падхапіў вясёлы ветрык. І змей радасна паляцеў угору. Ён падняўся вышэй тваёй галавы, вышэй дома, вышэй дрэва! *(Паводле Ільі Маршака і Алены Сегал; пераклад з рускай мовы)*

Знайдзіце ў тэксце дзеясловы.
У якім часе яны ўжыты?
Які дзеяслоў ужыты ў цяперашнім часе?
Запішыце сказ, у якім ёсць ***не*** з дзеясловам.

**613.** Прачытайце тэкст. Сталіцы якіх краін упамінаюцца ў ім?

З кожным годам павялічваецца насельніцтва Зямлі. А значыць, расце і колькасць гарадоў.

Самымі старажытнымі гарадамі сярод сталіц дзяржаў з’яўляюцца Афіны, Дэлі, Рым.

Гарады ўзніклі ў глыбокай старажытнасці, калі рамёствы і гандаль аддзяліліся ад земляробства. Але большасць сучасных гарадоў з’явілася адно-два стагоддзі назад, калі ўзнікла прамысловасць.

Колькасць гарадоў і гарадскога насельніцтва і надалей будзе павялічвацца. *(Паводле Марка Максімава)*

Знайдзіце ў тэксце дзеясловы. Вызначце іх час.
Выпішыце з тэксту па адным сказе з дзеясловамі, што стаяць у розным часе.
Пазначце час дзеясловаў.

**614.** Які горад з’яўляецца сталіцай Беларусі? Што вы ведаеце пра горад Мінск? Колькі ў ім жыхароў? Ці былі вы ў Мінску? Што ў ім ёсць адметнага? Раскажыце пра сталіцу Беларусі.

**615.** Прачытайце пытанні. Адкажыце на іх, ужываючы дзеясловы патрэбнага часу.

Чым вы займаліся ў вольны час зімой?
Як вы дапамагаеце дарослым вясной?
Што вы збіраецеся рабіць летам?

Запішыце тры сказы. Пастаўце пытанні да дзеясловаў. Абазначце час дзеясловаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**616.** Прачытайце тэкст. Ці бачылі вы жураўлёў?

### На роднае балота

Кожны год вяртаюцца жураўлі з цёплых краін на роднае балота. Доўга яны ляцяць вясной на сваю радзіму.

Высокім чаротам і сухой леташняй асакой зарасло вялікае балота. У самых недаступных месцах пабудуюць гнёзды жураўлі.

Спакойна яны жывуць на балоце. Не пройдзе воўк, не прабярэцца ліса, не падкрадзецца асцярожная рысь.

Водзяць вясной жураўлі вясёлыя карагоды. Збяруцца ў кружок, махаюць крыламі, танцуюць. Па ўсім балоце разносяцца іх шумлівыя галасы. *(Паводле Івана Сакалова-Мікітова; пераклад з рускай мовы)*

?! Пастаўце пытанні да ўсіх дзеясловаў у тэксце. Вызначце час, у якім ужыты кожны дзеяслоў.
Запішыце тэкст пад дыктоўку.

Праверце дыктанты адно ў аднаго.

**617.** Прачытайце тэкст. У якім часе ўжыты ў ім усе дзеясловы?

### Вясновая ноч

Павольна надыходзіць цёплая вясновая ноч. Абрысы лясоў трацяць сваю форму. Неба нізка звісае над зямлёю. Яно ўзіраецца ў яе тысячамі вачэй. Над сялом стаіць незвычайная цішыня. Сярпок месячыка нырае ў хмарку. Робіцца вельмі цёмна. *(Паводле Якуба Коласа)*

?! Змяніце час усіх дзеясловаў у тэксце з цяперашняга на прошлы.
Запішыце тэкст з дзеясловамі прошлага часу.
Падкрэсліце ў першым сказе галоўныя члены сказа.

**618.** Прачытайце тэкст. Колькі ў ім частак? Вызначце час дзеясловаў у тэксце.

### Пчаліны гарадок

Усю зіму пчолы драмалі ў вуллях на сотах з пахучым мёдам. Яго пакінуў на зіму клапатлівы пчаляр. Пчолы не ўпадаюць



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

у зімовую спячку. Яны толькі дрэмлюць. Зімой ім таксама патрэбна ежа, а здабываць яе няма дзе.

Але вось зіма скончылася. Надышла вясна. Пчолы выпаўзаюць з лятка і грэюцца на сонейку. Потым яны выпраўляюцца ў палі і лясы.

У вуллі ў гэтую пару́ кіпіць работа. Пчолы чысцяць, прыбіраюць пасля зімоўкі свой домік. Яны праветраць памяшканне, падрыхтуюцца да працы ў летнія дні. *(Паводле Георгія Скрабіцкага; пераклад з рускай мовы)*

?! Якую назву можна даць першай частцы тэксту? Аб чым у ёй расказваецца?
Пра што другая частка тэксту? Трэцяя?
Дайце назвы кожнай частцы тэксту і запішыце план.
Прачытайце тэкст яшчэ раз. Перакажыце яго па плане.
Напішыце пераказ.

**619.** Прачытайце народныя прыметы.

Птушкі ўюць гнёзды на сонечным баку дрэў — будзе халоднае лета.

Гракі крычаць — надвор'е сапсуецца.

З бярозы цячэ шмат соку — будзе дажджлівае лета.

?! Знайдзіце ў кожным сказе па два дзеясловы. У якім часе яны ўжыты?
Запішыце сказы, падкрэсліце дзеясловы, абазначце іх час.
Ці ведаеце вы якія-небудзь прыметы веснавога надвор'я?

## *Урокі 5—7. Неазначальная форма дзеяслова*

**620.** Прачытайце верш. Да каго звяртаецца ў ім паэт?

Звоніць, скача, як дзіцятка,
гэты жэўжык-ручаёк,
на яго, бы тая матка,
сонца кідае свой зрок.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

А зіма аж пачарнела,
годзе ёй тут кросны **ткаць**!
Ну, маленства, жыва, смела
выйдзем вéсну **прывітаць.**
*(Якуб Колас)*

?! Назавіце ў вершы ўсе дзеясловы. Вызначце іх лік, час.
Ці змаглі вы вызначыць лік і час выдзеленых дзеясловаў?

*Запомніце!*
Дзеясловы маюць пачатковую форму, якая называецца **неазначальнай** формай дзеяслова.
Дзеяслоў у неазначальнай форме адказвае на пытанні **што рабіць? што зрабіць?**
Неазначальная форма толькі называе дзеянне, але не абазначае ні часу, ні ліку, ні асобы: *будаваць, збудаваць, малаціць, змалаціць.*

**621.** Прачытайце дзеясловы. На якія пытанні яны адказваюць?

Гаварыць, адказаць, спяваць, глядзець, выглянуць, сустрэць, знайсці, прывітаць.

?! Ці можна вызначыць, які лік, час гэтых дзеясловаў?
Запішыце спачатку дзеясловы, якія адказваюць на пытанне што рабіць?, а пасля дзеясловы, якія адказваюць на пытанне што зрабіць?

**622.** Прачытайце дзеясловы. Пастаўце да кожнага пытанне.

Глядзіць, выглядаем, пойдзем, паспрачаемся, пайсці, паспрачацца, працуюць, працаваць, папрацаваць.

?! Запішыце толькі тыя дзеясловы, якія адказваюць на пытанні што рабіць? што зрабіць?

**623.** Прачытайце сказы. Знайдзіце ў іх дзеясловы неазначальнай формы.

Даўняя гэта мара — паглядзець на ўсё Палессе адразу. *(Барыс Сачанка)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Маці папрасіла купіць свежага хлеба.
Выйшаў бусел пагуляць. *(Максім Танк)*

?! Спішыце сказы.

Праверце адно ў аднаго правільнасць выканання задання.
Падкрэсліце ў сказах дзеясловы ў неазначальнай форме.

**624.** Прачытайце народныя выказванні. Растлумачце іх сэнс.

**Абы-як жыць — неба капціць.**
**Жыццё пражыць — не поле перайсці.**
**Не маючы спрыту, няма чаго за лейцы брацца.**

**Ле́йцы** — вяроўкі, рамяні для кіравання коньмі ў запрэжцы.

?! Знайдзіце ў кожным сказе дзеясловы неазначальнай формы. На якія пытанні яны адказваюць?
Запішыце па памяці адно з выказванняў. Праверце сябе па кнізе.

**625.** Прачытайце верш. Знайдзіце ў ім дзеясловы ў неазначальнай форме.

Гляньце, дзеткі, у аконца,
ды пара ўжо ўставаць...
Як прыгожа там бясконца!
Сорам, дзеткі, позна спаць.

Вы зірніце ў аконца,
палюбуйцеся хаця:
колькі волі, колькі сонца,
колькі новага жыцця!

*(Міхась Чарот)*

?! Выпішыце з верша дзеясловы ў неазначальнай форме.
Знайдзіце ў вершы дзеясловы, блізкія па значэнні, сінонімы. Запішыце іх так, каб усе яны былі ў неазначальнай форме.

**626.** Прачытайце дзеясловы ў неазначальнай форме.
Падбярыце да іх сінонімы.

Ісці, ..., ... .
Глядзець, ..., ... .
Гаварыць, ..., ... .
Сумаваць, ..., ... .

?! Запішыце рады сінонімаў, што ў вас атрымаліся.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**627.** Уявіце, што на вуліцы вы сустрэлі свайго сябра (сяброўку) з незнаёмым вам хлопцам (дзяўчынкай). Вы хацелі б пазнаёміцца. Выкарыстайце для гэтага наступныя фразы.

Я хацеў бы з табой пазнаёміцца.
Мяне завуць Сяргей. А цябе?
Прыемна пазнаёміцца.

?! Разыграйце такую сітуацыю ў асобах.

**628.** Прачытайце сказы, ставячы дзеясловы, што ў дужках, у неазначальную форму.

Каб дасканала (вывучаю) лес, мала толькі (хаджу) па ім і (гляджу). Трэба (умею) (назіраю), (умею) (бачу). *(Якуб Колас)*

Як хацелася мне досвіткам (паеду) у лес разам з бацькам і братам! *(Валянцін Мыслівец)*

Не (знайду) даражэй мне нічога за цябе, мой абветраны край.
*(Анатоль Сабалеўскі)*

?! Спішыце сказы, раскрываючы дужкі.

**629.** Прачытайце верш народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча. Якая асноўная думка гэтага верша? Што паэт хацеў сказаць?

Калі рана ўстанеш —
разам з першай птушкай,
што шукае тут жа
для дзяцей яды́, —
колькі ты паспееш
памагчы слабейшым,
падтрымаць, суцешыць,
выручыць з бяды!

?! Знайдзіце ў вершы дзеясловы з блізкім значэннем, сінонімы. На якое пытанне яны адказваюць? У якой форме стаяць? Выпішыце гэтыя дзеясловы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**630.** Прачытайце дзеясловы ў неазначальнай форме. Падбярыце да іх дзеясловы з супрацьлеглым значэннем, якія таксама стаяць у неазначальнай форме.

Маўчаць — ..., браць — ..., плакаць — ..., стаяць — ..., радавацца — ..., адчыняць — ..., засынаць — ... .

Запішыце пары дзеясловаў з супрацьлеглым значэннем.

**631.** Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс. Знайдзіце ў прыказках словы з супрацьлеглым значэннем — антонімы.

Лепей трошкі зрабіць, чым багата нагаварыць.
Добрая слава людзей збірае, а дрэнная — разганяе.
Чым дакучліва бурчаць, лепей памаўчаць.

У якіх прыказках дзеясловы стаяць у неазначальнай форме? Пастаўце дзеясловы з другой прыказкі ў неазначальнай форме. Запішыце ўсе дзеясловы ў неазначальнай форме.

**632.** Прачытайце словазлучэнні.

Пісаць сачыненне. Глядзець у акно. Адпачыць у лагеры. Кіраваць машынай. Купіць хлеба. Выступаць на сцэне.

Ад дзеясловаў неазначальнай формы ўтварыце дзеясловы цяперашняга, прошлага і будучага часу. Запішыце паводле ўзору.

Узор. *Чытаць кнігу — чытаю кнігу, чытаў кнігу, прачытаю кнігу, буду чытаць кнігу.*

**633.** Прачытайце тэкст.

Добрая рэч — азбука прыроды. Па ёй можна пазнаць невядомае. У добрае надвор'е па воблаках можна прадказаць навальніцу або працяглы дождж. Птушкі таксама могуць многаму навучыць. Каб вывучаць азбуку прыроды, трэба з малых гадоў хадзіць па



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

лясах і палях і за ўсім назіраць. Калі што незразумела, варта ў кнігах пашукаць, у людзей распытаць.

?! Спішыце, падкрэсліце дзеясловы неазначальнай формы.

**634.** Прачытайце прыказкі ў двух слупках.

| | |
|---|---|
| За багацце розуму не купіш.<br>Навуку за плячыма не носяць.<br>Пакаяннай галавы і меч не сячэ. | За багацце розуму не купі́ць.<br>Навуку за плячыма не насіць.<br>Пакаяннай галавы і мячу не секчы. |

?! Як вы разумееце прыказкі? Растлумачце.
Знайдзіце ў прыказках левага слупка дзеясловы, вызначце іх час і лік.
Запішыце прыказкі з правага слупка. Падкрэсліце дзеясловы. У якой форме ўжыты дзеясловы?



**635.** Прачытайце і адгадайце загадку.

Як ідзе — і шастом галавы не дастаць.
А ўпадзе — і з травы-муравы не відаць.

?! Спішыце загадку, дапішыце адгадку. Падкрэсліце дзеясловы неазначальнай формы.

## *Урок 8. Змяненне дзеясловаў па ліках і часах*

**636.** Прачытайце словы. Якой часцінай мовы яны з'яўляюцца? Устаўце прапушчаныя словы.

| Што рабіць? | Што робіць? | Што рабіў? | Што будзе рабіць? |
|---|---|---|---|
| будаваць | будуе | будаваў | будзе будаваць |
| ... | збірае | ... | ... |
| ... | ... | лавіў | ... |
| ... | ... | ... | будзе гаварыць |
| клікаць | ... | ... | ... |
| ... | ... | працаваў | ... |



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?! Запішыце практыкаванне, устаўляючы патрэбныя словы. Складзіце 2—3 сказы з гэтымі дзеясловамі (на выбар).

**637.** Прачытайце верш.

**Бярозавы сок**

Дзяцел дзюбу прыкладзе —
кропля горла студзіць.
Сок цячэ па барадзе,
капае на грудзі.
Пацягнуў яшчэ разок,
дзюбай цмокнуў: ну і сок!

*(Мікола Арочка)*

?! Спішыце. Знайдзіце дзеясловы. Абазначце іх лік.

**638.** Прачытайце дзеясловы. На якой мове яны напісаны?

Ждать, вести, нести, работать, ехать, спать, молчать, лететь, учить, любить, стоять, греметь.

?! Перакладзіце дзеясловы на беларускую мову. Запішыце. Складзіце тры сказы з дзеясловамі на выбар.

**639.** Прачытайце тэкст.

**Шпакоўня на дубе**

У майстэрні прыемна пахла свежым пілавіннем. Дзед Мікіта з Васільком майстравалі шпакоўні.

Да вечара зрабілі чатыры домікі для птушак. Тры павесілі ў садзе на яблыньках. Чацвёртую прымацавалі на дубе, што рос на ўзлеску.

Аднойчы сонечнай раніцай у сад прыляцелі шпакі. Яны аблюбавалі домікі на яблынях. Шпакоўня на дубе чамусьці не спадабалася птушкам. Засумаваў Васілёк.

Праз некалькі дзён хлопчык убачыў на дубе вавёрачку. Яна заўважыла Васілька і шуснула ў домік.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Цяпер хлопчык кожны дзень бегаў да дуба. Ён назіраў за вавёрачкай, частаваў яе семкамі. *(Паводле Янкі Галубовіча)*

?! Чым займаліся ў майстэрні дзед Мікіта і Васілёк?
Колькі яны зрабілі домікаў для птушак? Дзе павесілі шпакоўні?
Хто пасяліўся ў шпакоўні на дубе? Як паставіўся Васілёк да новага жыхара?
Колькі частак у гэтым тэксце?
Пра што расказваецца ў першай частцы? Якую назву ёй можна даць?
Пра што расказваецца ў другой частцы? Як можна яе назваць?
Пра што трэцяя частка? Якая назва падыходзіць ёй?
Складзіце план тэксту. Запішыце яго.
Прачытайце тэкст яшчэ раз.
Раскажыце тэкст па плане. Напішыце пераказ.

**640.** Прачытайце тэкст.

Многія ходзяць па лесе. Але не ўсе чуюць, разумеюць, назіраюць, адчуваюць прыроду. Так, на працягу стагоддзяў людзі бачылі, як падае снег. Але толькі назіральны чалавек заўважыў, якую цудоўную, прыгожую форму мае кожная сняжынка. Заўважыў і сказаў пра гэта іншым.

?! Спішыце тэкст. Падкрэсліце дзеясловы, абазначце іх лік і час.

## *Урок 9. Падагульненне па тэме «Дзеяслоў»*

**641.** Прачытайце тэкст. Змяняйце дзеясловы, што ў дужках, як патрабуе сэнс.

### Як робяць гнёзды

Грак (будаваць) сваё гняздо на вяршыне высокага дрэва. Пакуль грак (шукаць) пруток, грачыха (пільнаваць) пабудову.

Потым грачыха (ляцець), а грак (заставацца). Пакідаць хатку нельга, бо іншая пара гракоў (заняць) іх гняздо.

(Збіраць) гракі сухія пруткі, (пакласці) іх кучай на галінках — і гняздо гатовае.

?! Запішыце тэкст, раскрываючы дужкі. Дзеясловы стаўце ў патрэбную форму.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**642.** Прачытайце словы. Складзіце з іх сказы.

1. Садзіцца, сонца.
2. Доўгі, ад, цень, крывой, дастае, сасны, ужо, берага, самага, да.
3. На, адлівае, захадзе, неба, ружовай, фарбай, мяккай.
4. Луг, затаіўся, зарэчны, у, пакоі, задуменным.
5. Цішыню, парушае, толькі, хвалі, усплеск.
6. Белае, заблыталася, воблачка, у, дрэў, вершалінах.

?! Запішыце сказы, якія атрымаліся. Падкрэсліце дзеясловы. Вызначце лік і час дзеясловаў.

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

**1.** Прачытайце тэкст.

На беразе Нёмана раскінуліся старыя дубы. Такія дубы рэдка дзе ўбачыш. Ім ажно па некалькі соцень гадоў. За гэты час дубы сталі высокія і магутныя. Яны надзейна ахоўваюць раку.

Спішыце тэкст. Падкрэсліце дзеясловы дзвюма лініямі, вызначце іх лік і час.

**2.** Прачытайце словы.

| *цяперашні час* | *прошлы час* | *будучы час* |
|---|---|---|
| жыве | ... | ... |
| корміць | ... | ... |
| бачыць | ... | ... |
| стаіць | ... | ... |

Запішыце словы ў прошлым і будучым часе.

**3.** Прачытайце словы.

Гаварыць, даражыць, сумуе, берагчы, напісаў, дапамагаць, наступіла, перадаць, кіраваць, выносілі, праехалі, падняла, слухаць.

Выпішыце дзеясловы неазначальнай формы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# # *Дзеяслоў.* Не *з дзеясловамі*

**643.** Прачытайце словы. Знайдзіце сярод іх тыя, якія абазначаюць назвы дзеянняў. Пастаўце да іх пытанні.

Дзень, свята, бегчы, рабіць, лён, цудоўны, рашаю, пішу, цень, светлы, прыгожы.

?! Выпішыце з гэтых слоў дзеясловы.

**644.** Прачытайце рады слоў. Назавіце часціны мовы, да якіх адносіцца кожнае слова.

Цемната, цёмны, цямнець.
Святло, светлы, святлець.
Бялець, белы, белізна.
Чорны, чарнець, чарната.

?! Запішыце дзеясловы.
Якія дзеясловы з'яўляюцца супрацьлеглымі па значэнні, антонімамі?

*Успомніце!*
**Дзеяслоў** — гэта часціна мовы, якая абазначае назву дзеяння. Дзеяслоў адказвае на пытанні **што рабіць? што зрабіць? што рабіў? што будзе рабіць? што робіць?** і падобныя: *чытаць, прачытаць, чытаў, прачытае, чытае.*

**645.** Прачытайце жартаўлівы дыялог.

— **Адчыні** вароты!
— А хто **едзе**?
— Той, хто ўсё **ўмее**!
— **Глядзі**, усё ўмее, то сам і **адчыняй** вароты.

?! Да якой часціны мовы адносяцца выдзеленыя словы?
Пастаўце да дзеясловаў пытанні.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**646.** Прачытайце назоўнікі і дзеясловы.
Да назоўнікаў падбярыце дзеясловы, якія падыходзяць па сэнсе.

| | |
|---|---|
| сякерай | пішуць |
| нажом | колюць |
| відэльцам | мыюць |
| мылам | ядуць |
| ручкай | рэжуць |

Запішыце спалучэнні слоў, што атрымаліся.

**647.** Прачытайце народныя выказванні. Растлумачце іх сэнс. Каго называюць ранняй птушкай? Як яшчэ называюць чалавека, які рана ўстае?

Ранняя птушка крыльцы цярэбіць, а позняя вочкі трэ.
Спрытны ўсюды паспее.

Знайдзіце ў сказах дзеясловы. Пастаўце да іх пытанні.
Словы яшчэ якіх часцін мовы ёсць у першым сказе?
Спішыце прыказкі. Падкрэсліце дзеясловы дзвюма лініямі.

**648.** Уявіце, што вы вырашылі заўтра ўстаць раней звычайнага, каб заняцца нейкімі важнымі справамі.
Раскажыце, што вы будзеце рабіць, калі ўстанеце рана.
Выкарыстоўвайце ў сваіх выказваннях дзеясловы.

**649.** Прачытайце сказы. Пра што або пра каго гаворыцца ў кожным з іх?

Блізка рэчкі Самацечкі камары таўкуцца. *(Максім Багдановіч)*
Над снежнай палянай віселі ў бяздонні неба буйны́я зоркі. *(Змітрок Бядуля)*
Скрозь галіны лесу свеціцца шэрае, агорнутае воблакамі неба. *(Якуб Колас)*

Знайдзіце ў кожным сказе дзеяслоў. Ад якога слова патрэбна паставіць да яго пытанне?
Спішыце сказы. Падкрэсліце дзеясловы дзвюма лініямі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**650.** Прачытайце сказы. Звярніце ўвагу на напісанне ***не*** з дзеясловамі.

Не раскідвай свае рэчы па пакоі.
Не кідай смецце на дарозе.
Не перабягай вуліцу перад транспартам, які рухаецца.

?! Спішыце сказы. Пішыце ***не*** асобна ад наступнага дзеяслова.

*Успомніце!*
***Не*** пішацца асобна ад наступнага дзеяслова: *не хачу, не выканаць, не зрабіў.*

**651.** Падумайце і скажыце, чаго яшчэ не патрэбна рабіць.
Выкарыстайце ў сваіх выказваннях ***не*** ў спалучэнні з дзеясловамі.
Запішыце адно з такіх выказванняў.

**652.** Прачытайце верш. Знайдзіце ў ім дзеясловы. Пастаўце да іх пытанні.

Ах, як гэта радасна ведаць,
што, лічачы сябрам сваім,
усе цябе любяць і вераць,
што крыўды (не)зробіш ты ім!
*(Ніл Гілевіч)*

?! Спішыце слупок верша, раскрываючы дужкі.

**653.** Паразважайце, што значыць быць сябрам.
Што значыць «не зрабіць крыўды»?
Якой крыўды не зробіць сябар сябру?

**654.** Прачытайце загадкі Міколы Маляўкі. Здагадайцеся па малюнку і колькасці літар, пра што ідзе гаворка.

**Што за шлях?**

Не шуміць старымі ліпамі,
не зарос густой травою —
залатым пяском усыпаны
гэты шлях над галавою.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Напячэ аладак
белых — не замажа,
хоць сама заўсёды
чорная, як сажа.

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|

Выпішыце з загадак ***не*** з дзеясловамі.

**655.** Прачытайце народныя выказванні. Растлумачце іх сэнс.

Ніякая праца (не)ганьбіць чалавека.
Работы словам (не)заменіш.
Ад людскога вока (не)схаваешся.
З аднаго палена агню (не)раскладаюць.

Спішыце сказы, раскрываючы дужкі.

**656.** Прачытайце верш. Наколькі адпавядае яго змест сэнсу першых двух выказванняў з папярэдняга практыкавання? Што значыць *лынды біць*?

**Лынды**

Што я цэлы дзень рабіў?
Ой, рабіў — лынды біў.
А пад вечар, каб вы знялі,
мяне ногі (не)трымалі.

Ледзь да ложка дацягнуўся —
лёг і нават (не)разуўся.
Ой, нялёгка лынды біць —
лепш работу рабіць.
*(Ігар Мазнін; пераклад з рускай мовы Васіля Віткі)*

Спішыце ў радок сказы, у якіх ёсць ***не*** з дзеясловам. Раскрывайце ў гэтых сказах дужкі.

**657.** Прачытайце верш. Замест кропак устаўце ***не***.
Ці можна сказаць, што Лявонка б’е лынды?

У Лявонкі рукі,
рукі — ну як трэба,



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

а як есці сядзе —
... адрэжа хлеба,
... насыпле цукру,
... налье ён чаю.
Толькі адно чуеш:
— Мама, я чакаю...
Дома і на ўроках,
на прышкольных градках —
анідзе ... знойдзе
ён рукам занятку.
*(Паўлюк Прануза)*

?! Пастаўце пытанні да ўсіх дзеясловаў у вершы.
Запішыце ў сшыткі дзеясловы, перад якімі ўжыта ***не***.

## # *Змяненне дзеясловаў па часах*

**658.** Прачытайце сказы. У якім сказе апісваецца дзеянне, якое ўжо адбылося? А дзеянне, якое адбываецца зараз? У якім сказе гаворыцца пра дзеянне, якое яшчэ будзе адбывацца?

Учора я доўга глядзела тэлевізар.
Зараз я гуляю на вуліцы.
Вечарам я пачытаю кнігу.

?! Пастаўце пытанні да дзеясловаў.
Спішыце сказы. У дужках перад дзеясловамі запішыце пытанні, на якія яны адказваюць.

**659.** Прачытайце дзеясловы. Пастаўце да іх пытанні.

Прачытаў, чытаю, прачытаю.
Сядзеў, сяджу, пасяджу.
Гуляю, пагуляю, гуляў.
Выконваю, выканаю, выканаў.

?! Выпішыце спачатку дзеясловы, якія абазначаюць дзеянне, што адбываецца зараз; потым — дзеянне, якое ўжо адбылося; і, нарэшце, што будзе адбывацца.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Запомніце!*
Дзеясловы змяняюцца па часах. Яны могуць быць **цяперашняга, прошлага** і **будучага часу**.
**Цяперашні час** абазначае дзеянне, якое адбываецца ў момант гутаркі.
*Пахне свежым сенам.*
**Будучы час** абазначае дзеянне, якое будзе адбывацца пасля моманту гутаркі.
*Запахне (будзе пахнуць) свежым сенам.*
**Прошлы час** абазначае дзеянне, якое адбылося да моманту гутаркі.
*Пахла свежым сенам.*

**660.** Прачытайце сказы. Пастаўце пытанні да выдзеленых дзеясловаў.

Агнём вясёлак **ззяюць** росы ў моры жытніх каласоў. *(Якуб Колас)*

Неспадзявана **ўпаў** туман на мора: усё **ахутала** імгла. *(Сяргей Грахоўскі)*

Заўсёды дальняя дарога **развее** смутак і бяду. *(Сяргей Грахоўскі)*

?! Вызначце час дзеясловаў у кожным сказе.
Запішыце сказы. Абазначце час дзеясловаў наступным чынам: цяперашні час — *ц. ч.,* будучы час — *б. ч.*, прошлы час — *пр. ч.*

*Запомніце!*
Дзеясловы **цяперашняга** часу адказваюць на пытанні **што робіць? што робяць?**
Дзеясловы **прошлага** часу адказваюць на пытанні **што рабіў? што зрабіў? што рабіла? што зрабіла? што рабілі? што зрабілі?**
Дзеясловы **будучага** часу адказваюць на пытанні **што зробіць? што будзе рабіць? што зробяць? што будуць рабіць?**

**661.** Прачытайце жарт. Ці ведаеце вы адказ на пытанне настаўніцы?

Настаўніца **пытаецца** ў вучняў:
— Чаму чапля **стаіць** на аднойназе?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Калі яна **падніме** і другую, — **сказала** Ніна, — дык **паваліцца** на зямлю. *(Тамара Тарасава)*

?! Пастаўце пытанні да выдзеленых дзеясловаў. Вызначце час дзеясловаў.

**662.** Прачытайце дзеясловы. Пастаўце пытанне да кожнага з іх. Вызначце час дзеясловаў.

Малюю, прачытаў, глядзяць, паслухаю, буду вучыць, ствараў, вывучыў, прачытаю, маляваў, створу, буду маляваць, чытаем, глядзелі, паглядзяць, паслухаў, вучу, слухаю, ствараю.

?! Запішыце спачатку дзеясловы, што стаяць у цяперашнім часе, потым — у будучым, і апошнімі — тыя, што стаяць у прошлым часе.

**663.** Прачытайце тэкст.

**Вясна ідзе**

Забулькалі, заспявалі пад снегам ручаі. На старой таполі ацерабіўся, замахаў крыламі чорны грак.

Убачыў грака — вясну сустрэнеш. Так кажа прымаўка. Снег у полі пацямнеў, набрыняў і асеў. На ўзгорках чарнеюць праталінкі. У лесе на дрэвах набухаюць пупышкі, весела звіняць сінічкі на голым веццы, звонка грукае дзяцел на старой асіне.

Наўкола ўсё булькае, звініць і гукае: «Вясна ідзе-е-е!»

*(Паводле Валерыя Кастручына)*

?! Выпішыце з тэксту дзеясловы. Пазначце іх час.

**664.** Прачытайце вершаваную загадку. Па малюнку і колькасці літар адгадайце яе.

...Спакваля мяхі развёў —
і, як вырай жаўрукоў,
гукі раптам узляцелі,
зазвінелі,
затрымцелі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Чарадзейны перабор
скалыхнуў і дом,
і двор.
То званочкам
ён зальецца,
то, здаецца,
зазлуецца,
быццам гром той,
прабурчыць,
то раптоўна замаўчыць.
*(Здзіслаў Стома)*



Знайдзіце ў загадцы дзеясловы. Вызначце іх час.

**665.** Прачытайце тэкст. У якім часе ўжыты ў тэксце ўсе дзеясловы?

**Вясна**

Стаялі цудоўныя дні. Ярка свяціла веснавое сонца. Яго промні сагравалі зямлю.

Зелянела на ўзгорках маладая траўка. У лясах з'явіліся першыя веснавыя кветкі.

Чарнела ў полі свежая ралля. З раніцы да ночы на полі гудзелі трактары.

Змяніце час дзеясловаў з прошлага на цяперашні. Прачытайце тэкст яшчэ раз.
Спішыце тэкст, ужываючы дзеясловы ў цяперашнім часе.

**666.** Раскажыце пра змены, якія адбываюцца зараз у прыродзе.

Што ў прыродзе ўжо адбылося?
Што адбываецца зараз?
Што будзе адбывацца далей?

**667.** Прачытайце народныя прыметы веснавога надвор'я.

Рана прыляцелі гракі, жаўрукі і журавы — да ранняй і цёплай вясны.
Калі мышы робяць гнёзды ў копах нізка, вясна будзе сухая.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Калі ўвесну бяроза перад вольхаю ліст распусціць, то лета будзе сухое, калі вольха ўперад — мокрае.

Вызначце час дзеясловаў.
Запішыце ў сшытку сказ, у якім ёсць дзеяслоў цяперашняга часу і дзеяслоў будучага часу.

**668.** Прачытайце верш. Як вы разумееце выраз «ранак вытарашчыў вочы»?

Першы гром быў сёння ўночы.
Дождж да дня шумеў вясёла.
Ранак вытарашчыў вочы,
як дзіця глядзіць наўкола.
Што за ноч магло зрабіцца!
Перайначана ўсё чыста:
поле дыхае, дыміцца
парай лёгкаю, празрыстай.
Набрынялыя пупышкі,
што яшчэ драмалі ўчора,
ахінаюць голле пышна,
вабяць яркасцю ўзораў.

*(Паводле Ніла Гілевіча)*

Вызначце час дзеясловаў.
Вывучыце першы слупок верша.
Запішыце яго па памяці. Праверце сябе па кнізе.

**669.** Скажыце, выкарыстаўшы адзін сказ, што вы рабілі ўчора.
У другім сказе скажыце, чым займаецеся сёння.
У трэцім сказе раскажыце пра вашы планы на заўтра.
У першым сказе выкарыстайце дзеяслоў у прошлым часе, у другім — у цяперашнім, у трэцім — у будучым.

**670.** Прачытайце тэкст. Ці назіралі вы калі-небудзь усход сонца? Ці прыгожая гэта з’ява?

## Усход сонца

Небасхіл ледзь прыкметна **пасвятлеў**. З-за воблака **пасыпаліся** чырвоныя промні. І вось **паказваецца** само сонца. Яно **купаецца**



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ў сваім святле. Праз некалькі хвілін агністы шар **адарвецца** ад хмар, **узнімецца** і **паплыве** над зямлёй і **будзе** шчодра **раздаваць** цяпло. З усходам сонца **зазіхацяць** кроплі ранішняй расы, **адзавуцца** спевамі птушкі, **прачнецца** ўсё жывое на зямлі. *(Паводле Міколы Ваданосава)*

Пастаўце пытанні да выдзеленых дзеясловаў. Вызначце іх час.
Выпішыце спачатку дзеясловы цяперашняга часу, потым — прошлага, і нарэшце — будучага.

**671.** Прачытайце верш. Які настрой гэтага верша?

### Вясной

Дзень — празрысты,
водар — лёгкі.
Май шчыруе
ўздоўж сяла.
Белапенная чаромха
над платамі
расцвіла.

Радасна працуюць
пчолы.
Птушкі гімн
пяюць вясне.
Вецер,
сонечны, вясёлы,
падпявае ім і мне.

*(Міхась Пазнякоў)*

**Шчырава́ць** — старанна рабіць што-небудзь.

Знайдзіце ў вершы дзеясловы. У якім часе яны ўжыты?
Вывучыце на памяць другі слупок верша.
Запішыце яго па памяці.

**672.** Прачытайце тэкст. Якую назву можна яму даць?

Хлопчык бег праз вуліцу. Нечакана спатыкнуўся, упаў і параніў нагу. Хлопчыка прынеслі дамоў. Маці яго была хворая. Яна



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

пачула стогн сына, ускочыла з пасцелі, каб быць каля яго. Хлопчык перастаў стагнаць. Пакуль яму абвязвалі нагу, ён ні разу не крыкнуў.

— Ці табе не баліць? — спытаў яго ў канцы доктар.

— Дужа баліць! — шэптам сказаў хлопчык. — Але я не хачу, каб мама ведала пра гэта. *(Паводле Леанілы Гарэцкай)*

?! Ці можна сказаць, што сын — клапатлівы хлопчык?
Як вы паводзіце сябе ў падобных выпадках?
У якім часе ўжыты дзеясловы ў тэксце?
Прачытайце або паслухайце тэкст яшчэ раз.
Перакажыце яго.

# ПАЎТАРЭННЕ ВЫВУЧАНАГА ЗА ГОД

## *Урок 1*

**673.** Прачытайце тэкст. Ацаніце ўчынкі тых, хто вырваў клёнік, і хлопчыкаў, ад імя якіх вядзецца гаворка ў тэксце.

### Клён

Аднойчы майскай парою мы з братам ішлі па лясной дарозе. Раптам убачылі пасярод дарогі вырваны клёнік. Пупышкі яго нагадвалі дзюбачкі птушанят, якіх мучыць смага.

Шкада нам зрабілася дрэўца. Паднялі яго і панеслі дадому. Пасадзілі клёнік у агародчыку.

Штодзённа пад вечар паліваем яго чыстай вадою. Расце наш клёнік, лісточкі распускае. Праз колькі год вырасце наш клёнік, стане прыгожым дрэвам. *(Паводле Міколы Янчанкі)*

?! Якая тэма тэксту?
Якая яго асноўная думка?
На колькі частак можна падзяліць тэкст? Дайце назву кожнай частцы.
Складзіце план.
Запішыце назву і план тэксту ў сшытку.
Знайдзіце ў тэксце дзеясловы. Вызначце іх час.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Выпішыце спачатку дзеясловы цяперашняга часу, потым — прошлага, затым — будучага.
Назавіце займеннікі, якія выкарыстаны ў тэксце.

**674.** Прачытайце загадкі. Успомніце, як пішацца ***не*** з дзеясловамі. Здагадайцеся, пра што загадкі, па першай і апошняй літарах у словах-адгадках.

Мы стаім — і ён стаіць,
мы бяжым — і ён бяжыць,
нашы рухі пераймае,
ні на крок (не)**адступае**.
Толькі ў цемры ды начамі
пакідае жарты з намі.
*(Нічыпар Парукаў)*

| | | | |
|---|---|---|---|
| ц | | | ь |

Папераблытаў ногі,
папераблытаў вусы,
разлёгся ля дарогі
для нашае спакусы.
І цяжка **абмінуць**,
каб трохі (не)ўскубнуць.
*(Ніл Гілевіч)*

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| г | | | | х |

?! Выпішыце з загадак дзеясловы, якія ўжыты з ***не***.
Назавіце ў загадках займеннікі.
Выпішыце з загадак выдзеленыя словы. Абазначце ў іх прыстаўкі.
* Назавіце дзеясловы ў неазначальнай форме.

**675.** Прачытайце верш.

**Дапамагу**

На гародзе ў бабулі
многа морквы і цыбулі,
памідораў, агуркоў,
часнаку і буракоў.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Я на грады **пабягу**
і бабулі **памагу:**
моркву з рэпай **прапалю,**
а пасля гуркі палью.
*(Тадзіяна Кляшторная)*

?! Колькі сказаў у вершы?
Выпішыце з верша назоўнікі. Па пытаннях вызначце іх склоны.
Выпішыце выдзеленыя словы. Абазначце іх часткі.
* Назавіце ў першым і другім сказах аднародныя члены.
* Якія назоўнікі адносяцца да першага скланення, а якія — да другога? Выпішыце назоўнікі ў два слупкі.

**676.** Прачытайце тэкст. На якую ён тэму? Якую назву можна яму даць?

У жаваранкаў існуе свой хор. Перад заходам сонца птушкі ўзлятаюць высока-высока. Адна перад адной яны спяваюць пяшчотныя песні. **Агністы, чырвоны шар патанае за небакраем.** Тады змаўкаюць і хаваюцца на спачынак палявыя песняры. Наўкол наступае вячэрняя цішыня. *(Паводле Івана Грамовіча)*

?! Знайдзіце ў тэксце роднасныя словы. Выпішыце, абазначце іх часткі.
У выдзеленым сказе назавіце сінонімы.
Спішыце тэкст. У першым сказе вызначце галоўныя і даданыя члены сказа.

## *Урок 2*

**677.** Прачытайце верш. Вызначце яго асноўную думку. Што хацеў выказаць паэт з дапамогай гэтага верша?

### Гняздо на вішні

**(Не)чакай** бядоты нейкай.
**Будзе** добра і зацішна.
Ты **(не)бойся,** верабейка,
што **зрабіў** гняздо на вішні.
Будзе шмат варон — **прагонім,**
**закрычаць** гракі — **суцішым.**



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ад кату́ мы а**баронім,**
тваіх дзетак **пакалышам.**
*(Мар'ян Дукса)*

?! Выдзеленыя дзеясловы выпішыце ў такім парадку: цяперашні час, прошлы і будучы.
Назавіце займеннікі, якія выкарыстаны ў вершы. Замест якіх слоў яны ўжыты?
* Знайдзіце назоўнікі адзіночнага ліку. Вызначце іх скланенне і склон, у якім яны стаяць у вершы.

**678.** Прачытайце тэкст. Дайце яму назву.

Цудоўная пара — лета! Усё навокал зялёнае. Усё навокал радаснае. На лугах шмат кветак. А ў **лесе** на цёплых палянках наліваюцца пунсовым **сокам** суніцы. На пагорках суніцы салодкія, але дробныя. А ў **траве** ягады буйны́я. Быццам чырвоныя завушніцы вісяць.
*(Паводле Любові Варанковай; пераклад з рускай мовы)*

?! Напішыце назву тэксту. Запішыце тэкст пад дыктоўку.
Вызначце склоны выдзеленых назоўнікаў.

Праверце дыктанты адно ў аднаго.
* Да якога скланення адносяцца выдзеленыя назоўнікі?

**679.** Прачытайце тэкст. Ці чулі вы, як спявае салавей? Ці заўважалі, на якіх дрэвах ён спявае?

Дзе ёсць вада і расце алешына, там абавязкова жыве салавей. Гэты цудоўны птах не заспявае на хвойцы, на бярозцы або дубку. Яму падавай менавіта шэрую алешыну з лазою, а яшчэ чаромху з калінай любіць ён. Тут і пяе салавей, а побач **растуць залацістыя** лотаці ды **блакітныя** незабудкі. *(Паводле Рыгора Ігнаценкі)*

?! Выпішыце з тэксту выдзеленыя словы. Абазначце іх часткі.
Падбярыце да кожнага слова аднакаранёвыя, роднасныя словы.
Запішыце тры групы роднасных слоў.
* Просты ці складаны апошні сказ тэксту? Чаму?
* Запішыце апошні сказ. Абазначце ў ім галоўныя члены. Звярніце ўвагу, што ў другой частцы гэтага сказа аднародныя дзейнікі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**680.** Прачытайце тэкст.

### Птушкі ў чэрвені

Змаўкаюць птушыныя спевы. У большасці лясных птушак вывеліся птушаняты. Клапатлівыя бацькі безупынна носяць у гнёзды чарвякоў вусеняў слімакоў матылькоў мушак. Нялёгка ім накарміць дзяцей.

Падлічана, што адна сям'я шпакоў знішчае за дзень каля чатырохсот шкодных садовых слімакоў. Вялікае значэнне мае і тое, што птушкі разносяць насенне дрэў і розных раслін. Гэтым яны дапамагаюць росту і развіццю лясоў. *(Віталь Вольскі)*

?! * Спішыце першы абзац. У сказе з аднароднымі членамі пастаўце патрэбныя знакі прыпынку.
Вызначце дзейнікі і выказнікі ў першых двух сказах.
Выпішыце з гэтых сказаў словазлучэнні.

## *Урок 3*

**681.** Прачытайце верш. Да якіх адносін да прыроды заклікае ў ім аўтар? У якім сказе гэты заклік выказаны?

На паляне ў цішыні лясной,
дзе пчалой пазвоньвае крыніца,
чэрвеньскай асыпаны расой,
спяць чабор, мятліца, медуніца.
Сонца разбудзіла ўжо даўно
і зязюлю з сойкай, і сініцу.
А яны спяць серабрыстым сном.
Абудзіце іх і не будзіце!

*(Максім Танк)*

?! Знайдзіце ў вершы прыметнікі. З якімі назоўнікамі яны звязаны?
Вызначце лік, род і склон прыметнікаў.
Якія прыназоўнікі ёсць у вершы?
Знайдзіце ў сказах верша займеннікі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Выпішыце словы, якія адносяцца да вядомых вам часцін мовы, у такім парадку: займеннік, злучнік, дзеяслоў, прыметнік, прыназоўнік, назоўнік.
* Які злучнік ужываецца ў сказах з аднароднымі членамі?

**682.** Прачытайце тэкст. Якую назву можна яму даць?

Ужо некалькі дзён мы з сябрамі збіраліся пайсці ў лес. Зараз канец чэрвеня, і ў лесе з’явіліся першыя падарункі лета — чарніцы і суніцы.

І вось мы ідзём па ляснoй дарозе. Удалечыні заблішчала невялікае лясное возера. Злева ад дарогі растуць маладыя елачкі. Справа красуюць прыгажуні-бярозкі. Мы заўважаем у траве чырвоныя ягады суніц. А вось з-пад елачкі выглядае важны мухамор. Хутка пачнецца і грыбная пара́.

Знайдзіце ў тэксце дзеясловы. Вызначце іх час.
Знайдзіце ў тэксце назоўнікі і прыметнікі, з якімі яны звязаны па сэнсе.
Запішыце назву тэксту.
Запішыце тэкст пад дыктоўку. Над дзеясловамі пазначце іх час.

**683.** Прачытайце пытанні. Адкажыце на іх.

Хутка лета. Дзе ты збіраешся правесці канікулы?
Чым думаеш займацца?
Якія кніжкі хочаш прачытаць?
Ці будзеш ты сумаваць па школе?

Напішы невялікае апавяданне на тэму «Як я збіраюся правесці летнія канікулы».

**684.** Прачытай верш-пажаданне. Які наказ дае паэт у гэтым вершы? Што значыць «слухаць родную прыроду»?

**Слухай родную прыроду**

У любую пару́ года,
у пагоду, непагоду
слухай родную прыроду —
ты пачуеш галасы
таямнічае красы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

З лесам, з нівай залатою
размаўляе ветравей,
сонца-сонейка — з зямлёю,
з цішынёю — салавей,
з небам — рэкі і азёры,
хваля — з ніцаю вярбой...
Як і што яны гавораць,
слухай, сябра любы мой.
*(Васіль Жуковіч)*

?! Знайдзіце ў вершы словы-сінонімы і словы-антонімы.
Выпішыце іх.
Растлумачце значэнне слоў *ветравей, таямнічы.* Калі самі не можаце растлумачыць, паглядзіце ў тлумачальным слоўніку.

## *Урок 4*

**685.** Прачытайце словы.

Паляна, ноч, збожжа, куток, **відэлец**, возера, абед, школа, радасць, войска, перамога, соль, парасон, **зямля**, аўтамабіль, серада, панядзелак, **восень**.

?! Якой часцінай мовы з’яўляюцца гэтыя словы?
Вызначце скланенне кожнага назоўніка.
Праскланяйце выдзеленыя словы пісьмова.
Складзіце са словамі на выбар тры сказы розных відаў: апавядальны, пытальны, пабуджальны.

**686.** Прачытайце тэкст.

### У чэрвені

**Прыгожы свет** у чэрвені. Над лугам пасля цёплага дажджу зіхаціць прыгожая вясёлка. У небе плывуць лёгкія аблачынкі.

У агародзе паспелі салодкія клубніцы. Духмяныя ягадкі самі ў роце растаюць. На сонечнай паляне просяцца ў вядзерца чырвоныя сунічкі. Пахаваліся ў мох жоўтыя лісічкі. На лузе, у полі,



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

у лесе цвітуць рознакаляровыя кветкі. Іх водар вабіць усіх. Над кветкамі лётаюць **руплівыя пчолкі** і збіраюць нектар. Восенню яны пачастуюць нас салодкім мёдам. *(Па матэрыялах часопіса «Вясёлка»)*

Выпішыце з тэксту прыметнікі разам з назоўнікамі, з якімі яны звязаны па сэнсе. Вызначце лік, род і склон гэтых назоўнікаў і прыметнікаў.
Праскланяйце выдзеленыя словазлучэнні.
Знайдзіце сказы, які адпавядаюць наступнай схеме:



**687.** Прачытайце тэкст.

На ўзлеску невялікага бярэзніку расла маленькая сунічка. З сонейкам і ветрыкам сябравала чырвоная ягадка. Аднойчы здарылася нечаканае. Неба пакрылася цёмнымі хмарамі. Наляцеў моцны вецер і паламаў крохкія сунічныя лісточкі. Пачала ягадка сохнуць. Магла б загінуць маленькая сунічка. Ды на ўзлесак прыйшлі гаманлівыя дзеці. Яны асцярожна выкапалі сунічны куст і панеслі ў школьны сад. З тае пары жыве сунічка ў вясёлых і дружных дзяцей. Яна паправілася, ажыла і гарэзліва ззяе чырвонай шапачкай.

Якая тэма тэксту?
Назавіце яго асноўную думку.
На колькі частак можна падзяліць тэкст? Дайце назву кожнай частцы.
Складзіце план.
Запішыце назву і план тэксту ў сшытку.
Напішыце пераказ.

**688.** Прачытайце сказы. Якія віды сказаў тут ёсць?

1. Пачалося лета. 2. На небе паказаліся рэдкія воблакі. 3. Свеціць сонейка. 4. Падзьмуў вецер. 5. Вясна была цёплая. 6. Летняя ноч апусцілася на зямлю. 7. Дзяніска навучыўся маляваць. 8. Птушкі прыляцелі. 9. Водар ландышаў расплываўся па ваколіцы.

Выпішыце развітыя сказы. Падкрэсліце галоўныя і даданыя члены сказа.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Урок 5

**689.** Уявіце, што да вас у школу прыехаў карэспандэнт з газеты. Ён хоча даведацца, як прайшоў у вас гэты навучальны год. Карэспандэнт задае вам пытанні, а вы адказваеце на іх.

— Назаві, калі ласка, сваё прозвішча і імя.
— … .
— Скажы некалькі слоў пра сваю настаўніцу.
— … .
— Якім быў гэты навучальны год?
— … .
— Што табе дапамагала ў вучобе?
— … .
— Што найбольш запомнілася са школьнага жыцця?
— … .
— Што ты хочаш пажадаць сваім сябрам напярэдадні летніх канікул?
— … .

?! Разыграйце гэту сцэнку некалькі разоў. Мяняйцеся ролямі.

**690.** Прачытайце верш. Да чаго звяртаецца паэт у вершы? Які настрой у верша: радасны ці сумны? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

**Развітаемся, званок!**

Сёння ў нас апошні ўрок —
ты звіні даўжэй,
званок,
доўга, радасна звіні
жаўранкам у вышыні.
Зычна, весела, заўзята
абвясці пра наша свята.
Колькі раз ты
гучна-гучна
на заняткі клікаў вучняў —



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

далятаў і да сталоўкі,
і да шумнай спортпляцоўкі.
Не вятрамі, не шпакамі —
год агучаны званкамі.
Сёння ў нас апошні ўрок —
развітаемся, званок!
Падары расстанне гэта,
звонка выпусціўшы ў лета.
Сам жа,
сцішаны, у зморы
спі спакойна ў калідоры.

*(Мар’ян Дукса)*



?! Знайдзіце ў вершы роднасныя словы.
З якім настроем вы развітваецеся са школай?

**691.** Уявіце, што вашы сябры — гэта першакласнікі, а вы ім павінны растлумачыць правілы паводзін летам.
Што карысна рабіць?
Чаго трэба засцерагацца ў час летніх канікул?
Ці трэба дапамагаць старэйшым?
Раскажыце гэта перад класам.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК

**Абра́зіць** — пакрыўдзіць, прынізіць.

**Абцугі́** — металічны інструмент, які выкарыстоўваецца ў кавальскай справе для захоплівання і заціскання жалеза.

**Аб'я́ва** — паведамленне, якое даводзіцца да ўсеагульнага ведама.

**Акты́ўны** — дзейны, энергічны.

**Алю́р, рысь** — спосабы бегу каня.

**Аптымісты́чны** — жыццярадасны.

**Бандэро́ль** — паштовае адпраўленне ў папяровай абгортцы.

**Бе́лле** — белізна, яркі, чысты белы колер.

**Бруі́цца** — цячэ, пераліваецца.

**Буя́ць** — бурна расці.

**Ваенка́м** — ваенны камандзір, начальнік ваенкамата.

**Ваенкама́т** — установа, якая прызывае ў армію.

**Вандро́ўнік** — чалавек, які вандруе, падарожнічае.

**Ве́жа** — высокае і вузкае архітэктурнае збудаванне.

**Вепр** — дзікі кабан, дзік.

**Вербало́з** — куст ці дрэва сямейства вярбовых.

**Віху́ра** — бура, завея, завіруха.

**Во́лат** — чалавек вялікага росту і сілы; велікан, гігант.

**Вы́спа** — невялікі востраў, часцей пясчаны.

**Глей** — вязкі асадак з мінеральных або арганічных рэчываў на дне вадаёмаў.

**Грэ́баваць** — адчуваць агіду, з пагардай адносіцца да чаго-небудзь.

**Грэ́бля** — насціл з бярвення ці галля для праезду цераз балота, гразкае месца; гаць.

**Гу́слі** — мнагаструнны музычны інструмент славянскіх народаў.

**Ды́баць** — ісці размерана і важна або нязграбна.

**Жо́лаб** — прыстасаванне з дошак, ліставога жалеза і іншага для сцёку вадкасцей або перасыпання чаго-небудзь.

**За́мець** — завіруха, мяцеліца або снег, які вецер пераганяе па зямлі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**За́пар** — непасрэдна адзін за адным, без пропуску.

**Запі́ска** — кароткае пісьмо.

**За́сень** — месца, закрытае ад прамянёў сонца; цень.

**Зацятá** — упарта, настойліва.

**Земляны́ цвыркý́н** — насякомае, якое жыве ў зямлі і шкодзіць сельскагаспадарчым раслінам.

**Зені́тчыца** — ваеннаслужачая, якая з дапамогай спецыяльных гармат збівае самалёты.

**Зрэ́б'е** — грубая кудзеля (валакно), што аддзяляецца пры трапанні лёну і іншага, а таксама палатно з такой кудзелі і адзенне з такога палатна.

**Казю́рка** — казяўка, кузурка, маленькае насякомае.

**Каме́ль** — ніжняя патоўшчаная частка дрэва, расліны, якая прылягае да кораня.

**Карце́ць** — адчуваць неадольнае жаданне зрабіць што-небудзь.

**Клю́шня** — канцавая частка ножкі рака і ракападобных, якая нагадвае клешчы і служыць для хапання.

**Князь** — правіцель і кіраўнік войска ў старажытныя часы.

**Кро́сны** — ручны ткацкі станок.

**Ле́йцы** — вяроўкі, рамяні для кіравання коньмі ў запрэжцы.

**Ле́тнік** — дарога, якой ездзяць толькі летам.

**Лы́ка** — унутраны слой кары маладых лісцевых дрэў (пераважна ліпы).

**Ля́мец** — тоўсты, шчыльны матэрыял, звалены з шэрсці, воўны.

**Ляме́ш** — частка плуга, якая падразае пласт зямлі знізу.

**Ляшчы́на** — куст ці дрэва, на якім растуць лясныя арэхі.

**Макрамэ́** — мастацкі выраб з тоўстых плеценых нітак.

**Мро́іцца** — уяўляцца ў думках, здавацца.

**Мулінэ́** — гатунак каляровых нітак для вышывання.

**Мядзве́дка** — насякомае, якое жыве у зямлі і шкодзіць сельскагаспадарчым раслінам.

**Наго́да** — падстава для чаго-небудзь.

**На дварэ́** — на вуліцы, у прыродзе.

**Ната́тка** — кароткі запіс пра што-небудзь, памятка.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Пад’е́зд** — уваход у будынак; месца, па якім пад’язджаюць да чаго-небудзь.

**Партыза́н** — удзельнік вайны ў тыле ворага.

**Паса́г** — маёмасць, якую даюць бацькі ці родзічы маладой, калі яна выходзіць замуж.

**Пасі́ўны** — неактыўны, неэнергічны; абыякавы да ўсяго.

**Песімісты́чны** — які бачыць толькі адмоўнае.

**Плёс** — шырокі ціхі ўчастак ракі паміж перакатамі або астравамі.

**По́сцілка** — лёгкая саматканая коўдра або прасціна, якую рассцілаюць на пасцель, якой накрываюць ці засцілаюць ложак, або кавалак тканіны, якой накрываецца ці завешваецца што-небудзь.

**Разва́жыць** — супакоіць, палепшыць настрой; прыняць рашэнне.

**Раз’ю́шаны** — які знаходзіцца ў лютасці, шаленстве.

**Рыштава́нне** — часовае збудаванне з дошак, стоек або металічных трубак, якое ўстанаўліваецца ўздоўж сцен для будаўнічых або рамонтных работ.

**Слата́, сло́та** — вадкая гразь на зямлі, на дарогах.

**Ста́рыца** — старое, перасохлае рэчышча.

**Строка́ты** — які вылучаецца неаднароднасцю, разнастайны, з розных элементаў; рознакаляровы.

**Сугало́ссе** — спалучэнне некалькіх гукаў рознай вышыні, звычайна гарманічнае, прыемнае.

**Талака́** — калектыўная дапамога пры выкананні якіх-небудзь работ.

**Тур** — першабытны дзікі бык, продак свойскай каровы.

**Хві́ля** — хвіліна, мінута, імгненне.

**Чвэрць** — чацвёртая частка чаго-небудзь цэлага.

**Шало́м** — шлем, старажытны металічны воінскі галаўны ўбор, які ахоўваў галаву ад удараў, стрэл.

**Шчырава́ць** — старанна рабіць што-небудзь.

**Я́ва** — тое, што сапраўды існуе або існавала; рэальнасць, рэчаіснасць, а не сон ці мара.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ПАГУТАРЫМ
# (прыкладныя маўленчыя сітуацыі, якія могуць абмяркоўвацца ў класе)

### Знаходка

— Добры дзень!

— Прывітанне!

— Я знайшоў пашпарт каля вашай крамы.

— Пакажы, калі ласка. Я не памятаю такога чалавека. Аднясі дакумент у міліцыю.

— А дзе бліжэйшы аддзел міліцыі?

— Тут недалёка ад крамы, на вуліцы Новай.

— Дзякуй! Да пабачэння.

— Калі ласка.

### Рэцэпт

— Добры дзень, Алеся! Пакаштуй, я ўчора пякла пячэнне (пірог і гэтак далей).

— Дзякуй, з задавальненнем! Ой, як смачна! Раскажы мне рэцэпт, калі ласка. Я паспрабую таксама спячы.

— Вельмі просты рэцэпт. Слухай...

— І сапраўды проста. Дзякуй. Сёння абавязкова паспрабую спячы.

### Выпадковасць

— Наташа, прынясі цукар, калі ласка.

— Бабулечка, міленькая, я забылася табе сказаць, што я выпадкова перакуліла пакет з цукрам і ён амаль увесь высыпаўся на падлогу.

— Чаму ты нічога не сказала? З чым мы будзем чай піць?

— Прабач мне, я зараз збегаю ў магазін.

— Ну добра, тады яшчэ і смятаны купі.

— З задавальненнем.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

### Многа спраў

— Мацвей, мама сказала, каб мы памылі посуд, прапыласосілі пакоі, вынеслі смецце і схадзілі ў магазін па хлеб.

— Давай я вынесу смецце і схаджу ў магазін.

— А чаму ты? Давай наадварот.

— У мяне ёсць прапанова: я мыю посуд.

— Я прапыласошу.

— А потым разам сходзім у магазін.

— Па дарозе вынесем смецце.

— Дамовіліся.

### Рамонт

— Мама, у мяне парваліся красоўкі.

— Як? Мы ж нядаўна іх купілі!

— Трэба зноў новыя купляць.

— Не, мой даражэнькі, спачатку ты аднясеш іх у майстэрню па рамонце абутку.

— Я не ведаю, куды ісці.

— Майстэрня знаходзіцца ў суседнім доме.

— Можа, ты сама занясеш?

— Не. Сам парваў, сам і нясі.

### Цікавы фільм

— Слухай, Антон учора хадзіў у кіно. Яму вельмі спадабалася.

— Які фільм ён глядзеў?

— «Апошні асілак». Антон казаў, што вельмі смешны фільм.

— Я б схадзіў, але, баюся, бацькі не дазволяць. Я не паспею выканаць дамашняе заданне.

— Тады давай сходзім у суботу.

— Давай.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. *Антонава, Н. У.* Беларуская мова. Навучальныя пераказы: 2—4-я кл.: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Н. У. Антонава, В. І. Свірыдзенка. — Мінск: Аверсэв, 2015. — 64 с. — (Урок у пач. шк.).

2. *Баханькоў, А. Я.* Тлумачальны слоўнік беларускай мовы / А. Я. Баханькоў, І. М. Гайдукевіч, П. П. Шуба. — Мінск: Нар. асвета, 1990. — 396 с.

3. Беларуская дзіцячая літаратура: хрэстаматыя: вучэб. дапам. для навучэнцаў пед. вучылішчаў / склад. М. Б. Яфімава, В. М. Ляшук. — Мінск: Выш. шк., 1996. — 655 с.

4. Беларуская літаратура: пазакласнае чытанне / уклад. Л. І. Строк. — Мінск: ЮниПрессМаркет, 2013. — 384 с. — (Серыя «Хрэстаматыя»).

5. *Вольскі, А. В.* Літаратурнае чытанне: падруч. для 2-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання: у 2 ч. / А. В. Вольскі, І. А. Гімпель. — Мінск: НІА, 2011. — 120 с.

6. *Галяш, Г. А.* Беларуская мова: 4-ы кл.: рабочы сш.: дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навучання / Г. А. Галяш, Н. А. Жыліч. — 6-е выд. — Мінск: Аверсэв, 2015. — 96 с. — (Рабочыя сш.).

7. *Жыліч, Н. А.* Беларуская мова: 3-і кл.: тэматычны трэнажор / Н. А. Жыліч, А. Г. Казлова. — Мінск: Аверсэв, 2007. — 96 с. — (Карткі-заданні).

8. Залатыя каласкі: чытанка для дзяцей / уклад. М. А. Федасеенка [і інш.]. — Мінск: Лазурак, 1994. — 384 с.

9. Зборнік дыктантаў: для фак. педагогікі і методыкі пач. навучання, педагогікі і псіхалогіі (дашк.), дэфекталогіі пед. ін-таў / Я. М. Адамовіч [і інш.]. — Мінск: Выш. шк., 1988. — 270 с.

10. Зборнік дыктантаў па беларускай мове за перыяд навучання на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі: дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання. — Мінск: НІА, 2011. — 128 с.

11. Зборнік матэрыялаў для выпускнога экзамену па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» за перыяд навучання і выхавання




Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі: тэксты дыктантаў. — Мінск: НІА: Аверсэў, 2017. — 218 с.

12. *Змушко, А. М.* Беларуская мова: вучэб. дапам. для 8-га кл. 1-га аддз-ня дапам. шк. з беларус. мовай навучання / А. М. Змушко. — Мінск: Нар. асвета, 2004. — 195 с.

13. *Казлова, А. Г.* Беларуская мова: 4-ы кл.: тэматычны трэнажор / А. Г. Казлова. — 5-е выд. — Мінск: Аверсэў, 2014. — 128 с. — (Карткі-заданні).

14. *Клышка, А.* Буквар: падруч. для 1-га кл. установ агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання: для работы ў кл. / Анатоль Клышка. — Мінск: НІА, 2014. — 151 с.

15. *Клышка, А.* Вярэнька загадак: адкажы, чаму загадкі маюць гэткія адгадкі / Анатоль Клышка. — Мінск: Юнацтва, 1982. — 16 с.

16. *Красней, В. П.* Беларуская мова : поўны школьны курс: тэорыя: дапам. для вучняў ст. кл. установ агул. сярэд. адукацыі / В. П. Красней, Я. М. Лаўрэль. — 8-е выд. — Мінск: Аверсэў, 2017. — 287 с.

17. Крынічка: хрэстаматыя для дзяцей мал. шк. узросту / уклад. Р. Шостак. — Мінск: Радыёла-плюс, 2006. — 430 с.

18. *Мацвеенка, У. І.* Займальны родны алфавіт: вершы, загадкі, скорагаворкі: для мал. шк. узросту / У. Мацвеенка. — Мінск: Маст. літ., 2013. — 47 с.: іл.

19. *Місун, У. Л.* Між зялёных бароў: вершы і казка / У. Л. Місун. — Мінск: Юнацтва, 1981. — 23 с.

20. Наш край: кн. для пазакл. чытання ў 2-м кл. / склад. У. А. Сарока. — 3-е выд., дапрац. — Мінск: Нар. асвета, 1982. — 271 с.

21. Пазакласнае чытанне: 1-ы (2-і) кл. / склад. Н. У. Антонава, Г. А. Галяш. — Мінск: Пач. шк., 2016. — Сш. 1: Восень золата рассыпала. — 16 с.

22. *Парукаў, Н. І.* Зорачкі-пушынкі: загадкі / Н. І. Парукаў. — Мінск: Нар. асвета, 1980. — 31 с.

23. *Паўлоўскі, І. І.* Беларуская мова: зб. кантрольных работ (спісванні, дыктанты, дыктанты з граматычным заданнем): 1—4-я кл.: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / І. І. Паўлоўскі. — 2-е выд. — Мінск: Аверсэў, 2013. — 125 с. — (Кантрол.-вымяр. матэрыялы).

24. *Паўлоўскі, І. І.* Беларуская мова: падруч. для 4-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання: у 2 ч. / І. І. Паўлоўскі. — Мінск: НІА, 2013. — Ч. 2. — 125 с.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

25. Пралеска: хрэстаматыя для дзіцячага сада: дапам. для педагогаў дашк. устаноў / уклад., уступ. арт. А. І. Сачанкі. — 2-е выд., стэр. — Мінск: Скакун, 2001. — 702 с.

26. *Пушча, Я.* Збор твораў: у 2 т. / Я. Пушча. — Мінск: Маст. літ., 1994. — Т. 2: Вершы. Паэмы. Пераклады. Крытычныя артыкулы 1930—1963. — 462 с.

27. *Салаўцоў, М. І.* Чаму плуг не ржавее: вершы / М. І. Салаўцоў. — Мінск: Маст. літ., 1978. — 21 с.

28. *Сахарчук, В. Я.* Што такое? Хто такі?: загадкі / В. Я. Сахарчук. — Мінск: Юнацтва, 1998. — 32 с.

29. *Свірыдзенка, В. І.* Скланенне назоўнікаў: 4-ы кл.: сш.-трэнажор / В. І. Свірыдзенка. — Мінск: Аверсэв, 2013. — 48 с. — (Урок у пач. шк.).

30. *Свірыдзенка, В. І.* Скланенне прыметнікаў: сш.-трэнажор: 4-ы кл. / В. І. Свірыдзенка. — Мінск: Аверсэв, 2014. — 48 с.

31. *Скарынкін, У.* Апошняе слова: вершы / Уладзімір Скарынкін. — Мінск: Маст. літ., 1994. — 94 с.

32. *Сторажава, Н. А.* Першае падарожжа: вершы, лічылкі, скорагаворкі: для дзяцей дашк. і мал. шк. узросту / Н. А. Сторажава. — Мінск: Нар. асвета, 2012. — 24 с.

33. Сцяжынка: вершы, казкі, загадкі, аповесці і апавяданні: хрэстаматыя для пазакл. чытання ў 5 кл. / уклад. В. Я. Ляшук, Л. В. Асташонак. — Мінск: Юнацтва, 1999. — 527 с.: іл. — (Шк. б-ка).

34. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: больш за 65 000 слоў / пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко; афарм. А. М. Хількевіча. — 2-е выд. — Мінск: БелЭн, 1999. — 784 с.

35. *Тумаш, Г. В.* Беларуская мова: 5-ы кл.: рабочы сш.: дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. В. Тумаш. — 16-е выд., перапрац. — Мінск: Аверсэв, 2017. — 111 с.

36. *Цыбульская, С. І.* Беларуская мова: 5-ы кл.: рабочы сш.: дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / С. І. Цыбульская. — 5-е выд. — Мінск: Сэр-Вит, 2017. — 147 с. — (Шк. праграма).



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ЗМЕСТ

ПАЎТАРЭННЕ .......... 3
Урок 1. Гукі і літары .......... 3
Урок 2. Націск. Правапіс *о, э — а* .......... 5
Урок 3. Зацвярдзелыя гукі і літары, якія іх абазначаюць. Правапіс *е, ё — я* .......... 7
Урок 4. Падоўжаныя зычныя. Глухія і звонкія зычныя .......... 9
Урок 5. Мяккія і цвёрдыя зычныя .......... 11
Урок 6. Будова слова. Канчатак .......... 13
Урокі 7—8. Будова слова. Суфікс .......... 15
Урок 9. Будова слова. Прыстаўка .......... 18
# Роднасныя словы. Корань слова .......... 21
Урок 10. Галоўныя члены сказа .......... 24
Урокі 11—12. Галоўныя і даданыя члены сказа .......... 25
# Віды сказаў па інтанацыі і мэце выказвання .......... 28
МАЎЛЕННЕ .......... 32
Урокі 1—2. Дыялагічнае і маналагічнае маўленне .......... 32
ТЭКСТ .......... 36
Урокі 1—2. Тэкст. Тэма, асноўная думка тэксту .......... 36
Урокі 3—4. Часткі тэксту .......... 41
Урок 5. Назва і план тэксту .......... 45
Урокі 6—7. Пераказ тэксту .......... 47
Урок 8. Напісанне запіскі, нататкі, аб'явы .......... 52
Урокі 9—10. Складанне апавядання .......... 54
# Складанне апавядання па апорных словах і словазлучэннях, па яго пачатку або канцоўцы .......... 57
СКАЗ .......... 60
Урок 1. Простыя сказы .......... 60
Урок 2. Простыя неразвітыя і развітыя сказы .......... 63
Урок 3. Складаныя сказы .......... 65
Урокі 4—5. Складаныя сказы. Злучнікі паміж часткамі складанага сказа .......... 66
Урок 6. Аднародныя члены сказа .......... 70
Урокі 7—8. Злучнікі паміж аднароднымі членамі і знакі прыпынку пры іх .......... 73



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Урок 9. Падагульненне па тэме «Сказ» ............................ 78
**Праверце сябе** ........................................................ 79
# Галоўныя і даданыя члены сказа ..................................... 79
# Словазлучэнне ............................................................ 84
СЛОВА ............................................................................ 88
Урок 1. Значэнне слова ................................................. 88
Урокі 2—3. Тлумачальны слоўнік ..................................... 91
Урокі 4—5. Сінонімы ........................................................ 95
Урокі 6—7. Антонімы ....................................................... 98
РОДНАСНЫЯ СЛОВЫ ..................................................... 102
Урокі 1—2. Роднасныя словы ......................................... 102
Урокі 3—4. Формы слова і роднасныя словы ..................... 105
Урокі 5—6. Прыстаўкі і прыназоўнікі ............................. 109
Урокі 7—8. Часткі слова ............................................... 112
**Праверце сябе** ........................................................ 115
# Будова слова .............................................................. 116
# Правапіс прыставак ..................................................... 122
ЧАСЦІНЫ МОВЫ ............................................................ 126
**Назоўнік** ................................................................. 126
Урок 1. Назоўнік .......................................................... 126
Урок 2. Лік назоўнікаў ................................................. 129
Урок 3. Назоўнікі, якія не змяняюцца па ліках ................. 131
Урокі 4—5. Род назоўнікаў ........................................... 133
Урок 6. Значэнне склонаў і склонавыя пытанні ................. 139
Урок 7. Склоны і склонавыя пытанні ............................... 142
Урок 8. Скланенне назоўнікаў множнага ліку .................... 145
Урок 9. Тры скланенні назоўнікаў .................................. 147
Урок 10. Першае скланенне назоўнікаў ............................ 149
Урок 11. Змяненне па склонах назоўнікаў 1-га скланення (давальны і месны склоны) ........................................... 151
Урок 12. Змяненне па склонах назоўнікаў 1-га скланення (вінавальны і назоўны склоны) ........................................ 153
Урок 13. Змяненне па склонах назоўнікаў 1-га скланення (родны склон) ............................................................... 155
Урок 14. Змяненне па склонах назоўнікаў 1-га скланення (творны склон) .............................................................. 156



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Урок 15. Змяненне па склонах назоўнікаў 2-га скланення ..... 159
Урок 16. Змяненне па склонах назоўнікаў 2-га скланення (назоўны і вінавальны склоны) ..... 161
Урок 17. Змяненне па склонах назоўнікаў 2-га скланення (родны склон) ..... 164
Урок 18. Змяненне па склонах назоўнікаў 2-га скланення (давальны склон) ..... 166
Урок 19. Змяненне па склонах назоўнікаў 2-га скланення (творны склон) ..... 167
Урок 20. Змяненне па склонах назоўнікаў 2-га скланення (месны склон) ..... 169
Урок 21. Трэцяе скланенне назоўнікаў ..... 172
Урок 22. Змяненне па склонах назоўнікаў 3-га скланення ..... 174
Урок 23. Змяненне па склонах назоўнікаў 3-га скланення (творны склон) ..... 177
Урок 24. Падагульненне па тэме «Назоўнік» ..... 178
**Праверце сябе** ..... 179
# Склоны і склонавыя пытанні назоўнікаў ..... 180
**Прыметнік** ..... 189
Урокі 1—2. Прыметнік ..... 189
Урокі 3—5. Лік і род прыметнікаў ..... 192
Урокі 6—14. Змяненне прыметнікаў па склонах ..... 200
Урок 15. Падагульненне па тэме «Прыметнік» ..... 216
**Праверце сябе** ..... 216
**Займеннік** ..... 217
Урок 1. Займеннік. Агульнае паняцце ..... 217
Урок 2. Асабовыя займеннікі ..... 219
Урокі 3—4. Знаходжанне займеннікаў у сказе, тэксце ..... 222
**Дзеяслоў** ..... 227
Урок 1. Дзеяслоў ..... 227
Урок 2. Лік дзеясловаў ..... 229
Урокі 3—4. Часы дзеяслова ..... 232
Урокі 5—7. Неазначальная форма дзеяслова ..... 235
Урок 8. Змяненне дзеясловаў па ліках і часах ..... 240
Урок 9. Падагульненне па тэме «Дзеяслоў» ..... 242
**Праверце сябе** ..... 243



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# Дзеяслоў. *Не* з дзеясловамі ........................................ 244
# Змяненне дзеясловаў па часах ........................................ 248
ПАЎТАРЭННЕ ВЫВУЧАНАГА ЗА ГОД ........................................ 254
Урок 1 ........................................ 254
Урок 2 ........................................ 256
Урок 3 ........................................ 258
Урок 4 ........................................ 260
Урок 5 ........................................ 262
ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК ........................................ 264
ПАГУТАРЫМ........................................ 267
СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ ........................................ 269

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

(Назва і нумар школы)

| Навучальны год | Імя і прозвішча навучэнца | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака навучэнцу за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |

Вучэбнае выданне

**Змушко** Антаніна Міхайлаўна
**Дзенісевіч** Людміла Рыгораўна

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

**Вучэбны дапаможнік для 8 класа
першага аддзялення дапаможнай школы
з беларускай мовай навучання**

Рэдактары *Н. Б. Кучмель, І. В. Летуновіч*
Дызайн вокладкі *Л. І. Мелава*
Мастак *Л. А. Мурашка*
Тэхнічнае рэдагаванне і камп’ютарная вёрстка *М. С. Чычынай*
Карэктары *В. Р. Ермаковіч, В. М. Іваноў*

Падпісана да друку 19.10.2018. Фармат 70×90 $^1/_{16}$. Папера афсетная № 1. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 20,18+0,29 форз. Ул.-выд. арк. 11,60+0,40 форз.
Тыраж 518 экз. Заказ 155.

Выдавец і паліграфічнае выкананне: рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/159 ад 27.01.2014, № 2/63 ад 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ










## АРФАГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК

**А**
аўся́нка
ахво́тна

**Б**
бандэро́ль

**В**
верабе́й
во́кладка

**Г**
гарбу́з

**Д (ДЗ)**
дзве́ры
до́шка

**К**
кулі́к

**Л**
ла́ска
лы́ка

**М**
макрамэ́
медуні́ца
ме́сца
мянту́з

**Н**
надво́р’е

**П**
падбе́л
по́паўзень
пялёсткі

**Р**
ручні́к

**С**
сусе́д
сцю́жа

**Т**
тале́рка

**У**
учо́ра

**Я**
ядло́вец